# ВАСІЛЬ ВІТКА

# ДЗЕЦІ І МЫ



*Васіль Вітка*

# ДЗЕЦІ І МЫ

*Мінск*
*«Мастацкая літаратура»*
*1977*

Бел 2
В 54

## *Ад аўтара*

*Розныя гэта рэчы — ад запісу ў дзённіку да нарыса і апавядання. І пісаліся яны ў розныя часы: пад уражаннем асабіста ўбачанага, перажытага і па неадкладнай патрэбе выказацца пра тое, што трывожыць і хвалюе,— які ты, чалавек, якім імкнешся стаць, у чым твой запаветны ідэал, як разумееш і як бачыш ты сваё шчасце?*

*Самае блізкае мне, пра што я думаў і пісаў, упершыню аб'ядналася пад адной вокладкай.*

В $\frac{70303-073}{М 302(05)-77}$ 4-77

© Выдавецтва «Мастацкая літаратура», 1977 г.

# *Увага, нараджаецца чалавек*

# *Дзеці і мы*

## *На арбіту жыцця*

Колькі ў прыродзе таямніц і загадак, але самая складаная — чалавек.

Вось кагадзе што нарадзілася дзіця. Першы плач, першы крык. Чым галасней яно плача, тым радасней мы, дарослыя, смяёмся. Чым мацней яно крычыць, тым большая наша ўпэўненасць — новы насельнік зямлі стартаваў удала.

Так прынялі, так зразумелі мы першыя пазыўныя сігналы чалавека, які выйшаў на арбіту жыцця.

А, між іншым, сэнс гэтых пазыўных не толькі ў воклічы перамогі, а і ў трывожным папярэджанні: спяшайцеся! Не траццe марна ніводнай хвіліны! З узлётнай пляцоўкі пачаўся мой лёс. Якім я стану чалавекам — ужо цяпер, у першыя дні, месяцы, гады,— залежыць ад вас.

І сапраўды, трывожыцца ёсць з-за чаго. Загадка чалавечай асобы вызначаецца рэкордна кароткім часам.

Колькі б ты ні пражыў: семдзесят, восемдзесят, дзевяноста, сто гадоў, але залаты запас усяго твайго жыцця, які абумовіў тваю чалавечую сутнасць,— гэта твае першыя гады, тваё маленства.

«Хіба не тады я набываў усё тое, чым я цяпер жыву, і набываў так многа, так хутка, што за ўсё астатняе жыццё я не набыў і аднае сотае таго»,— прызнаецца вялікі чалавеказнаўца Л. М. Талстой.

Канкрэтызуючы гэты вывад, А. С. Макаранка ўдакладняе суадносіны паміж магчымасцямі чалавека да пяцігадовага ўзросту і пасля — на працягу ўсяго жыцця: «Галоўныя асновы выхавання закладваюцца да пяці год, і тое, што вы зрабілі да пяці год,— гэта 90 працэнтаў усяго выхаваўчага працэсу».

Удумайцеся ў парадаксальную няўмольнасць гэтай загадкі: пяць год — дзевяноста працэнтаў!.. А за гэтымі лічбамі — людскія лёсы, шчаслівыя, няшчасныя, радасныя і сумныя... Божа мой, як часта мы, дарослыя, самі

таго не думаючы, становімся ворагамі сваім дзецям толькі таму, што іх маленства прыстасоўваем да сваіх выгод, звычак, камфорту, гвалтуючы іх волю, прыглушаючы іх энергію, цікаўнасць, дапытлівасць, фантазію! Грубыя імпульсы, прымітыўныя ўражанні, у асяроддзі якіх спазнаецца свет, набываецца першы вопыт, глыбока раняць і духоўна калечаць дзіця. А колькі сямейных драм, як удараў маланкі, перакрыжоўваецца ў дзіцячых сэрцах, колькі раз'юшаных кулакоў злосці, нянавісці, недаверу і страху грукацяць у іх кволыя душы!

Якім будзе чалавек, гаворыць А. Макаранка, залежыць ад таго, якім вы яго зробіце да пятага года жыцця. Калі вы да пяці год не выхавалі яго як трэба, потым прыйдзецца перавыхоўваць.

Перавыхоўваць неймаверна цяжка. Але, як ні дзіўна, найбольшыя нашы сілы і найбольшыя нашы сродкі трацяцца на перавыхаванне. Мы толькі тым і займаемся, што перавыхоўваем, як бы загадзя разлічваючы, што ўпушчанае намі, не дароблёнае намі, а то і злачынна сапсаванае намі, павінен выправіць нехта наступны, хто падымае чалавека на чарговую ступень.

Колькі ступеняў у ракеты, што кожнага з нас падымае ў свой жыццёвы космас: маленства, малалецтва, юнацтва, сталасць... Але, бывае, падняўшыся нават на самую вышэйшую, чалавек так і не ўбачыць, дзеля чаго ён падымаўся — ні радасці адчування прасторы для думкі, для творчасці, ні хараства жыцця, таму што бачанню, адчуванню ўсяго гэтага яго не навучылі на першай, на самай галоўнай, ступені — у тыя пяць — сем год, калі яго істота была здольная ўзбагаціцца на ўсё жыццё.

Першая ступень жыцця ў адрозненне ад касмічнай ракеты не толькі не адпадае, а прырастае навек. І калі яна была ўдалая — чалавек шчаслівы, лёгка і радасна яго душы, калі няўдалая — усё жыццё адчувае яе пакутны цяжар.

## *Гадаванцы воўчага логава*

Рамантычная аповесць Кіплінга пра хлопчыка, якога выгадавала ваўчыца і выхавалі звяры, канчаецца тым, што семнаццацігадовы юнак па закліку крыві вяртаецца да людзей, да маці, якая яго нарадзіла.

Прыгожая легенда. Пісьменнік у сваім Маўглі спалу-

чыў два асяроддзі, дзве стыхіі жыцця — людскога і звярынага, звычаі і законы чалавека са звычаямі і законамі джунгляў. Постаць дужага, спрытнага, загартаванага ў неверагодных выпрабаваннях юнака, па прызнанню роднай маці, самага прыгожага ў свеце, напэўна, і аўтару здавалася тым эталонам, тым ідэалам чалавека, сфарміраваць якога можа толькі асяроддзе дужых, бясстрашных... Людзей? Не абавязкова. Магчыма, маральны кодэкс джунгляў, якім у дасканаласці авалодаў Маўглі, найболей прыдатны?

Мы добра ведаем, хто ў далейшым, адкінуўшы ўсякую паэзію і рамантычнасць, узяў на ўзбраенне падобны спосаб выхавання «магутнай асобы». Гісторыя вынесла суровы прысуд прарокам, якія найвышэйшым сваім евангеллем абвясцілі: чалавек чалавеку — воўк.

Легенда пра чалавека, выхаванага па воўчых законах, адкінута і самім жыццём.

Нарадзіўшыся і жывучы ў каланіяльнай Індыі, Р. Кіплінг пісаў «Кнігу джунгляў», безумоўна, пад уражаннем рэальных фактаў, калі ваўчыцы, у якіх людзі знішчалі ваўчанят, вымушаныя неадольным матчыным інстынктам, выкрадалі з паселішчаў дзяцей, заносілі ў свае логава і кармілі сваім малаком. Чалавечае немаўля прыстасоўвалася да ўмоў і звычак звярынага асяроддзя, але, звычайна, лёс воўчых гадаванцаў заўсёды канчаўся трагічна: стаўшы на карачкі, чалавек болей не падымаўся, вывучыўшыся выць па-воўчы, назаўсёды забываў чалавечую мову, зрабіўшыся зверам, не вяртаўся да людзей.

Нялёгка прыстасавацца да жыцця, поўнага небяспек і выпрабаванняў, але з малаком маці гадаванец спасцігае і мудрасць навучання: трапнасць бачання, чуйнасць слыху, калі і як адгукацца на знаёмыя поклічы...

Для Індыі, для яе джунгляў, у якіх дзейнічае юны герой Кіплінга, ды і для самога аўтара гэтай цудоўнай кнігі не рэдкаю навіною было, калі знаходзілі ў воўчым логаве або лавілі ў лясных нетрах людскіх дзяцей, выгадаваных ваўкамі.

Яшчэ ў час маленства пісьменніка ўвесь свет абляцела паведамленне, што ў сіроцкі дом г. Агра перададзены хлопчык, злоўлены ў джунглях. Паляўнічыя палічылі яго за дзіўнага, ніколі не бачанага звера і кінуліся наўздагон, каб схапіць жывога. Але калі той на карачках упаўзаў у пячору, пазналі, што гэта чалавек.

Паляўнічыя дымам выкурылі з пячоры яе насельнікаў, забілі ваўчыцу і двух ваўчанят. Хлопчык, які адчайна абараняў логава, пакусаў паляўнічых. Воўчаму прыёмнаму сыну, паводле сведчання ўрачоў, было сем год. Хлопчыка злавілі ў суботні дзень, таму назвалі яго Субота.

Маленькі Субота нагадваў псіхічна хворага: нізкі лоб, зубы вытыркалі з рота, неспакойны, трывожны позірк. Час ад часу ён крыўляўся, нервова патузваючы ніжняй сківіцай. Спачатку прыглядаўся да людзей, потым, прысеўшы на карачкі, абпоўзаў кожны куток у пакоі. Хапаў, што траплялася, і абнюхваў, прабаваў на смак.

Пражыўшы 35 год, ён так і не навучыўся гаварыць. Толькі незадоўга да смерці змог засвоіць два словы: вах (добра) і пані (вада).

Праз пяць год пасля таго, як быў знойдзены Субота, у той жа сірочы дом з суседніх джунгляў прывезлі яшчэ аднаго хлопчыка. Яго злавілі ў воўчай зграі. Меў ён каля дзесяці год. Піў ваду, хлебчучы языком, грыз косці і еў сырое мяса.

Падобных сенсацыйных выпадкаў нямала. Бываюць яны і ў наш час.

Ёсць над чым задумацца, прачытаўшы гэтыя сумныя гісторыі. За мільёны год сваёй эвалюцыі чалавек падняўся на нечуваныя вышыні. І будзе падымацца яшчэ вышэй, узбагачаючы, удасканальваючы свой розум, багацце і хараство сваіх пачуццяў. Аднак біялагічны парадокс не такая простая праблема, каб не лічыцца з ёй. Трывожачыся за кожнага нашага суродзіча, які з'явіўся на свет, трэба памятаць, што гены — самыя высакародныя гены ў сваім кодзе, у сваім кібернетычным спадчынным запісе, перадаюць яму і ўсемагутныя інстынкты і рэфлексы. Некаторыя рудыменты пры спрыяльных умовах перамагаюць набытыя якасці, нават замацаваныя генетычнай праграмай. Уласцівыя ўсім жывым арганізмам, яны аказваюцца самымі стойкімі. У гэтым зарука непераможнасці і бясконцасці жыцця.

Спадчынная праграма — няспынная эстафета, але галоўны яе клопат — данесці біялагічную гарантыю. Вопыт спазнання, духоўныя якасці, усе магчымасці і здольнасці, не заўсёды гарантаваныя спадчыннасцю, набываюцца і развіваюцца ва ўмовах жыццёвага асяроддзя.

І хоць чалавек, выхаваны зверам, не становіцца зве-

рам, але не становіцца ён і чалавекам. Не прынесла поспеху і «ачалавечванне» жывёл, хоць такія намаганні рабіліся і робяцца, але канчаюцца яны драматычна: прыстасаваўшыся да ненатуральных умоў жыцця, выхаванцы чалавека — звяры, выпушчаныя на волю, ужо не могуць прыстасавацца да свайго асяроддзя.

## *Калі пачынаць?*

— Калі пачынаць выхаванне чалавека?

— Ну, вядома, з нараджэння!

Я схільны думаць, што трэба пачынаць раней — да нараджэння. Не прэтэндую на першаадкрыццё ісціны. Многія тысячагоддзі гэтай ісцінай кіруецца народная педагогіка, а ў некаторых народаў грамадзянскі кодэкс: ва ўсходніх краінах, налічваючы ўзроставы стаж чалавека, яму дадаюць яшчэ дзевяць законных месяцаў.

Не надта дасведчаныя і ў псіхалогіі, і ў рэфлексікалогіі, нашы маці, усе разам узятыя, цераз жыццёвы вопыт даходзілі да ісцін, якія потым станавіліся добрымі традыцыямі. І ў нашы дні жыве прыгожы і добры звычай — шанаваць і аберагаць душэўны настрой, чысціню пачуццяў жанчыны, якая рыхтуецца стаць маці. Лягчэй за ўсё, не разабраўшыся, выкінуць з народнай этыкі разам з прымхамі і забабонамі і тыя набыткі вопыту, якія, па праву разумных спадчыннікаў, мы павінны б з удзячнасцю пераняць.

Мудрая маці вучыла дачку — будучую парадзіху — старацца як мага болей бачыць прыгожага: людзей, жывёл, краявідаў, спяваць самыя лепшыя песні, сцерагчыся ад усяго нядобрага і злога. Дзеля чаго? Дзеля таго, хто павінен нарадзіцца.

Дзеля яго ўсімі маткамі свету ствараліся калыханкі, вынашаныя пад сэрцам разам са сваімі самымі лепшымі надзеямі.

Яшчэ ва ўлонні маці дзіця, адчуўшы біццё маленькай чырвонай кропелькі жыцця, спалучае яго з сігналамі, з пазыўнымі, якія пасылае яму матчына сэрца. Матчыны пачуцці, яе настрой, яе хваляванні перадаюцца дзіцяці.

Сярод актыўных імпульсаў, якія фарміруюць пачуцці дзіцяці ў калысцы,— безумоўна, гукавыя. У бязладным наваколлі слых паступова вучыцца адрозніваць парадак,

які падначальваецца рытму сэрца, рытму дыхання, дзіця спасцігае мову гукаў. Адсюль пачынаюцца вытокі эмацыянальнага фарміравання. Яшчэ не валодаючы ніякім вопытам думкі, яшчэ не здольнае думаць, немаўля ўжо адрознівае сумны або радасны настрой гукавой гармоніі.

У палаце радзільнага дома ўключылі магнітафон, на стужцы якога былі запісаны тоны скарачэнняў спакойнага і ўсхваляванага сэрцаў. Рытму спакойнага сэрца немаўляты не заўважылі, пры першых жа гуках усхваляванага ўсю палату ахапіў плач.

Успомніце сваіх дзяцей у тыя хвіліны, калі асэнсаваных рухаў яшчэ зусім не відаць, але першая ўсмешка ўжо выклікаецца прыемным, радасным настроем. Калі свайму маленькаму сыну я спяваў сумную песню «Я табун сцерагу», яго губкі крывіліся ў грымасу, вось-вось гатовую перайсці ў плач, і як адразу ж мяняўся настрой, як ажыўлялася дзіця, калі пачынаўся які-небудзь бравурны марш.

Першаасновы душэўнага хараства пачынаюцца з калыскі. На самай ранняй стадыі развіцця эмацыянальны фактар, безумоўна, галоўны і вырашальны. Цяжка вярнуць страчанае, калі не выявіліся, не развіліся пачуццёвыя формы спазнання, уласцівыя ўзросту: непасрэднае адчуванне, успрыняцце, уяўленне, фантазія. Гэта і ёсць тая аснова, на якой пачынаецца мысленне. Нездарма выдатны педагог нашага часу В. А. Сухамлінскі запаветным дэвізам сваёй дзейнасці назваў сэрца — «Сэрца аддаю дзецям». Выключная па сваёй выразнасці думка Леаніда Лявонава: «Розум заўсёды спасцігае толькі тое, што ўжо ведае душа».

Славуты швейцарскі педагог Песталоцці сцвярджаў: «Першапачатковае навучанне дзіцяці ніколі не бывае справай галавы, ніколі не бывае справай *розуму* — яно вечна бывае справай *пачуццяў*, справай *сэрца*...»

Якім быць нашаму немаўлятку, што кагадзе нарадзілася, залежыць ад нас, ад нашых клапатлівых рук і душэўнай чуласці.

## *Каляска з транзістарам*

Ці заўважалі вы, як маладыя шчаслівыя бацькі, вывозячы ў паркі, у скверы сваіх маленькіх дзяцей, абавязкова да каляскі прыладжваюць транзістар? Якая ідылія эпохі НТР! Сумяшчэнне, так сказаць, карыснага з пры-

емным. Але дзеля каго? Для дзіцяці? Наўрад. Таму не спяшайцеся ўдасканальваць калясак і выпускаць іх з транзістарамі.

...Кураняткам, якія яшчэ не вылупіліся на свет, падаюць механічныя сігналы, і яны назаўсёды запамінаюць іх. І не дзіва, што пасля адразу ж бягуць на знаёмы гук.

Хітрая штука — умоўны рэфлекс. І падумайце, якімі мудрацамі трэба было быць нашым продкам, каб авалодаць яго загадкай.

Упраўны і кемлівы беларускі мужык, жывучы побач з такім неспакойным і шкадлівым суседам, як касалапы Міхайла Іванавіч, задумаўся, як бы яго прылучыць да карыснае работы. І, трэба сказаць, дадумаўся: нязграбнага цельпука зрабіў танцорам!

Так у семнаццатым стагоддзі сярод спрадвечных пушчанскіх бароў узнікла школа, слава якой дайшла да нашых дзён,— смаргонская акадэмія!

Галоўнае, чаму вучыла яна, гэта — адчуванню рытму. Калі няўмелых танцораў заганялі ў клетку на горача напаленую спадыспаду бляху, не могучы стаяць, кожны як мага вышэй падымаў лапы. А ў гэты час моцна пачынаў біць бубен. Пасля, калі смаргонскіх выхаванцаў на ланцугах вадзілі па мястэчковых кірмашах, дастаткова было загрукаць у бубен, як калматыя гультаі адразу ж пускаліся ў скокі.

Інстынктыўнае адчуванне рытму ўласцівае ад нараджэння. З самага малку дзеці, як ніхто іншы, адчуваюць рытм. Гэтую простую ісціну засвоілі і паэты, якія пішуць для дзяцей. Уся бяда, што некаторыя з іх і ў нашы дні застаюцца на ўзроўні смаргонскіх таптуноў.

Прашу прабачэння за аналогію, але баюся, што першыя сігналы, гукі і сугуччы могуць застацца самымі блізкімі, роднымі і прыгожымі і для слыху чалавека.

Агульнавядомыя жыццёвыя факты: нармальнае дзіця глуханямых бацькоў абавязкова павінна мець дачыненне да жывой мовы, каб развіваць слых, інакш яно можа застацца нямым і глухім.

Я з трывогай думаю не толькі пра транзістар у дзіцячай калясцы, але і пра тую гукавую экзекуцыю, якая бяздумна, беспакарана праследуе і нас, і нашых дзяцей, што, нават прыехаўшы ў лес, яны не чуюць ні птушынага спеву, ні шуму дрэў, ні чарадзейнай ляснoй цішыні, а глухнуць ад дынамікаў і рупараў — самых пашыраных срод-

каў у арганізацыі так званых масавых формаў калектыўнага адпачынку.

Прырода — выдатны сродак узбагачэння пачуццяў і розуму чалавека — павінна была б стаць сапраўдным сябрам дзяцей, асабліва гарадскіх. На жаль, змалку ў іх выхоўваюцца безуважнасць і ўтылітарны погляд на прыроду. Яна, маўляў, для таго, каб на яе ўлонні адпачыць, падыхаць свежым паветрам. Эмацыянальнае, эстэтычнае ўздзеянне прыроды арганізатары адпачынку дзяцей не лічаць сродкам выхавання. Мала хто з гарадскіх дзяцей бачыць такія дзівосныя цуды, як усход і захад сонца, як зорнае начное неба — хіба толькі ў планетарыі... Бываючы ў летніх лагерах, я апытаў сотні дзяцей — якіх яны бачылі, чулі птушак, якія расліны, кветкі запомнілі, ці назіралі за жыццём мурашак — і часцей за ўсё сустракаў здзіўленыя ўхмылкі: ці да гэтага нам, мы займаемся болей важнымі справамі.

Грамадства не можа быць абыякавае да таго, у чыіх і ў якіх руках маленькі чалавек. Пачатковыя ўстановы, дзе мацуецца ўзлётная пляцоўка будучага грамадзяніна (яслі, дзіцячыя сады, малодшыя класы ў школе), пры ўсёй матэрыяльнай забяспечанасці часам вельмі лёгка, калі не легкадумна, вырашаюць пытанне — каму даверыць пачэснае права выхоўваць і вучыць.

Якою б вонкава лёгкай ні здавалася задача, а першы клопат трэба пачынаць з ясляў. Натуральна, што ўсё тут скіравана на фізічны, на медыцынскі догляд, але час ужо выпрацаваць цвёрдыя асновы навукова абгрунтаванай методыкі — як стварыць агульны настрой, прыемны ўсяму асяроддзю, якое асвятленне, якія колеры, якія гукі, якія мелодыі ўражваюць, узбагачаюць эмацыянальныя імпульсы дзіцяці.

На XIII Пленуме ЦК КПБ (красавік 1974 г.) кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС першы сакратар ЦК КП Беларусі П. М. Машэраў, гаворачы аб праблемах школы, сям'і і выхавання дзяцей, выказаў вельмі слушную думку аб арганізацыі ў рэспубліцы ўсеагульнага бацькоўскага педагагічнага навучання:

«Трэба зрабіць так, каб усе бацькі дасканала ведалі педагагічныя асновы сямейнага выхавання, новыя патрабаванні савецкай педагогікі і дзейнічалі ў такой выключна адказнай справе, як выхаванне дзяцей, не інтуітыўна, а на цалкам навуковай аснове».

Сапраўды, пастаўлена надзвычай важная жыццёвая задача, вырашэнне якой вымагаецца далейшым развіццём нашага грамадства.

Можа, не толькі ў практычным, але і ў больш шырокім значэнні ажыццяўлення гэтай задачы наспела патрэба ў грамадскім інстытуце маці. Неабходны разумныя намаганні, каб пры ўсёй нашай увазе, медыцынскіх клопатах, што ўжо сталі нормай жыцця, мы яшчэ рупіліся і аб псіхалагічным, этычным, эстэтычным клімаце, у якім маладая жанчына рыхтуецца стаць маці.

Складанасць праблемы яшчэ ў тым, што калі раней сям'я з трыма, чатырма, пяццю і болей дзецьмі была сама асяродкам вопыту, у якім удзельнічалі, несучы адказнасць за выхаванне разам з бацькамі, і дзеці (большыя гадавалі меншых, змалку далучаючыся да сямейнай педагогікі), дык сучасная сям'я практычна бездапаможная. Цяпер у большасці сем'яў адзін-адзіны гадаванец, ды і затым маладыя бацькі не ўпраўляюцца. Практычна ён для іх, нявопытных, недасведчаных, часта саміх яшчэ дзяцей — забаўка, цацка, з якой прыемна пагуляць, а на ўсё, што звязана з болей складаным клопатам, па іх перакананню, ёсць яслі, сад, школа.

«Сямейная педагогіка», якая трымаецца на адным дзіцяці, бокам вылазіць грамадскай педагогіцы. Нездарма А. С. Макаранка шчыра прызнаваўся: «Асабіста мне калі і прыходзілася сустракацца з самым разбэшчаным эгаізмам, які разбурае не толькі бацькоўскае шчасце, але і поспехі дзяцей, дык гэта былі амаль выключна адзіныя сыны і дочкі».

Уявіце сабе: маладому, выпешчанаму эгаісту прыспічыла жаніцца. І вось вам арыфметыка: эгаізм + эгаізм = не сышліся характарамі. Дробнае самалюбства не вытрымлівае самых звычайных жыццёвых турбот.

— Хм,— хмыкае пагардліва юная жонка,— каб я яму шкарпэткі мыла....

Яму — гэта значыць, свайму юнаму мужу.

— А хто ж мые?

— Мама.

— Чыя?

— Як чыя? Мая. Яна ж у нас жыве...

Праўдзівей сказаўшы, не мама жыве ў іх, а яны — у мамы.

Бедная маці, як яна цешылася, аддаючы сваю адзіную

дачушку замуж, якое вяселле закаціла, у даўгі пазалазіла! І цяпер з сіл выбіваецца, каб толькі дагадзіць «дзеткам». Маладым усё гэта так падабаецца, што каторы год не злазяць з матчынай шыі.

— Бягу, спяшаюся,— расказвае маці, вымушаная заўсёды спяшацца, разрывацца, каб управіцца і на рабоце, і дома.— Я ж ведаю, яны галодныя сядзяць. Прыбягу — і праўда: сядзяць, чакаюць. Абед згатую, пакармлю. Пад'ядуць мае дзеткі, лягуць на канапу — адпачываюць...

Падобныя «ідыліі» ні ў якую статыстыку не ўваходзяць, але ж яны — сумны вынік жыцця. Так адзінка вымярэння прадаўжэння роду, адзіны кумір увагі маладых бацькоў і гэтак жа небагатых вопытам дзядоў і бабак, што за сваё жыццё выпесцілі аднаго сынка або дачушку, выглядае не вельмі ўцешным паказчыкам.

## *Пяць тысяч пытанняў за дзень*

Поспех выхавання маленькіх — у вопыце, у прызванні, у любові дарослых.

Там, дзе ў дзіцячым садзе выхавацелькі — дзяўчаткі, якія самі кагадзе што развіталіся з маленствам і з усіх сіл стараюцца паказаць сваю дарослую паважнасць, не разумеюць, а то і не любяць дзяцей,— сумна і нецікава выхаванцам.

Колькі ні прыглядаюся, ні прыслухоўваюся да дзіцячых чародак, выведзеных пагодным днём на пагулянку, я яшчэ ні разу не бачыў, не чуў, каб такая выхавацелька нечым незвычайным, цікавым зувабіла дзяцей, абудзіла, захапіла іх думку, фантазію.

У тоне, у інтанацыі яе заўваг і выкрыкаў адчуваецца нездаволенасць, раздражнёнасць. На каго? На што? Вядома ж, на дзяцей, на свой пастушыны абавязак. Сумна ёй з дзецьмі. Божа мой, а як дзецям з такой выхавацелькай?

Колькі агеньчыкаў пагасне ў дапытлівых вачанятках! Колькі пытанняў застанецца без адказу!

А пытанняў многа. Процьма. Ад чатырох да сямі маленькі чалавек прагне як мага болей даведацца. Статыстыкі падлічылі: дзіця ў гэтым узросце задае каля ста пытанняў на дні. Сто пытанняў памножце на «статак», які «пасе» выхавацелька — тры тысячы, пяць тысяч! Звар'яцець можна!

Так і гавораць усе, хто не любіць дзяцей, хто пакутуе ўсё жыццё, легкадумна выбраўшы сабе прафесію выхавацеля.

Практыка найлепшых садоў паказвае, што сапраўдны поспех выхавання, атмасферу радаснай творчасці нясуць дзецям людзі, якія ідуць да іх па праву вялікага вопыту, па праву любові.

У вясковай школе цяпер — новая бяда: рэзка знізілася колькасць вучняў. У найболей цяжкім становішчы апынуліся якраз пачатковыя класы, дзе адзін настаўнік адначасна вучыць першы, другі, а то і ўсе тры разам.

У многіх школах, на вялікі жаль, пачатковыя класы даручаюць не найбольш здольным і вопытным педагогам.

І вось якраз там, дзе закладваюцца асновы пісьменнасці, выхоўваецца пачуццё жывога слова, дзе трапяткое няўрымслівае сэрца дзіцяці прагне спазнаваць і адкрываць свет, маленькі чалавек сустракае безуважнасць. Гэта недаравальна. Па сутнасці, гэта — самагубства ўсяго навучальнага працэсу. Якія могуць быць поспехі ў школе, дзе вучня не навучылі вучыцца, не абудзілі ў ім радасці пазнання?

Упушчанае ў пачатковых класах ніколі не нагоніш. А ўпускаецца многае, асабліва ў вясковых маленькіх школах, дзе настаўнік болей за ўсё заклапочаны сваім агародам, каровай і свінушнікам. Вельмі ж падчас кідаецца ў вочы кантраст паміж дзвюма сядзібамі: настаўніцкай, на якой дагледжаны кожная градка, дрэва і куст, і школьнай — з чэзлымі прысадамі, удзірванелым дваром з турнікам і лесвіцай, а наводшыбе — з абавязковай дзялянкай бульбы або жыта. Вось і ўся «лабараторыя», у якой настаўнік-хутаранін адкрывае вучням радасць працы і свет прыроды.

Як не можа быць дзіцячага пісьменніка, які не разумее і не любіць дзяцей, так не можа быць настаўніка, што выбраў спецыяльнасць не па закліку душы.

Янка Маўр успамінаў, як яго пасля Панявежскай семінарыі паслалі ў сельскую школу, але не настаўнікам, а памочнікам настаўніка. І гэта ў часы, калі і школ, і настаўнікаў было не гэтулькі, як цяпер. Няблага было б, сапраўды, каб малады педагог праходзіў абавязковую вывучку ў старэйшага калегі.

Экзамен на права быць настаўнікам канчаецца не атрыманнем дыплома. Гэты экзамен ён трымае кожны дзень

і ўсё сваё жыццё. У гэтым высокае прызванне прафесіі і яе грамадзянскае вызначэнне — народны настаўнік.

Наша школа на ўздыме свайго далейшага развіцця. Удасканальваюцца падручнікі, праграмы, метадычнае майстэрства, удасканальваецца вучэбны працэс, але мы падышлі і да вырашэння яшчэ больш важнай задачы — да ўдасканалення працэсу выхавання, пачынаючы яго з самай адказнай стадыі фарміравання асобы чалавека — з малодшага ўзросту.

## Педагагічныя сенсацыі

Фізікі і лірыкі — вызначэнне, якое ўвайшло ў абыходак нашых уяўленняў, калі мы гаворым пра супрацьлеглыя погляды, адзін з якіх аддае перавагу практычнасці, рацыяналізму, а другі — пачуццям, эмоцыям.

Не зважаючы на пэўную ўмоўнасць вызначэння, ім можна характарызаваць і сутнасць канфліктаў у педагогіцы, сутнасць разных поглядаў на пытанне — як, якімі метадамі і сродкамі выхоўваць чалавека.

Навука выхавання, як ні адна з навук, сваім прызначэннем найбольш блізкая народу. Пакаленне за пакаленнем не толькі спажываюць яе дасягненні, але дадаюць і свой вопыт.

Славуты рускі педагог К. Д. Ушынскі сцвярджаў, што народныя казкі — бліскучыя ўзоры педагогікі. «Я не думаю, каб хто-небудзь змог спаборнічаць у гэтым выпадку з педагагічным геніем народа».

«Прыродныя рускія педагогі — бабка, маці, дзед...— пісаў Ушынскі,— разумелі інстынктыўна і ведалі з вопыту, што маральныя сентэнцыі прыносяць дзецям болей шкоды, чым карысці, і што мараль заключаецца не ў словах, а ў самім жыцці».

Народная педагогіка. У яе скарбах столькі мудрасці, геніяльнай прастаты, даходлівасці і дасканаласці жанравых формаў: калыханка, пацешка, байка, загадка, прымаўка...

А казка?.. Нямала выпрабаванняў яна выцерпела ўжо на нашай памяці. Колькі энергіі, запалу патраціў К. І. Чукоўскі, бароначы яе ад самых розных праціўнікаў! Ну, здавалася, канчаткова паклаў на лапаткі, болей ніхто не адважыцца адбіраць казку ў маленства. Не! «Наватарскія» тэорыі жывучыя. У нашы дні яны спяшаюцца пры-

стасавацца да ідэй навукова-тэхнічнага прагрэсу, яны нават гатовы абагнаць сам прагрэс.

«Казкі? Містычная лухта!» Чуеце, якія знаёмыя катэгарычныя інтанацыі? Хто гэта гаворыць? Гаворыць інжынер Нікіцін. І не толькі гаворыць. Сваіх дзяцей ён выхоўвае паводле свайго метаду, адкідаючы, як забабоны, тыя каштоўнасці, што асабліва дарагія маленству.

«Казкі адводзяць убок,— сцвярджае інжынер Нікіцін.— Гульні, цацкі, лялькі — далоў! — Што такое лялька? Абсалютна бескарысная гульня».

У сям'і Нікіціных усе дзіцячыя гульні заменены разнастайным тэхнічным прыладдзем і начыннем. На сценах — літары, табліцы, карты, схемы. У вялікім пакоі бацька паставіў турнік, павесіў кольцы, канат. Бацькі далі дзецям свабоду ў дзейнасці і пачалі наглядаць, як ідзе развіццё. Алёша прачытаў першае слова, калі яму было 2 гады 8 месяцаў, Антон — у 3 гады 3 месяцы. Да трох год дзеці навучыліся лічыць. За два гады да школы браты лічылі да мільёна, ведалі простыя дробы, пазнаёміліся з табліцай Мендзялеева. Пайшоўшы ў школу, Алёша за год скончыў адразу тры класы. Антон пайшоў на год пазней, але дагнаў брата.

А вось вам незвычайная фізічная загартоўка: на навагоднюю ёлку хлопчыкі прыйшлі ў трусіках і басанож! Пазней самы меншы — Ванюшка — паставіў нечуваны спартыўны рэкорд: у сем месяцаў практыкаваўся на турніку.

Што гэта — эксперымент? Эксперымент, але не педагагічны, а тэхнічны. Смелае, рашучае, унікальнае прыстасаванне рацыяналізму да педагогікі.

Як ні дзіўна, аўтары эксперыменту — муж і жонка Нікіціны — упэўнены, што іх метад — самая перадавая сістэма выхавання. Нікіціны актыўна выступаюць з тэарэтычным абгрунтаваннем сваіх перакананняў. Яны выпусцілі кнігу, якая самой назвай вымагае катэгарычнага адказу: «Ці правы мы?»

Няма неабходнасці падрабязна расказваць ні пра кнігу, ні пра сам вопыт, многія, напэўна, бачылі тэлевізійны фільм, які называўся «Дзень у сям'і Нікіціных». Памятаеце, голенькія малышы зімою скачуць па сумётах, гуляюць у снежкі? Вырабляюць розныя штукі на кольцах і турніку. Яшчэ не вымаўляючы слоў, чытаюць і лічаць?

Мала ў каго ўсё гэта не магло не выклікаць захаплення. Глядзіце, якія магчымасці закладзены ў маленькім чалавеку!

Спецыфіка нервовай сістэмы, лічыць Нікіцін, забяспечвае кожнаму здароваму дзіцяці развіццё любых здольнасцей, даступных чалавеку.

Як усё проста, як заманліва!

Сенсацыйным эксперыментам зацікавіліся вучоныя. Інстытут педыятрыі правёў грунтоўнае абследаванне дзяцей Нікіціных, вынікі якога, на жаль, не ўвайшлі ў фільм. Вучоныя не згадзіліся з бацькамі, што знарок «гартавалі» дзяцей холадам, заахвочвалі падымаць, натужваючыся цераз сілу, штангу. Выклікала трывогу псіхічнае развіццё падвопытных — прыкметнае збядненне эмацыянальнай сферы.

Нельга ператвараць дзіця ў кібернетычную машыну, гвалтоўна прыстасоўваць патэнцыяльныя магчымасці арганізма, разлічаныя прыродай на ўсё жыццё, да тэмпаў, якіх нібыта вымагае навукова-тэхнічны прагрэс.

## *Пашкадуйце маленькага чалавека*

Яшчэ задоўга да школы дзіця можа за якія два месяцы навучыцца чытаць, але самастойна чытаць і разумець яно не будзе. Яму лягчэй спазнаваць свет з дапамогай дарослых, цераз пераймание, цераз гульню.

Ёсць выхавацелі, якія, падобна інжынеру Нікіціну, скептычна, з пагардай глядзяць на гульню. Іх патрабаванне не гуляць, а вучыцца, на першы погляд, правільнае, якраз вучэнню і прычыняе непапраўную шкоду.

Вось бацькі хваляцца: малыя сынок або дачушка лічаць да тысячы. А што за лічбамі, якая з іх большая, якая меншая — дзіця не адрознівае.

Гэтак жа механічна засвоіўшы літары, дзіця не дайшло ні да сэнсу, ні да гукавой будовы слова, сказа і часта на ўсё жыццё застаецца глухое да мілагучнасці і хараства роднай мовы.

Сапраўдны поспех падрыхтоўкі дзіцяці да школы не ў шкалярскіх метадах, а ў творчай актыўнасці, уласцівай узросту. Своеасаблівыя псіхічныя працэсы вызначаюць развіццё дзіцяці, своеасаблівыя і спосабы навучання яго.

Дзеці адкрываюць свет шчыра і даверліва. Вучацца жыць, пераймаюць нас.

Мая першакласніца прыйшла са школы, поўная ўражанняў. Усе яны павінны знайсці форму выяўлення.

— Дзядуля, давай пагуляем у школу!..

За настаўніцу, вядома, была яна. І я ўбачыў, адчуў стыль, прыёмы, любімыя хадавыя сказы і словы настаўніцы, якая вучыла маю ўнучку. «Застаецца толькі пазайздросціць!» — гэта калі яна хваліць некага і паказвае выкананае заданне, носячы паміж партаў сшытак выдатніка. «Прозсізальфін». Што гэта? І як ты запомніла, як ты навучылася вымаўляць слова, якога я не знайшоў нават у энцыклапедыях?

Мая «настаўніца» тлумачыла мне, што гэта маляванне нейкіх адвольных знакаў у клетках.

Я пайшоў у школу і прасядзеў дзень на ўсіх уроках. «Элемент», «варыят» — я ўжо зміры́ўся з гэтымі словамі, якімі сыпала настаўніца. Але ў яе багатым лексіконе былі яшчэ: інтэнсіўнасць, ідэал, сутнасць, арыенціроўка, інтанацыя, супрацоўніцтва, авал, тэкст, вывад...

Ці не занадта многа на другім месяцы вучобы ў першым класе?

Калі хочаце ўбачыць сябе вачыма дзяцей — прыгледзьцеся да іх гульняў. Гэта самае праўдзівае люстра. Чым заняты, чым заклапочаны вы, якія вашы сямейныя дачыненні, якое абыходжанне з людзьмі — усё адбілася ў гэтым люстры.

Беспрадметных дзіцячых гульняў няма, іх аснова — заўсёды жыццё, асяроддзе, атмасфера і той мікраклімат, у якім расце будучы чалавек.

Не спяшайцеся падначаліць дзіця законам, па якіх вы, дарослыя, вызначаеце свае ўчынкі. Дзіцячыя паводзіны не заўсёды адпавядаюць нашым вывадам і ацэнкам.

І пераступіўшы парог школы, дзіця не развітваецца з маленствам. Яго не трэба вырываць з прывычнага асяроддзя і перасаджваць у новае, незнаёмае. Як ніколі, у гэтыя хвіліны яго жыцця патрэбна псіхалагічная чуласць і сям'і, і школы — абодвух полюсаў, у магнітным полі якіх будуць складацца новыя ўражанні і ўяўленні дзіцяці.

...Вось яно надзела строгую школьную форму, пачапіла на плечы ранец і нават схілілася пад яго цяжарам. Ваша сэрца сціснулася ад спачування і жалю: сапраўды, малое ў свае сем год падняло нялёгкую ношу. Як панясе — з прыемнасцю, з радасцю ці, не паразумеўшыся са

школай і не знайшоўшы падтрымкі дома, ступіць на паласу адчужэння, якая часта ляжыць паміж сям'ёю і школай?

Апынуўшыся на гэтай нейтральнай, нічыйнай паласе, дзіця траціць многае, што ўласціва маленству, а падчас і само права на маленства.

Спачувайце дзецям, якія імкнуцца хутчэй стаць дарослымі, хутчэй пераадолець выпрабаванне маленствам як адзнакі сваёй непаўнацэннасці. Колькі патрэбна мець сілы, мужнасці і зацятай цярплівасці, каб вытрываць страхі, забароны, ушчуванні, якія пагражаюць маленькаму чалавеку!

Чым і кім мы яго ні страшым: спачатку бабай-ягой, дзедам, што забярэ неслуха ў мяшок, доктарам, які зробіць укол, міліцыянерам...

Потым пачнуцца яшчэ большыя страхі: перад бацькамі, перад настаўнікамі, перад дырэктарам школы — за тройкі і двойкі, за паводзіны.

Як спасцігнуць усю складанасць узрушэнняў, перажыванняў, што абрынуліся на дзіцячую душу? Як разабрацца, каго слухацца, каго баяцца? А тут яшчэ і паміж бацькамі ў сям'і неразбярыха, нелады. Столькі разрадаў маланкі праходзіць цераз маленькае сэрца — дзіву даешся запасам яго трываласці. Але рана ці позна ўсе гэтыя разрады, што сабраліся ў ім, выбухнуць супраць нас — недаверам і нянавісцю, грубасцю і чэрствасцю. Дар за дар!

Мяжа адчужанасці... Як зрабіць, каб дзіця нідзе не адчувала яе? Ёсць толькі адзін сродак — любоў і павага да дзіцяці, да яго чалавечай годнасці.

...Вось першы выхад маленькага чалавека ў вялікі свет — дзіцячы сад. Колькі новых адкрыццяў і ўражанняў! Але, выйшаўшы за межы сям'і, дзіця не магло не адчуць: яно ўступіла ў асяроддзе новых, не залежных ад яго адносін, часта незнаёмых, нязвыклых і незразумелых.

Прыйшоўшы ў сад, многія яшчэ не ведаюць сваіх прозвішчаў. Яны — Вовы, Вані, Машы. Але праз дзень-два ўсе яны — паспартызаваныя грамадзяне... У дзіцячых садах дзяцей пачынаюць зваць па прозвішчах!

Прозвішчы, прозвішчы... Колькі з-за вас нашым дзецям ранніх слёз, крыўдаў і абраз! Нідзе, як у школе, асабліва ў пачатковых класах, няма такой фенаменальнай здольнасці — з любога прозвішча зрабіць мянушку.

Школьная «антрапаніміка» — даўняя благая традыцыя. Адкуль яна? Ды ўсё з тых жа крыніц — з казённага, службовага рэестра, з канцылярскай інвентарызацыі. Дзеці пераймаюць ад дарослых усё, у тым ліку і душэўна глухую педагогіку.

Класны журнал — магутны сродак улады. І ніхто яе так не адчувае на сабе, як дзеці. Пакуль настаўнік вядзе вачыма зверху ўніз або знізу ўверх, у многіх сэрца ўцякае ў пяты: Іваноў, Пятроў, Сідарава!

Калі ў садзе дзіця яшчэ ведалі па імю, дык у школе — неабавязкова: настаўнік абыходзіцца прозвішчамі, а вучні — мянушкамі, утворанымі з гэтых прозвішчаў.

Прыйшоўшы аднаго дня са школы, мая ўнучка паведаміла радасную навіну: хлопчык, з якім яна сядзіць на адной парце, назваў яе — Юля! Божа мой, якая падзея, якое шчасце пачуць сваё імя, адчуць натуральнасць абыходжання!

## *Пернік і бізун*

Магутная ўлада ў педагога, у выхавацеля. Магутная, але і небяспечная, калі яна дробязная, эгаістычная, капрызная.

Педагог павінен заўсёды памятаць, гаварыў В. А. Сухамлінскі, што дзіця кожную хвіліну свайго жыцця знаходзіцца ў стане самапазнання, самавызначэння, самавыхавання. Яму хочацца ў нечым паказаць сябе, выявіць сваю волю, розум, вынаходлівасць, кемлівасць.

Дзіцячыя свавольствы заўсёды былі і будуць. Няма большай шкоды для выхавання, як падазраваць дзіця ў свядомай зламыснасці. Дробязнасць і прыдзірлівасць дарослых глыбока раняць дзіцячыя душы.

Яшчэ болей небяспечна вырашаць непаразуменні, канфлікты вучняў з настаўнікамі, паводзіны і ўчынкі дзяцей з дапамогаю калектыву, як гэта робяць нявопытныя, псіхалагічна непісьменныя выхавацелі.

Калектыўнае рэагаванне на памылку, на ўчынак свайго аднакласніка ніколі не дае выніку, на які спадзяецца настаўнік. Асуджаючы свайго таварыша, дзеці паўтараюць словы дарослых. У іх яшчэ няма сваіх перакананняў, разумення сутнасці жыццёвых з'яў, пра якія яны гавораць. Бяздумнае выкарыстанне калектыву ў педагагічных мэтах надрывае, разбурае сам калектыў, атручвае

ў ім атмасферу адзінства і сяброўства, заахвочвае няшчырасць і пустаслоўе.

Ушынскі вельмі мудра засцерагаў нас: «Калі вы хочаце зрабіць дзіця нягоднікам, дык прывучайце яго змалку паўтараць розныя маральныя сентэнцыі, і пасля яны не будуць ужо мець на яго ніякага ўплыву».

Неасцярожнае слова, а тым болей прыкметная антыпатыя выхавацеля, падтрыманая самімі дзецьмі, можа стаць невыноснай пакутнай траўмай. Вымушанае цярпець, звыкаючыся з думкай, што яго «не любяць», або рашыўшы супраціўляцца, бараніць сваю годнасць, дзіця марнуе, спусташае свае найлепшыя пачуцці.

Хто не цэніць даверлівасці, не разумее безабароннасці дзіцячай душы, ніколі не даможацца ўлады старэйшага над малодшым. Дыстанцыя паміж дарослымі і дзецьмі, за якую ўсімі сіламі імкнуцца ўтрымацца некаторыя выхавацелі як за сваю перавагу,— самы ненадзейны сродак. Такая перавага не ўтрымаецца ні на страху, ні на пагрозах, ні на пакараннях. Не дай бог мець аўтарытэт, набыты такім спосабам. Такі чалавек непазбежна грубее і тупее ад самалюбства і самадурства.

Услухайцеся і ўдумайцеся ў мудры запавет Сухамлінскага: «Кожнага з нас павінна трывожыць думка аб самай важнай праблеме нашай прафесіі — праблеме ўлады педагога, улады чалавека над чалавекам, улады старэйшага над малодшым. У тым фондзе выхаваўчых сродкаў, якія ёсць у распараджэнні педагога, яго ўлада над дзецьмі — найбольш агульны і адначасова найбольш востры, тонкі і небяспечны сродак. Гэта інструмент, якім можна зрабіць тонкую, непрыкметную аперацыю, але можна і безнадзейна скалечыць пяшчотную дзіцячую душу».

На нашага маленькага касманаўта, які стартаваў з дзетсадаўскай пляцоўкі ў школьныя прасторы, большым выпрабаваннем, чым адчуванне фізічнай бязважкасці, неўзабаве абрушацца такія перагрузкі, пераадольваць якія яму становіцца цяжэй і цяжэй.

Хто ўстаіць, хто не схіліцца перад самым магутным скіпетрам улады, ад узмаху якога залежаць і кара, і літасць!

Пяцёрка, чацвёрка, тройка, двойка, кол! Колькі нясуць яны радасці адным, колькі засмучэння — другім, колькі зняверанасці і безнадзейнасці — трэцім!

Найбольшай гордасцю Сухамлінскага было тое, што ён не ставіў сваім вучням дрэнных адзнак.

Пра адзнаку як стымул вучэння Васіль Аляксандравіч піша ў сваіх кнігах, якія цяпер даступныя ўсім зацікаўленым чытачам. Я прыгадаю выказванні, якія зберагла магнітафонная стужка,— запіс яго гутаркі з настаўнікамі Марыйскай АССР у 1967 г. Пра што гутарка? Ды ўсё пра тое ж балючае пытанне — ацэнка ведаў, адзнака.

Не ўсе дзеці вучацца аднолькава. Адны лепш, другія горш. І калі да ўсіх падыходзіць з адной меркай, дык у некаторых дзяцей не цяжка выклікаць нянавісць да школы.

Тут вельмі важна, асабліва ў пачатковых класах, гаварыў Сухамлінскі марыйскім калегам, вельмі важна — не спяшацца з ацэнкай.

Калі дзіця на працягу года атрымлівае двойкі, двойкі, двойкі, яно можа наогул страціць веру ва ўсё — у сябе, у настаўніка.

Паспрабуем вось мы, дарослыя людзі, каб нам кожны дзень нехта гаварыў: ты безнадзейны чалавек, нікуды не варты, у цябе нічога не атрымаецца. Вось ты год папрацуеш, а мы на цябе і працоўнай кніжкі не выпішам, выкраслім гэты год з твайго жыцця. Як гэта будзе даросламу? А дзіцяці як?

«Я лічу недарэчнымі патрабаванні асобных кіраўнікоў органаў народнай асветы, школьных інспектараў, патрабаванні як мага болей «накапляць», як яны гавораць, адзнак у журнале. Гэта глупства. Нельга гэтага патрабаваць ад настаўніка. Трэба настаўніку давяраць, трэба настаўніка паважаць. Трэба, каб настаўнік ставіў столькі адзнак, колькі лічыць неабходным. Навошта безліч адзнак? Яны ні пра што не гавораць, калі іх многа, калі яны ставяцца часта, калі ацэньваецца кожны крок вучня».

Загадзя вызначаць, колькі павінна быць чацвёрак і пяцёрак і як іх размеркаваць па кварталах,— падобнае планаванне зневажае школу.

У некаторых школах даходзіць да таго, што вучні адказваюць па адным слове і кожнаму ставіцца адзнака, адзнака ўсяму класу. Вучань мог і не ведаць патрэбнага слова, але адгадаў выпадкова. Пагоня за адзнакамі абясцэньвае іх вартасць. Якая неабходнасць ставіць кожны раз адзнаку па такіх прадметах, як чытанне? Уменне чытаць выпрацоўваецца не так хутка. Не можа быць, каб

сёння дзіця чытала на чатыры, заўтра — на два, паслязаўтра — на пяць. Дзесяткі адзнак па адным прадмеце — гэта бязглуздзіца.

І цяпер у школе Сухамлінскага шануецца выдатная па сваёй чуласці да кожнага вучня сістэма ацэнак. Адзнаку трэба заслужыць працай, стараннасцю. І калі табе яе не паставілі ў дзённік, у класны журнал, значыць, спадзяюцца на цябе, верац, што ты яе заслужыш. Слабога двойка ніколі не заахвоціць да вучэння.

Мала назваць душэўна глухім педагога, які адзнаку ператварае ў бізун, якім ён размахвае направа і налева. Гэта ўжо маральны дзікун, які ўпіваецца ўладай.

За што толькі не пагражаюць двойкай і калом — калом, які падчас, сапраўды, набывае літаральны сэнс,— уладалюбныя войты ад педагогікі!

Дзяўчынка, што разам са школай ішла ў цырк на навагодняе відовішча, столькі наплакалася, бедная, з-за таго, што ёй давялося ў мароз надзець шарсцяную кофтачку, а не белую сацінавую блузку. Бо настаўніца сказала: хто прыйдзе не ў блузцы — таму будзе кол.

Школьны кумір — круглы выдатнік. І хоць з ім бывае цяжэй, чым з усімі іншымі, але без яго нельга. Яго гатовы надзімаць, падпампоўваць, ствараць вакол яго арэол. Дзеля чаго — здагадацца не цяжка: дзеля планавых паказчыкаў пасняховасці.

Ніхто так, як самі дзеці, не спасцігае мудрую сутнасць — у чым перавагі і перспектывы выдатніка.

Вось маё інтэрв'ю з адным «перспектыўным таварышам».

Мой субяседнік — надзвычай удумлівы і разважлівы. Але пры ўсёй разважлівасці шустрыя, зыркія вачаняты так і бягуць, так і бягуць за імклівай няўлоўнай думкай.

— Ну, як вучышся?

— Амаль выдатнік.

— Чаму — амаль?

— Адна чацвёрка,— сказаў ён і сумна ўздыхнуў.

Аказваецца, бяда ў чалавека. З-за аднае чацвёркі, можна сказаць, рухнула кар'ера. І не толькі таму, што ён не выдатнік, а таму, што калі б ён быў «круглы», дык быў бы староста класа, а цяпер ён толькі намеснік старасты.

Дарослыя, што былі пры гэтай размове, весела смяяліся. Смяяўся і я, а ў душу запала горкае зярнятка: вось

і яшчэ адзін чалавек уцяміў, што красіць вопратка, на якой «сустракаюць». Бывае, праўда, і так: хопяцца «праводзіць па розуме», а розум ужо неразлучны з такімі сябрамі, як саноўнае сябелюбства, крыўдлівасць, нецярпімасць.

Дай бог, каб усе гэтыя беды абмінулі цябе, мой дарагі дружа, намеснік старасты 1-га «А» класа...

Сферу дачыненняў дарослых і дзяцей не разгародзіш, не падзеліш. Бацькам, выхавацелям, настаўнікам важна памятаць, што мы заўсёды на вачах: дзеці ў нас, мы — у дзяцей.

— Дзядуля, што такое «очковтирательство»? — пытаецца ўнучка, сустрэўшы ў кнізе незнаёмае слова.

— Не цяжка здагадацца,— сказаў дзед.— Злучэнне двух слоў у адным утварыла...

Мінуўся тыдзень, і вось, ледзь цягнучы партфель, унучка вяртаецца са школы.

— Ой, я такая галодная...

— Хіба ты ў школе не абедала?

— А сёння абеду не было.

— Як гэта?

Дзед не паверыў, але, пасля таго як унучка прагнала свой голад і настрой яе палагаднеў, падрабязна дапытаўся — чаму не было абеду.

— Не хапіла,— удакладніла ўнучка.— Мы пабеглі на перапынку, але нас не пусцілі. «Прыходзьце на другім перапынку». А мы глянулі з дзвярэй — і не пазнаём свайго буфета: сталы засланы, у шклянках — белыя сурвэткі, на сталах — кветкі. Камісія прыехала! Прыбеглі ў клас — і клас не пазнаём. На вокнах — вазоны, што ў батанічным кабінеце стаялі.

— А чаму ж на другім перапынку не паабедалі? — не мог супакоіцца дзед.

— Мы пабеглі, але ўжо нічога не было...

— Куды ж дзеўся абед?

— Камісія з'ела. Так нам сказала павырыха. І кветкі зноў у батанічны кабінет забралі. А ведаеш, дзядуля, як прыгожа, калі на акне, на сонцы — кветкі!..

Незнаёмае слова, вычытанае ў кнізе, знайшло наглядпае тлумачэнне ў жыцці, хоць дзяўчынка яшчэ і не магла звязаць яго сэнс з падзеяй, якая адбылася на яе вачах. Малая ва ўсім верыць дарослым, а калі і пачне ў чым

сумняваецца, дык, напэўна, ужо будзе ведаць, што гавараць пра гэта няёмка.

Нялёгка дзіцяці спазнаваць свет дарослых, усю складанасць іх учынкаў і слоў, якімі яны тлумачаць свае ўчынкі...

## *Навучанне і выхаванне*

Гэта дзве задачы педагогікі. Але яшчэ большая задача — як іх спалучыць, а дбаючы аб малодшым узросце,— як, зрабіўшы выхаванне самым галоўным клопатам, падпарадкаваць яму ўсю сістэму навучання.

Педагог у пачатковых класах перш за ўсё — выхавацель. Няма большай шкоды, як легкадумнасць адносін да першакласніка. Падумаеш: Маша ела кашу, Міла мыла Дашу! А, між іншым, у пачатковых класах найбольш складаная методыка, а яшчэ складаней — разабрацца ў спецыфічных асаблівасцях узросту, убачыць і зразумець індывідуальныя схільнасці і магчымасці дзіцяці.

Дзіця не скарбонка, у якую колькі хочаш можаш напхаць, і, як некаторыя думаюць,— чым больш, тым лепш.

Колькі ні пераглядаюцца школьныя праграмы, не цяжка заўважыць тэндэнцыю павялічваць нагрузку на вучэбны працэс. Тэндэнцыя зразумелая, яна вызначаецца ходам развіцця грамадства, але ж узровень нашага камуністычнага грамадскага развіцця вымагае перш за ўсё духоўнага ўзбагачэння чалавека як асобы, поўнага выяўлення здольнасцей кожнага. Вось чаму ў нашай школе выхаваўчы працэс, удасканаленне гэтага працэсу, майстэрства выхавання павінны набываць усё большае значэнне, а ў дачыненні да малодшых класаў — галоўнае і вырашальнае.

Болей душэўнай чуласці, любові і павагі да маленькага чалавека! Ён у тым узросце, самым даверлівым і безабаронным, калі так многа ахвотнікаў яго вучыць, і часцей за ўсё — не даваць яму магчымасці заставацца самім сабой — дзіцем.

Некалі К. Маркс пісаў, што для чалавека развітога грамадства вольны час будзе яго найбольшым багаццем. Якою ж цаной вызначыць вольны час дзіцяці, што пайшло ў школу?

Не ўпраўляючыся нашпігаваць яго ў класе, мы спадзяёмся, што дома, з дапамогаю бабкі, яно зразумее ўсё

тое, чаго не зразумела ў школе. Як ні дзіўна, але некаторыя пачатковыя падручнікі разлічаны не так на вучня, як на яго бацькоў, на дзеда і бабку.

На жаль, бабка вучылася па недасканалых праграмах, і якая ёй, беднай, пакута зноў перавучвацца, каб не страціць свайго педагагічнага аўтарытэту!

Здавалася б, школа пры ўсёй сваёй прафесійнай дасканаласці павінна ганарыцца манапольным правам вучыць і аберагаць дзіця ад староннягa, нявопытнага, недасведчанага ўмяшання ў вучэбны працэс, як, скажам, медыцына не дзеліць сваіх кампетэнцый з самадзейнымі лекарамі, аднак нідзе няма столькі саматужніцтва, як у педагогіцы. Вучыць дзіця не толькі маюць права, а і абавязаны ўсе — нават хто не ўмее, не можа і не хоча. Пашыраная ў нас хатняя дапамога — найгоршы вораг навучання, яна выхоўвае бязволле і няўпэўненасць у сілах і здольнасцях дзяцей.

Педагогіка, якая не ўкладваецца ў метадычны рэгламент, якая вымушае школьніка вучыцца дома, распісваецца ў сваёй прафесійнай недасканаласці. Пяць-шэсць гадзін у школе — для маленькага чалавека дастаткова напружаны рабочы дзень.

Малому пабегаць бы, пагуляць у любімыя гульні, а яно, схіліўшыся над сталом, карпее над урокамі, над хатнімі заданнямі. Не вельмі трывожымся мы, што дзеці ўсё радзей і радзей бываюць на свежым паветры, бо ўжо і вольным часам, які выпадае, распараджаемся не мы, не нашы дзеці, а дзядзька Тэлевізар.

Па праву дарослых мы ўзялі сабе два выхадныя дні, хоць не ўсе маюць пільную патрэбу ў такім багацці, некаторыя не ведаюць, куды яго дзець, як яго змарнаваць, але добрае шчодрасці ў нас не хапіла чамусьці для нашых дзяцей.

Якраз дзецям яго, гэтага вольнага часу, не хапае болей, чым каму.

## *Калыска чалавека — праца*

Навучыць чытаць, пісаць, лічыць — не такая, урэшце, вялікая педагагічная мудрасць. Калі б толькі ў гэтым яна заключалася — школа жыла б прыпяваючы. Большыя складанасці, на першы погляд, не вартыя ўвагі, чым далей, тым глыбей падрываюць і вучэбны, і выхаваўчы

поспех. Пачынаюцца яны спакваля, калі дзіця, часцей за ўсё адзінае ў бацькоў, ператвараецца спярша ў кумір, а пасля — у дэспата, утрыманца і спажыўца ўсяго гатовага. Кіруючыся адзіным імкненнем — няхай нашаму дзіцяці будзе лягчэй, чым нам было,— дарослыя ствараюць такія «лёгкасці», што, выправіўшыся ў школу, дзіця ўжо няздольнае перамагаць самыя малыя цяжкасці.

Пяшчотныя рукі аберагалі дзіця ад усяго — і ад першых засмучэнняў, і ад радасці самому перажыць асалоду: я — сам! І вось вам — маленькі чалавек і вялікі гультай, абыякавы і нецікаўны, эгаістычны і бязвольны.

Сям'я вінавата? Вінавата, але...

Не спяшайцеся з вывадам, што я хачу падзяліць віну пароўну: і сям'я, і школа.

Калі б такі падзел адказнасці можна было ўстанавіць, дык гэтыя два полюсы ўзаемнага прыцягнення лёгка маглі б паразумецца, строга вызначыўшы абавязкі: сям'я выхоўвае, школа вучыць. Але ні сям'я, ні школа ніколі не падзеляць сфераў уплыву. Найбольшая бяда, калі паміж імі — вакуум, тая паласа адчужанасці, трапіўшы на якую, выхаванец вызваляецца ад уплыву і адной, і другой.

Аднак гаворка ідзе пра сямейнае выхаванне. Што здарылася? Чаму цяпершнія бацькі, людзі непараўнальна вышэйшай культуры, чым іх папярэднікі, сталі такімі нездатнымі выхавацелямі?

Вядома, і цяперашнія бацькі не ворагі сваім дзецям, але, параўнаўшы магчымасці іх вопыту выхавання з вопытам сямейнай педагогікі нашых папярэднікаў, як гэта ні дзіўна, мусіш прыйсці да сумнага вываду: сучасная сям'я ўжо не можа быць універсальным выхавацелем дзяцей.

Скажаце, таму, што бацькі, занятыя работай, не маюць магчымасці аддаваць увагі дзецям. Не, не таму. Бацькі ніколі не займаліся адным выхаваўчым клопатам, ім заўсёды не хапала часу, прычына тут болей грунтоўная і залежыць ад сацыяльных змен, што адбываюцца ў грамадстве. І калі мы не заўважаем гэтых змен, не лічымся з імі, тым большыя нашы духоўныя страты.

Сямейная педагогіка ў многім страціла грунт, на якім трымалася працоўнае выхаванне, калі дзеці змалку ўцягваліся ў працоўную сферу, у вытворчыя інтарэсы бацькоў, у бытавы клопат.

Колькі самых разнастайных штодзённых турбот было ў хаце селяніна, у кватэры рабочага-гараджаніна. Многія з гэтых турбот станавіліся дзіцячымі абавязкамі. З узростам павялічваўся вопыт кожнага ва ўсім, што павінен умець чалавек не толькі па спецыяльнасці. Акрамя фізічнай загартоўкі чалавека праца несла ў сабе найбагацейшыя сродкі этычнага і эстэтычнага пазнання. Апрача людзей маленькага чалавека акружалі яшчэ такія сябры, незаменныя і цудоўныя партнёры маленства, як жывёлы, птушкі, шматлікія жывыя істоты, кожная з якіх была аб'ектам пазнання, з кожнай трэба было знайсці спосабы ўзаемаразумення. Вялікімі духоўнымі багаццямі авалодвала дзіця ў сваіх дачыненнях са з'явамі прыроды, з законамі жыцця, адкрываючы свет, у якім чалавек становіцца чалавекам.

Дзіўна бывае глядзець, з якой сарамлівасцю ходзяць вакол падлетка сур'ёзныя дарослыя людзі, заклапочаныя праблемай, як яму адкрыць тайнае тайных прыроды, растлумачыць, адкуль ён з'явіўся, хоць большасць гэтых байбусаў даўно ўжо ведае, што іх знайшлі не ў капусце...

Зямля яшчэ валодае вялікай сілай прыцягнення. Адзін дзівак-паэт, жывучы на дванаццатым паверсе, са сваёй кватэры па сцяне спусціў тонкі дроцік — «прызямліўся», каб час ад часу ад яе, матухны, набірацца натхнення...

Механічна перамяніўшы адны ўмовы на другія, нават на лепшыя, не так лёгка знайсці «зазямленне». Майго даўняга знаёмага, які ўсё жыццё пражыў на гарадской ускраіне, перасялілі ў новы шматпавярховы дом. Калі ў сваёй ваколіцы ён ведаў кожнага і яго ведалі ўсе, бо рэдка хто абыходзіўся без паслуг добрага майстра-сталяра, дык тут наш навасёлец апынуўся як рыба на пяску. Усё неабходнае для сталяркі нечыпне аказалася не толькі непатрэбным, яго проста не было куды дзець. «Усё пааддаваў па людзях. Сабе пакінуў адзін гэблік, ды і той, ці паверыце, кладу пад падушку...»

Не адным старым людзям цяжка ламаць звычкі, побыт, рытм жыцця. Не лёгка і дзецям — асабліва навасельцам так званых мікрараёнаў, дзе няма на чым спыніцца пагляду, узбагаціцца ўражаннямі. Асабліва гэтую няўтульнасць адчуваюць падлеткі, той узрост, у якім дзіця актыўна імкнецца да дзейнасці, да выяўлення і выпрабавання свайго характару.

Ф. Энгельс сцвярджаў: прыйдзе час, калі знікне патрэба ў гарадах-гігантах. Размяшчаючыся раўнамерна, яны будуць трымацца бліжэй да зямлі, да прыроды. Тэндэнцыя сучаснай урбанізацыі, падначаленая неадольнай цэнтрабежнай сіле, кіруецца на як мага большыя маштабы. Усе любяць прыроду, ніхто не прызнаецца, што ненавідзіць яе, нават праекціроўшчыкі. Чаму — нават? Таму, што, плануючы прадпрыемства, яго звычайна «прывязваюць» да лесу. Калі будаваўся Гомельскі суперфасфатны камбінат, я намагаўся зразумець — чаму ў лесе? Гаспадары завода нават пакрыўдзіліся: «А вы падумалі пра тых, хто будзе тут жыць?» Аргумент неабвержаны, і я, што называецца, прыкусіў язык. І вось прадпрыемства ўжо многа год паспяхова працуе, але ніхто тут не жыве, усе жылыя заводскія дамы пабудаваны і будуюцца ў горадзе. Якая ж была патрэба ставіць пад пагрозу лес, што на дзесяткі кіламетраў пакрыўся густым рудым пылам? На жаль, не так мала прыкладаў, калі, будуючы і гарады ў лесе, спярша высякаюць дрэвы, а потым спустошаную зямлю «азеляняюць» нанава.

З першых год жыцця дзіця ўцягваецца ў вытворчыя інтарэсы дарослых, спачатку праз гульню, пасля цераз працоўны клопат. І там, дзе найбольш трывалая база дзейнасці і штодзённых абавязкаў, звычайна ў вялікіх і дружных сем'ях,— праца заўсёды была калыскай, выйшаўшы з якой чалавек цвёрда ведаў сваю мэту.

Не спяшайцеся з вывадамі: маўляў, аўтар найлепшы метад выхавання бачыць у патрыярхальнай сям'і, аплаквае тое, што беззваротна адыходзіць у нябыт. Нічога я не аплакваю і тым больш не лічу побыт старой сям'і паратункам для сям'і сучаснай.

Прагрэс рухаюць дзве сілы: сцвярджэнне новага і адмаўленне старога. Стварэння без разбурэння не бывае. Адсюль і прырода канфліктаў, што вызначаюць сутнасць грамадскіх адносін: набыткі не абыходзяцца без страт, і часам вельмі значных, якіх адразу, механічна не кампенсуеш, не заменіш.

Якая база для працоўнага выхавання ў сучаснай сям'і, у сучаснай, асабліва гарадской, кватэры, якія хатнія абавязкі ўскладаюцца на дзіця? Іх няшмат: засланць свой ложак, збегаць у магазін, вынесці вядро са смеццем. Што яшчэ? Колькі б ні набралася падобных клопатаў — усе яны механічныя. Ад нас, ад дарослых, залежыць, каб

дзіця паступова прывыкала да думкі і радавалася, што памагае нам.

Дзіця імкнецца працаваць, калі праца нясе радасць пазнання, эмацыянальнага ўзбагачэння.

На жаль, на вялікі жаль, і школа не далёка адышла ад сямейных метадаў. Яна таксама толькі знаёміць з працай, а не вучыць працаваць, не выхоўвае працай. Паступова дзіця прывыкае да працоўнага ўрока як да самага нецікавага і нуднага занятку. Калі да ўсяго дадаць, што ў нас не так многа настаўнікаў, здольных захапіць дзяцей, адкрыць ім сапраўдную радасць творчасці, што гэтую, найболей адказную, форму выхавання манапалізуюць людзі без педагагічнай культуры, рамеснікі і хатнія гаспадыні, дык, натуральна, узнікае пытанне: дзеля чаго такая політэхнізацыя?

## *Школа радасці*

Дзе ж выйсце? Яго падказвае вопыт школ, якія не толькі шукаюць, а і знаходзяць магчымасці вырашэння праблемы.

Усім вядома Паўлышская сельская школа імя В. А. Сухамлінскага, якая яшчэ пры жыцці гэтага выдатнага паэта савецкай педагогікі стала творчай лабараторыяй, асяродкам нястомных намаганняў — усе магчымыя сродкі падначаліць выхаванню працай.

Праца ў Паўлышскай школе — творчасць, пошук, эксперымент, выпрабаванне сіл, волі, характару, здольнасцей. Кожнаму выхаванцу яна — любімая. У школьным раскладзе — урокі любімай працы. Энтузіязм творчасці ўласцівы ўсім — ад пачаткоўца да выпускніка. Школа з усёй яе гаспадаркай, сядзібай, садам, агародам, цяпліцамі і аранжарэямі, лабараторыямі і майстэрнямі — база, дзе ёсць магчымасць прыкласці свае сілы кожнаму. Калі спатрэбіцца большы прастор — калі ласка: калгасныя палі, фермы, машыны.

Эмацыянальны стымул — стварэнне матэрыяльных і духоўных багаццяў, якія бачыць удзельнік працоўнага працэсу. Мэта дае накірунак, гуртуе і яднае намаганні калектыву. Ужо на прыкладзе таго, што Паўлышская школа сама, сваімі рукамі стварыла ўсю «малую» механізацыю: машыны, трактары, жняяркі, сеялкі, веялкі і ўсе прылады, неабходныя для апрацоўкі школьнага ўча-

стка,— можна бачыць, на што здольны працоўны энтузіязм дзяцей, адухоўлены мэтай. Вучні зрабілі станкі і інструменты сталярнай і слясарнай школьных майстэрняў.

Найбольшая цікавасць да працы ў дзяцей малодшага ўзросту. «Вытокі здольнасцей і талентаў дзяцей — на кончыках іх пальцаў»,— гаварыў Сухамлінскі.

У Паўлышскай школе дзеці вучацца рабіць усё, што ўмеюць іх настаўнікі,— ад цацкі, ад мадэлі да такарнага варштата і радыёпрыёмніка.

Па школьнаму раскладу адзін раз на тыдзень падлетак прыходзіць у майстэрню. Гэтым, па сутнасці, вычэрпваецца праграмная праца. Ці можа яна задаволіць усе самыя разнастайныя патрэбы і схільнасці дзяцей? Вядома, што не. Актыўная, творчая цікаўнасць знаходзіць сваё найшырэйшае разгарненне ў гуртках жывёлаводаў, селекцыянераў, садоўнікаў, пчаляроў, механізатараў, электратэхнікаў, канструктараў, слесараў, токараў...

Адухоўленая праца не можа быць сумная, нецікавая. Дасягнуты вынік, здзяйсненне задумы — заўсёды асалода, радасць. Юныя паўлышане высока шануюць свае працоўныя здабыткі. Самае любімае сярод многіх школьных урачыстасцей — Свята ўраджаю.

Ступіўшы на сядзібу школы Сухамлінскага, вы не можаце не заўважыць: тут не пустуе, не марнуецца ніводзін лапік зямлі, на ўсім — адзнака дагледжанасці, няспынных клопатаў. Кожнае дрэва, расліна, кветка, вырашчаныя дзецьмі,— ва ўсіх на вачах, на памяці, кожнае мае сваю гісторыю і радаслоўную. Вось густыя разложыстыя яліны, прывезеныя з Беларусі,— падарункі выхаванцаў Кармянскай школы-інтэрната. Колькі ў паўлышскіх дзяцей было хваляванняў — ці прымуцца дрэўцы? Прыжыліся, трывала ўвайшлі каранямі ў зямлю. Юныя паўлышане не толькі нястомна даглядалі, расцілі ялінкі, яны думалі пра іх як пра жывых істот, пісалі пра іх у школе. Вось казка, складзеная вучнямі другога класа.

### БЕЛАРУСКАЯ ЯЛІНКА НА УКРАІНЕ

Расла сабе маленькая ялінка ў Беларусі. Грэла яе яснае сонейка, палівалі дажджы, а зімой ахутваў снег. Мы паехалі да беларускіх сяброў. Яны падаравалі нам ялінку. Мы прывезлі дрэўца і пасадзілі ля школы.

Прачнулася ялінка, бачыць — цвітуць яблыні.

— Дзе я?

— Ты на Украіне,— сказалі дзеці.— Ты будзеш расці ў нас. А мы будзем цябе даглядаць.

Міжволі пераношуся ў думках з Паўлыша ў Карму, тым больш што ніхто іншы, а Васіль Аляксандравіч Сухамлінскі звярнуў маю ўвагу на Кармянскую школу і пазнаёміў з яе дырэктарам Міхаілам Апанасавічам Дзмітрыевым — цудоўным чалавекам і педагогам.

Многія праблемы хвалявалі Сухамлінскага і Дзмітрыева, і сярод іх, безумоўна ж, працоўнае выхаванне. Яшчэ ўвосень 1961 года ў Мінску на навукова-педагагічнай канферэнцыі яны абодва выступалі з дакладамі па гэтай праблеме.

Для Кармянскай школы яна, гэтая праблема, ускладнялася і ўскладняецца тым, што вучні, якія паступаюць сюды, гэта дзеці, лёс якіх не заўсёды пачынаецца шчасліва: адны не маюць бацькоў, другія паспелі трапіць у асяроддзе, якое на самым пачатку зняверыла іх добрыя надзеі і пачуцці, трэція... о, трэція — іх таксама няма-ла — гэта ахвяры глухой і сляпой педагогікі, з якімі не спраўляюцца і не могуць знайсці паразумення ў іншых школах і, распісаўшыся ў сваёй няздатнасці, перадаюць у інтэрнат. Міхаіл Апанасавіч Дзмітрыеў прымае ўсіх. За тры дзесяткі год яго педагагічнай практыкі не было выпадку, каб ён паверыў у безнадзейнасць чалавека. Добрая, шчодрая душа — Міхаіл Апанасавіч! Але я не магу зразумець, чаму ў нас не становяцца вядомымі бра-каньеры, па віне якіх так многа дзяцей трэба перавучваць і перавыхоўваць?

У Кармянскай школе, можа, нават большыя магчымасці для працоўнага выхавання, чым у Паўлышы. Яе сядзіба займае дзесяткі гектараў зямлі, аднаго саду 22 гектары. Сапраўды, ёсць дзе разгарнуцца. І трэба сказаць, што кармянцы любяць і ўмеюць працаваць — дружна, весела і згуртавана. А яшчэ не менш важна зазначыць, што, акрамя ўсяго, яны ведаюць цану сваёй працы, яны змалку вучацца гаспадарыць, думаць, рашаць, як найлепш для самой школы, для поспеху навучання, для дабрабыту кожнага выхаванца размеркаваць сродкі і зберажэнні, якія на сваім рахунку мае кожны клас...

Не так даўно мы даведаліся пра паспяховы вопыт працоўнага выхавання яшчэ ў адной школе. Пра яго

ўзрушана, захапляюча расказаў па тэлебачанні чалавек нястомнага пошуку ўсяго самага цікавага і незвычайнага ў нашым жыцці пісьменнік С. С. Смірноў.

Цяпер вядомы і вопыт, і адрас школы: Калужская вобласць, сяло Уланава. Праўда, гэта ўжо не школа ў нашым традыцыйным уяўленні, хутчэй за ўсё гэта — дзіцячы калгас, камуна, асноўныя прынцыпы навучання і выхавання ў якой выпрацаваў некалі А. С. Макаранка. Софія Пятроўна Масонава — дырэктар Уланаўскай школы — вопыт выдатнага педагога перанесла ва ўмовы сучаснай калгаснай вёскі, на новым узроўні развіцця савецкага грамадства. Ва Уланаўскай школе дзеці вучацца, працуюць, жывуць па законах калектыву, па маральным кодэксе вялікай сям'і, з'яднанай аднымі інтарэсамі і клопатамі са сваімі бацькамі, са сваім калгасам, стаўшы яго брыгадай № 1, гадавальнікам усіх яго найлепшых кадраў.

Уланаўскія педагогі ажыццяўляюць задуму шырокай перспектывы: аднавіць, актывізаваць выхаваўчыя функцыі сям'і, паставіць сямейную педагогіку на трывалую навуковую аснову, зрабіць сям'ю верным саюзнікам і памочнікам школы.

Вопыт нашых самых лепшых школ наводзіць на думку: ці не залішне абцяжараны структура і абавязкі нашых органаў асветы? Навуковая, метадычная распрацоўка і ўдасканаленне выхаваўча-вучэбнага працэсу — вось іх галоўны клопат. Практыка, само жыццё паказваюць, што там, дзе будаўніцтва школ, іх матэрыяльнае забеспячэнне, непасрэдныя турботы пра ўмовы працы і навучання дзяцей пераходзяць у рукі бацькоў, у рукі зацікаўленых калектываў, арганізацый, устаноў, там заўсёды большы поспех гарманічнага спалучэння навучання з працоўным выхаваннем. Аматарскае шэфства, мецэнацтва «добрых дзядзькоў», якія сяды-тады могуць штосьці «падкінуць» школе — спісаную машыну, паламаны трактар,— у нашы дні падобная дапамога, па меншай меры, архаічная. Калгасы, заводы і фабрыкі ўжо могуць узяць на сябе адказнасць гаспадароў за сучасную школу.

На сустрэчах з гарадскімі настаўнікамі, калі гаворка заходзіць пра вопыт перадавой школы, пра Сухамлінскага, заўсёды чуеш адно пярэчанне: тое, што магчымае ў сельскай школе, немагчымае ў гарадской.

Дзіўная рэч! Аказваецца, манапольнае права на по-

шук, на новую думку ў педагогіцы ўзяла ў свае рукі сельская школа. «Школы радасці на асфальце не пабудуеш...» — уздыхаюць гараджане.

А вы на асфальце не будуйце. Ад вашых намаганняў, ад вашых турбот, ініцыятывы і творчай думкі залежыць, каб кожная наша школа стала школай радасці.

## *Подзвіг педагога*

Вучаць, выхоўваюць не падручнікі, не методыкі — вучыць, выхоўвае настаўнік. Які настаўнік — такія яго вучні.

На кожнай педагагічнай сістэме, і перш за ўсё на характары педагога, на яго асобе,— адбітак свайго часу. І як бы мы ні называлі свой век — атамны, касмічны, кібернетычны,— самы галоўны клопат грамадства — чалавек.

Няма больш высакароднай працы, чым праца педагога. І надышоў ужо час, калі грамадства можа давяраць яе толькі па праву прызвання, па праву таленту і любові да дзяцей.

Педагог, які не мае перакананняў, які спадзяецца, што ўсё неабходнае яму выкладуць у прадпісаннях,— лянівы, абыякавы, кансерватыўны — ён, як гэта ні дзіўна, недалёкі і ад «актывіста», што ўсё новае ў педагогіцы сустракае як чарговую кампанію. Галоўны клопат — не адстаць, уключыцца, пераняць, «укараніць».

Я быў на адной нарадзе метадыстаў і інспектараў. Тэма — Сухамлінскі. Скажу шчыра — засмуціла мяне абыякавасць. І толькі выступленне адной жанчыны ўразіла шчырасцю, радасцю адкрыцця. Яна не магла ўтрымаць слёз, бянтэжачыся ад непасрэднасці сваіх думак. Я не ўцярпеў і сказаў ёй: дарагая мая, не саромейцеся. Стары мужчына, я таксама не раз плакаў, чытаючы Сухамлінскага, спачуваючы яго нялёгкай барацьбе за права стаць настаўнікам, за права вучыць людзей. Расклаўшы Сухамлінскага па палічках, уціснуўшы ў цытаты, нам не будзе лягчэй. Наадварот, пасля Сухамлінскага сапраўднаму педагогу яшчэ цяжэй, цяжэй, але ясней, бо глядзець ён будзе з вышыні вопыту Сухамлінскага. Васіль Аляксандравіч сярод многіх сваіх дзённікаў вёў вельмі асабісты, нават інтымны: «Я — вачыма сваіх вучняў». Цяпер яго вучні глядзяць на сябе вачыма настаўніка.

Просты, сціплы, з ціхім голасам, добры чалавек нарабіў лішняга клопату тым, хто прывык да цыркуляра.

Хто не любіць дзяцей, не палюбіць і Сухамлінскага, як бы ні стараўся паказаць, што «ўкараняе» яго вопыт.

Радуючыся, як з кожным годам расце цікавасць да Сухамлінскага, не магу не паспачуваць Паўлышскай школе, якую асаджаюць паломнікі. Ні дня не абыходзіцца без гасцей — дэлегацыі, экскурсанты, турысты. Як расказвае новы дырэктар школы Мікола Іванавіч Кодак, паломніцтва яшчэ болей павялічваецца, калі, скажам, з'яўляецца новая кніга Сухамлінскага або па тэлебачанні пакажуць школу. Глядзіш: едуць машыны, аўтобусы, цэлыя табары цікаўных — тры, чатыры, пяць тысяч штогод! Колькі клопату — прыняць, размясціць. У Паўлышы няма дзе. Бліжэйшыя гасцініцы за васемнаццаць, дваццаць кіламетраў: у райцэнтры Ануфрыеўка, у Александрыі, у Краменчугу.

— Два гады пасля смерці Сухамлінскага,— расказвае Мікола Іванавіч,— мы працавалі, можна сказаць, пры адкрытых дзвярах. Нікому не адмаўлялі наведваць урокі — прыходзілі ўсе, хто хацеў. Але, папрацаваўшы ў такіх умовах, убачылі, што мы не вучым, а толькі тое і робім, што паказваем і дэманструем...

Я спытаўся ў дырэктара, ці ведае ён, што сярод усіх разнастайных формаў паломніцтва ў Паўлыш ёсць яшчэ і пуцёўкі, якія выдаюць мясцовыя органы асветы. Вясёлы па натуры чалавек, Мікола Іванавіч адказаў жартам: «Гэта, мабыць, для начальнікаў, настаўнікаў па пуцёўках я не бачыў».

Нядаўна ў школе адкрыўся музей Сухамлінскага. Ён заняў першы паверх старога, яшчэ земскіх часоў, будынка: два пакоі, у якіх жыў з сям'ёй Васіль Аляксандравіч, яго рабочы кабінет і тры залы — самыя вялікія былыя класныя пакоі. Музей багаты і па экспазіцыі, і па афармленні. Цяпер Паўлышская школа ўздыхне лягчэй: паломніцкі паток, абмінаючы рабочыя класы, паступова ўвойдзе ў свае рэчышча.

Актыўнасць і цікаўнасць, якія ўзнікаюць у нас да новага, кіруюцца чамусьці адзіным метадам: пабачыць сваімі вачыма, памацаць сваімі рукамі, папрабаваць на свой зуб.

Хто-хто, а педагогі добра ведаюць, што вынікі іх працы не заўсёды ўвасабляюцца ў наглядных паказчы-

ках, і наўрад ці хто з сур'ёзных людзей спадзяецца, прыехаўшы ў Паўлыш, за дзень, за паўдня зразумець і спасцігнуць увесь вопыт Сухамлінскага.

Паўлышская школа — такая ж, якіх тысячы. Сядзіба, сад, палявая дзялянка, аранжарэя, майстэрні, лабараторыі, класы. Напэўна, у многіх школах ёсць большыя магчымасці. Некаторыя верхагляды не могуць схаваць расчаравання: што тут незвычайнага? Верхагляд прагне сенсацый. Наслухаўшыся пра Сухамлінскага, але не прачытаўшы ніводнай яго кнігі, ён спадзяваўся «ўсё ўбачыць на месцы».

Але школа Сухамлінскага цяпер не ў адным Паўлышы, цяпер яна ўваходзіць у скарбніцу ўсёй савецкай педагогікі і можа стаць набыткам кожнага, хто аддае любімай справе ўвесь свой талент і сэрца.

Мне асабліва радасна, што жыццё і подзвіг Сухамлінскага знаходзяць самы шчыры водгук сярод моладзі. Не забуду сустрэчы са студэнтамі універсітэта ў Мінску. Можа, ніколі я так не хваляваўся, не быў на грані такога душэўнага напружання. Лёгка зразумець чаму. Калі, магчыма, агульную мову я знаходжу з дзецьмі, з малымі, дык універсітэцкая кафедра не зусім на мой рост.

Маё хваляванне павялічвалася па меры набліжэння да парога аўдыторыі. І раптам, як толькі я яго пераступіў, адчуў, што пераступіў яшчэ не самы вышэйшы свой парог. Убачыўшы вочы — добрыя і даверлівыя, увагу вялікай аўдыторыі,— знайшоў і кантакт, і адчуванне таго магнітнага поля, у прасторах якога набраў сабе сілы дзве гадзіны весці размову з будучымі педагогамі.

Разам са сваімі субяседнікамі яшчэ раз перажыў хвіліны душэўнага далучэння да высакароднага подзвігу гэтага чалавека.

Хвіліны пазнання Сухамлінскага як асобы, як вялікага педагога, я ўпэўнены, западуць у душы яго вучняў, паслядоўнікаў назаўсёды.

І яны без яго думак, без яго кніг ужо не змогуць абысціся. Будучыя настаўнікі сэрцам прымаюць жывую спадчыну Сухамлінскага, хоць яна яшчэ і не ўваходзіць у вучэбныя праграмы.

Не аднымі ружамі ўсыпаны шлях яго пошукаў. Яшчэ і цяпер зласловяць прыхільнікі цвёрдага выхаваўчага курсу: «Галубіная педагогіка». З іх пазіцый чалавечнасць, душэўнасць, давер, дабрата — не самыя лепшыя

сродкі выхавання. Што можна супрацьпаставіць галубінай педагогіцы? Ну, вядома ж, арлінную. Але ж мы добра зазналі яе метады і вельмі шчаслівыя, што вызваліліся ад іх назаўсёды...

Самую адказную і пачэсную прафесію на зямлі камуністычнае грамадства будзе даручаць толькі вартым высокай годнасці вучыць і выхоўваць.

...Сонечным майскім днём, пад'язджаючы да Паўлыша, мы ўбачылі Сухамлінскага ўжо ў бронзе. З высокага мармуровага пастамента ён глядзіць у прасцягі — дарагія і знаёмыя. Свеціцца ледзь улоўная мудрая ўсмешка вялікага дабратворцы.

Кладучы кветкі да помніка, я заўважыў дзяўчынку. У чорным жалобным шаліку, яна стаяла каля магілы. Яна несла высокую варту. У той дзень, калі яго хавалі, дзяўчынка прыйшла ў трэці клас. Усё запомніла яна. Малыя, узяўшыся за рукі, ішлі наперадзе, за імі неслі іх настаўніка, за трунаю ішло столькі людзей, колькі ў Паўлышы яна ніколі не бачыла. Уся дарога была ўсыпана буйнымі асеннімі вяргінямі, астрамі і хрызантэмамі.

Клава Ірклій цяпер у восьмым класе. Запавет настаўніка — шанаваць памяць людзей — стаў высакародным звычаем школы. Кожны прыходзіць сюды з глыбокім узрушэннем. І ціхая гадзіна роздуму ля помніка настаўніку — не толькі абавязак памяці. Можа быць, гэта і ёсць самае запаветнае выхаванне душы чалавека.

Такія гадзіны не мінаюць бясследна.

## *Дзеці складаюць казкі*

Напэўна, усіх, хто чуў пра гэтую школу, больш за ўсё ўражвае тое, што паўлышскія дзеці складаюць казкі.

Ах, якія незвычайныя дзеці! Не, дзеці — самыя звычайныя, як усюды.

Уся бяда, што ў большасці нашых школ мала хто з настаўнікаў за сваё жыццё сам склаў казку. Паўлышскія настаўнікі ўмеюць складаць. Навучыліся спачатку самі, потым пачалі вучыць дзяцей. І вучні, і настаўнікі пачатковых класаў жывуць казкай. Культ казкі ў Паўлышы — традыцыя, запавет Сухамлінскага. Першы ж урок, на які я трапіў, прыехаўшы ў школу, быў урок казкі. Канчаўся навучальны год, першакласнікі сядзелі за пар-

тамі і перапісвалі — кожны сваю найлепшую казку ў школьную анталогію.

І наступны ўрок — чытанне — быў казачны. Чыталі вядомую народную казку «Пшанічны каласок». Вы паслухалі б, як яны, першакласнікі, чыталі! Гэта быў спектакль, дзеянне ў асобах. Не толькі па выразнасці галасоў, па інтанацыі мы пазнавалі кожнага персанажа, мы адчувалі сімпатыі і антыпатыі, асабістыя адносіны да кожнага героя казкі.

Сапраўды, радасны гэты ўрок. І настаўніца Валянціна Іванаўна Таран, падводзячы вынікі года, магла быць задаволенай. Успаміналі, якія казкі чыталі дома, у школе, якія самі склалі.

— Што трэба ўмець, каб напісаць казку? — спыталася Валянціна Іванаўна.

— Трэба ўмець пісаць,— сказаў адзін хлопчык.

— Чытаць,— дадаў другі.

— Правільна,— згадзілася настаўніца.— А яшчэ што — самае галоўнае — трэба ўмець?

— Думаць,— адказалі дзеці ўсім класам.

Абудзіць думку, навучыць думаць — галоўны клопат паўлышскіх педагогаў.

Вядома, дзіця не складзе казкі, калі яго нішто не ўзрушыць, не здзівіць, не захопіць, не зацікавіць, калі настаўнік не натхніць, не акрыліць яго думку і, перш за ўсё, сам на вачах у дзіцяці не створыць казкі.

Скажам сардэчнае дзякуй марыйскім настаўнікам, якія, прыехаўшы ў Паўлыш, не толькі слухалі Сухамлінскага аб тым, як дзеці складаюць казкі, а і запісалі яго расказ на магнітафонную стужку. І сёння мы чуем яго ціхі задушэўны голас:

«...Наша работа, работа педагагічная, асабліва характэрная тым, што зярняткі, пасеяныя сягоння, даюць плады толькі праз пяць, праз шэсць гадоў. Вы бачылі і чулі, як дзеці расказваюць свае казкі,— усё гэта вынік вялікай творчай працы настаўнікаў малодшых класаў. Якраз у малодшым узросце дзіця можа набыць значна болей, чым яно набывае цяпер у многіх школах. Якраз тут яно можа тварыць, складаць казку. Якраз тут абуджаецца яго фантазія, яго думка...»

Казка заахвочвае думаць. Нямала прыкладаюць сіл, часу настаўнікі пачатковых класаў Паўлышскай школы,

каб навучыць сваіх выхаванцаў, як скласці першую казку ў жыцці.

Не адразу гэта даецца дзецям, не адразу далося і самім настаўнікам. Не ўмелі настаўнікі складаць казкі. Іх гэтаму ніхто не вучыў. Вучаць многаму, а што найболей неабходна дзецям, да гэтага не даходзяць у педагагічных навучальных установах. Два гады патраціў Васіль Аляксандравіч, рэгулярна раз на тыдзень збіраючы сваіх настаўнікаў і вучачы іх пісаць казкі і апавяданні. Не да сораму было, калі кожны адчуваў, што без творчай думкі не можа быць поспеху: умее настаўнік — будзе ўмець вучань.

За два гады да школы паўлышскія педагогі знаёмяцца са сваімі будучымі вучнямі. Знаёмства пераходзіць у сяброўства са школай, дзеці ўсё болей спазнаюць сваіх настаўнікаў, кожнае суботы ідуць у школу, ідуць, як на раднае свята. Ніхто не саджае іх за парты. Іх класы — увесь навакольны свет прыроды, з яе таямніцамі і загадкамі, барвамі і гукамі. Адсюль бярэ свае вытокі казка. На тэрыторыі школы ўсе прыгожыя, утульныя закуткі, мясціны, альтанкі называюцца «зялёныя класы». Асаблівая ўвага — раслінам, кветкам, дрэвам, усяму жывому ў прыродзе. Усё трэба ведаць — як называецца, як расце, як цвіце, якія плады. У многіх казках, якія складаюць паўлышскія дзеці, часта расказваецца аб траяндзе (ружы). У Паўлышы іх многа — гэта любімая кветка Сухамлінскага, з якой ён параўноўвае самую дарагую кветку жыцця — чалавека.

Некалі была прымаўка: у Маскву па песні; у нашы дні становіцца прымаўкаю: у Паўлыш па казкі. Пад такой назвай тэлебачанне нядаўна паказвала фільм. Паглядзеўшы яго, цяжка зразумець, чаму якраз у Паўлышы дзеці любяць казкі і самі складаюць іх. Не ўбачыўшы, не адчуўшы творчай працы педагога, той паэзіі жыцця, якую адкрывае вакол сябе дзіця, так і не зразумееш, чаму менавіта ў Паўлыш трэба ехаць па казкі. Васіль Аляксандравіч гаварыў: усе дзеці скрозь і ўсюды — паэты, мастакі, летуценнікі, фантазёры.

Мне было прыемна даведацца, як нядаўна настаўнік 33-й школы Гомеля Віктар Рыгоравіч Шаўчэнка таксама сабраў багаты ўраджай казак. Пасля доўгай цярплівай работы, улічваючы паўлышскі вопыт, ён правёў у пачатковых класах конкурс на лепшую казку. Конкурс

прынёс нечаканы і радасны плён — пераможцамі сталі ўсе юныя казачнікі!

У Паўлышы ёсць чаму павучыцца. Тут педагогі не толькі складаюць казкі, яны даследуюць псіхалогію дзіцячай творчасці, распрацоўваюць методыку складання казак.

Настаўніца 2-га класа Кацярына Маркаўна Жаленка, сістэматызуючы свой вопыт і вопыт калег, у цікавым артыкуле, напісаным для школьнага штогодніка «Педагагічная думка», які выдаецца ў школе Сухамлінскага ўжо дваццаць год, расказвае:

«Пад уплывам пачуццяў, выкліканых казкаю, дзіця вучыцца думаць словамі, спачатку расказваючы пачутую, а потым складае сваю. Добра, калі ў сям'і любяць казкі, часта расказваюць дзецям. Ужо ў самым раннім узросце ў дзіцяці развіваюцца думка і мова, выхоўваюцца асабістыя адносіны да дабра і зла. Такія дзеці, прыходзячы ў школу, валодаюць лагічнай мовай, умеюць пабудаваць цэлы сказ, а не задавальняюцца аднаскладовымі сцверджаннямі або адмаўленнямі, як гэта бывае ў сем'ях, у якіх дзіця не пачула і не расказала ніводнай казкі».

Бачыце, як вопытны, творчы педагог дакладна вызначае самы першы і самы важны выток мыслення: яно пачынаецца з сям'і.

Першыя словы, якія вы прачытаеце, пераступіўшы парог Паўлышскай школы, звернуты да маці:

«Маці, памятай, што ты галоўны педагог, галоўны выхавацель. Ад цябе залежыць будучыня грамадства».

На сцяне — вялікі, інкруставаны па дрэве, вобраз маці.

На другім паверсе, дзе размяшчаюцца старэйшыя класы, вы не можаце не спыніцца, не задумацца яшчэ каля адной карціны. На ёй ужо рэальны вобраз маці: пасівелая ад гора Марыя Аляксандраўна Ульянава, якая толькі што даведалася аб пакаранні старэйшага сына, не можа стрымаць сваіх цяжкіх пакут. Побач з ёй стаіць яе малодшы сын — яшчэ гімназіст. Па яго вачах, па ўсёй яго паставе мы бачым, як ён любіць сваю маці і будзе любіць і ганарыцца ёю ўсё жыццё.

Школа Сухамлінскага пачынаецца з любові, з пашаны да маці. Першае дрэўца, якое садзіць дзіця, прысвячаецца ёй. У Паўлышы няма садка, дзе б не расла «яблыня маці». Дрэвы, пасаджаныя рукамі дзяцей, маюць свае

любімыя імёны: маці, бацькі, дзеда, бабулі. Колькі чалавек у сям'і, столькі дрэў садзіць маленькі чалавек, стаўшы вучнем школы Сухамлінскага. Выхаванне любові да бацькоў, увагі, пашаны да блізкіх, родных на першым школьным уроку пачынаецца з пытання: ці ведаеце вы дзень нараджэння сваёй мамы? Хто ведае, давайце запішам у сшыткі, хто не ведае — спытайце і абавязкова запомніце.

Без сям'і, гаварыў Сухамлінскі, не можа быць паспяховага выхавання.

«Ніколі, я лічу, не будзе такой школы, каб бацькі здавалі сваіх дзяцей грамадству і каб яно выхоўвала, а бацькі займаліся сваім інтэлектуальным і эстэтычным развіццём, былі свабодныя ад усіх абавязкаў. Сапраўдным патрыётам, сапраўдным грамадзянінам могуць быць толькі добры бацька, добрая маці». (Магнітафонны запіс гутаркі з марыйскімі настаўнікамі).

З якой тонкай душэўнай далікатнасцю Васіль Аляксандравіч дакранаецца да пачуцця, самага дарагога для дзіцяці:

«Вывела маці-вераб'іха маленькіх верабянят. Сядзяць яны ў цёплым гняздзечку, есці просяць. Маці лятае і лятае, есці сваім дзеткам носіць.

Сустрэў яе хіжы ястраб. Рынуўся на вераб'іху і забіў.

Чакаюць малыя, а матулі няма і не будзе.

Што ж цяпер будзе?»

Мініяцюра з сарака слоў так і называецца: «Што ж цяпер будзе?»

Я цвёрда ўпэўнены ў адным, што гэтае, можа быць, першае трывожнае ў дзіцячым жыцці пытанне паставіў не паршакласнік, рукой якога ў сшытку па косай лінейцы вялікімі літарамі напісана казка. Ніхто, як Сухамлінскі, так асцярожна не ўмее закінуць у душу дзіцяці зярнятка, якое, упаўшы на ўдзячную глебу, прарастае там добрымі пачуццямі.

Сухамлінскі спыняе ўвагу юных казачнікаў не толькі на вонкавых праявах жыцця, ён будзіць думку, скіроўвае яе і да больш складаных уяўленняў, нават, здавалася б, недаступных дзіцяці.

Вось яшчэ казка з пытаннем, на якое не заўсёды дакладна можа адказаць і дасведчаны філосаф:

## ЯКОЕ ШЧАСЦЕ?

Мама спытала ў мяне:

— Якое шчасце?

Я сказала:

— Шчасце — гэта калі ніхто з дзяцей не плача.

І яшчэ тады шчасце, калі маленькіх птушак ніхто ў клетку не саджае. Бо хіба ў клетцы можа быць шчасце?

І яшчэ — каб мама ніколі не плакала і не сумавала — шчасце. Бо калі мама сумуе, дык і ў мяне слёзы на вачах.

Філосафу, які адпаведна свайму ідэалу даў вычарпальны адказ на пытанне — якое шчасце, тады было... сем год. Я добра ведаю аўтара гэтай казкі: чарнявая, вясёлая, усмешлівая Алена Малалетка. Яна цяпер у восьмым класе. Піша вершы, ахвотна чытае сваім сябрам, змяшчае ў школьнай «Літаратурнай газеце».

— Як ты дадумалася, Аленка, напісаць у першым класе такую казку?

— А мне Васіль Аляксандравіч памагаў, усім памагаў. Многія казкі складалі разам, усім класам. Складзём, потым расказваем, кожны расказвае. Васіль Аляксандравіч слухае ўсіх, а потым кажа: «А можа, вось так? Давайце паслухайце».

Над казкай сямігадовай Аленкі, вядома ж, высока лунае шчодрае сонечнае сэрца настаўніка, ды і стылістыка далекаватая ад магчымасцей аўтара, які толькі што навучыўся выводзіць першыя літары.

Зноў гучыць ціхі, разважлівы голас Васіля Аляксандравіча:

«...Я вяду ўрок з вучнямі другога класа. Мы ідзём у парк, там бачым вялікія дрэвы акацыі, у лісцях гудуць майскія жукі. Я кажу дзецям:

— Уявіце сабе, ляціць жук, а вось вострая калючка. Наляцеў на яе, небарака, укалоўся і, ранены, упаў на зямлю. Убачылі іншыя жукі, кінуліся ратаваць. Ну, а далей што?

Тут і пачынаецца фантазія дзяцей. Адны кажуць: прыехала «хуткая дапамога», перавязалі рану, павезлі ў бальніцу, там агледзелі, зрабілі яшчэ адну перавязку. І пераліванне крыві — дадаюць другія. У бальніцу пыляцелі маленькія жучкі. Яго сыны і дочкі...

Вось так і складаецца казка...»

Кожны вучань складае сваю казку. Няхай не адразу, не за адзін урок і нават не за адзін дзень, але складае — па слову, па сказу, пераказвае, перапісвае, думае...

Я падам яшчэ некалькі казак, напісаных у «Школе радасці». На першы погляд, усе яны простыя, поўныя наіўнага захаплення і здзіўлення перад светам, але ў кожнай нельга не заўважыць залацінку мудрасці, уласцівай настаўніку. Паэтычнае хараство гэтых маленькіх шэдэўраў не заўсёды ў адкрытым тэксце, а часцей за ўсё ў дасціпнай умоўнасці, у іншасказе, у алегарычнай вобразнасці.

### ЯК ЖАБА НАВУЧЫЛАСЯ СПЯВАЦЬ ПА-ЖУРАЎЛІНАМУ

Спадабалася жабе, як журавель спявае. Сядзіць яна ў балоце, слухае жураўліны спеў і думае: «Навучуся спяваць па-жураўлінаму. Буду не такая, як усе жабы. Няхай дзівіцца ўвесь жабін люд».

Доўга вучылася жаба спяваць па-жураўлінаму і не навучылася. Гавораць з ёю жабы па-жабінаму, а яна нібы і не разумее, адказвае ім па-жураўлінаму.

Узлаваліся жабы і гавораць сваёй сяброўцы:

— Ты ж такая жаба, як і мы. Чаму ж ты не хочаш гаварыць па-жабінаму?

А жаба адказвае:

— Хутка ў мяне вырастуць крылы, і я палячу, як журавель.

*Алег Галоўчанка, 1-ы клас.*

### КУРАНЯТЫ

Сядзела квахтуха на яйках. Доўга сядзела. Невясёлая была. Але вось яйкі адно за адным пачалі трэскацца. А са шкарлупін высунуліся маленькія галоўкі. Павылазілі кураняты. Павылазілі і пішчаць: пі-пі-пі.

— Ко-ко-ко! — кліча іх за сабою квахтуха.

Павяла на двор. Бягуць за ёю кураняты, глядзяць на ўсе бакі і дзівяцца: ой, які ж вялікі свет!

— Хіба ж гэта свет,— сказала квахтуха.— Вунь яшчэ агарод, а на агародзе — проса, а за просам — лапухі, а за лапухамі — пшанічнае поле.

*Наталка Ануфрыенка, 1-ы клас.*

## ЯК МЯДЗВЕДЗІК ПАЕЎ ЦУКЕРКІ

Усе мы з нецярпеннем чакалі Новага года. Тата купіў ялінку. Мама і сястра ўпрыгожылі яе цацкамі. Паміж галінак пасадзілі Мядзведзіка, а вакол яго навешалі цукерак. Раніцай усталі — няма цукерак.

— Дзе ж цукеркі? — пытае мама.

— Мабыць, Мядзведзік паеў,— сказаў я.— Глядзі, як ён аблізваецца.

Мама ўсміхнулася і кажа:

— Ну што ж, і Мядзведзік любіць цукеркі. Вазьмі і пакладзі яшчэ.

*Толя Бяззуб, 2-і клас.*

## РУЖА І СВІННЯ

Свіння рылася на агародзе. Шукала бульбу, што засталася ў зямлі. Разам з бульбай выкідвала чарвякоў. Шэры грак ішоў услед за свіннёй і падбіраў чарвякоў. Грак думаў: «Калі б не свіння — быў бы я галодны. Трэба падзякаваць свінні».

Пайшоў грак і прынёс свінні падарунак — ружу. Вось, думае грак, будзе рада свіння.

А свіння ляжыць у лужыне, грэецца на сонцы. Расплюшчыла адно вока — бачыць: грак з ружай.

— Вось табе падарунак,— гаворыць грак.

— Давай, давай,— абрадавалася свіння і з'ела ружу.— Смачная,— сказала яна,— але бульба смачнейшая.

*Каця Крывашэй, 3-і клас.*

Вы заўважылі ў гэтых казках, можа быць, яшчэ не зусім уласцівую сямі-васьмігадовым дзецям апавядальную інтанацыю і ледзь улоўную іранічную ўсмешку? Васіль Аляксандравіч упэўнены: дзіця разумее алегорыю, яе пераносны сэнс з усімі тонкасцямі падтэксту: аказваецца, і ў жаб ёсць свой «журавель у небе», а ў курыцы і куранят — свой неабсяжны сусвет, што не канчаецца нават за лапухамі, ідэал прыгажосці для свінні — тое, што можна з'есці. Дзеці разумеюць: дарослыя любяць гульню. Што ж, давайце пагуляем. Хто паеў цукеркі з навагодняй ёлкі? Мядзведзік. Ён любіць цукеркі, пакладзём яму яшчэ.

Прачытайце яшчэ дзве казкі, у якіх найбольш прыкметнае мысленне маральна-этычнымі катэгорыямі з падкрэсленым дыдактычным вывадам.

### ЛЯГЧЭЙ ЛАСТАЎКУ ЗЛАВІЦЬ, ЧЫМ ЗНЯВАГУ ЗАБЫЦЬ

Адзін хлопчык так разгуляўся, што маці мусіла сказаць:

— Не крычы, татка хворы.

Хлопчык не паслухаўся, зазлаваў, нават крыўднае слова маме сказаў.

Заплакала маці ад зняважы. А хлопчыку сорамна зрабілася. Ён і просіць:

— Мама, забудзьце крыўднае слова, даруйце.

— Я дарую, але не забуду,— сказала маці.— Лягчэй ластаўку злавіць, чым зняважу забыць.

*Клава Кананенка, 3-і клас.*

### КРАІНА БЕСКЛАПОТНЫХ

Была ў свеце такая краіна — Краіна Бесклапотных. Жылі ў ёй вясёлыя Бесклапотныя людзі. Замест сэрцаў у іх грудзях былі мяшэчкі з ружовай вадзічкай. Ружовая вадзічка цякла па жылах. Усё цела ў Бесклапотных было ружовае, і абліччы — ружовыя. У Бесклапотных была вельмі кароткая памяць. Вырастаючы, дзеці Бесклапотных забывалі бацькоў. Яны не памяталі, хто яны і адкуль.

Прыйшло ў краіну Бесклапотных няшчасце. Захапілі краіну злыя чужаземцы. Яны таптаді палеткі Бесклапотных, seклі сады, палілі дамы. А Бесклапотныя ўсміхаліся і толькі ківалі галовамі. Яны намагаліся нешта ўспомніць, але не маглі. Яны не ведалі, хто яны, хто былі іх бацькі і дзяды, хто пабудаваў іх дамы і пасадзіў стагадовыя дрэвы.

Але знайшліся ў Краіне Бесклапотных людзі з гарачай крывёю. У грудзях іх білася жывое сэрца. Яны сказалі Бесклапотным:

— Успомніце, хто вы! Успомніце, хто вашы продкі! Паглядзіце, што робяць ворагі на вашай зямлі!

Успомнілі Бесклапотныя, хто былі іх бацькі і дзяды,— сорамна зрабілася ім за сваю бесклапотнасць. Убачылі яны, што робяць ворагі на іх зямлі. Разгарэлася ў іх нянавісць да захопнікаў. Прагналі яны ўсіх са сваёй краіны і перасталі быць Бесклапотнымі.

*Сяргей Шкурат, 3-і клас.*

Па сваёй алегарычнай мудрасці гэта ўжо класічная казка. Хто яе склаў — класік з трэцяга класа ці вялікі

дабратворац і чарадзей дзіцячай душы — Васіль Сухамлінскі?

Я ўпэўнены — яны абодва. Любімыя вобразы, ідэі, думкі настаўніка, што прайшлі праз сэрца выхаванцаў, зрабіліся іх вобразамі і думкамі. Казкі Сухамлінскага сталі казкамі яго вучняў. Што запала ў душу, палюбілася дзіцяці, становіцца яго духоўным скарбам. Мяне ніколі не здзіўляе, калі, пачуўшы і запомніўшы верш, дзіця перапісвае яго на лісток і прысылае ў рэдакцыю з просьбай: надрукуйце мой верш. Чаму — яго верш? Не цяжка зразумець: радкі, словы, што назаўсёды запалі ў памяць,— гэта ўжо яго ўласныя словы. Калі мы, сталыя людзі, гаворым: мой Пушкін, мой Шаўчэнка, мой Купала — ніхто ж не асуджае нас за такую прыватную ўласнасць.

Ва ўсіх казках, складзеных у школе Сухамлінскага, б'ецца яго сэрца, жыве яго душа. Сабраўшы ўсе скарбы паўлышскіх казачнікаў, Васіль Аляксандравіч з вялікай гордасцю мог сказаць: мае казкі. Пры ўсёй выключнай сціпласці ён добра разумеў сваю ролю ў гэтай творчасці. Ён не адмаўляў свайго аўтарства, пачаўшы іх першую публікацыю ў «Вясёлцы». Кніга «Блакітныя жураўлі», якая рыхтавалася пры яго непасрэдным удзеле, складаецца з казак, напісаных у першых класах за 1969/70 навучальны год і ўзятых толькі з аднае школьнай анталогіі. А ўсіх іх, школьных казачных анталогій, налічваецца сорак пяць — гэта ўжо не дзесяткі, не сотні, а тысячы казак!

Казка — гэта чарадзейства адкрыцця. У кроплі расы зіхаціць сонца, у магічным крышталі слова — ключ, якім можна адамкнуць скарбніцу мовы народа. Толькі трэба ўмець знайсці і адну-адзіную расінку, якая валодае чароўнай сілай, і самае запаветнае слова. А хто шукае, той знаходзіць. Многія бачаць: ляжыць на дарозе кавалачак шкла — і не здагадваюцца, што гэта чароўнае шкло. А настаўнік са сваёй вучаніцай паднялі, паглядзелі і ўбачылі — знайшлі незвычайны скарб.

### СВЕТ ПРАЗ СІНЯЕ ШКЛО

Я знайшла маленькі кавалачак сіняга шкла. Прыклала да вачэй, паглядзела — і што я ўбачыла?

Усё наўкола стала сіняе. Не зямля, а падводнае царства. Не, гэта казка, якую я назаву «Свет праз сіняе шкло».

Вось перада мною пшанічнае поле. Не, гэта не пшаніца, а марскія хвалі. Што гэта плыве па моры? Камбайн? Не, гэта дзівосны карабель. Ён набліжаецца да мяне. За сінімі хвалямі — лес, як бераг таямнічага вострава.

Гляджу на неба — сонца. Яно было і застаецца сонцам — заўсёды. Нават у казцы. Калі б не было сонца, не было б і святла праз сіняе шкло. Не было б і казкі.

*Надзя Асташка, 3-і клас.*

Шчодрая душа гэтага чалавека была заўсёды гатовая дзяліцца ўсім са сваімі выхаванцамі. Дапусцім, што Васіль Аляксандравіч нават перабольшваў творчыя магчымасці дзяцей. Мы прабавалі ў асобных казках вызначыць прымат, перавагу творчай волі настаўніка, аднак задача такога аналізу вельмі спецыфічная і складаная. Казка — не малюнак, у якім дзіцячы свет умоўны не толькі па наіўных уяўленнях, яго ўмоўнасць залежыць ад нявопытнасці і бездапаможнасці рукі, якая трымае аловак. Пішучы казку, дзіця мае механічны навык — умее напісаць слова, але не заўсёды адчувае багацце яго сэнсавых адценняў, не ведае, як слова пераходзіць у вобраз, у карціну. Тут адной свабоднай імправізацыі недастаткова, патрэбна лагічная паслядоўнасць развіцця думкі.

Сухамлінскі ў стварэнні казкі ідзе ўслед за вопытам Талстога і Ушынскага, але ён хоча «зліцца» з дзіцячай творчасцю, растварыцца ў ёй. Багацце ж яго асобы не заўсёды ўмяшчаецца ў формы, уласцівыя першапачатковаму творчаму мысленню.

Паўлышскія педагогі прадаўжаюць і развіваюць добрыя традыцыі Сухамлінскага. Культ казкі ў малодшых класах шануецца высока. Як і раней, самыя лепшыя казкі захоўвае дырэктар. Старанна перапісаныя дзецьмі, пераплеценыя ў вокладкі з суравога палатна, гадавыя камплекты кожнага класа — іх можна пабачыць толькі ў дырэктара. Напісаныя пры жыцці Сухамлінскага — у музеі. Гэта самыя дарагія каштоўнасці школы.

Кацярына Маркаўна Жаленка і яе калегі — вопытныя настаўнікі пачатковых класаў — арыентуюць сваіх выхаванцаў не толькі на складанне казкі, а і на апавяданне — на ўменне дзіцяці ў словах выказаць убачанае, што захапіла яго ўвагу. Гэта вымагаецца тым, што ў дзіцяці на

першых пачатках трэба выяўляць рэальныя магчымасці мыслення і, узбагачаючы эмацыянальную актыўнасць, развіваць яго творчыя здольнасці і схільнасці.

Юныя паўлышане, як і ўсе дзеці,— жывыя, свавольныя, няўседлівыя, цікаўныя, дапытлівыя. Кожная сустрэча з імі — для мяне душэўнае свята.

Я чытаў паўлышскім казачнікам свае казкі, пацешкі, лічылкі па-беларуску і быў надта рады, што яны разумелі кожнае слова гэтак жа, як і мае слухачы ў нашых школах.

Радуюся ўсёй душой, што пабываў у дарагіх мне мясцінах і пакланіўся ўкраінскай зямлі, якая нарадзіла выдатных настаўнікаў і пісьменнікаў — Макаранку і Сухамлінскага.

## *Вытокі*

У Краменчугу, дакладней — у Крукаве, паселішчы, якое даўно злучылася з горадам, ёсць цікавы дамок. Ён стаіць на ўскраіне, на ціхай вуліцы, атулены яблынямі і кустамі бэзу. Цікавы ён тым, што гэта адзіны ў Савецкім Саюзе педагагічна-мемарыяльны музей А. С. Макаранкі.

Для многіх з нас яго жыццё звязваецца перш за ўсё з мясцінамі, апісанымі ў «Педагагічнай паэме». Гэта натуральна. Мастацкія ўражанні могуць часам засланіць не менш важныя падзеі біяграфіі пісьменніка, пра якія ён не паспеў расказаць.

Крамянчугскі музей Макаранкі цікавы тым, што размешчаны ён у доміку, у якім пісьменнік-педагог пражыў каля дваццаці гадоў.

Бацькі Макаранкі, шукаючы работы, прыехалі ў Крукаў, калі сыну было дванаццаць гадоў. Доўга туляліся па бараках, па чужых хатах, пакуль бацька, маляр чыгуначных майстэрань, не збудаваў свае, якой і суджана было стаць музеем.

Скончыўшы чатырохкласнае вучылішча ў Крамянчугу, Макаранка пасля аднагадовых педагагічных курсаў становіцца настаўнікам Крукаўскага двухкласнага чыгуначнага вучылішча. Самая важная акалічнасць яго педагагічнай дзейнасці ў тым, што пачалася яна на крутым уздыме грамадскай і рэвалюцыйнай думкі — у 1905 годзе.

«У цыганачнай школе, дзе я настаўнічаў, паветра было непараўнальна чысцейшае, чым у іншых месцах; рабочае, сапраўды пралетарскае асяроддзе моцна трымала школу ў сваіх руках. З гэтай школы выйшла багата бальшавікоў»,— пісаў Макаранка. Застаецца дадаць, што з гэтай школы выйшаў і ён сам.

Няма патрэбы расказваць яго далейшую біяграфію. Яго грамадскі і педагагічны подзвіг вядомы ўсім.

Асабіста для мяне, для маіх разваг знаёмства з домікам на крамянчугскай ускраіне дарагое тым, што я яшчэ болей упэўніўся ў перакананні: Макаранка, безумоўна, быў тым узвышшам, з якога глядзеў і ў мінулае, і наперад, у будучыню, В. А. Сухамлінскі.

На розных этапах грамадскага развіцця — абодва яны падзвіжнікі, гатовыя аддаць жыццё за свае ідэалы і перакананні.

Макаранка і Сухамлінскі — асобная тэма для даследавання. Не магло быць поўнага супадзення іх поглядаў і перакананняў. Калі б так здарылася, не было б Сухамлінскага як выдатнага педагога, не было б развіцця і ўдасканалення педагогікі як навукі.

Галоўнае, што яднала і яднае іх,— вера ў чалавека, любоў да чалавека.

Два педагагічныя музеі — Макаранкі ў Крукаве, Сухамлінскага ў Паўлышы — у блізкім суседстве, адлегласць паміж імі — усяго васемнаццаць кіламетраў.

Ужо тая акалічнасць, што Сухамлінскі вучыўся ў Палтаўскім педінстытуце, які скончыў Макаранка, не магла не ўплываць на пачуцці, не будзіць думку юнака. Тое, што Макаранка жыў і пачаў сваю працу, сфарміраваўся як педагог і грамадзянін у мясцінах непадалёк ад родных сцежак Сухамлінскага, не магло не запасці ва ўражлівую душу маладога педагога.

І я не памылюся, калі па гэтай, няхай толькі псіхалагічнай, аналогіі перакіну мосцік і яшчэ далей — да тых жыватворных вытокаў, з якіх нараджалася савецкая педагогіка, да яе ленінскіх першаасноў абгрунтавання сувязі школы з жыццём, навучання з выхаваннем, пачынаючы са смелага, наватарскага эксперымента, падтрыманага і ўхваленага У. І. Леніным, які блізкага свайго паплечніка і памочніка, нашага земляка Лепяшынскага, выпраўляе на Беларусь, у глухое сяло Ліцвінавічы, стварыць там такую школу, праверыць на практыцы прынцыпы новай

педагогікі. У першы год Савецкай улады ў Маскве збіраецца група энтузіястаў і выпраўляецца ў цяжкую і далёкую дарогу.

Маленькі калектыў падзвіжнікаў: стары настаўнік спеваў і добры гаспадарнік, слесар аднаго з маскоўскіх заводаў, дзве настаўніцы, адна з іх урач Вольга Барысаўна — жонка Лепяшынскага, другая — дачка і сам загадчык аддзела рэформы школ, член калегіі Наркамасветы — Панцеляймон Мікалаевіч Лепяшынскі, якому ў гэты час ужо было пяцьдзесят год!

Акрамя падручнікаў, школьных прылад яны везлі з сабой бібліятэку і па тым часе нечуваны для вёскі скарб — піяніна. Даехаўшы да Рослава, яны яшчэ мусілі адолець каля 180 кіламетраў на фурманках і пеша, каб дабрацца да Ліцвінавіч.

Гэта былі людзі, што добра разумелі, якога напружання розуму і волі запатрабуе ўзятая задача: стварэнне першай савецкай вопытна-паказальнай школы-камуны ва ўмовах таго часу.

Камунары ўтвараюць калектыў, які яднае настаўнікаў і вучняў. Пачынаюць з рэчаў, якія для цёмнай, занядбалай вёскі былі такой жа неадкладнай праблемай, як і многія іншыя: «Беседа о вшах»,— занатоўвае ў дзённіку Вольга Барысаўна.

«Паказвала дзецям вош пад лупай, а потым пад мікраскопам»,— запісвае Лепяшынская. Жывая сцэнка, якую яна падае, паказвае, як дзеці рэагуюць на такое вялікае для іх адкрыццё:

— Зірні, зірні, якія вялікія ў яе клюшні — во, імі ж яна нас і кусае. Давайце хутчэй стрыгчыся!

Хлапчукі ўзяліся стрыгчы адзін аднаго. Нажніцамі і машынкаю за дзве-тры гадзіны ўсе былі пастрыжаны.

Вопытныя педагогі вучылі дзяцей не толькі ў класе, яны вынеслі навучанне ў поле, у школьны сад, у майстэрні, выйшлі на вясковую сцэну з першымі спектаклямі і канцэртамі, арганізоўвалі хаты-чытальні, вучылі грамаце дарослых. Вопыт Ліцвінавіцкай школы-камуны пачалі пераймаць у розных кутках Беларусі.

Так нараджалася працоўная школа. Гістарычная драма часоў грамадзянскай вайны стала і педагагічнай драмай. Набліжалася пагроза нямецкага нашэсця, пачаліся эсэраўскія бунты. Так званы стракапытаўскі мяцеж, які пачаўся ў Гомелі, хутка дакаціўся і да Ліцвінавіч. Ку-

лацкія правакатары, сабраўшыся на рынку, кінулі кліч: «Бі камуну!» Яны рваліся спаліць школу. Настаўнікі і вучні вартавалі яе і ўдзень і ўначы. Здань небяспекі насоўвалася няўмольна. У ліпені 1919 года паводле распараджэння У. І. Леніна настаўнікі-камунары вярнуліся ў Маскву, дзе была ўтворана вопытна-паказальная школа Народнага Камісарыята асветы. За парты гэтай школы селі вучні, вывезеныя з Ліцвінавіч. Разам з імі вучыліся прыёмная дачка Леніна — Ніна Барамзіна, сын Варашылава — Пётр, дзеці вядомых рэвалюцыянераў Цюрупы і Курскага.

У гісторыі нашай рэспублікі першая школа-камуна пакінула глыбокі след. У Ліцвінавічах створаны унікальны музей Лепяшынскага, сярод экспанатаў якога — асабістыя рэчы, кнігі, рукапісы, літаратурныя творы і малюнкі. Музей узначальвае з дня яго ўтварэння нястомны прапагандыст педагагічнай спадчыны Лепяшынскага завуч школы Іван Гаўрылавіч Якуш.

Было б цікава і карысна сабраць і апублікаваць нарысы і артыкулы пра школу-камуну ў Ліцвінавічах, напісаныя Лепяшынскім, якія друкаваліся паўвека таму назад у часопісах «Огонек», «Народное просвещение» і іншых выданнях.

## *Паўлыш — Карма*

Гаворачы аб традыцыях, мы не часта ўдумваемся ў глыбокі сэнс іх пераемнасці. Звярніце ўвагу, як ні адна з прафесій, педагагічная замацоўваецца цэлымі дынастыямі, становіцца сямейным гонарам. Сёстры Зінаіда і Юлія, браты Мадэст, Пётр і Панцеляймон, яго жонка Вольга Барысаўна і дачка Вольга Лепяшынскія — педагогі. Сям'я Сухамлінскіх — усе педагогі. Гэты спіс можна прадаўжаць і прадаўжаць, але, зазначыўшы слаўную традыцыю педагагічнай эстафеты, не магу не вярнуцца да ранейшай думкі, што высакароднасць выклікае высакароднасць, подзвіг нараджае подзвіг. Макаранка і Сухамлінскі, Лепяшынскі і добры плён яго школы на Беларусі...

Жыватворныя накірункі педагагічных пошукаў, маршруты, якія прайшлі і праз маё сэрца, не могуць абмінуць і яшчэ адну дарагую мне мясціну.

Усё часцей і часцей заглядваю я ў гарадок, што ў вась-

мі кіламетрах ад сяла Ліцвінавічы, ад той школы, якую заснаваў Лепяшынскі і ў якой напярэдадні Айчыннай вайны пачаў свой шлях 19-гадовы педагог. Дзмітрыеў, пазней Герой Сацыялістычнай Працы, заслужаны настаўнік БССР, кандыдат педагагічных навук, дырэктар Кармянскай школы-інтэрната, а цяпер — рэктар Мазырскага педінстытута, не зважаючы на ўсе званні і тытулы, незвычайна сціплы, сардэчна далікатны, душэўна тонкі і праніклівы чалавек. Спалучыўшы ў сабе філолага і гісторыка, Міхаіл Апанасавіч за трыццаць год сваёй працы давёў да высокай дасканаласці прыроджаны талент чалавеказнаўцы, выхавацеля.

Сын вясковага настаўніка, ён у асяроддзі сваіх шасці братоў і шасці сясцёр ужо з малых год спасцігаў вопыт сямейнай педагогікі, гадуючы, даглядаючы меншых. Памагаючы бацьку вучыць дарослых і нават дзядоў і бабулек у школе лікбеза, ён бачыў, як людзі шануюць настаўніка. Яго бацька Апанас Максімавіч быў адзначаны найвышэйшай узнагародаю краіны — ордэнам Леніна.

Першы самастойны крок у школе, здавалася б, з выгляду нічым не прыкметнай, але авеянай легендарнай гісторыяй, быў для маладога педагога, напэўна, самым большым экзаменам, чым усе тыя, якія ён трымаў у Рагачоўскім настаўніцкім інстытуце.

Юнак добра ведаў, адкуль, з якое сцежкі пачынае сваю дарогу.

Але неўзабаве пачаўся экзамен на самае большае выпрабаванне. З першых дзён вайны малады настаўнік — баец знішчальнага батальёна. Новы навучальны 1941/42 год камсамолец Дзмітрыеў пачынае ў школе, адзінай тады для кожнага патрыёта,— у школе мужнасці. З настаўнікаў і старэйшых вучняў стварае падпольную групу разведчыкаў. У партызанах ён становіцца начальнікам спецыяльнага аддзела атрада, удзельнічае ў баях з акупантамі, у масавых аперацыях «рэйкавай вайны». Добра ведаючы нямецкую мову і яшчэ болей удасканальваючыся «на практыцы», як сам ён цяпер жартуе, «нямала памарочыў галовы фашыстам».

...Лёсы гэтых людзей, Сухамлінскага і Дзмітрыева, вельмі блізкія. Не выпадкова пасля вайны, зноў аддаючы свае сілы любімай справе, яны знаходзяць адзін аднаго якраз у дні, калі была найбольшая патрэба ва ўзаемнай дапамозе і падтрымцы.

Творчыя пошукі Сухамлінскага сустракаюцца не толькі з іранічнай ухмылкай перавагі агульнапрызнанай мудрасці над наіўнымі адкрыццямі правінцыяла. На старонках педагагічных выданняў яны атрымліваюць асуджэнне.

Дзмітрыеў у гэты час ужо дырэктар школы-інтэрната. Яго выхаванцамі былі дзеці, з якімі жорстка абышлася не толькі вайна, але і многія іншыя жыццёвыя выпрабаванні. Такім дзецям у нас ёсць вызначэнне: цяжкія дзеці. Як у кожным з іх знайсці і адкрыць чалавека? Якімі сродкамі? Дзмітрыеў верыў і верыць у самы галоўны сродак — у сэрца педагога. Дабрату можна выхаваць толькі дабратою, давер — даверам, душэўнасць — душэўнасцю. Толькі той, хто спазнаў сябе чалавекам, адкрыў у сабе грамадзяніна, пачынае свядома і актыўна вучыцца.

Далёка Паўлыш ад Кармы, але для аднадумцаў няма далечы. Сухамлінскі і Дзмітрыеў пачалі сяброўства, якое расце, умацоўваецца паміж дзвюма школамі і дае свой жыватворчы плён. Яблыні, пасаджаныя Сухамлінскім у вялікім садзе Кармянскай школы, сталі ўрадлівымі, прыгожымі дрэвамі.

Тое, што лічылі слабасцю Сухамлінскага, аказалася яго сілай. Вельмі вобразна сказаў цяперашні дырэктар Паўлышскай школы Мікола Іванавіч Кодак: «Калі б усе два з паловай мільёны настаўнікаў у адзін цудоўны дзень зразумелі, што кожны вучань — чалавек, адбылося б вялікае дзіва: мы ўсе ўбачылі б, як нам радасна вучыць, а дзецям — вучыцца!»

Як добра, калі на дапамогу прыходзіць сябар, выказвае не толькі спачуванне, але і падтрымлівае цябе адкрыта і шчыра, рызыкуючы звыклым спакоем.

Артыкулы нястомнага паўлышскага шукальніка, яго кнігі знаходзяць водгук і падтрымку не толькі ў педагогаў, а ўсё болей і болей у самай шырокай грамадскасці.

Успомніце, з якой цікавасцю сустракалася кожнае выступленне Сухамлінскага ў друку. Надзённыя праблемы выхавання становяцца блізкія ўсім. Педагогіка, аказваецца, навука не толькі для спецыялістаў. Грамадства зацікаўлена, каб яна стала ўсенароднай навукай.

Задача ўсеагульнага педагагічнага навучання, пастаўленая партыяй, непасрэдна вынікае з велічнай праграмы. Мы падняліся на той высокі рубеж гістарычнага развіцця, калі грамадству патрэбна як мага болей педа-

гогаў-падзвіжнікаў, выхавацеляў па праву і прызванню. Таму што вучым і выхоўваем мы чалавека па самых высокіх ідэалах гуманізму.

Карабель педагагічнай навукі ўпэўнена ідзе наперад. На гэтым караблі высокія мачты, надзейны капітанскі мосцік, ёсць на гэтым караблі, вобразна кажучы, і карма.

Не заўсёды работа педагога на відавоку. Але той, хто любіць сваё прызванне, хто рады сваёй працы, заўсёды адчувае сябе шчаслівым на гэтым караблі.

...Кожная сустрэча сяброў у Паўлышы і Карме — хвалюючая падзея, свята.

На гэты раз гасцямі кармянцаў былі паўлышане. Чатыры дні мы жылі пачуццямі радаснага ўзаемнага пазнання: ранішнік казкі, вечар паэзіі, агульнае пасяджэнне педсавета, мітынг дружбы ў раённым Доме культуры, экскурсія ў музей Лепяшынскага, сустрэча ў Ліцвінавіцкай школе, паездка ў лес, пасадка дрэў на ўшанаванне памяці В. А. Сухамлінскага побач з паркам памяці кармянцаў, што загінулі на вайне.

Юныя паўлышане, прынятыя ў адпаведныя класы і пакоі інтэрната, адразу ж уключыліся ў жыццё школы: хадзілі на ўрокі, выступалі на сумесных канцэртах самадзейнасці.

Гэта былі красавіцкія дні, вось чаму самымі хвалюючымі ўрокамі былі Ленінскія ўрокі, да якіх паўлышскія і кармянскія вучні і настаўнікі рыхтаваліся з асаблівым узрушэннем.

Жывы асяродак усіх такіх сустрэч у школе — музей У. І. Леніна, асаблівая гордасць кармянцаў. Бываючы ў Карме, Сухамлінскі захапляўся ленінскім музеем школы-інтэрната. Тут адбываецца прыём у камсамол, у піянеры, у акцябраты.

Незабыўныя хвіліны ў жыцці кожнага, яны душэўна ўзбагачаюць самымі высокімі пачуццямі ўсіх — ад першакласніка да сівога ветэрана.

## *Майстэрства выхавацеля*

Асаблівая ўвага ў гэтай школе да пачатковых класаў. Тут працуюць вопытныя педагогі С. П. Бодзілева, Ю. М. Любінская, М. Г. Мурашкова, якія ўсёй душою любяць выхаванцаў. Іх шматгадовы вопыт старанна збіраецца ў скарбонку творчых набыткаў педагагічнага май-

стэрства. Святлана Пятроўна Бодзілева вядзе багатую метадычную гаспадарку. Паўлышскія госці з вялікай цікавасцю знаёміліся з вопытам сваіх калег.

Як дбалыя гаспадары, кармянцы ашчадна, па крупінцы збіраюць усё, што памагае ўдасканаленню педагога, пашырае яго веды, культуру. Улічваецца кожная навінка, кніга. Калі ў бібліятэчнай картатэцы вы яе не знойдзеце, зазірніце яшчэ ў адзін цікавы даведнік — картатэку, у якой улічаны ўсе кнігі, што ёсць у асабістых бібліятэках настаўнікаў.

Цяжка сабе ўявіць настаўніка без бібліятэкі.

Асабістая бібліятэка Сухамлінскага налічвае 22 тысячы кніг. Кармянскія педагогі памятаюць яго добрую параду: калі дзеці павінны ў пяць-шэсць разоў болей чытаць, чым патрабуе праграма, дык настаўнік — у дзесяць разоў болей ведаць, чым сказана ў падручніках.

Арганізацыя вучэбнага працэсу ў малодшых класах не можа абысціся без багацця самых разнастайных наглядных дапаможнікаў. Тут заўсёды шырокае поле для творчай ініцыятывы, выдумкі, фантазіі не толькі настаўнікам, а і старэйшым вучням, якія ахвотна памагаюць малым.

І яшчэ адна, можа быць, самая плённая форма павышэння педагагічнага майстэрства, грамадзянскага і ідэйнага ўзроўню кожнага настаўніка і выхавацеля ўвайшла ў жыццё Кармянскай школы — гэта творчая справаздача.

Практыка яе падрыхтоўкі і правядзення актывізуе дзейнасць і творчую думку ўсяго калектыву. Да справаздачы рыхтуецца не толькі той, каго будзе слухаць педсавет, рыхтуюцца ўсе яго калегі: наведваюць урокі свайго таварыша, вывучаюць яго метадычны вопыт. Напярэдадні справаздачы наладжваецца выстаўка: рабочыя планы, канспекты ўрокаў, новыя дапаможнікі, пісьмовыя працы вучняў. Робячы справаздачу, педагог гаворыць і пра цяжкасці, недахопы, выказвае меркаванні, як іх пераадолець. На творчыя справаздачы запрашаюцца настаўнікі суседніх школ, бацькі вучняў.

Педагагічная спецыфіка школы-інтэрната вызначаецца ў першую чаргу майстэрствам выхавання. І калі для ўсіх агульнаадукацыйных школ разуменне «вучэбна-выхаваўчы працэс» успрымаецца як звыклае ўяўленне задачы, дык тут поспех навучання вырашае выхаванне, высокае майстэрства выхавання. «Нельга бесперапынна

толькі патрабаваць ад вучня, не спалучаючы патрабавальнасці з самым чулым клопатам і ўвагай да дзіцяці»,— гаворыць Дзмітрыеў, цвёрда ўпэўнены ў тым, што любоў да дзіцяці, вера ў яго здольнасці — зарука выхавання і поспеху нават тады, калі выхаванне здаецца безнадзейным. У гэтым сіла педагагічнага аптымізму.

Не утылітарная пісьменніцкая цікаўнасць у мяне да Міхаіла Апанасавіча Дзмітрыева. Калі б вабілі мяне толькі прыгоды і сюжэты, дык іх дастаткова ў кожнай школе. Наколькі мае змогі, я імкнуся далучыцца да ўсведамлення, што без настаўніка, без яго высокага служэння людзям не можа быць самага большага шчасця кожнага з нас — быць чалавекам.

Што да сюжэтаў, да прыгод, дык іх колькі хочаш у Кармянскай школе. Але тое, што можа прывабіць аматара дэтэктыўнай рамантыкі, дарагой цаной абыходзіцца школе.

Выхавацелі і педагогі ведаюць, якія трывожныя, небяспечныя вытокі жывяць усе незвычайныя, падчас драматычныя здарэнні, што адбываюцца тут, і як глыбока яны раняць, траўміруюць і дзіцячыя душы, і душы саміх выхавацеляў.

З дазволу Міхаіла Апанасавіча чытаю запісы ў яго дзённіку. Гэта рабочы, службовы дзённік, у якім ён запісвае наведванне ўрокаў, аналізуе стыль і метадычныя прыёмы кожнага настаўніка. Але часта бываюць хвіліны, калі пачуцці і перажыванні не ўціскаюцца ў форму службовай запатоўкі. Тады крычыць душа, і ў дзённіку з'яўляюцца такія запісы:

«У нашым інтэрнаце дзеці цяжкіх лёсаў. Паглядзіце ў вочы дзяцей, да якіх ніхто не прыходзіць і не прыйдзе,— і вы зразумееце, як нялёгка тут працаваць, але вы зразумееце — чаму мы працуем тут. Прыйшоў у 12 гадзін ночы дадому. Хіба можна так? І адчай нярэдка апаноўвае ўсю істоту. Разам з тым ёсць пратэст і нязгода з такім настроем: трэба! Інакш нельга! У імя тых, хто загінуў, у імя будучыні...»

У дзённіку запісаны гутаркі з некаторымі героямі крымінальнай рамантыкі, у якіх адзін закон: «Хто выдае, таму — нажа!» І яны падрабязна, з паэтызацыяй, з захапленнем расказваюць, як грабілі ў гомельскім парку, як абкрадалі магазіны і ларкі, дзе жылі, у якіх сховішчах складалі свае «скарбы».

...Перапыняю чытанне. Мне не церпіцца адразу ж даznацца: які іх лёс?

Міхаіл Апанасавіч не можа схаваць добрай усмешкі:

— Харошымі людзьмі сталі...— і называе мне мясціны, расказвае, дзе хто, як жывуць, якія ў іх сем'і і якія яму пісьмы пішуць.

Цяжкае, скалечанае маленства. Тады прычыны яго былі вядомыя — вайна. Але ж нямала душэўных траўмаў калечаць дзіцячыя душы і цяпер, у нашы дні. Якія іх прычыны, якая глеба нараджае драмы, псіхалагічныя зрывы і ўсе тыя трывожныя здарэнні, добра павінен ведаць выхавацель.

Аднак, якія б самыя розныя яны ні былі, гэтыя прычыны, сутнасць іх зводзіцца да таго ж назоўніка: сіроцтва, няхай ужо не ў простым сэнсе, але, можа быць, не менеі цяжкае.

Душэўная беспрытульнасць, сямейнае сіроцтва — яшчэ болей пакутлівыя, калі ёсць бацька ці маці, але якім ты не патрэбен, якія гатовы цябе забыць, аддаць у чужыя рукі... Што можа быць страшней для кволай, бездапаможнай і хваравіта-ўражлівай дзіцячай душы?

Хто ў школах-інтэрнатах найболей цяжкія? Душэўныя сіраты — дзеці, пачуцці якіх зняверапы бацькамі, сямейнымі драмамі і канфліктамі. Бацька завёў другую сям'ю, мае другіх дзяцей. Маці выйшла замуж, склалася новая сям'я. Куды прытуліцца, куды прыгарнуцца «нічыйнаму»? А дзіця прагне бацькоўскай, матчынай ласкі. Не маючы яе, шукае збліжэння са сваякамі, не знаходзячы, спадзяецца на давер і падтрымку першых сустрэчных, хто яму здаўся добрым.

Усе незвычайныя здарэнні ў школе-інтэрнаце ў большасці падобныя адно на адно. Галоўная форма пратэсту, бунту дзіцяці супраць сваіх крыўдзіцеляў — дарослых людзей, у сумленнасці, даверы і справядлівасці якіх яно расчаравалася,— гэта ўцёкі.

Куды ўцякаць — у хвіліны адчаю не задумваешся. Паддаешся адзінаму парыву: стаць вольным, незалежным, самастойным. Я — сам. Гэта і ёсць зярнятка чалавечай годнасці, якую кожны бароніць у сабе.

Я быў сведкам не ўцёкаў, а звароту. Адбываўся ён ціха і малапрыкметна. Чулы выхавацель з вопыту ведае: у такія хвіліны лепш зрабіць выгляд, што ўсё ідзе сваім парадкам. У тым, што ўцякач вернецца, ніхто і не сум-

няваўся. А сам уцякач наўрад ці думае, на якой грані напружання была школа ўвесь гэты час.

Толькі дзеці не маглі ўтрымацца, каб не прыбегчы да дырэктара і пацiху не паведаміць радаснай навіны:

— Валік вярнуўся!

...Зацятая замкнёнасць, душэўная зняверанасць Валіка ад крыўды, што ён нікому не патрэбны. Бацька кінуў, з'ехаў у Казахстан, у маці — новая сям'я, засталіся дзед з бабкай. Да іх уцёк Валік. Зімою начаваў у полі, у стозе сена. Можна сабе ўявіць, колькі за доўгую ноч перавярнулася ў яго душы горкай крыўды!

Я гаварыў з дзедам і бабкай. Яны ўжо на апошнім рубяжы паміж роспаччу і надзеяй. Упэўнена верыў адзін чалавек — дырэктар школы — і дамагаўся, каб паверылі і старыя, што іх унук стане добрым чалавекам.

Ёсць яшчэ ў нашым жыцці адна з'ява, вартая трывогі,— так званая маці-адзіночка. Не ў тым звыклым для нас уяўленні, што бярэ свой пачатак ад пасляваенных год, не маці-ўдава і салдатка, а з тых адзіночак, што маюць па пяцёра, сямёра, васьмёра дзяцей...

Калі наша пісьменніцкая брацiя была ў гасцях у адным славутым раёне, сакратар райкома партыі — жанчына, якая тонка адчувае гумар не толькі вясёлы, а і сумны,— расказала такую жыццёвую навелу.

Дзябёлая, у поўнай сіле маладзіца прыйшла прасіць дапамогі:

— Ой, сакратарка, ты ж сама жанчына, памажы майму гору.

— Што ж у цябе за гора, кабетка?

— Дзеці абселі — ратунку няма.

— Колькі ж іх у цябе?

— Ой, пяцёра. Хай бы старшыня калгаса выпісаў які мяшок пшаніцы — скажы яму, сакратарачка.

— Дык няўжо ж вы з мужам удваіх не можаце зарабіць на сваіх дзяцей?

— Ой, маўчы. Няма ж у мяне мужа. І не было.

— А дзеці ж чые?

— А хто іх ведае — усякія.

— Ну, добра, памагчы — памагу я тваім дзецям. Але ж і парады мае паслухайся: трымайся, кабетка.

— Я трымаюся,— запэўніла шматдзетная адзіночка.— Цяпер як толькі сцямнее, дык я дзверы — на зашчапку...

Да гэтай сумнай навелы дадам яшчэ філалагічны пастскрыптум.

Татаў-адзіночак няма, але ж па аналогіі з мамамі-адзіночкамі краўцы з мінскага атэлье «Цюльпан» зрабілі такі ўклад у сучасны лексікон: «Брюки-одиночки в пошив не принимаются». Бедныя «брюки», дасталося, нарэшце, і вам па заслугах, хоць вы заўсёды лічылі сябе парай...

Яшчэ не так даўно была вельмі папулярная песенька, у якой дзяўчына сумуе на танцах без кавалера, «потому что на десять девчонок по статистике девять ребят».

Дэмаграфічная лірыка становіцца, як бачыце, сумнай прозай. Можа быць, некалі кодэкс народнай маралі быў залішне жорсткі ў абыходжанні з маці-адзіночкамі, але ж і ў наш час няма ніякіх падстаў для апраўдання тых бесклапотных маладзіц, што не бяруць дзвярэй на зашчапку.

Якое маральнае права можа мець такая жанчына на выхаванне дзяцей? Гэтае пытанне я задаваў сам сабе і ў Карме, калі даведаўся, як такая вось «адзіночка» прыехала і ўпотай забрала са школы сваю старэйшую дзяўчынку, таму што няма каму няньчыць меншых!

Кінуліся наўздагон школьныя ганцы. Прыязджаюць і бачаць: сядзіць іх выхаванка ў запечку, поўным дзяцей — адно за адно меншае, а нястомная шукальніца прыгод з брыгадаю заезджых шафёраў ужо рыхтуецца ў чарговы рэйс па новае папаўненне запечка.

Якімі песенькамі парадуе нас падобнае выроўніванне дэмаграфічнага балансу: колькі «ребят» на колькі «девчонок»?

Татаў-адзіночак няма. Ёсць двухногія казлы, што з лёгкасцю незвычайнай скачуць з месца на месца, уцякаючы, хаваючыся, ратуючыся ад самай страшнай для іх пашпартнай адзнакі: тата.

Двухногія казлы заўсёды напагатове вербавацца і перасяляцца. Не ўпэўнены ў матэрыяльнай карысці такога «перасялення», я ўсё часцей і часцей пераконваюся ў маральнай шкодзе, якую яно нясе грамадству.

Сямейныя разлады, душэўнае сіроцтва і прычыны, што вымушаюць аддаваць дзяцей у школы-інтэрнаты,— вось якой цаной мы расплачваемся за легкадумнасць вандроўнага казлінага племені.

Дбаючы пра выхаванне «цяжкіх» дзяцей, трэба больш уважна бачыць і аблічча «лёгкіх» бацькоў, іх ваяўнічае маральнае браканьерства, іх безадказнасць перад грамадствам.

## *Новыя далягляды*

На карце Беларусі гэты гарадок мала чым прыкметны. Яго часта блытаюць з аднайменнай вёскай той жа вобласці. Не вельмі блізкія маршруты злучаюць яго з вялікімі дарогамі. Да чыгуначнай станцыі Рагачоў — 55 кіламетраў, да абласнога цэнтра Гомеля — 110. Але за апошнія гады ўсё болей і болей экскурсантаў, арганізаваных у групы і дэлегацыі, і не арганізаваных, а проста цікаўных людзей прыязджае сюды. Хто гэтыя цікаўныя людзі? Педагогі, выхавацелі.

Кармянская школа-інтэрнат патроху прывыкла да гэтага. Спачатку такая ўвага была прыемная, цяпер становіцца ўсё болей клопатная. Як ні дзіўна, але паломніцтва нават у настаўнікаў, як мы ўжо бачылі на прыкладзе школы Сухамлінскага, лічыцца самай актыўнай формай вывучэння вопыту.

Розныя паломнікі, розныя іх інтарэсы, залежныя ад праблем і пытанняў, якія займаюць увагу: кожны глядзіць са сваёй вышкі.

Я быў сведкам прыезду ў Карму дырэктараў школ цэлага раёна. Аб'ектам іх цікавасці была надзённая цяпер кабінетная сістэма навучання. Дзмітрыеў вадзіў гасцей па ўсіх кабінетах, абсталяваных тэхнічнымі прыладамі. Пасля грунтоўнай падрабязнай гаворкі дырэктары пачалі задаваць пытанні. Сярод мноства цікавых, звязаных з важнымі педагагічнымі праблемамі, былі і такія: колькі ў вас коней, машын, дзе дастаяце бензін, угнаенні?

Я сядзеў побач з прыезджым адміністратарам. Такое ўражанне, што гэтыя пытанні — самыя важныя для яго, галоўныя яго праблемы і клопат. Як я даведаўся пазней, школа яго, сапраўды, самая горшая ў раёне.

Выказваючы свае меркаванні пра кабінетную сістэму, прызнаюся, я збянтэжыў Міхаіла Апанасавіча перад гасцямі, перапытаўшы, ці ўсе кабінеты паказаў ім дырэктар.

— Усе! — пацвердзілі стомленыя госці.

А гаспадар здзіўлена паглядзеў у мой бок, чакаючы, якога вожыка я гатоў яму падкінуць.

— Не ўсе,— сказаў я рашуча.— Самага галоўнага кабінета вам не паказалі — кабінета дырэктара.

Усе задаволена засмяяліся: маўляў, у кожнага з нас ёсць свой, і ніякага асаблівага там вопыту не ўбачыш.

Сапраўды, ён — не клас, не лабараторыя, а, між іншым, ён найпершы кабінет, які павінен быць уключаны ў сістэму выхавання.

Кабінет дырэктара! Колькі пакаленняў вучняў змянялася, і для ўсіх ён — лобнае месца ў школе. Кабінетам дырэктара грозяць, палохаюць, і колькі маленькіх сэрцаў заходзяцца ад страху, калі дзіця павінна пераступіць яго парог!

Кабінета Дзмітрыева — прасторнага, утульнага, поўнага кніг і ўзораў дзіцячай творчасці,— не баіцца ніхто. Дзеці ідуць сюды ў любы час, калі ёсць патрэба і нават калі няма.

Я бачыў, як першакласнік, набегаўшыся па калідоры і не ведаючы, што яму рабіць далей, паціху прачыніў дзверы дырэктарскага кабінета, прасунуў галаву і доўга выглядаў, як дырэктар сядзіць за сталом, думае, піша.

Няўжо ён, дырэктар, не ведае, што ёсць на свеце цікавейшыя рэчы? Як далучыць яго да болей вясёлага занятку?

Хлопчык не ўтрымаўся і падаў радасны сігнал: гаў-гаў-гаў! Дырэктару было не да забавы, і ён сказаў:

— Коля, мне няма часу, пабяжы ў сад, туды ўсе пабеглі,— і, нібы апраўдваючыся перада мною, дадаў: — Дзеці ёсць дзеці...

Уявіце, што нарабіла б гэтае бяздумнае «гаў», якое б гэта было «чп» у любой іншай школе!

Дзеці ёсць дзеці — любімая прымаўка Дзмітрыева. Нездарма на пытанне, колькі ў яго дзяцей, Міхаіл Апанасавіч адказвае: шэсцьсот, хоць і добра разумее, што пытаюцца пра яго родных дзяцей. Для Дзмітрыева яны ўсе родныя. Толькі так, як ты любіш, як ты ацэньваеш учынкі сваіх дзяцей, толькі так ты павінен любіць і ацэньваць учынкі сваіх выхаванцаў, калі ты педагог. Я ўявіў сабе, як бы Міхаіл Апанасавіч абышоўся са сваім унукам Дзям'янкам, калі б той, прасунуўшы галаву ў кабінет, такім жа воклічам прывітаў дзеда, як сваволь-

нік-першакласнік. Што было б? Тое самае: калі б у яго быў вольны час, ён ахвотна пагуляў бы, пазабаўляўся б і з тым, і з другім, а калі няма, дык — выбачайце, хлопцы, гуляйце самі.

Прыгледзьцеся да выхаваўчага майстэрства гэтага выдатнага псіхолага. Ён ніколі не павышае голасу, ніколі не загадвае, ён — просіць. І любая яго просьба выконваецца з ахвотай.

Вучні старэйшых класаў паехалі на стрэльбішча, вечарам далажылі — усе адстраляліся выдатна, занялі першае месца ў міжраённым спаборніцтве. Прыемна дырэктару, але ўстрывожыла адна дробязь. Таго ж вечара на калідоры пачуліся прарэзлівыя свісткі. Міхаіл Апанасавіч адразу вызначыў прычыну іх з'яўлення: хлопцы свісталі ў пустыя патроны, што прывезлі як трафеі сваёй перамогі.

Усіх, хто ездзіў на стрэльбішча, дырэктар сабраў у сваім кабінеце.

— Хлопцы,— сказаў ён,— вы ведаеце, што ў школе ў нас зарок — не свістаць. Але той, хто свіснуў, для мяне — не страшны злачынец, я нават не хачу ведаць, хто свістаў. Мяне ўстрывожыла іншае, што можа здарыцца.

Хлопцы насцярожыліся: што ж можа здарыцца?

— А раптам малодшым вашым сябрам, каму трапіў у рукі такі патрончык, захочацца змайстраваць сабе самапал? Хто можа паручыцца, што нехта не застанецца без вока?

Ніхто не мог паручыцца, хаця і запэўнівалі, што нікому не раздавалі сваіх трафеяў. Але згадзіліся: кожны прынясе свае дзесяць адстрэленых гільзаў. Назаўтра раніцай усе пустыя патроны ў абоймах стаялі на дырэктарскім стале.

У пасляваенных падлеткаў было асаблівае захапленне вырабам саматужнага ўзбраення. Не мінула гэтае захапленне, вядома, і школу-інтэрнат. Канструктары ўласных агнястрэльных сістэм не задаволіліся тым, што прыдумалі, трэба ж было яшчэ праверыць іх баявую дзейнасць. І вось адпае ночы на школьным дзядзінцы бабахнулі стрэлы. Раніцай з'явілася міліцыя. Следства было нескладанае. Самапалы знайшліся адразу ж як рэчавыя доказы. «Не спяшайцеся,— сказаў дырэктар.— Я вам пакажу болей цікавыя рэчы». І, узяўшы ўсю саматужную баявую прадукцыю ў ахапак, павёў міліцыянераў у ка-

цельную. Строгія міліцэйскія хлопцы, відаць, спадзяваліся, што ўбачаць новыя арсеналы.

Падышлі да топкі, і дырэктар з усяго маху шпурнуў «рэчавыя доказы» ў полымя. «На гэтым, хлопчыкі, і скончым «аперацыю»,— сказаў ён, ўратаваўшы дзяцей ад вялікіх непрыемнасцей. Ніхто, як яны, самі дзеці, не разабраўся так дасканала, у чым іх віна і хто ім дапамог зразумець свой учынак.

Заадно раскажу, адкуль у школе зарок — не свістаць. Цяжка, ой як цяжка абысціся без такой хлапечай заліхвацкасці. Але што паробіш: дагавор ёсць дагавор — толькі не ў школе.

Аднаго разу ён сабраў усіх свістуноў, вывеў у сад і ля старой разгалістай грушы абвясціў: «Давайце, хто каго перасвішча!»

У спаборніцтве ўдзельнічалі найлепшыя школьныя салаўі, але першае месца заняў... дырэктар!

Памятная алімпіяда свістуноў пад грушаю не толькі ўвайшла ў гісторыю школы, яна стала яшчэ і добрым правілам: калі чалавеку прыспічыць абавязкова высвістацца, ён ведае, куды бегчы.

Пад грушу! — гэта ўжо як пароль, зразумелы кожнаму, у каго часам збіраецца шмат лішняе энергіі, якую не ведаеш куды дзець.

Старая груша, якая многа бачыла на сваім вяку, рада добраму таварыству. Аб яе шурпатыя галіны падраў штаны не адзін няўрымслівы гарэзнік, у якога заўсёды хапае натхнення і спрыту залезці на яе верхавіну. Груша не крыўдзіцца. Яна любіць дзяцей, кожнае восені прыносіць шчодры ўраджай.

Так дырэктар знаходзіць агульную мову не толькі з дзецьмі, а, як бачыце, і з дрэвамі — з кожным дрэвам у сваім вялікім садзе. І дрэвы памагаюць выхаванню. Вось перад школай — яблыня Сухамлінскага. Запаветная мясціна, дарагі куток кожнаму. А вось — парк Славы, пасаджаны рукамі дзяцей. Вучні з настаўнікамі сабралі звесткі пра кармянцаў, якія аддалі сваё жыццё за наша шчасце. На ўшанаванне памяці пра кожнага пасаджана дрэва — болей трохсот дрэў. Паводле свайго праекта пабудавалі помнік. Спіс герояў запаяны ў металічную капсулу і навечна захаваны пад гэтым помнікам.

Новы навучальны год пачынаецца ў парку Славы.

Сюды сыходзяцца родныя і блізкія загінуўшых. Кожны ведае дрэва, пасаджанае на ўшанаванне памяці сына, бацькі, дзеда. Юная змена дае клятву быць падобнымі на тых, хто да канца быў верны Радзіме, хто аддаў за яе жыццё.

Вакол школы стаяць стогадовыя ліпы, вартуючы межы дзіцячай дзяржавы, што жыве па законах людской дабраты, душэўнага даверу і клопату аб шчасці кожнага свайго грамадзяніна,— усё гэта таксама класы навучання і выхавання.

Кожная драбніца мае сэнс. З малых, самых нязначных, на першы пагляд, прыступак складаюцца лесвіцы, падымаючыся па якіх дзіця шырэй бачыць радасць свайго жыцця ад таго, што яго акружаюць бацькоўская ўвага, матчына ласка і заўсёдны клопат.

Ну хто б мог падумаць, парупіцца пра такую, зусім ужо, здавалася б, дзіцячую забаву, як гульня ў класы,— тыя ўсім вядомыя дзесяць клетак, якія малююць дзеці, асабліва дзяўчаткі, скачучы на адной ножцы з класа ў клас і з такой радасцю абвяшчаючы перамогу, калі каму ўдаецца адразу «скончыць» усю школу.

Але вы заўважылі, напэўна, што хутчэй праскакаць дзесяць класаў, чым намаляваць іх. Ступіўшы на двор Кармянскай школы-інтэрната, кожны, хто мае цікаўнае вока, не можа не ўбачыць, што перад самым ганкам на асфальце белай фарбай добрая, клапатлівая рука намалявала любімую дзіцячую гульню ва ўсіх яе варыянтах — прыгожа і так трывала, што ніхто не сатрэ. Перад школай, у якой трэба вучыцца дзесяць гадоў, паявіліся вясёлыя класы, якія лёгка і радасна праскакаць за адну перапенку.

Усё ўваходзіць у сістэму выхавання, бо гэта асаблівая школа. Яе прызначэнне ў тым, каб дзецям, зняверанным грубасцю, безуважнасцю, чэрствасцю дарослых, вярнуць маленства, стварыць атмасферу сямейнага асяроддзя. Тут выхавацель і настаўніца — бацька і маці, вучні старэйшых класаў — браты і сёстры малодшым.

...Алег прыйшоў у бібліятэку з бруднымі рукамі. Дырэктар убачыў, ласкава ўзяў рукі хлопчыка ў свае, доўга аглядаў і сказаў:

— Бяжы, Алежка, скажы, каб памылі табе рукі — цёплай вадой з мылам, а заўтра, як будзеш ісці ў школу, пакажаш, ці добра адмыліся.

Хлопчык паабяцаў: усё зробіць як след.

— А якой вадой будзеш мыць? — перапытаў Міхаіл Апанасавіч.

— Гарачай! — гукнуў у парозе Алежка. Раніцай, убегшы ў кабінет дырэктара, ён моўчкі выставіў рукі. Яны былі чыстыя.

Той, хто не ведае такога абыходжання з дзецьмі, наўрад ці зразумее, чаго яны бягуць у кабінет дырэктара: адзін паказвае самастойна прышыты гузік, другі — адпрасаваны гальштук, трэці — зацыраваныя штаны.

Дзіву дасися трапнасці яго вока. Ён не абміне ўвагай ніводнага свайго выхаванца.

— Табе так падабаецца хадзіць? — пытаецца дырэктар з вясёлай усмешкай у старшакласніка, кашуля якога расшпілена наросхрыст так, што відаць уся грудзіна. Здаровы дзяцюк з кучаравай чупрынай злёгку бянтэжыцца і захінае рукою каўнер.— Не, я не супраць. Калі ласка, хадзі сабе так...— як бы вінавата дадае Міхаіл Апанасавіч.— Я толькі хацеў даведацца, ці падабаецца табе самому.

Праз якую хвіліну прысаромлены юнак, ужо зашпілены і падцягнуты, абавязкова пастараецца зноў трапіць на вочы. Яны абмяняюцца толькі позіркамі, і дырэктар яшчэ раз упэўніцца, што выхоўваць можна і без ушчування. Дастаткова добрай усмешкі і бяскрыўднага жарту.

Бываючы ў школе, ніколі не абміну добрай нагоды пабачыць, паслухаць, як ён вядзе ўрокі гісторыі. Методыка яго самая разнастайная: адзін урок не падобны на другі. Але найбольш любімая форма ўрока — дыялог, спрэчка, эмацыянальная ўзрушанасць кожнага, актыўнасць усяго класа. Міхаіл Апанасавіч пахаджае між партаў, і добрая ўсмешка гаворыць: я задаволены вамі.

Настаўнік радуецца: ён збірае ўраджай з тых зярнят, якія пасеяў у добрую глебу.

Мне няма неабходнасці падрабязна расказваць пра педагагічнае майстэрства Дзмітрыева. Наўрад ці лепш я скажу, чым сказаў В. А. Сухамлінскі ў кнізе, якая выйшла ў 1973 годзе пад назвай «Разговор с молодым директором школы»:

«Я ведаю дзесяткі цудоўных майстроў педагагічнай працы з розных куткоў Савецкага Саюза, і найважнейшай рысай іх майстэрства з'яўляецца самавыяўленне, самараскрыццё духоўнага багацця перад вучнямі. Некалькі

год сябруем мы з дырэктарам Кармянскай школы-інтэрната Гомельскай вобласці Міхаілам Апанасавічам Дзмітрыевым. Ён некалькі разоў бываў у гасцях у нас у школе, я бываў у Карме. Гэта цудоўны педагог; сакрэт яго майстэрства заключаецца ў тым, што, слухаючы яго ўрокі, дзеці адчуваюць незвычайнае багацце чалавека. Ён захапляе дзяцей багаццем думак. Выкладаючы гісторыю, ён чытае на памяць цэлыя старонкі дакументаў. Выдатнай асаблівасцю ўрокаў гэтага майстра з'яўляецца ўменне знайсці яркую, выразную, захапляючую форму для выяўлення ідэі».

## *Гары, разгарайся, шчодры агеньчык*

Камуна, інтэрнат, дзіцячы калгас, політэхнічная, агульнаадукацыйная, з англійскай, з французскай мовай, з матэматычным, з фізічным ухілам, узорная, паказальная, эксперыментальная... Якая разнастайная, якая багатая ты, наша школа! Але мы хочам, каб ты стала яшчэ лепшая, яшчэ болей дасканалая.

У адным не цешу сябе ілюзіяй, што гарантыя тваёй дасканаласці ў тым, каб педагога замянілі машыны.

З трывогай услухоўваюся ў бесклапотны аптымізм, з якім так лёгка вырашаюцца педагагічныя праблемы.

Праграмаванае навучанне, кабінетная сістэма, тэхнічныя сродкі — усё гэта, безумоўна, уваходзіць у вучэбны працэс. Без сучасных дасягненняў не можа абысціся школа.

Але ж нельга ідэалізаваць ролю тэхнікі, ператвараць навучанне ў канвеер, таму што самая адказная задача школы ёсць выхаванне: працоўнае, маральнае, этычнае, эмацыянальнае, эстэтычнае, фарміраванне духоўна багатай чалавечай асобы.

У Карму едуць глядзець, як школа ўдасканальвае вучэбны працэс. Тэхнічныя сродкі — іх тут дастаткова: тэлевізары, кінапраектары, эпідыяскопы, фільмаскопы, магнітафоны, ёсць вялікая фільматэка і фанатэка. Але самае прыемнае, што ўся гэтая вучэбная індустрыя не засланіла сабой педагога, што яна ў яго руках — толькі добры дапаможнік.

Самае горшае, калі тэхніку разумеюць як моду: глядзіце — і мы не адсталі ад прагрэсу.

У школе-інтэрнаце ёсць свой радыёвузел, але я ні разу не чуў, каб ён без патрэбы падаў свой голас, а калі і падае, дык чуе толькі адна школа. Затое сусед школы — старажытны, яшчэ мінулага стагоддзя, спіртзаводзік — так удасканаліў магутнасць свайго голасу, што чуваць на ўвесь райцэнтр:

— Таварыш Белы, вас выклікае дырэктар!

Пра тое, што таварыша Белага, свайго галоўнага інжынера, выклікае дырэктар, павінна ведаць усё насельніцтва горада. Дзеля гэтага пасярод заводскага двара на высачэзным слупе ўмацавана магутная труба.

Як бачыце, нават пры дзедаўскай тэхніцы, што вырабляе не такую ўжо прагрэсіўную прадукцыю, таксама можна быць на ўзроўні тэхнічнага прагрэсу...

Найпершая ўмова ўдасканалення школы — настаўнік, выхавацель. Вось хто павінен стаць у асяродку ўсёй нашай увагі — асоба педагога, яркая, таленавітая, з высокай культурай інтэлекту, з яснымі і цвёрдымі ідэйнымі перакананнямі, з гатоўнасцю пайсці на подзвіг у імя гэтых перакананняў.

Камсамол, моладзь могуць болей шчодра вылучаць са свайго асяроддзя самыя лепшыя, самыя здольныя сілы на авалоданне прафесіяй настаўніка, пачэснейшай і адказнейшай за якую няма ў нашым грамадстве.

З усіх вялікіх будоўляў, якія вядзе камсамол, найвялікшай павінна стаць тая, што рыхтуе сапраўдных майстроў выхавання новага чалавека.

Будучага педагога трэба рыхтаваць загадзя, яшчэ ў сценах школы. Заслугоўвае пахвалы і самай актыўнай падтрымкі ініцыятыва Гродзенскага педінстытута, які стварыў завочны факультэт будучага настаўніка. Інстытут вядзе папярэднюю падрыхтоўку вучняў 9-х і 10-х класаў, якія выявілі найбольшыя педагагічныя здольнасці.

Як бы мы ні клапаціліся пра матэрыяльна-тэхнічную базу, гісторыя, традыцыі, аблічча, характар, жывая душа кожнай школы творацца калектывам тых, хто ў ёй працуе і вучыцца.

Не магу забыць, як камсамольцы Кармянскай школы-інтэрната сабраліся на адну са сваіх вячэрніх гутарак. Яна называлася «Камуністы планеты». Доўга вучні рыхтаваліся да свайго «Агеньчыка»: збіралі матэрыялы, фатаграфіі, вучылі вершы. Гаворка ішла пра надзённыя

падзеі на планеце, пра палымяных барацьбітоў за мір — камуністаў, пра будучыню.

Рэальным вобразам гэтай будучыні былі пачэсныя госці вечара — хлопчык і дзяўчынка, акцябраты. Заключнае слова належала ім. Але яны яшчэ не маглі выказаць сваіх пачуццяў словамі. Дзеці выйшлі на сярэдзіну залы і крэйдай на падлозе пачалі маляваць сонца — кожны сваё. У хлопчыка яно было вялізнае, з размашыстымі, імклівымі прамянямі, якія разыходзіліся далёка і асвятлялі ўсіх нас, у дзяўчынкі яно было маленькае, лагоднае і добрае. У яго не было прамянёў, затое яно глядзела на нас шчыра, даверліва і — шчасліва ўсміхалася.

Я люблю многія нашы школы і езджу туды, як вучань, які толькі-толькі далучаецца да навукі па імені Педагогіка, і, можа быць, мой неспакой, мае трывогі і думкі, якімі я жыву, у нейкай ступені спатрэбяцца людзям, болей дасведчаным у справе выхавання нашага сучасніка.

У кожнай школе складаецца свая казка.

У кожнай школе гарыць свой агеньчык.

Да пабачэння, да новых сустрэч, мае дарагія!

*1974*

# „Сэрца аддаю дзецям“

Загадзя скажу, што кнігу з такой назвай, кнігу, аб якой пойдзе гаворка, нялёгка знайсці ў продажы. Яна разышлася ў першыя ж дні свайго паяўлення ў кнігарнях і кіёсках. Шчыра падзяляю радасць тых, хто мае гэтую кнігу, хто валодае бясцэнным скарбам, у які ўкладзена жывое, шчодрае сэрца, поўнае любові да дзяцей, да таго дзівоснага казачнага свету, імя якому — маленства.

Кнігу напісаў настаўнік. Пісалася яна адчасна са смелым, наватарскім эксперыментам, з творчым пошукам новых магчымасцей у савецкай педагогіцы, якой Васіль Аляксандравіч Сухамлінскі аддае ўсе свае сілы і талент.

Пасля дзесяці год педагагічнай працы В. А. Сухамлінскі быў прызначаны дырэктарам сярэдняй школы ў сяле Паўлыш Кіраваградскай вобласці. Гэта было неўзабаве пасля вайны. Але ўжо з першых дзён сваёй новай пасады Сухамлінскі прыходзіць да цвёрдага перакanання, што быць настаўнікам настаўнікаў, вучыць іншых, як выхоўваць дзяцей, а самому не быць з дзецьмі — гэта значыць перастаць быць выхавацелем.

«Я зайздросціў класным кіраўнікам,— прызнаецца Сухамлінскі,— яны заўсёды з дзецьмі».

Сапраўдная духоўная еднасць там, дзе настаўнік становіцца сябрам дзіцяці. Такая блізкасць нясе асалоду і радасць у працы. Жывая, непасрэдная сувязь з дзецьмі — вось крыніца думак, назіранняў, адкрыццяў, радасцяў і засмучэнняў, без якіх няма творчае педагогікі.

«Чалавек, які сустракаецца з вучнямі толькі на ўроку, па адзін бок настаўніцкага стала,— не ведае дзіцячай душы, а хто не ведае дзіцяці, той не можа быць выхавацелем».

Сутнасць кіраўніцтва сучаснай школай, гаворыць Сухамлінскі, заключаецца ў тым, каб у практыку нашай педагогікі ўваходзіў найлепшы вопыт, самыя перадавыя педагагічныя ідэі. І той, хто з'яўляецца творцам гэтага

вопыту, чыя праца становіцца ўзорам для іншых выхавацеляў,— той і павінен быць душой школы.

Без такога дырэктара — найлепшага выхавацеля — нельга ўявіць сабе ў нашы дні савецкую школу.

Дырэктар Сухамлінскі робіць вывад, што ён не зможа кіраваць школай, калі сам не будзе выхавацелем.

Восенню 1951 года за тры тыдні да заняткаў, адначасна з прыёмам у першы клас, ён бярэ на ўлік хлопчыкаў і дзяўчатак, якія пойдуць у школу праз год, і адкрывае побач са звычайнай сярэдняй сваю незвычайную пачатковую школу.

Шаснаццаць хлопчыкаў і пятнаццаць дзяўчатак прыходзяць на заняткі. Але настаўнік не садзіць іх за парты, ён вядзе сваіх вучняў у школьны сад, на калгасны агарод, на пасеку, у поле, у лес. Дзеці прырастаюць душой да свайго настаўніка. Яны ходзяць разам з ім у падарожжы, сустракаюць усход сонца, слухаюць птушак, шум лесу, малююць, спяваюць. Але гэта не толькі гульні і забавы. Гэта вытокі, адкуль пачынаецца пазнанне хараства свету. Няхай дзіця ўбачыць, адкрые для сябе родныя вобразы прыроды, сваёй зямлі — тады ў яго сэрца і памяць назаўсёды ўвойдзе і вобраз Радзімы. Рана разгортваць буквар, калі дзіця не адчула яшчэ жывых вытокаў слова.

Так узнікае школа, якую ў сяле назвалі «Школай радасці». З першых дзён В. А. Сухамлінскі адкрывае ў ёй дзецям жыватворныя крыніцы роднай мовы. Слова ў яго становіцца цудадзейным ключом, якім можна адамкнуць усе таямніцы жыцця. Адкрыццё слова ў лузе, у полі, пад блакітным небам, на беразе рэчкі з'яўляецца першым штуршком да творчасці саміх дзяцей. У іх узнікае патрэба перадаць свае пачуцці і перажыванні, расказаць аб прыгажосці ўбачанага: мысленне пачынаецца са здзіўлення.

І вось дзеці, якія яшчэ не ўмеюць ні чытаць, ні пісаць, складаюць апавяданні, вершы, казкі. Цэлы альбом пад назваю «Наша роднае слова» сабраў Сухамлінскі з гэтых дзівосных паэтычных мініяцюр. Маленькія шэдэўры светлай, чыстай наіўнасці, шчырасці і непасрэднасці дзіцячай душы нельга чытаць без хвалявання. Гэта — узоры першароднай паэзіі.

У маленстве — кожны паэт, кожны мастак. Ніхто гэтак, як дзеці, не адчувае ўсёй казачнасці і маляўнічасці свету. Але творчасць становіцца духоўнай, эмацыянаць-

най патрэбаі дзяцей толькі тады, калі дарослыя ўмеюць адкрыць перад імі хараство жыцця, прыроды, хараство слова. Як любоў да музыкі нельга выхаваць без музыкі, гаворыць Сухамлінскі, так і любоў да паэтычнай творчасці не можа быць выхавана без творчасці, без адчування роднага слова.

Роднае слова! Калі, як не з самага малку, убірае чалавек у сваю памяць, у сваё сэрца ўсю тваю красу, мілагучнасць і чароўнасць! У самыя першыя гады жыцця ўражлівая душа дзіцяці спасцігае твае найтанчэйшыя адценні і фарбы.

Адчуванне дакладнасці слова, уменне карыстацца ім, культура мовы і нават пісьменнасць — усё гэта залежыць ад таго, як загучала слова, пачутае ў маленстве.

Мова — духоўнае багацце народа. Колькі я ведаю моў, столькі разоў я чалавек — гаворыць народная мудрасць. «Але багацце, увасобленае ў моўных скарбах іншых народаў, застаецца для чалавека недаступным, калі ён не авалодаў роднай мовай, не адчуў яе хараства. Чым глыбей чалавек пазнае тонкасці роднай мовы, чым танчэй яго адчуванне ігры адценняў роднага слова, тым болей падрыхтаваны яго розум да авалодання мовамі іншых народаў»,— піша В. А. Сухамлінскі.

Маленства — самы адказны момант жыцця, стартавая пляцоўка чалавека. І ад таго, хто вёў дзіця за руку, хто адкрыў яму навакольны свет, будзе залежаць яго ўзлёт, лёс, будучыня і шчасце.

Без душэўнай чуласці, без любові да дзіцяці не можа быць выхавання. Там, дзе няма разумення тонкасці людскіх адносін, вырастаюць бяздушныя, бессардэчныя людзі.

Маральнае аблічча асобы залежыць ад таго, якія крыніцы жывілі чалавека ў самыя раннія гады яго маленства.

Самая небяспечная педагогіка — бяздзетная, якая забывае галоўнае, што дзіця і ў школе застаецца дзіцем. Духоўнае жыццё дзіцяці паўнацэннае толькі тады, калі яно жыве ў свеце гульні, казкі, музыкі, фантазіі, творчасці.

Як часта нашы педагогі ўпэўненыя, што чым больш яны ўціснуць у галаву дзіцяці гатовых ісцін, гатовай інфармацыі, тым большая будзе паспяховасць. Кепскі настаўнік падносіць ісціну, харошы — вучыць яе знаходзіць.

Гэту простую мудрасць ніяк не могуць засвоіць настаўнікі, якія думаюць, што дзіця можна ператварыць у скарбонку лічбаў, правілаў, формул. Жывая памяць дзіцяці — не лічыльная машына! Перш за ўсё навучыце дзіця думаць, разважаць, абудзіце яго цікаўнасць. Не глушыце яго безліччу пытанняў. Будзьце больш уважнымі да таго, пра што ў вас пытаюцца вашы вучні. Таму што там, дзе ўзнікае пытанне, там нараджаецца думка. «Дайце дзіцяці падумаць!» — вось шчырыя парады В. Сухамлінскага, парады, якія праверaны яго шматгадовай практыкай настаўніка.

Пачатковая школа ў першую чаргу павінна навучыць вучыцца — такі галоўны вывад аўтара кнігі «Сэрца аддаю дзецям».

Прыход дзіцяці ў школу не павінен быць рэзкім пераломам у яго жыцці. Няхай новае, незвычайнае, невядомае паступова ўваходзіць у свядомасць, не збіваючы з тропу, не бянтэжачы мноствам нечаканых узрушэнняў.

Школа не адбірае маленства, а прадаўжае яго. У Сухамлінскага дзеці гуляюць з цацкамі да дзесяці гадоў. У Паўлышскай школе ёсць спецыяльны пакой лялек, ёсць «пакой казкі», ёсць «куток летуценняў», ёсць «пакой музыкі», ёсць «Кніга прыроды», якую пішуць дзеці. І самае цікавае, што ўжо з першага класа яны ж авалодваюць і сталымі працоўнымі навыкамі — сеюць на сваіх дзялянках пшаніцу, даглядаюць, жнуць, малоцяць, мелюць і пякуць свой хлеб, гадуюць цялят і ягнят, садзяць дрэвы і кветкі, майструюць складаныя мадэлі машын і ўсе да аднаго — і хлопчыкі, і дзяўчаткі — умеюць гуляць у шахматы!

У сваёй «Школе радасці» Сухамлінскі прыкладае ўсе намаганні, каб дзеці па-сапраўднаму адчулі шчасце маленства, і перш за ўсё тыя, хто не меў яго дома, у сям'і.

«Школа радасці» становіцца школай здароўя, фізічнай падрыхтоўкі. «Вопыт пераканаў мяне ў тым,— расказвае Васіль Аляксандравіч,— што галоўная прычына адставання ў вучобе — кепскае здароўе, хваравітасць або хвароба, часцей за ўсё скрытая, замаскаваная дзіцячай жвавасцю і гарэзнасцю. Я пераканаў бацькоў у тым, што чым больш яны будуць берагчы малышоў ад прастуды, тым слабейшыя будуць дзеці. Усе згадзіліся з маёй просьбай пасылаць дзяцей у гарачыя дні ў школу басымі — дзецям гэта была вялікая радасць».

Зімою настаўнік клапоціцца, каб яго вучні як мага болей былі на свежым паветры. З якой радасцю паведамляе Сухамлінскі, што ў трэцім і чацвёртым класах ніводзін з вучняў за ўсю зіму ні разу не прастудзіўся! Ён цікавіцца, які апетыт у яго выхаванцаў, ці ёсць усе патрэбныя вітаміны ў іх харчаванні, дае парады кожнай сям'і.

Улічваючы здабыткі папярэднікаў, дасягненні майстроў айчыннай і сусветнай педагагічнай думкі, Сухамлінскі ўмела чэрпае і з тых глыбінных крыніц, якія захоўваюць найбагацейшыя скарбы *народнай педагогікі.* Валодаючы яе вопытам, вучоны адчувае той цвёрды грунт, тую жыццёвую аснову, на якой могуць быць дасягнуты яшчэ многія надзейныя сродкі ўдасканалення педагагічнага майстэрства.

Самым выпрабаваным сродкам фарміравання чалавечай асобы, характару, глыбокай эмацыянальнай культуры В. А. Сухамлінскі лічыць працу. Праца становіцца вялікім выхавацелем, калі яна арганічна ўваходзіць у духоўнае жыццё дзіцяці, развівае цікаўнасць і дапытлівасць, выклікае радасць перамогі цяжкасцей, абуджае першае грамадзянскае пачуццё творцы матэрыяльных каштоўнасцей, без якіх немагчыма жыццё чалавека. Дзіця імкнецца працаваць таму, што праца нясе яму асалоду. У працы яно бачыць самасцвярджэнне сваёй годнасці. Не дзіва, што ў школе Сухамлінскага працоўныя заняткі завуць урокамі *любімай працы.*

Пачуццё чалавечай годнасці — першая іскрынка, якая запальвае ў душы дзіцяці агеньчык творчасці, і Сухамлінскі імкнецца, каб у яго школе не было ніводнага вучня, які не раскрыў бы сваёй індывідуальнасці, сваёй самабытнасці, не выявіў сваіх здольнасцей. А вытокі здольнасцей дзяцей — на кончыках іх пальцаў,— лічыць Сухамлінскі.— Чым больш майстэрства ў дзіцячай руцэ, тым разумнейшае, кемлівейшае дзіця. Фізічная праца цесна звязана з разумовым развіццём. І як гэта важна, калі ў самыя першыя гады жыцця дзіця сваімі рукамі, само ажыццяўляе сваю задуму, вызначае сабе задачу і здзяйсняе яе!

«Даць дзецям радасць працы, радасць поспеху ў навучанні, абудзіць у іх сэрцах пачуццё гордасці, асабістай годнасці — гэта першая запаведзь выхавання,— гаворыць Сухамлінскі.— У нашых школах не павінна быць няшчас-

ных дзяцей — дзяцей, душу якіх грызе думка, што яны ні на што не здатныя. Поспех у навучанні — адзіная крыніца ўнутраных сіл дзіцяці, што нараджаюць энергію для пераадолення цяжкасцей, жаданне вучыцца».

Сухамлінскаму ёсць чаму радавацца ў сваёй школе. Але, можа быць, самае выдатнае яго дасягненне — гэта тое, што ён ні разу не паставіў сваім вучням дрэннай адзнакі. Яго дзеці, скончыўшы «Школу радасці», прыйшлі ў пяты клас, не атрымаўшы ніводнай двойкі. Калі што не выходзіць у вучня, настаўнік наогул не ставіць яму адзнакі. Гэта і ёсць пэўная адзнака. Але дзіця не пакарана, не зняважана, яно будзе старацца, каб заслужыць добрую адзнаку.

Калі ацэнка ператвараецца ў бізун або ў салодкі пернік, якімі дарослыя падганяюць дзіця,— разбураецца сама аснова правільнага выхавання — вось якое заключэнне робіць аўтар кнігі.

Настаўнік для дзіцяці — увасабленне справядлівасці. Паглядзіце ў вочы першакласніку, якому вы паставілі нездавальняючую адзнаку. Дзіця не толькі адчувае няшчасце, але і ўпэўнена, што гэта найвялікшая несправядлівасць. Настаўнік, які паставіў двойку за тое, што вучань чагосьці не зразумеў, прычыніў дзіцячай душы глыбокую крыўду.

Сапраўды, нельга без жалю наглядаць, калі глушацца натуральныя пачуцці дзяцей, калі настаўнік бачыць выхаванне толькі ў тым, каб укласці як мага болей ведаў у іх галовы. З якім хваляваннем пераступае дзіця парог школы, як даверліва глядзіць у вочы свайму настаўніку! Але часта бывае так, што праз некалькі месяцаў, а то і тыдняў згасае агеньчык у яго вачах і многім вучэнне становіцца мучэннем.

Усе свае намаганні і клопаты і ўсе творчыя пошукі настаўніцкага калектыву дырэктар школы аб'яднаў, спалучыў з клопатамі і намаганнямі бацькоў сваіх выхаванцаў. Няма таго вучня, пра сям'ю якога, пра яго родных і блізкіх не ведаў бы настаўнік. У сем'ях, дзе да сэрца прымаюць радасць і гора не толькі сваіх, а і чужых дзяцей, вырастаюць людзі добрыя, чулыя і сардэчныя. Дзіця — гэта люстра духоўнага ўзроўню бацькоў, маральнай атмасферы ў сям'і.

Вось ужо дванаццаць гадоў засаб два разы на месяц прыходзяць у школу сяла Паўлыш бацькі, родныя і бліз-

кія, якія дбаюць аб шчасці сваіх дзяцей і вывучаюць з дапамогай настаўнікаў курс псіхалогіі і педагогікі.

— У працэсе работы,— расказвае Сухамлінскі,— я сустракаўся з многімі цяжкасцямі ў выхаванні дзіцячага калектыву і, каб пераадолець іх, дзяліўся думкамі, раіўся з вопытнымі педагогамі, настаўнікамі пачатковых класаў сваёй школы.

Так кіраўнік школы, набываючы свой вопыт, падсумоўваючы асабістыя вывады, бярэ на ўзбраенне найлепшыя здабыткі сваіх калег, так складаецца педагагічнае майстэрства ўсёй школы, дзе прызнаным аўтарытэтам становіцца педагог-наватар, педагог-вучоны, сапраўдны паэт сваёй працы, які найбольш глыбока здолеў асэнсаваць свае перакананні і знайсці выразную форму сваім канцэпцыям.

«Што самае галоўнае было ў маім жыцці?» — пытаецца сам у сябе Васіль Сухамлінскі. І дае вычарпальны адказ: «Любоў да дзяцей».

Чацвёрты дзесятак гадоў працуе бязвыезна ў сяле В. А. Сухамлінскі. Шмат кніг напісаў ён. Часта яго выступленні мы сустракаем у часопісах і газетах. І заўсёды яго слова нясе людзям радасць адкрыцця дзіцячай душы, вучыць высокаму майстэрству выхавання чалавека.

«Самым галоўным поспехам сваёй выхаваўчай работы,— гаворыць Сухамлінскі,— я лічу тое, што дзеці навучыліся адчуваць чалавека, блізка прымаць да сэрца яго радасці і засмучэнні, жыць сярод людзей, любіць сваю Радзіму і ненавідзець яе ворагаў».

Пра незвычайны вопыт, вопыт высакароднага, пачэснага і самаадданага служэння чалавеку расказвае гэтая кніга. У ёй мы ўбачылі, як клапатлівыя, чулыя і разумныя рукі ўводзяць будучага грамадзяніна краіны ў дзівосны свет пазнання, як памагаюць яму вучыцца, як абуджаюць у яго душы высокія пачуцці, як выхоўваюць чалавечую годнасць, веру ў людзей, бязмежную любоў да сваёй роднай савецкай зямлі, як засяваюць удзячную глебу дзіцячай уражлівай душы першымі зярнятамі вернасці і адданасці ўзвышаным камуністычным ідэалам.

Чытаючы «Сэрца аддаю дзецям», забываеш, што гэта навуковае даследаванне, а не мастацкі твор, захапляешся гулыбокім псіхалагічным пранікненнем у перажыванні і хваляванні яго маленькіх герояў, сам перажываеш і хва-

люешся за іх, засмучаешся іх засмучэннямі, радуешся іх радасцямі. Сапраўды, адкрыць свет маленства можа толькі той, хто здольны сам у поўным сэнсе стаць дзіцем.

Па меры таго як уваходзіш у жыццё, у падзеі, што адбываюцца ў «Школе радасці», усё болей і болей спазнаеш і чалавека, які стварыў гэтую школу.

Якое добрае сэрца, якая харошая душа ў гэтага чалавека, і ў той жа час — сіла волі, характару, упэўненасці ў сваіх перакананнях!

І якая асалода расказваць пра гэтую кнігу, радуючыся за перамогу Сухамлінскага, за яго школу!

*1969*

# *Настаўнік*

Пазнаёміліся мы з ім вясною 1969 года ў Кіеве. Пісьменнікі Украіны, педагогі, камсамольскія работнікі, мастакі і выдаўцы абмяркоўвалі праблемы выхавання пасля пастановы ЦК КПСС аб дзіцячай літаратуры.

Да гэтага я ведаў яго як аўтара бліскучых артыкулаў у цэнтральных газетах і часопісах — артыкулаў, якія заўсёды будзілі думку, стваралі такое ўражанне, што з табою гаворыць чалавек, які тонка і дасканала ведае свет дзіцячай душы, разумее ўсе цяжкасці і складанасці фарміравання асобы будучага грамадзяніна.

Яго выступленне на гэтай нарадзе ўразіла глыбінёй назіранняў, развага і вывадаў. Але акрамя таго, што перад намі выступаў педагог, псіхолаг, усе мы адчулі, што ён валодае талентам яркага, вобразнага бачання жыцця, людзей і асабліва характараў сваіх выхаванцаў. Неўзабаве гэта пацвердзілася яго кнігаю «Сэрца аддаю дзецям».

З гэтай сустрэчы пачалося наша сяброўства, перапіска і супрацоўніцтва. На старонках «Настаўніцкай газеты» я расказаў пра яго кнігу і пра тое ўзрушэнне, якое выклікала яна ў мяне, чытача.

Васіль Аляксандравіч з уласцівай яму чуласцю адгукнуўся адразу двума лістамі — мне і рэдакцыі. Пішучы да мяне, ён, вядома, яўна перабольшваў маю кампетэнцыю ў тонкасцях педагогікі, у лісце да рэдакцыі паведамляў, што газета набыла новага чытача.

Але ён стаў не толькі чытачом, а і актыўным аўтарам беларускіх газет і часопісаў. Нашы настаўнікі, моладзь, дзеці заўсёды з асаблівай цікавасцю сустракалі кожнае слова Сухамлінскага. Ужо стаўшы вядомым вучоным, прызнаным аўтарытэтам педагагічнай навукі, Васіль Аляксандравіч на старонках «Вясёлкі» ўпершыню выступае як аўтар цудоўных апавяданняў для самых юных чытачоў. Тонкае адчуванне паэзіі маленства, глыбокае пранікненне ў псіхалогію дзіцяці адразу ж выявілі ў ім талент дзіцячага пісьменніка.

Гэта была натуральная заканамернасць творчага развіцця яго багатай і чулай натуры.

Дасканала распрацаваўшы і абагульніўшы сваю практыку педагога, свае навуковыя перакананні ў многіх грунтоўных даследаваннях і асабліва ў кнізе «Сэрца аддаю дзецям», Васіль Сухамлінскі не мог не паспрабаваць сваіх сіл у мастацкай прозе, прынамсі, у нялёгкім жанры апавядання, прытчы і казкі для дзяцей.

У сваіх пісьмах ён неаднойчы давяраў мне сваё шчырае жаданне: «Каб у Беларусі была выдадзена хоць маленькая кніжачка маіх апавяданняў (тых, што Вы апублікавалі, і тых, што, магчыма, яшчэ апублікуеце)».

Памятаю, як ён радаваўся надрукаванню сваіх першых навел, ілюстраваных мастаком Алегам Луцэвічам. «Хлопчык, што выскачыў праз акно,— вельмі падобны на жывога, таго, што і цяпер дзівіць нас сваімі свавольствамі...» — пісаў ён мне.

Удалы пачатак быў такі плённы, што праз паўгода ў Васіля Аляксандравіча быў ужо гатовы рукапіс цэлай кнігі апавяданняў, якую ён прыслаў нам з чулым, сардэчным надпісам: «Гэтую кніжку аўтар прысвячае сябрам-беларусам».

Нямала жывых, трапяткіх пачуццяў сваёй душы, свайго роздуму ўклаў ён у кнігу «Блакітныя жураўлі».

Той, хто ведае «Сэрца аддаю дзецям», знаёмячыся з Сухамлінскім як з дзіцячым пісьменнікам, не можа не ўбачыць і не адчуць тых адпраўных этычных высноў, адкуль ішоў ён як педагог і якімі эстэтычнымі прынцыпамі кіруецца як мастак.

Жыццёвы матэрыял той жа, той жа абсяг назіранняў, роздуму і тыя ж вывады, але ўжо іншыя сродкі пазнання дзіцячай душы. Сухамлінскі-пісьменнік у самых разнастайных і падчас зусім нечаканых ракурсах шчыра і бескампрамісна даследуе псіхалогію маленства і вельмі часта ў сутыкненні, нават у канфлікце з псіхалогіяй дарослых, якія не заўсёды разумеюць логіку паводзін дзяцей.

Самае каштоўнае, што ўмеў бачыць у дзецях Сухамлінскі, і педагог і пісьменнік,— гэта тая чысціня даверу, тая дабрата і крыштальная сумленнасць, без якіх немагчыма выхаванне чалавека, грамадзяніна, патрыёта.

Аб'ектам мастацкага даследавання аўтар бярэ пераважна канкрэтныя жывыя характары дзяцей, якіх ён ведаў, вёў з класа ў клас, ашчадна фарміраваў іх натуры,

выхоўваў іх густы і жыццёвыя перакананні. У казках і прытчах Сухамлінскі бліскуча выкарыстоўвае найлепшыя традыцыі сваіх слаўных папярэднікаў — педагогаў і мысліцеляў Л. Талстога, К. Ушынскага. Тыя ж яго рэчы, у якіх пагляд аўтара скіраваны непасрэдна ў сваё маленства,— гэта, па сутнасці, вершы ў прозе, творы, вартыя найлепшых паэтычных анталогій.

Бязмежная любоў да дзяцей натхніла Васіля Сухамлінскага на жыццёвы і творчы подзвіг, які цяпер шырока вядомы не толькі педагогам, а ўсім, хто дбае аб выхаванні чалавека новага камуністычнага грамадства.

Высокае права вучыць, стаць любімым настаўнікам не аднаго пакалення людзей ён здабыў самаахвярнай любоўю патрыёта, воіна, камуніста.

Вера Сухамлінскага ў чалавека, у веліч, у хараство яго душы прайшла праз нечуваныя выпрабаванні.

Расказваючы нашым чытачам пра выдатнага педагога-наватара, пра яго кнігу «Сэрца аддаю дзецям», я тады яшчэ не ведаў і нават не здагадваўся пра тыя трагічныя акалічнасці яго біяграфіі, якіх сам Васіль Аляксандравіч, такі мужны і стрыманы чалавек, ні ў лістах, ні ў размовах пры сустрэчы, ні тым больш у сваіх творах ніколі не кранаўся.

Пра асабістую трагедыю яго жыцця я даведаўся з газеты «Правда», з рэцэнзіі В. Грышына на «Сэрца аддаю дзецям», якая дала кнізе самую высокую ацэнку. Пачаўшы чытаць, я абрадаваўся, што яшчэ і яшчэ мільёны людзей даведаюцца пра гэтага чалавека, пра яго высакародную, натхнёную працу. І раптам з апошніх радкоў артыкула даведваюся пра такую жахлівую падрабязнасць, якая, як выбліск маланкі, высвеціла мне дарагое, роднае, гордае і мужнае аблічча майго далёкага сябра. Глыбока ўзрушаны, я таго ж дня пішу яму: «Дарагі Васіль Аляксандравіч, знаю, што кранацца асабістага, самага балючага, нікому не дазволена, я і не адважваюся — хачу толькі даведацца, як склалася Ваша жыццё...» Праз два тыдні я атрымаў адказ:

«Дарагі дружа, у гэтыя дні вельмі, вельмі хвалююся, таму што лісты ад сяброў і ад усіх не вядомых мне людзей растрывожылі старую рану, якая ніколі, ніколі не загоіцца. Я прасіў В. Грышына не пісаць пра гэта (у часе прабывання ў нас ён даведаўся, бо не даведацца нельга, усе ведаюць), але ён сказаў, што напісаць трэба абавязкова.

Я пайшоў у армію на другі дзень вайны — яшчэ ніхто нічога яснага не мог ні ўявіць, ні прадбачыць. Ніколі не думаў, што да нас на Дняпро прыйдуць немцы. З Верай, маёй маладой жонкай (ёй быў 21 год, мне 23), мы расталіся, спадзеючыся на тое, што хутка вораг будзе разбіты і наша шчасце зноў будзе бясхмарнае. Але атрымалася не так. Прыйшлі немцы: разам з дзвюма сяброўкамі Вера (яна толькі што скончыла настаўніцкі інстытут) падбірала і распаўсюджвала лістоўкі, скінутыя з нашых самалётаў, потым дзяўчаты з Верай пачалі самі пісаць лістоўкі, заклікаючы моладзь не ехаць на катаргу ў Германію... Яны хавалі зброю, перадавалі яе нашым салдатам, памагалі пераапраўляцца цераз Дняпро.

Іх схапіла гестапа. Веру і дзвюх яе сяброўак страшэнна катавалі. Вера дачасна нарадзіла дзіця... Паліцэйскі (наш здраднік) ударыў яго галавой аб каменную сцяну, забіў, вынес і кінуў на сметнік, і там яно ляжала тры дні... А маці, пасівелая ад гора, глядзела ў акно... Потым ёй выкалалі вочы... Потым павесілі.

У мяне і цяпер кроў стыне ў жылах, калі я думаю пра гэта. Я ведаю, што такое любіць і што такое ненавідзець. Я тысячу разоў перакананы, што па-сапраўднаму ненавідзіць ворага той, хто пяшчотна любіць — дзяцей, прыгажосць, Чалавека. І калі, бывае, хто-небудзь павучае мяне, што вось у такой і такой маёй працы, маўляў, недастаткова глыбока выказана ідэя непрымірымасці да ворага, я з цяжкасцю стрымліваю гнеў.

Дарагі мой дружа, мая любоў да беларускага народа — гэта перш за ўсё разуменне, што такое гора. Наш украінскі народ таксама выцерпеў шмат пакут, але беларусы выпілі чашу гора яшчэ большую.

У мяне ёсць дзеці — усяго двое дзяцей, дачка і сын... Як хацелася мне, каб іх было дзесяць! Як я люблю, як люблю сваіх дзяцей, як даражу любоўю да мяне іх маці — маёй жонкі. Мы разам з ёю шануем памяць Веры...

Дарагі мой дружа, можа быць, гэтыя словы сказаны не гэтак, як трэба было б іх сказаць... але — мне цяпер вельмі цяжка. Я, прачытаўшы газету, сеў на лаўцы ў садзе і сядзеў гадзіны тры, да ночы. Пайшоў дадому і газету згубіў. Мінула некалькі дзён, ніяк не знайду хаця б адзін нумар газеты; калі зможаце, прышліце мне экземпляр «Праўды» за 9 красавіка 1970 г.».

Колькі ж трэба было мець душэўнай сілы, каб, перажыўшы ўсё гэта, не знямець, не счарсцвець сэрцам і каб сваю мужнасцьператварыць у сапраўдны подзвіг усяго жыцця ў імя вялікай любві да дзяцей, да чалавека, да яго шчасця!

Васіль Сухамлінскі, палітрук роты, франтавік, пасля цяжкіх раненняў вяртаецца ў сваё роднае сяло на Кіраваградчыне, паблізу Дняпра, і да апошняй хвіліны свайго жыцця працуе дырэктарам Паўлышскай сярэдняй школы.

Памёр Васіль Аляксандравіч знянацку, у самым росквіце творчых сіл, на самым высокім узлёце свайго яркага, самабытнага таленту.

Свой апошні артыкул — зварот да дзяцей напярэдадні новага навучальнага года — ён ужо не пісаў, а дыктаваў, лежачы ў бальнічным ложку. Першага верасня 1970 года яго «Слова да вучняў» было надрукавана ў газеце «Праўда», а назаўтра Васіля Сухамлінскага не стала. Ён пражыў толькі палову веку, але вялікі плён яго натхнёнай працы назаўсёды астанецца жывой спадчынай, што ўжо ўвайшла ў скарбніцу нашай айчыннай і сусветнай педагагічнай навукі. У адзін славуты рад яе прызнаных імёнаў — Коменскага, Ушынскага, Макаранкі, Корчака — па праву стала імя Васіля Сухамлінскага.

Яго пяру належыць каля чатырох дзесяткаў кніг, шмат артыкулаў па самых разнастайных праблемах навучання і выхавання. Творчы энтузіязм гэтага чалавека, яго кіпучая дзейнасць былі незвычайныя: дырэктар школы, настаўнік у першым класе, выкладчык мовы і літаратуры, член-карэспандэнт Акадэміі педагагічных навук СССР, кіраўнік семінара псіхалогіі і педагогікі для бацькоў у сваёй школе, ён вёў няспынную перапіску з сотнямі калег, вучоных, пісьменнікаў, чытачоў не толькі Савецкага Саюза, але і многіх краін свету.

Кожным сваім словам, кожным радком, звернутым да дзяцей, да бацькоў, да настаўнікаў, ён самаадданa ўслаўляе дарагі яму ідэал чалавека новага грамадства — чалавека высокай маральнай чысціні, адданага сваёй Радзіме, працавітага, крышталька сумленнага, добрага, чулага да ўсяго ўзвышанага і прыгожага ў жыцці і непрымірымага да душэўнай глухаты, абыякавасці, самазадаволенасці і эгаізму. Такімі ён хацеў бачыць сваіх вучняў. Такімі ён іх выхоўваў.

У маляўнічым старадаўнім сяле Паўлыш паміж густых акацый, груш, яблынь і мноства кветак, насаджаных яго рукамі, як пчаліны вулей, гудзе яго школа. Старэнькая вясковая мураванка, яна стала «Школай радасці», як назвалі яе ў народзе.

Выдатная праца Сухамлінскага «Сэрца аддаю дзецям», у якой абагульнены вопыт педагога-наватара,— гэта сапраўды яго песня песняў. Яна зрабілася ўжо настольнай кнігай усіх, хто знайшоў сваё прызванне ў выхаванні новага пакалення.

Ніхто не ствараў адмысловых умоў настаўніку Сухамлінскаму і яго школе. Высакародны подзвіг гэтага чалавека яшчэ раз гаворыць нам, што вялікае права і шчасце быць настаўнікам людзей здабываецца толькі вялікай любоўю да свайго народа, да сваёй Радзімы.

Сапраўды, толькі вялікая любоў патрыёта магла натхніць гэтага нястомнага, няўрымслівага шукальніка на такую нялёгкую, штодзённую, здавалася б, малапрыкметную працу, калі звычайная сельская школа на геаграфічнай карце нашай сучаснай педагогікі ператварылася ў такі навуковы асяродак, да якога скіроўваюцца зацікаўленыя позіркі не толькі тэарэтыкаў і практыкаў савецкай школы, але і педагогаў многіх краін свету.

Сухамлінскага засыпалі пісьмамі румыны, чэхі, палякі. Яго артыкулы з нашай прэсы перадрукоўвалі ў Італіі, Японіі, Індыі, Бразіліі. Яго педагагічныя вывады зацікавілі французаў, англічан, іспанцаў, партугальцаў, арабаў.

Як толькі «Сэрца аддаю дзецям» выйшла ў свет у 1969 годзе, яно было перакладзена на многія мовы.

З нашай рэспублікай у яго былі самыя блізкія сувязі.

«З Беларусі нам прыслалі сёе-тое пра Хатынь,— пісаў ён мне.— Чытаем у кожным класе. Хочам, каб дзеці не толькі ведалі ўсё гэта. Трэба, каб попел пакутнікаў грукаў у дзіцячыя сэрцы...»

Вучні яго школы сябруюць з вучнямі беларускіх школ. Сам Васіль Аляксандравіч быў знаёмы з многімі нашымі настаўнікамі, сябраваў, перапісваўся, абменьваўся кнігамі з Аркадзем Куляшовым, Янкам Брылём.

З многіх яго лістоў асабіста да мяне не магу не згадаць некалькіх радкоў, якія выказваюць думкі і пачуцці, што асабліва рупілі Сухамлінскаму — педагогу, грамадзяніну, патрыёту:

«З вялікім хваляваннем прачытаў Ваш сардэчны ліст.

Дзякуй, шчырае дзякуй за цёплыя словы пра маю сціплую працу. Я заўсёды з прыемнасцю прыгадваю нашы сустрэчы. Дужа дзякую за кнігі. У нас у школе ёсць «Пакой думкі». Гэта своеасаблівая чытальня. Сюды прыходзяць дзеці і падлеткі, каб памарыць, падумаць над кнігаю. Прага думкі — вось самае галоўнае, што, здаецца мне, трэба нам выхоўваць у маладога пакалення. Бо маем пагрозу таго, што сярод патоку інфармацыі, сярод скавытання транзістараў і мігцення кіно і тэлеэкрана жыве ён, чалавек, часам бяздумна і духоўна бедна. А яшчэ большая бяда, што не толькі часам, а часта. Маю за абавязак свой напісаць артыкул (а потым і кнігу) пра духоўнае жыццё чалавека.

У «Пакоі думкі» на пачэсным месцы — творы беларускіх пісьменнікаў.

У мяне такое перакананне: кожны з нас — украінцаў, беларусаў, рускіх — мусіць валодаць (прынамсі, чытаць) хоць бы чатырма нашымі славянскімі мовамі (а то і пяццю, шасцю). Без гэтага мы будзем духоўна збеднены. Я чытаю свабодна па-беларуску і не толькі разумею, а і адчуваю ўсе сэнсавыя і эмацыянальныя адценні слова.

Лічу, што кожная з нашых славянскіх моў нясе сваю непаўторную духоўную стыхію, і як бы — не дай бог — хоць адна з нашых моў памерла, страту, ні з чым не параўнаную, панеслі б мы ўсе...»

Такі быў і застаецца ў сваіх вучнях, у сваіх кнігах, у сваіх запаветах настаўнік Сухамлінскі, знаёмства з якім я лічу сваім вялікім шчасцем.

І хоць кароткае было наша сяброўства, але яно ўзбагаціла мяне такімі радасцямі, якія я адчуў упершыню ў жыцці.

Дзякуючы далучэнню да яго жыватворчых думак і пачуццяў я адчуў, што падняўся на нейкую вышэйшую ступеньку, адкуль значна шырэй відзён свет.

Так я набыў настаўніка, хоць і маладзейшага за сябе, але які адкрыў мне радасць пазнання адвечнай маладосці і шчасця маленства, за якія мы павінны ісці на самы высокі подзвіг.

*1971*

# *Выхаванне словам*

З усіх сродкаў выхавання, якія ёсць у нас, у людзей, самым выпрабаваным і надзейным было і будзе слова.

Нельга не ўстрывожыцца тым, што наша школа, узбройваючыся тэхнічна, пасняхова засвойваючы самую сучасную інфармацыю, як гэта не прыкра, зніжае свой галоўны паказчык — пісьменнасць. Сведчанне гэтаму — экзамены пры паступленні ў ВНУ, калі большасць выпускнікоў школ сярод усіх, часта высокіх, ацэнак самую ніжэйшую атрымлівае па пісьме, па літаратуры, па мове.

А хто ж, як не школа, адзіная і галоўная ўстанова, па абавязку ўсенароднай сярэдняй адукацыі павінна навучыць кожнага свайго выхаванца не толькі пісьменнасці, але і абавязкова даць яму трывалыя асновы эстэтычнай культуры, развіць слых і густ да слова, каб потым, кім бы чалавек ні стаў, якую б спецыяльнасць ні выбраў, у ім жыла патрэба няспыннага духоўнага ўзбагачэння?

Няшчасны на ўсё жыццё той чалавек, якому не трапіўся настаўнік, які адкрыў бы яму радасць і асалоду далучэння да невыказнага хараства слова, да скарбаў паэзіі. Такі чалавек, дажыўшы веку, наўрад ці палюбіць кнігу, ці будзе мець у ёй друга і дарадчыка.

Нямала нашкодзіла і ўсё яшчэ шкодзіць нам даўняя недаацэнка слова як сродку выхавання.

Непавага да слова, нявер'е ў слова нараджаюць педагагічнае бескультур'е, сцвярджае Васіль Аляксандравіч Сухамлінскі.

Чаму слова ў аднаго настаўніка — радасць адкрыцця, а ў другога яно — пакута для вучняў, для выхаванцаў?

Адказ на гэтае пытанне вялікі педагог нашай сучаснасці даў не толькі сваімі тэарэтычнымі абгрунтаваннямі, але і ўсім сваім вопытам.

Не можа быць узаемаразумення, не можа быць тонкіх душэўных дачыненняў паміж настаўнікам і вучнем там, дзе пануе косназыкасць, убоства думкі, бяскрыласць і беднасць мовы.

Не будзем спасылацца на прызнанні паэтаў і пісьменнікаў, згадаем кожны пачатак свайго жыццёвага шляху — хто навучыў нас любіць кнігу?

Перш за ўсё той, хто ўпершыню чытаў нам яе — чытаў так, што самое дзеянне, якое адбываецца на яе старонках, кожны рух і ўчынак яе герояў, кожнае слова, якое яны вымаўляюць і як вымаўляюць, былі для нас сапраўднай асалодай, узрушалі нашы душы, поўнілі іх новымі, яшчэ не спазнанымі пачуццямі.

Асабіста я не сустракаў яшчэ чалавека, які на пытанне, калі ён палюбіў кнігу, адказаў бы, што гэтай любові яго навучылі не ў маленстве, а што захапіўся ён літаратурай, адчуў сапраўдную асалоду мастацкага слова ў тым школьным узросце, калі на ўроках кожны твор і кожнага пісьменніка пачынаюць разбіраць анатамічна — па костачках, дабіраючыся да іх сутнасці, адпаведна метадычным прадпісанням.

Эстэтычнае выхаванне словам пачынаецца з развіцця, з узбагачэння пачуццяў. Чым шырэйшы набытак уражанняў і перажыванняў, тым болей дзіця бачыць і чуе ў навакольным свеце сувязяў і ўзаемадачыненняў. І тут слова, яго ўнутранае багацце, яго разнастайныя сэнсавыя і эмацыянальныя магчымасці — бадай, адзіны сродак і спосаб выхавання духоўнай культуры чалавека. «Улюбёны ў хараство слова становіцца болей чулым і патрабавальным да этычнага і маральнага быцця вакол сябе»,— гаворыць Сухамлінскі.

Юнак, дзяўчына, якім пашчасціла змалку, са школы сустрэць настаўнікаў і выхавацеляў, чуйных да хараства слова, праз усё жыццё будуць удзячныя ім за душэўнае святло, за чысціню пачуццяў, якія якраз і робяць чалавека шчаслівым. Далікатнасць, сардэчнасць адносін, найтанчэйшыя перажыванні, чарадзейная сіла кахання, захапленне прыгажосцю прыроды, пачуцці адданасці і любові да Радзімы — усё, што, на першы пагляд, немагчыма вызначыць і выказаць словамі, аднак жа ўсё, літаральна ўсё знайшло і знаходзіць сваё выяўленне ў слове, у вобразе, у паэзіі, у мастацтве. І навучыцца разумець і адчуваць душэўнае хараство чалавека, аказваецца, можна пры дапамозе таго ж слова, калі яно жыве, гучыць, спявае ў душы настаўніка.

У маленстве — кожны паэт. Але, як сцвярджае Сухамлінскі, было б наіўным чакаць, што жаданне творчасці

прыйдзе да дзіцяці само па сабе. Паэзію нараджае пачуццё прыгажосці. Без выхавання гэтага пачуцця, скончыўшы школу, юнак і дзяўчына застануцца абыякавымі да хараства слова. «Паэтычная творчасць — найвышэйшая ступень слоўнай культуры, а слоўная культура раскрывае самую сутнасць культуры чалавечай».

Няма нічога выключнага ў тым, што ў Паўлышскай школе дзеці складаюць вершы, пішуць казкі.

У нашага маладога паэта Алеся Разанава, які настаўнічаў у школе, усе вучні таксама пісалі вершы. У маладога літаратара, гомельскага настаўніка Віктара Шаўчэнкі, дзеці складаюць казкі, якія друкуюцца на старонках нашых часопісаў.

Парадокс творчых узаемаадносін настаўнікаў з вучнямі ў тым, што большасць з іх — настаўнікаў, якія павінны натхняць дзіцячыя душы, заахвочваць жаданне авалодваць словам,— самі ў апошні раз браліся за творчае пяро, пакідаючы студэнцкую парту.

Гэта мы гаворым пра выкладчыкаў літаратуры і мовы. Пра філалагічную ж культуру выкладчыкаў усіх іншых дысцыплін у практыцы іх падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі, атэстацыі і пераатэстацыі, абавязковага метадычнага ўдасканалення нідзе і ніхто не руціцца і не клапоціцца. «Мова — не мая спецыяльнасць»,— можа сказаць вам педагог-прадметнік. І бывае, дзіву даешся, наколькі яна, гэтая мова прадметніка, бедная, сірочая, а то і проста малапісьменная.

Дзве блізкія, крэўныя мовы — беларуская і руская, дзве аднолькава зразумелыя і даступныя. У гэтым — вытокі нашага духоўнага багацця. Але ж ёсць і пэўныя адметныя ўласцівасці і адрозненні ў кожнай, і нельга механічна блытаць асабліва іх этымалагічныя, фанетычныя і арфаграфічныя адценні, як нярэдка блытаюць *карысць* з *карыслівасцю*, *блага* з *дабром*, *адданасць* з *безадказнасцю*, *лік* з *абліччам*, *лікаванне* з *лічэннем* і г. д.

Мы, беларусы, асабліва гараджане, падчас залішне ўпэўненыя, што дасканала валодаем рускай мовай. Я таксама адзін з тых, хто ў гэтым сэнсе перабольшваў свае магчымасці, але, трапляючы ў асяроддзе, дзе руская мова натуральная, жывая, як паветра, якім дыхае чалавек, не раз адчуваў, на вялікі жаль, сваю лексічную і сінтаксічную нязграбнасць. Але заўважаючы свае недахопы, запамінаеш і чужыя.

Пазнаёміўшыся нядаўна са сваім спадарожнікам па вячэрняй прагулцы і разгаварыўшыся аб жыцці-быцці, аб хуткасці і зменлівасці падзей, я пачуў яго сумны ўздых:

— Да, жисть бегит,— сказаў ён і глыбакадумна дадаў. — И годы бежат...

Па тым, як ён вымавіў гэтыя словы, не цяжка было зразумець, што мой субяседнік не толькі ўпэўнены ў глыбіні зместу, але і ў дасканаласці формы свайго заключэння.

Мой знаёмы — кандыдат філасофскіх навук!

Бываючы ў школах, не мінаю магчымасці паслухаць, пабачыць настаўніка ў класе, радуюся кожнаму знаёмству. І вось я на ўроку географа, педагога са стажам, з вопытам і пэўнымі ведамі, але мова яго, элементарная недасведчанасць у фанетычных уласцівасцях некаторых словазлучэнняў і назваў бязлітасна пілуюць слых.

Ледзь улоўныя ўхмылкі зайгралі на вуснах дзяцей, калі настаўнік, выклікаючы да карты, з асаблівым націскам падкрэсліваючы складовае «у», прасіў паказаць рэчку Яузу. У вучняў быў болей тонкі слых, і яны ўзбагацілі школьны фальклор такой частушкай:

Ткнуўшы пальцам у Яузу,
Адпачні, зрабі паузу.
Ехаць прыйдзецца каму з нас
Па фауну у Каунас,
Наматай сабе на вус —
Здай памылкі ў пакгауз.
Лепей без такога грузу
Вандраваць нам па Саюзу.

Мова настаўніка — паказчык яго агульнай культуры, узроўню яго прафесійнай дасканаласці.

Не валодаючы словам, нельга навучыць не толькі любові да літаратуры, да паэзіі, але і да філасофіі, і да геаграфіі.

Віну за непісьменнасць вучняў, студэнтаў мы ў першую чаргу ўскладаем на педагогаў-славеснікаў. У многім яны вінаватыя. Але ці толькі яны? Ці не бывае і так, калі ўсё тое добрае, чаго дамагаецца славеснік, разбураюць яго калегі, многія з якіх мову, стыль лічаць не вартымі ўвагі, калі плён аднаго настаўніка вынішчаецца непісьменнасцю, прымітыўнасцю думкі і слова другога, абмежаванага утылітарнасцю сваёй задачы?

Час, нарэшце, дайсці да простай высновы, што кожны настаўнік, хто б ён ні быў па спецыяльнасці,— таксама славеснік, што вучыць ён не толькі матэматыцы, фізіцы, хіміі, батаніцы, а і абавязкова — культуры думкі, дасканаласці валодання словам.

Паспяховасць навучання немагчымая без выхавання філалагічнай эрудыцыі. Нудныя, нецікавыя ўрокі многіх нашых прадметнікаў не таму, што нібыта нецікавыя ісціны, тэарэмы і формулы выкладаюць яны, а таму, што самі выкладчыкі не валодаюць словам, няздатныя акрыліць думку, знайсці вобразнае ўвасабленне, дзейсную аналогію, асацыяцыю, параўнанне сваім доказам і вывадам.

Не памятаю ўжо дакладна сутнасці геаметрычнай формулы, здаецца, плошча паверхні конуса, але і на сёмым дзесятку год я не забыўся, як у Слуцкай прафтэхшколе наш матэматык «дзядзька Ватэль», каб мы назаўсёды запомнілі пі-эр-эль, звязаў яго з прозвішчам жанчыны, што жыла па суседстве са школай,— Пірэліха. Так было напісана на таблічцы дома, што стаяў на рэчцы Случ першым за Чортавым мосцікам.

Наш матэматык выдатна валодаў канкрэтнасцю вобразнага мыслення: незвычайнае, абстрактнае ён умеў спалучыць са звычайным, знаёмым і рэальным.

Прыгадаў свайго «дзядзьку Ватэля», калі нядаўна з радасным захапленнем знаёміўся з вопытам настаўніка з г. Данецка Віктара Фёдаравіча Шаталава.

У чым сутнасць методыкі выкладання Шаталавым тых навук, дзе, здавалася б, менш за ўсё патрэбна вобразнасць? Матэматыка і фізіка вымагаюць перад усім лагічнай паслядоўнасці думкі і запамінання, запамінання і яшчэ раз запамінання непахісных законаў, тэарэм і формул. Але ж запамінанне і разуменне — не адно і тое ж, наадварот, гэта, аказваецца, несумяшчальныя разумовыя працэсы.

Як жа быць, якія знайсці сродкі, каб кожную неабходную ісціну ў першую чаргу зразумець, а потым запомніць — цвёрда і назаўсёды?

Натуральна, што Шаталаў не абышоўся без дапамогі вобразнага мыслення: вобраз — заўсёды зерне, з якога вырастае магутнае дрэва пазнання. Сабраць, спрасаваць у адным вобразе, у адной мадэлі як мага болей ведаў, каб потым, разгарнуўшы гэты вобраз у шырокую панараму, убачыць усе неабходныя падрабязнасці. Думку чала-

века можна згарнуць, закадзіраваць у зручную схему і разгарнуць, раскадзіраваць, калі яна спатрэбіцца ў поўным маштабе. Прасцей кажучы, сваю методыку Шаталаў будуе на вобразнай прыродзе ўласцівасцяў памяці: ключавое слова, аналогія, умоўны знак, без якіх не абыходзіцца кожны з нас, калі з няспыннага патоку інфармацыі хоча зразумець, запомніць, выхапіць самае істотнае і неабходнае. Нічога дзіўнага, што, сам выключна ашчадны, выразны і дакладны ў слове, Шаталаў выхоўвае яснасць мовы, дакладнасць слова і ў сваіх вучняў.

Сапраўды, плённага поспеху звычайна дамагаецца той педагог, які пры дапамозе трапнага і дасканалага слова ўмее ярка і вобразна адкрыць самыя складаныя рэчы, здзіўляючы сэнсавай даступнасцю і нават зрокавай нагляднасцю.

Хто з нас, са школьных дзён, з дзён юнацтва, не памятае пра тыя славутыя «штаны, што на ўсе стораны раўны»?

Хто не памятае не менш славуты закон, адкрыты не ў лабараторыі, а ў звычайнай ванне?

Хто не памятае закона, адкрытага дзякуючы таму, што аўтару гэтага адкрыцця на галаву ўпаў яблык?

Навуковае абгрунтаванне сваім адкрыццям далі Піфагор, Архімед і Ньютан. Але папулярную даступнасць тлумачэння вялікіх ісцін знайшлі, вядома, педагогі-паэты, якія сваім клопатам лічылі і лічаць — нават даўно вядомае адкрываць нанава: будзіць творчую фантазію, заахвочваць няўтольную людскую цікаўнасць. А да пошукаў і адкрыццяў няма болей прыдатнага ключа, як слова. Не дзіва, што ўсе вялікія педагогі — заўсёды майстры слова: Русо, Песталоці, Талстой, Ушынскі, Макаранка, Корчак, Сухамлінскі...

Пісьменнік і настаўнік — не ўсё так проста ў гэтым спалучэнні. Вельмі часта яны не знаходзяць агульнай мовы, хоць здавалася б, што кожны пісьменнік — абавязкова настаўнік, што без літаратуры, без мастацкага слова не можа быць ніякай педагогікі.

Але ці заўсёды гэтыя дзве родныя сястры — педагогіка і літаратура — у згодзе? Не заўсёды. Бываюць непаразуменні, супярэчнасці і нават канфлікты, асабліва ў ацэнцы слова, яго магчымасцяў.

У гісторыі рускай літаратуры засведчаны факты, калі вядомыя пісьменнікі, прызнаныя стылісты і знаўцы мовы,

рызыкнуўшы напісаць школьнае сачыненне, траплялі ў вельмі няёмкае становішча. Адзін з іх, узяўшыся дапамагчы пляменніцы, атрымаў... двойку. Гэта быў Іван Сяргеевіч Тургенеў. Другі, напісаўшы сачыненне свайму сыну, атрымаў... тройку. Прыняўшы гэта не толькі як абразу годнасці пісьменніка, але і свайго высокага чыну, ён надзеў віцмундзір, загадаў падаць выезд і паехаў да дырэктара гімназіі патрабаваць тлумачэння.

— Ваше превосходительство,— сказаў пачціва дырэктар,— сочинение отличное, но написано не теми словами...

«Прэвасхадзіцельствам» быў Міхаіл Яўграфавіч Салтыкоў-Шчадрын.

Падобныя літаратурныя канфузы былі і пазней, здараюцца і ў наш час, але застаюцца незасведчанымі.

«Не тымі словамі...» — нярэдка і цяпер можна пачуць у школе. А якія ж словы «тыя», што так радуюць слых некаторых педагогаў? І не толькі педагогаў, але і некаторых пісьменнікаў, і, на вялікі жаль, тых, што пішуць для дзяцей.

У папулярным дзіцячым часопісе, тыражом болей ста тысяч экземпляраў, паэт вуснамі пяці-шасцігадовага хлопчыка гаворыць:

Не хаджу я ў сад дзіцячы,
Дома з мамаю жыву.
І сур'ёзная задача
Мне ўскружыла галаву.

Заўважце, які «спецыфічна» дзіцячы зварот: «І сур'ёзная задача мне ўскружыла галаву»!

На творчым семінары дзіцячых пісьменнікаў чытаў сваё апавяданне празаік, ужо не малады ўзростам і стажам работы ў школе. Галоўная падзея, пра якую расказваў аўтар,— сход вучняў першага класа.

«— Мы ўзялі абавязацельства — актыўна павышаць узровень авалодання ведамі,— сказаў стараста Валеры, адкрываючы сход.— Барацьбу за павышэнне паспяховасці мы павінны ўвязаць з кампаніяй па збору макулатуры...»

Валеры, вядома, быў станоўчы герой. Такімі ж героямі былі ўсе ўдзельнікі сходу і настолькі станоўчымі, што адрозніць іх адзін ад аднаго было немагчыма. І гаварылі яны на адной «станоўчай» мове, на мове аўтара, свайго настаўніка, які паспеў ужо выдаць і кнігу, якая адразу ж

увайшла ў «актыў» дзіцячай літаратуры — ведама ж, аб надзённым жыцці сучаснай школы!

Так, падчас, спасылаючыся на важнасць тэмы, мы чынім непапраўную шкоду мове дзяцей.

Словы-канцылярызмы, словы-штампы запамінаюцца механічна, без усякага напружання думкі. Убогія, пустапарожнія, яны нічога не адкрываюць, нікога не хвалююць. Гэта — мякіна, смецце. Разграбаючы іх, не заўсёды дабярэшся да зярняці, да сэнсу.

А колькі штодзённа мы чуем такіх слоў! Не да гонару ні пісьменніка, ні настаўніка выхоўваць такімі словамі сваіх вучняў і чытачоў.

Я параіў пісьменніку-педагогу прачытаць апавяданне сваім вучням першага класа, а пасля папрасіць — няхай кожны раскажа сваімі словамі. Упэўнены, што мова, стылістыка ды і верагоднасць паводзін герояў апавядання змяніліся б непазнавальна.

Такі вопыт вельмі памог аднаму пісьменніку-настаўніку. Заснаваўшы школу для сялянскіх дзяцей, ён пачаў пісаць спецыяльную хрэстаматыю. Але як прымуць вучні яго апавяданні, як зразумеюць? Ён стаў чытаць іх і дарослым, і дзецям, а прачытаўшы, прасіў — раскажыце. Ён вывяраў натуральнасць слова на сваіх героях. Тое, як яны яму расказвалі і пераказвалі, станавілася канчатковай рэдакцыяй твора. Выдатныя былі рэдактары ў Льва Мікалаевіча Талстога!

Бяда многіх педагогаў у тым, што ўсю сутнасць слова, а заадно і прызначэнне літаратуры яны бачаць выключна ў павучальнасці, у дыдактычнасці, а сама дыдактычнасць разумеецца імі як нейкі цыркуляр або інструкцыя.

Чуйнасць да слова, да ўсіх яго сэнсавых граняў — заўсёды сведчанне не толькі культурнага ўзроўню чалавека, але і яго маральных і этычных уяўленняў.

Знарок такога не прыдумаеш, але так здарылася. Вяртаючыся з сяла Паўлыш, я быў поўны ўражанняў. Гарэў, разгараўся агеньчык маіх дарожных разваг. Але вось на адной палескай станцыі новыя пасажыры ў маё цяпельца падкінулі новага хворасту — і мой агеньчык задыміў даволі горка.

У вагон упырхнула чародка дзяўчат, і як адразу ж высветлілася, студэнтак, што пасля практыкі вярталіся ў Мінск. Па тым, з якой узрушанасцю яны, толькі паспеўшы сесці, адразу ж дасталі тоўсты сшытак, наўзахапы

сталі гартаць яго, чытаць і перачытваць, чулліва вымаўляючы асобныя словы і сумна пры гэтым уздыхаючы, я ўжо здагадаўся — вершы!

І так мне захацелася хоць адным вокам зазірнуць — якія, але я цярпліва чакаў. І толькі калі мае дзяўчаткі начыталіся, наўздыхаліся, асмеліўся папрасіць — дайце пачытаць, бо і я ж вельмі люблю «сцішкі».

Так, гэта былі вершы, гэта быў альбом лірыкі, і не цяжка было здагадацца, што мае спадарожніцы — не толькі чытачы альбома, але і тыя, хто яго складае, хто ўсе свае тайныя перажыванні, радасці і смутак, крык сваёй душы давярае яго старонкам.

Каханне не заўсёды нясе асалоду шчасця, бывае, што і горкія расчараванні. Штосьці падобнае адбылося і ў жыцці аўтара верша. Але гэта быў не толькі крык аб уласнай драме, гэта, перш за ўсё, быў урок тым, хто таксама мог стаць ахвярай легкадумнасці. Увесь верш — зварот і наказ:

Запомни, девушка, скажу об этом прямо.
Зачем скрывать, когда всё так и есть.
Мои глаза смутились от счастья,
Чтоб дрожь унять, мне приходилось лечь.
Я ей кивнул, к ногам ее склонился,
Коснулся ртом ее волос.
Обнял раскинувшуюся страстно —
И неизвестное сбылось.
Я приподнимаюсь, сажусь к ней поближе,
Презрительно смотрю в ее глаза.
Ну что ж, прощай, на этом все,
Иди, ты больше не моя.
Теперь ты будешь плакать дни и ночи,
Я жизнь твою в расцвете погубил.
Но ты пойми меня, родная,
Я был влюблён, но не любил.
Запомни, девушка, сильно не люби,
Не верь словам мужчин, они все могут.
Пусть он лежит в ногах перед тобой,
Запомни раз и навсегда.

Па ўсім відаць, аўтар гэтай споведзі меў вельмі далёкае ўяўленне аб паэзіі, але наказальнае яго імкненне выкласці сваю мараль, свае сентэнцыі, стварыць мадэль сучаснага донжуана толькі ў вершах, толькі вершамі абгрунтаваць «тэорыю» кахання. І нічога дзіўнага, што ўсе этычныя высновы гэтай нямудрай тэорыі раскрыты поўнасцю ў сваёй першароднай прымітыўнасці, у неразвітасці пачуццяў.

Самае сумнае, што гэты так званы «сціх» напісала адна з маіх спадарожніц. Магчыма, бог засцярог яе ад усіх тых жахаў, пра якія яна расказала. Магчыма, кіравалася яна адным толькі добрым клопатам аб дзявочым гонары і дзеля гэтага ўзялася за пяро. Розныя бываюць прычыны і патрэбы брацца за пяро. Адных гэтае пяро слухаецца, другіх не толькі не слухаецца, а ўсе твае добрыя намеры паварочвае супраць цябе самога.

Жыве чалавек у асяроддзі людзей, глядзіш — па апошняй модзе апранаецца, судзіць паводзіны і ўчынкі іншых, але вось прыйшла неабходнасць самааналізу, інтымнай споведзі перад сябрамі, блізкімі, і выяўляецца, наколькі ж сам ён духоўна ўбогі.

І як жа асабліва крыўдна, калі гэта — малады чалавек, юнак, дзяўчына, жыццё якіх толькі пачынаецца. Яны паспелі завяршыць сваю галоўную асвету — скончылі сярэднюю школу, дзе акрамя авалодання моўнай культурай павінны былі набыць і асновы эмацыянальнай, эстэтычнай і маральнай пісьменнасці. Болей іх гэтаму ніхто не навучыць. Тыя, хто стане вучыцца далей, будуць авалодваць спецыяльнасцю, удасканальвацца ў сваіх прафесіях, дзе багацце мовы не абавязковае, а ў бытавым і службовым ужытку можна абыходзіцца настолькі малым запасам, што пры дапамозе двух-трох слоў выказваюцца ўсе самыя неабходныя эмоцыі. Мы добра ведаем гэтыя «магутныя» словы, чуем іх штодня!

У школе чалавек яшчэ мог пачуць або нават чытаць Пушкіна, Цютчава, Блока, Купалу, Багдановіча, мог... Але вось мае спадарожніцы год-два, як пакончалі школы, а дзе ж іх незабыўныя ўражанні ад паэтычных адкрыццяў? Мяркуючы па альбоме, яны да самай узвышанай пары свайго юнацтва так і не дакрануліся душою да паэзіі, хаця і ўпэўненыя, што аб інтымных пачуццях трэба абавязкова гаварыць вершам.

Мілыя мае палескія паэтэсы, як мне крыўдна, што вы не выпадковыя для мяне спадарожніцы, бо я адчуваю ваша імкненне да прыгажосці, да чысціні, да цнатлівасці дарагіх для вас душэўных скарбаў, але ніхто не памог вам, не навучыў вас, што з такімі скарбамі і паэзія, і музыка, і мастацтва заўсёды абыходзяцца толькі самымі дасканалымі і словамі, і сродкамі!

Няма нічога заганнага ў самой традыцыі. Дзяўчаты заўсёды адчувалі патрэбу мець вернага субяседніка, з

якім у пэўныя хвіліны можна адвесці душу. Дзённіку, альбому, як найлепшым сябрам, заўсёды давяралася самае запаветнае. Але, як гаворыць мудрае выслоўе, скажы мне, хто твой друг, і я скажу — хто ты.

Альбом палескіх студэнтак мяне вельмі засмуціў. Толькі неўзабаве я быў засмучаны яшчэ болей. Мая ўнучка прынесла са школы альбом сваёй сяброўкі — вучаніцы... 3-га класа!

Так, і гэта быў альбом, і яго змест таксама даваў уяўленне аб яго складальніцы, у якой быў свой ідэал прыгажосці: дзяўчынка збірала, выразала і наклейвала на старонкі свайго альбома ўсё, што здзіўляла яе фантазію асаблівай раскошай — узоры модных прычосак, шыньёнаў, парыкоў, фатаграфіі прыгажунь з распушчанымі валасамі, пацеркі і каралі на іх лебядзіных шыях, алмазы і золата ў іх вушах, зіхатлівыя бранзалеты на іх запясцях, казачныя брыльянты на іх выпешчаных пальцах, не гаворачы ўжо аб фасонах сукенак і ўсіх астатніх убораў — ад халата да пенюара з карункамі, гіпюрам і без...

З якіх шчодрых крыніц чэрпала дзіця ўсе гэтыя незлічоныя цуды харастваʔ Ды з вельмі блізкіх: з часопісаў мод, з абгортак туалетнага мыла, з наклеек ад шампуню, крэмаў, пудры...

Пройдзе нямнога год, і можаце быць пэўныя, што ў нашай дзяўчынкі ўжо і дома або ў рабочым ці студэнцкім інтэрнаце над ложкам, над сталом ці ў альбоме будуць красаванца хоць і іншыя «шэдэўры» айчыннага і замежнага вырабу, але ўсё той жа эстэтычнай вартасці.

Вучаніца 3-га класа ў сваім альбоме не змяшчала сваіх вершаў, але, як ні дзіўна, і яна адчувала, што ніякае хараство не можа абысціся без паэзіі. І таму на старонках яе сшытка час ад часу з'яўляліся ўзоры той фальклорнай лірыкі, якую дзіця чула ў асяроддзі старэйшых — пра тое, як заяц прыйшоў дадому п'яны і як цёшча выкінула яго за парог, пра тое, як жонка ашуквае мужа, і г. д. У альбоме пераважалі якраз такія сюжэты. Круг замыкаўся: уяўленне аб прыгожым зноў звярталася да слова, не магло абысціся без слова. Зноў спалучаліся ў сваім адзінстве падманная прыгажосць формы з мізэрнасцю і ўбоствам зместу.

Вось вам слова. Які гэта найтанчэйшы сродак абыходжання з чалавекам, з самымі дарагімі скарбамі яго

душы! Авалодаць дасканаласцю слова нельга, не выхоўваючы, не развіваючы эмацыянальнай культуры.

Слова вымагае выключнай сумленнасці ў абыходжанні з яго зместам і сутнасцю. Самыя небяспечныя вынікі выхавання, калі ў таго, хто бярэцца выхоўваць, слова разыходзіцца са справай, а гучныя і прыгожыя заклікі не адпавядаюць паводзінам і ўчынкам.

Не можа быць рознага значэння адных і тых жа слоў, з якімі мы звяртаемся да калектыву ў цэлым і да асобнага чалавека ў прыватнасці. Нельга ў адным выпадку гаварыць патэтычна і ўзвышана, а ў другім — толькі катэгарычна, загадна: не рваць, не ламаць, не пляваць, не лаяцца, не красці, не ашукваць...

Не так рэдка падобныя «звароты», а то і пагрозы штрафам у рэальных рублях мы сустракаем на вуліцах, у парках і нават у культурна-асветных і бытавых установах, пераступіўшы парог якіх, мы павінны вывучыць звод правілаў і кодэкс паводзін, як сябе трымаць у гэтых сценах. У сваёй большасці яны зневажаюць ні ў чым нявінных людзей, псуюць настрой, а ў асобных выпадках, можа, нават і натхняюць, асабліва падлеткаў,— а што, калі зрабіць якраз тое, што забараняецца і караецца?

За 1975 год, як паведамляе «Вячэрні Мінск», у горадзе налічана больш пяці тысяч наўмысных паломак тэлефонаў-аўтаматаў, не зважаючы на ўсе крымінальныя пагрозы. Напісаўшы «не зважаючы на пагрозы», я сам сабе падумаў, а што, калі наадварот — зважаючы на пагрозы, на штраф аж да ста рублёў? Гэта ж яшчэ больш прынадна і спакуслівa! Не ўсе псіхалагічныя тонкасці дзіцячага азарту вядомыя нам, асабліва ў пераломным узросце, калі адчуванне рызыкі так і падмывае, так і вабіць выпрабаваць сваю храбрасць.

У добра знаёмай мне школе-інтэрнаце юрысты, знаёмячы вучняў з асновамі заканадаўства, асабліва падрабязна расказвалі пра многія віды злачынстваў, і як за якое судзяць, колькі даюць, і што кожнае злачынства ў нас не застаецца нераскрытым.

Праз некалькі дзён з хімкабінета зніклі самыя каштоўныя прылады. Следства вялі тыя ж юрысты, але не знайшлі ніякіх слядоў. І толькі калі мінулася сенсацыйнасць падзеі, прылады ўсе да адной зноў з'явіліся на сваім месцы.

Гарэзлівасць, дураслівасць, свавольства — так назы-

ваем мы многія не зразумелыя нам учынкі дзяцей. А што, калі — і самаабарона кволага, яшчэ не ўсталяванага, але пачуцця чалавечай годнасці, бездапаможны і наіўны выклік грубаму вокрыку і пастраху?

Рукамі дзяцей робіцца нямала злачынстваў, але мяне асабліва ўражвае, трывожыць, збівае з тропу найбольш незвычайнае і нечаканае, у псіхалагічных і маральных прычынах якога разабрацца цяжэй і складаней.

Я маю на ўвазе нядаўна пабудаванае ў дзіцячым парку кафэ «Алёнка», прызначанае для дзяцей і ўжо зняважанае, я ўпэўнены, самімі дзецьмі, падлеткамі. Кафэ пабудавана ў выглядзе круглага шатра, сцены якога выкладзены з новага матэрыялу — шкляных пустацелых плітак. І вось якраз шкло і з'явілася спакусай выпрабавання яго трываласці. Цяпер амаль няма ніводнай цэлай пліткі. Прабітыя навылёт сцены стракацяць цэментавымі латамі, пазакладаны цаглінамі. Праз дзіркі як на далоні відаць усё кафэ ў сваім запусценні. Злачынства рабілася метадычна, настойліва не адзін дзень, вечар, ноч. Дзеля таго каб збрыдзіць будынак, спатрэбілася заўзятасць не аднаго дзікуна, апантанага страсцю разбурэння. Якія ж тут стымулы, якія матывы дзікунства? Жахліва, але ж дзікуны жывуць сярод нас, растуць, ходзяць у школу, штодня глядзяць тэлевізар. Яны нашы знаёмыя, блізкія, можа, нават нашы мілыя дзеткі, унукі...

Што ж адбываецца? Адбываецца незаўважная пераацэнка маральных і эстэтычных крытэрыяў. Імклівы рух тэхнічнай рэвалюцыі, рост дабрабыту, жыццёвага камфорту абганяюць, апярэджваюць рэвалюцыю духоўную, таму многія не адразу зразумелыя і асэнсаваныя супярэчнасці і канфлікты вельмі дорага каштуюць нам.

Падобная непрадбачлівасць дорага абыходзіцца і нашай школе.

Некаторыя школы ўжо ганарацца тым, што літаральна ўсе класы ператвораны ў кабінеты.

Наўзахапы адна перад адной, каб не адстаць, яны тэхнізуюць навучальны і выхаваўчы працэс, бачачы ў індустрыяльным педагагічным канвееры свой канчатковы ідэал і не заўважаючы, як ірвуцца многія жывыя ніці, што звязвалі вучня са школай.

Практычна ў вучня ўжо няма ні свайго класа, ні месца ў ім, ні класнай маёмасці, за якую ён нясе адказнасць. Разам з абязлічанасцю грамадскіх каштоўнасцей абяз-

лічваецца і асабістая адказнасць, паступова ўсталёўваецца спажывецкае перакананне: мне абавязаны ўсе, я — нікому.

Мы вельмі шчодра будуем так званыя школьныя комплексы, школьныя стадыёны і нават ужо не майстэрні для працы, а сама меней — палацы, наіўна спадзеючыся, што ў палацах якраз і вырашацца ўсе праблемы працоўнага выхавання.

Нядаўна мне пашчасціла ўбачыць адно ўнікальнае вучылішча. І хоць яно называецца рамесніцкае, але стварылі яго выдатныя мастакі і педагогі, якія вучаць і выхоўваюць сапраўдных майстроў, улюбёных у свае прафесіі рэзчыкаў, чаканшчыкаў, інкрустатараў, керамістаў і многіх іншых умельцаў, так патрэбных для ўпрыгожання жыцця і побыту людзей, для развіцця іх эстэтычнага густу.

Я ніколі не быў прыхільнікам пашыранага ў нас перакананн я, што, каб пераняць вопыт, трэба абавязкова паглядзець сваімі вачыма і памацаць рукамі. Такі метад у дачыненні да школ мала дае карысці. Але вось бабруйскае вучылішча... Словамі цяжка расказаць, на што здольная падзвіжніцкая самааддана сць і вера педагога ў свае ідэі. Аркадзь Ягоравіч Ларын стварыў цуд, які варта паглядзець як мага большай колькасці людзей. Разам з калектывам аднадумцаў ён практычна паказаў, як трэба рашаць задачы выхавання працай.

Калектыў выхаванцаў і педагогаў бабруйскага вучылішча жыве ў яго сценах, у яго класах, у яго майстэрнях, як у дзівоснай казцы, якую яны твораць самі, сваімі рукамі, сваім розумам, сэрцам і талентам.

Гэта — не паказная прыгажосць, не тая эстэтыка, якая, ідэалізуючы, стэрылізуючы форму, заадно стэрылізуе і змест. Гэта — няспыннае, жывое асяроддзе творчасці, атмасфера радасці, дзе ўсё, што акружае цябе, выхоўвае тваю чалавечую гордасць — гэта зрабіў я, гэта — мая праца!

Школа — запаветны дом маленства і юнацтва, і ці будзе дарагім, родным ён таму, хто за дзесяць гадоў навучання не кіўнуў і пальцам, каб упрыгожыць гэты дом, укласці ў яго сваю працу і клопаты, дагледзець сад, вырасціць у ім свае дрэвы і кветкі?

Прыклады маральнага дзікунства, што стымулюецца інстынктамі, без пробліску пачуцця адказнасці, нярэдкія

вакол нас. Мнагавата прыкладаў і штодзённага захаплення сілай і здольнасцямі біць нагамі, кулакамі, галавой — у футболе, у боксе, у самба, дзю-до, не гаворачы ўжо пра тэледэтэктывы.

Я быў сведкам такой карціны: гурт дарослых хлопцаў з вясёлым узрушэннем шпурляў у Свіслач абломкі цэглы і камяні, дамагаючыся нейкага прыцэльнага пападання. Але гэта ім не ўдавалася. Тады яны шпурлялі з яшчэ большай заліхвацкасцю, бегучы ўслед за плывучай па вадзе мішэнню. Уздоўж парапета збіраліся натоўпы цікаўных. Што ж такое там плыло? Анаконда, кракадзіл? Шмат чаго плыве па нашай Свіслачы. На гэты раз плыла пустая бутэлька, рыльцам угару. У яе абавязкова трэба было пацэліць. Магутная каманда байбусаў не магла адступіцца ад пастаўленай мэты. Запасы камянёў і цэглы канчаліся, але самі «снайперы» пра гэта не надта трывожыліся. Зграя падлеткаў-добраахвотнікаў вышуквала новыя рэзервы. Адзін выламаў з лесвічных прыступак цэментовую пліту — ну, на гэты раз, нарэшце, пацэляць!

— Хлопцы, дзеці! Што вы робіце? — нема закрычаў я.— Ніхто так не абыходзіцца нават з памыйнай ямай, як вы з нашай няшчаснай рэчкай! Ці вы ўжо настолькі здзічэлі, што не можаце глянуць на сябе вачыма людзей?

Можа быць, што яны і сапраўды яшчэ не зусім здзічэлі, бо, асцепаўшы рукі ад пылу і пяску, павярнулі да лаўкі, на якой па-святочнаму ўбраныя сядзелі іх сяброўкі.

«Не праходзьце міма!» — колькі такіх заклікаў звернута да нас, каб мы, убачыўшы благія ўчынкі іншых, актыўна ўмешваліся, дамагаліся справядлівасці, асуджэння і нават пакарання!

Я вінаваты перад вамі. Акрамя абурэння, я не ведаў — куды і ў што мне ўмяшацца. Маё асуджэнне не зрабіла на маладых людзей ніякага ўражання. Яны перапынілі свае забавы таму, што іх асуджаў чалавек па праву старэйшага — толькі ўсяго. Ні збянтэжанасці, ні вінаватасці, ні сарамлівай чырвані на іх абліччах я не ўбачыў. Я і цяпер перакананы, што ўмяшацца туды, куды мы ў першую чаргу павінны ўмяшацца,— нялёгкая справа. Ні павучанні, ні пагрозы, ні нават суровыя пакаранні не памогуць, калі ў чалавеку беспрабудным сном спіць жывая існасць душы, яго ўласны, адзіны і галоўны суддзя, перад якім быць сам-насам і заўсёды заставацца

чалавекам — куды цяжэй, чым на вачах у людзей.

Падмяняючы сутнасць формай, можна зняславіць самы добры намер. Раскажу пра адно здарэннне, якога я быў не толькі сведкам.

Перад Новым годам у нашага домакіраўніцтва заставаліся нескарыстаныя грошы. Рашылі пафарбаваць фасад нашага дома. З вёдрамі, з пэндзлямі і найноўшай тэхнікай прыйшлі маляры. Праз два дні дом зазіхацеў. З вуліцы люба было глянуць. З вуліцы — так, а вось нам, жыхарам, глянуць на вуліцу ўжо нельга было. Пафарбаваўшы сцены, нам заадно пафарбавалі і шыбы. А як даўно ўжо вядома, пісьменнікі жыццё бачаць толькі з акон сваіх кватэр — што нам было рабіць? Не адчыніш і не памыеш — на дварэ зіма, мароз. Немалых турбот, хваляванняў каштавала дамагчыся права зноў зірнуць на свет праз чыстае шкло.

У слоўніку Даля слова *халтура* і яго сінонімы *халтуга, халтыга, хаптуга* пазначаны як мясцовыя, дыялектныя. У беларускай мове слова, блізкае гучаннем, як вы ведаеце, мае вельмі сумны сэнс. Пра нядобрасумленную ж работу гаварылася — тандэтная, зробленая на тандэт, або, як і цяпер кажуць мае землякі,— на шармака.

Ушакоў значна пашырае тлумачэнне слова: «пабочны і пераважна лёгкі заработак звыш асноўнага, *першапачаткова,*— падкрэслівае ён,— у пеўчых царкоўнага прытча».

Пазней, калі пеўчыя царкоўнага прытча вымерлі, халтуршчыкамі па блізкасці прафесіі лічыліся ў нас пераважна эстрадныя падзёншчыкі.

У нашы дні слова «халтура» ва ўсіх яго — сумным, прыкрым і ганебным — значэннях, на вялікі жаль, набыло незвычайную пашыранасць. Цяпер яно чуваць у многіх прафесіях, у тым ліку і ў пісьменнікаў, і ў педагогаў...

Але крытэрыі, якімі вымяраецца вартасць прафесіі кожнага з нас,— адзіныя: ці жывеш ты клопатам і трывогамі свайго часу, ці ёсць у цябе ясныя грамадзянскія перакананні, ці ставіш ты сваю прафесію вышэй за ўсе, якія мог выбраць сабе?

...Слова! Ты — прысяга воіна і тайна дзявочага сэрца, вокліч, з якім ідуць у бой, і першы радасны ўсклік дзіцяці, ты — нябачная цытадэль, што спыняе ворага, ты — і павуцінка, што рвецца пры самым кволым павеву ветрыка...

Адзіны з усіх жывых істот, хто не можа абысціся без цябе,— чалавек.

Прыклад незвычайнай ашчаднасці да слова дае народ.

Сваім вялікім ісцінам ён заўсёды знаходзіць магутныя крылы.

Колькі трапнасці і даскапаласці ў прыказках, прымаўках, загадках, выслоўях! Усё найкаштоўнае з духоўнага набытку, з маральнага вопыту, з этычных і эстэтычных скарбаў запаміналася, узбагачалася, жыло і жыве толькі таму, што кожнаму дыяменту мудрасці знаходзіцца самая дакладная па сваёй выразнасці аправа ў вобразе, у метафары, у слове.

З якой чуйнасцю падбірае і выбірае народ словы для сваіх песень! Ніколі ні параўнанне, ні эпітэт не даюцца механічна, а заўсёды з разлікам на ўзмацненне вобраза:

Пыл, пыл па дарозе,
Пыл, пыл па шырокай...

Азначэнне, далучанае праз радок, адразу ж дае прасторавае ўяўленне ўсёй карціны: і дарогі, і пылу, які над ёю курыць клубамі.

А вось як можа ўзрушыць пачуцці той жа эпітэт, калі яму знаходзіцца дакладнае месца.

Многія памятаюць народную песню: «Я сягоння тут, а заўтра паеду...» У ёй спяваецца пра тое, як жонка, нацярпеўшыся гора з мужам, не толькі не засмучаецца, калі той выбіраецца ў дарогу, але і гаворыць, што адной ёй будзе лягчэй: «з табой, мілы, гаравала, без цябе не буду».

І вось — вайна, мужа забіваюць.

Убіт, убіт мілы,
Закінуты ў жыта,
Чырвонаю кітайкаю
Лічыка накрыта.

Якое жаночае сэрца не зойдзецца ў смутку ад такое весткі! Жонка ідзе на апошняе развітанне. І вы паслухайце, з якой выключнай псіхалагічнай сілай падаецца і ставіцца на сваё месца адзін-адзіны эпітэт! Ён ужо не толькі слова, а і вышыня, на якую раптам падымаецца горкі смутак жанчыны:

Прыйшла туды міла,
Кітайку адкрыла,
Чырвоную як адкрыла,
Дый загаласіла.

Для глухога вуха слова можа быць і здрадлівым, і жахлівым у спалучэнні з другімі словамі. Прыемна сказаць пра малады прыгожы румянец: кроў з малаком, але не дай бог: малако з крывёю!

Ва ўсіх сферах дзейнасці, у дачыненні са сваім асяроддзем чалавек не можа абысціся без слова. Адзін задавальняецца двума-трыма дзесяткамі, другі прагна ўбірае ў сябе ўсе яго скарбы. Чым багацейшае духоўнае жыццё чалавека, тым багацейшая, ярчэйшая яго мова.

З першых дзён, калі пачынаецца свядомасць, узнікае патрэба мысліць вобразна: чалавек ачалавечвае свет вакол сябе, пераносячы свае адчуванні на жывыя істоты, расліны, рэчы, з'явы. Гэтая ўласцівасць, бадай, самая каштоўная ў кожным з нас. Без яе чалавек сляпы і глухі. Калі дзіця плача, убачыўшы забітую птушку, зламаную галінку,— бацькі могуць быць пэўныя, што ў душы іх сына ці дачушкі прараслі зярняткі дабра, спачування, спагады чужому болю, бядзе, няшчасцю. А калі на вуліцы бачыш абдзёртыя, знявечаныя ліпы або ў парку стаптаныя кветкі і дарожкі, усыпаныя шклом бітых бутэлек, з горкім жалем уяўляеш бязроднага пустадомка, да аглухлай душы якога ўжо цяжка дастукацца. Яго сэрца не скаланецца і ад большых злачынстваў і кашчунстваў. Ён можа не толькі скрышыць дрэва, вырашчанае і дагледжанае людской ласкай, але і, апантаны базарнай прагнасцю, выразаць усе кветкі ля самай дарагой рэліквіі нашай памяці — ля помніка сваім бацькам. І самае страшнае, што гэта факт.

Ніхто гэтак, як дзіця, якое пачынае гаварыць, адкрываць тайны слова, не адчувае мілагучнасці, ласкі, прыгажосці і маляўнічасці роднай мовы.

Пераступіўшы школьны парог, пачаўшы сваё жыццё ў калектыве, дзіця яшчэ думае ўслых, яно не можа жыць без слова. Слова — матэрыяльнае выяўленне яго яшчэ наіўнай, няўпэўненай думкі, кволага, бездапаможнага пачуцця.

Не палохайце дзіцяці патрабаваннем сціхнуць, замаўчаць! Цішыня ў першым, у другім, у трэцім класах, цішыня, якую некаторыя педагогі лічаць ідэалам навучання,— страшная цішыня. Яна, як драпежнік, падкраўшыся на мяккіх лапах, можа задушыць самае жывое і трапяткое, што ёсць у дзіцяці,— яго дапытлівую думку, яго няспыннае жаданне думаць.

Настаўніца першага класа адной са школ на ўскраіне Масквы, у Кунцаўскім раёне, Софія Мікалаеўна Ласёнкава гаворыць пра шчасце педагога, у якога дзеці думаюць услых. Яна дамаглася такога шчасця. У яе класе кожны рух думкі дзіцяці выяўляецца ў слове. На кожным уроку ў прыцішаным гуле ўсяго класа гучыць, як сярэбраная песня жаваранка, голас жывое трапяткое думкі. Гэта — камертон, на які настройваецца слых усяго класа, гэта і магічная ўлада дырыжорскай палачкі педагога, які дае накірунак, вызначае строй, лад і вышыню гучання свайго цудоўнага аркестра!

Залежнасць слова ад эмацыянальнай асновы была вядомая даўно. Да эпохі кнігадрукавання была эпоха слыху. Мы цяпер рэдка задумваемся, што ўсе бясцэнныя скарбы народнай паэзіі нараджаліся адначасова, сінхронна ў слове і ў мелодыі. Нават калі з'явіліся кнігі, яны яшчэ доўгія вякі чыталіся толькі ўслых.

Я не браўся даследаваць ні праграм, ні методык выкладання мовы. Мне рупіла падзяліцца толькі думкамі аб магчымасцях слова, аб яго этычным і эстэтычным значэнні ў фарміраванні асобы чалавека, у выхаванні яго светапогляду, яго перакананняў, культуры яго душы і сэрца.

Сваімі рашэннямі XXV з'езд КПСС вызначыў магістральныя накірункі развіцця савецкага грамадства, вызначыў перспектывы і сродкі выхавання нашага сучасніка, багаццяў яго духоўнага свету. Безумоўна, што ў надзейным, выпрабаваным арсенале гэтых сродкаў вельмі прыдасца і спатрэбіцца натхнёнае, жывое і дзейснае слова пісьменніка і слова настаўніка.

*1976*

# *Вытокі вобраза*

Дождж ідзе, рэчка бяжыць, вецер вые... Той, хто першы сказаў так, быў паэтам.

Паэтычны вобраз, алегорыю, метафару нараджае наша адчуванне навакольнага свету як жывой, блізкай, роднай нам істоты.

Спасцігнуць, зразумець, запомніць з'яву і рэч лягчэй цераз параўнанне з самімі сабою або з ужо добра вядомымі і знаёмымі табе ўяўленнямі.

Вобраз — заўсёды радаснае адкрыццё тваёй блізкасці з людзьмі, са светам, з прыродай.

Вобраз — заўсёды загадка і адгадка — заўсёды вобраз. Вобраз у вобразе. Вось паслухайце: Як нарадзіўся, так за кій схапіўся. Хто гэты разбойнік, што з першай хвіліны жыцця ўжо хапаецца за кій? Калі б адгадка кіравалася простай логікай, наўрад ці спатрэбіліся б чалавеку загадкі. У тым і каштоўнасць паэтычнага вобраза, што, надзяляючы невядомае, неспазнанае вядомымі і знаёмымі нам прыкметамі і якасцямі, ён заўсёды здзіўляе нечаканасцю сэнсавай даступнасці і зрокавай дакладнасці. Неспадзяванасць, парадаксальнасць аналогіі, якая ўражвае думку, напэўна, і ёсць бясцэнная ўласцівасць нашай памяці, здольнай няспынна ўзбагачаць сябе ўсё новымі і новымі адкрыццямі.

Дык хто ж той забіяка, што ўжо з пялёнак хапаецца за кій? Не даўшы волі фантазіі, нізашто не здагадаецеся, што гэта — хмель!

Ну, а вось вам яшчэ мудрэйшы дзівак, блазан і штукар: Сам у ботах, а хаджу на галаве. Доўга будзеце гадаць — хто такі, а разгадка простая — цвік у падэшве!..

З цікавасцю чытаю выдадзеную «Вышэйшай школай», на жаль, усяго ў дзвюх тысячах экземпляраў, кнігу, навуковая і практычная значнасць якой не можа не парадаваць усіх, хто мае непасрэднае дачыненне да народнага слова: пісьменнікаў, філолагаў, літаратуразнаўцаў.

Але першымі, хто мае самую пільную патрэбу ў такой кнізе, у такім дапаможніку, я назваў бы настаўнікаў, выкладчыкаў мовы і літаратуры, складальнікаў школьных падручнікаў, метадыстаў, выхавацеляў дзіцячых садоў — усіх, хто вучыць і выхоўвае словам, але часта і вельмі часта забываючы аб першародных, аб самых каштоўных магчымасцях слова — яго вобразнасці, метафарычнасці і выключнай дакладнасці.

Кніга называецца «Паэтыка беларускіх загадак», і напісаў яе чалавек, у багатым і адметным таленце якога шчасліва спалучыліся паэт і вучоны.

Ніл Гілевіч, на творчым рахунку якога ўжо не адна навуковая праца па фальклоры, на гэты раз аб'ектам даследавання выбраў вытокі народнай мовы і чалавека ў той шчаслівай пары, калі ён пачынае адкрываць сабе і спазнаваць свет ва ўсіх праявах, фарбах і гуках.

Слова для дзіцяці — заўсёды чарадзейны ключ, якім адмыкаюцца ўсе таямніцы. Сваёй практыкай і вопытам народ сцвердзіў, што няма болей дзейснага сродку развіцця разумовых здольнасцяў, кемлівасці і дапытлівасці, чым загадка.

Загадкі заўсёды адрасаваліся дзецям. Па даўняй традыцыі фалькларысты лічаць загадку жанрам «дзіцячым». Але вылучым і падкрэслім самае істотнае ў гэтым жанры — ствараўся і ствараецца ён дарослымі, ствараецца людзьмі яркага вобразнага мыслення і ў першую чаргу з педагагічнай, выхаваўчай задачай. Дзеці самі твораць пацешкі, лічылкі, дражнілкі, але вельмі рэдка — загадкі.

У вялікім вопыце народнай педагогікі загадка была і ёсць найпершым падручнікам выхавання чуйнага слыху да слова, да ўсіх яго сэнсавых, вобразных, эмацыянальных і гукавых багаццяў. І гэты нічым не заменны падручнік з пакалення ў пакаленне складаюць, выпрабоўваюць і ўдасканальваюць самыя мудрыя народныя педагогі.

Аўтар даследавання з выключнай дакладнасцю бачыць прызначэнне загадкі якраз маленькаму чалавеку. «У сістэме сродкаў ідэйна-эстэтычнага выхавання дзяцей загадку не можа замяніць нішто — ніякі іншы від або жанр фальклору»,— сцвярджае Н. Гілевіч, знаўца ўсёй народнай творчасці — нашых цудоўных песень, казак, прымавак, замоў і г. д.

Свае сцверджанні ён абгрунтоўвае ўсёй логікай да-

следавання, усім ходам цікавых назіранняў, разваг і вывадаў.

Мне асабліва дарагія плённыя вынікі гэтай працы. Яны даюць падставу спадзявацца, што наша школьная педагогіка болей актыўна і з большай зацікаўленасцю пачне, нарэшце, браць на сваё ўзбраенне магчымасці і сродкі, якія так неабходны цяпер, калі культура слова, дасканаласць валодання мовай, агульная пісьменнасць вучняў павінны стаць галоўным паказчыкам працы кожнага настаўніка.

Гаворачы словамі аўтара, з усіх жанраў фальклору, бадай, нідзе няма такога прастору для выпрабавання слова, як у загадках. Гэта, сапраўды, творчая лабараторыя мовы, у якой нараджаюцца незлічоныя скарбы паэзіі.

Пры дапамозе загадкі, цераз загадку фарміруюцца эмацыянальныя ўражанні, здзіўленне перад адкрыццём тайны, радасць пазнання з'яў і рэчаў, сутнасць і значэнне якіх становяцца найбольш зразумелымі і блізкімі.

Вобразная паэтызацыя, увасабленне нежывой рэчы ў адухоўлены персанаж, у жывую істоту, у чалавека, ды яшчэ блізкага або роднага табе,— як усё гэта ўзрушае і не толькі будзіць думку, а і заахвочвае самога думаць і тварыць!

Малы Малышак
Зваліўся з вышак.
Не так пабіўся,
Як шапачкі забыўся.

Уявіце сабе нечаканае здзіўленне, трывожнае хваляванне, прагную цікаўнасць таго, хто ўпершыню чуе гэтую выдатную паэму з чатырох радкоў! У ёй ёсць героі, які адразу ж выклікаў нашу спагаду і спачуванне,— малы Малышак, і ён, напэўна ж, вясёлы, няўрымслівы гарэза і вяртун, іначай, чаго б ён апынуўся на тых вышках? І вось непрадбачаная бяда — зваліўся з вышак. Але, як і павінна быць нават у самых небяспечных дзіцячых прыгодах, усё абышлося шчасліва — сам цэлы, толькі шапачкі забыўся. А ў гэтай шапачцы, аказваецца, увесь фокус, яна якраз і абвяла нас вакол пальца. Кожны будзе весела ўсцешаны і нават з прыемнасцю пасмяецца з сваёй някемлівасці: як жа я не здагадаўся, што гэта — арэх? Ну, давайце загадвайце другую — цяпер я ўжо напэўна адгадаю... І дзіцячая фантазія, і слых, і ўвага да кожнага слова і вобраза зноў пачынаюць сваю творчую работу.

У гэтай кнізе — сотні загадак, сапраўдных дыяментаў народнай паэзіі, вядомых многім з нас яшчэ з маленства. І чым болей іх увойдзе ў памяць нашых юных сучаснікаў, тым больш чуйнымі будуць яны да хараства моўных багаццяў. Як бы пасля ні вычэрпваліся, ні мялелі крыніцы нашых душэўных запасаў, вытокі маленства, вытокі народнага слова заўсёды будуць жывіць і ўзбагачаць нашы запаветныя пачуцці.

Я не толькі падзяляю захапленне Ніла Гілевіча, з якім ён гаворыць пра дзівосную прыгажосць народных загадак, чарадзейства іх вобразаў, іх рытміку, інтанацыю і гукавую паліфанію. Я рады пацвердзіць сваім вопытам, што многаму з таго, што сам пісаў для дзяцей, памагала памяць маленства, тыя ж загадкі, якія некалі ўражвалі і вабілі дзіцячую фантазію і слых. Цудоўнай загадцы пра ластаўку я абавязаны цэлым раздзелам паэмы-казкі «Буслінае лета».

Шатавіла-матавіла
Па-нямецку гаварыла...

Такія прызнанні ўдзячнасці роднаму слову выказвалі і выказваюць многія з нас, але можа быць, што з асаблівым пранікненнем адчувае і паказвае нам жыватворнае хараство народнай паэзіі аўтар гэтай кнігі — выдатны паэт і ўдумлівы даследчык.

Ніл Гілевіч сказаў важкае і новае слова пра беларускую загадку. Ён разгледзеў яе ў шырокім плане навуковага аналізу. Я свядома вылучыў адзін, але, на маю думку, самы надзённы аспект гэтага даследавання — яго пільную патрэбу нашай практычнай педагогіцы і ўсім, хто заклапочаны болей актыўнымі, болей дзейснымі сродкамі выхавання словам — паэтычнымі багаццямі народнай мовы.

*1976*

# *Вачыма маленства*

Увага — малююць дзеці!

Цэлы свет, цэлая краіна адкрываюцца перад намі.

Колькі фарбаў і колераў, колькі ўрачыстага святла, радасці і шчасця ў гэтай дзівоснай краіне, імя якой — Маленства!

Усе мы выйшлі з гэтай краіны, але зноў у ёй пабываць зможам хіба толькі як турысты.

Я запрашаю вас у падарожжа, якое прынясе нямала хвілін сапраўднай асалоды. А калі на чыё сэрца і набяжыць лёгкая хмурынка засмучэння ад таго, што нам ужо не вярнуцца ў краіну свайго маленства,— не саромейцеся гэтай людской слабасці. Чалавек рэдка азіраецца ў мінулае. І часцей толькі дзеля таго, каб лепш зразумець будучыню.

Тое, што вы ўбачыце вачыма нашых дзяцей, перанясе вас не ў мінулае, а ў наша заўтра.

У кожнага пакалення — сваё маленства. Што для нас некалі было недасяжнай марай, для нашых дзяцей сталася надзённымі ўмовамі жыцця. Пільным клопатам нашых юных грамадзян зрабілася неабходнасць авалодаць космасам. Рэдка хто з іх пры дапамозе сваёй багатай фантазіі і самых маляўнічых фарбаў не пабываў на Месяцы, на Марсе і Венеры. Любімы герой нашых дзяцей ужо не толькі ступіў нагой на глебу далёкіх планет. Ён даўно засяліў іх шумнымі дзіцячымі садамі, пабудаваў там школы, паркі і стадыёны.

І на зямлі нямала турбот у юных энтузіястаў. Нанава адкрываючы свет, яны перайначваюць, удасканальваюць яго, каб у ім было радасна жыць. Паглядзіце, якія гарады малююць яны. Як прыемна жыць у дамах, пабудаваных па іх праектах! І гэта не адвольная фантазія. Усё ставіцца на рэальны грунт, вынікае з жыццёвай патрэбы. Кожная рэч, кожная дэталь, намаляваная рукою дзіцяці, мае сваё прызначэнне.

Паставіўшы вялікі шматпавярховы дом, што зіхаціць усімі сваімі сонечнымі вокнамі, ніхто не забудзе на яго

даху вывесці з дзесятак комінаў, з якіх абавязкова павінен ісці дым. Ідзе дым, значыць, ідзе жыццё, а людзям, якія жывуць у гэтым доме, цёпла, прыемна і ўтульна.

Свет дзіцячых уяўленняў — гэта сапраўды яшчэ не пазнаная намі краіна, дзяржава, у якой уся ўлада належыць дзецям.

Гісторыя чалавецтва не паўтараецца нават у забавах, а творыцца нанава. І ў вясёлым гурце, і на адзіноце, і ў смеху, і ў слязах дзеці твораць тыя галоўныя багацці, без якіх не можа існаваць свет,— сябе, грамадзян і будаўнікоў вялікай будучыні.

Метафарычнасць мыслення, упэўненасць і наіўнасць, уражлівасць і даверлівасць — якасці, уласцівыя ўсім дзецям, незалежна ад таго, у якой частцы нашай планеты жывуць яны.

Ніхто так не блізкі паміж сабой, як дзеці, як іх творчасць. Калі б мова іх уяўленняў, мова іх забаў, радасці і засмучэнняў была прынята дарослымі, яна ўжо даўно зрабілася б мовай шчырага даверу і дружбы.

Мова фарбаў — інтэрнацыянальная. Цераз душы дзяцей збліжаюцца душы бацькоў.

Вось чаму не можа не цешыць нас, што ўсё часцей і часцей у многіх краінах свету наладжваюцца міжнародныя выстаўкі дзіцячага мастацтва, якое заваёўвае ўвагу самай шырокай грамадскасці.

Праўда, паміж творчасцю дзяцей і дарослых заўсёды існавала і будзе існаваць вялікая розніца. І натуральна, што не можа быць паступовага пераходу ад дзіцячага малюнка да карціны мастака. Як немагчыма даросламу вярнуцца ў маленства, так немагчыма сталаму мастаку ўбачыць свет вачыма дзіцяці.

Было б недарэчнасцю ўводзіць у нейкі фетыш наіўнасць дзіцячай кампазіцыі, як гэта робяць прыхільнікі спрашчэння, прымітывізацыі выяўленчага мастацтва, калі прафесійная бездапаможнасць выдаецца за дзіцячае бачанне свету.

Сцвярджаць, што дзіцячая замалёўка — гэта ўжо і ёсць мастацкі твор, можа толькі той, хто не рупіцца пра сапраўднае эстэтычнае развіццё дзіцяці. Мастацкае выхаванне не ў тым, каб захаваць наіўную недасканаласць дзіцячага малюнка, а ў тым, каб глыбокую дзіцячую чуласць да мастацтва перанесці пасля цераз высокі рубеж сталасці.

Не ўсе дзеці, што любяць маляваць, стануць мастакамі. Але, якую б прафесію яны ні выбралі, гэтыя людзі назаўсёды застануцца душэўна чулымі да ўсяго прыгожага, без чаго не можа быць сапраўднай радасці ў чалавека.

Паэтамі, мастакамі становяцца не ў юнацтве і не ў сталыя гады, а ў трох- і пяцігадовым узросце, калі творчы экстаз авалодвае табой з такой сілай, што кожная ўмоўнасць ператвараецца ў рэчаіснасць, калі вакол цябе ёсць толькі тое, чаго ты хочаш, чаго прагне твая фантазія.

— Намаляваць табе кароўку?

— Намалюй.

— Ну вось глядзі: гэта — рогі, гэта — ногі, гэта — хвост, а гэта — малачко...

Сама карова з яе рагамі і хвастом занялі на паперы не многа месца, затое малачко — увесь ліст. У ім, у малачку, галоўны сэнс і пафас натхнення.

Мая мастачка не толькі намалявала карову, яна ўжо доіць яе. І я сапраўды чую, як цурчыць пахучы сырадой, як пругка б'е ў дно дайніцы.

І вось добрая гаспадыня шчодра ўжо частуе мяне, налівае поўную конаўку. І я з асалодай п'ю.

Але што мая асалода ў параўнанні з урачыстасцю чарадзейкі, якая стварыла гэты цуд!

Яна ходзіць вакол свае «кароўкі», прысядае, гаворыць з ёй, як з самай блізкай істотай, потым гоніць на пашу, на лужок.

І так да новага дзіва...

Малюнкі беларускіх дзяцей пабывалі ў Бельгіі, Італіі, Чэхаславакіі, Польшчы, Югаславіі, Індыі, ЗША. Многія з іх адзначаны ўзнагародамі і дыпломамі аўтарытэтных журы.

Эстэтычнае выхаванне дзяцей пачынае займаць у нас усё большую заклапочанасць дарослых, і асабліва творчай інтэлігенцыі.

Самай шчырай удзячнасці заслугоўвае работа, якую дзесяткі год вёў у выяўленчай студыі Мінскага палаца піянераў старэйшы педагог і вядомы мастак Сяргей Пятровіч Каткоў і якую вядзе мастак Васіль Фёдаравіч Сумараў — кіраўнік студыі на Мінскім камвольным камбінаце, нястомны прапагандыст думкі, што ўсе дзеці ад прыроды — мастакі, таму што бачаць свет у яго самых яркіх фарбах і вобразах.

Вялікую работу вядуць студыі ў Бабруйску, Слуцку,

Пінску, Гомелі, Баранавічах, Магілёве, Віцебску, Брэсце, у школах-інтэрнатах, у многіх вясковых школах. Добрай традыцыяй становяцца ў рэспубліцы выстаўкі дзіцячай творчасці.

Трэба ўсюды з самых лепшых малюнкаў дзяцей ствараць сталыя экспазіцыі, якія былі б у заўсёдным руху па дзіцячых садах, школах, клубах, бібліятэках, кінатэатрах. Колькі светлай радасці прынясуць яны не толькі дзецям, а і дарослым, колькі прывабяць удзячных сэрцаў!

Чым болей будзе ўцехі ў нашых дзяцей, тым большай будзе радасць адкрыцця і пазнання мастацтва, тым болей будзе шчасця ў іх жыцці.

Шырэй адкрывайце дзецям свет прыгожага, ва ўсіх яго фарбах і колерах, ва ўсіх яго невычэрпных скарбах!

*1974*

# *Не толькі сямейная падзея*

Вяселле... Якое яно павінна быць?

Адкажу адным словам: вясёлае. Вяселле павінна быць вясёлае.

Не бяруся прапанаваць методыкі, ні тым болей сцэнарыя, чаго звычайна дамагаюцца распрацоўшчыкі і «праекціроўшчыкі» новых абрадаў.

Будучы ў адной замежнай краіне, мы з таварышам, зайшоўшы ў рэстаран паабедаць, сустрэлі відовішча, якога нідзе і ніколі дагэтуль не бачылі. За доўгім сталом, на відным месцы, сядзелі, мяркуючы па ўбранні, маладыя і іх госці. Але як трымалася ўся гасціна — і маладыя і пажылыя — з застылымі нерухомымі абліччамі, без аніводнага слова і ўхмылкі, гэта было нешта супрацьлеглае нашым уяўленням пра вяселле.

Кампанія адседзела запланаваны час, паднялася і накіравалася да дзвярэй. Калі маладыя праходзілі міма нашага стала, мы — я і мой друг — усталі. Мой калега, вясёлы, няўрымслівы ўкраінец, не ўцярпеў. Ён папрасіў дазволу павіншаваць маладых. Працэсія прыпынілася. Мой друг з шырокай добрай усмешкай сказаў, здавалася б, самыя простыя чалавечыя словы, якія ў нас гавораць у падобным выпадку, і... о, дзіва! Нявеста шчасліва ўсміхнулася — першы раз за ўсю ўрачыстасць. Павесялелі твары ў гасцей. Павесялелі і мы самі ад таго, што і на гэтае дзіўнае вяселле хоць на хвіліну зазірнула весялосць.

Потым нам тлумачылі, што вяселле гэтае з мясцовасці, дзе якраз бытуе такі звычай — вяселле без вяселля.

У нашых вясельных звычаяў зусім іншы характар. І чым паўней, задушэўней ён раскрываецца і выяўляецца, тым большая асалода ўсім удзельнікам гэтай, ніколі не забыўнай у жыцці чалавека ўрачыстасці.

Вось чаму, мне здаецца, адразу ж трэба сказаць самае галоўнае, што сучаснае, новае вяселле — гэта не толькі нечае асабістае сямейнае свята, а падзея грамадская, свята нашага новага жыцця. І ў яго падрыхтоўцы

і правядзенні павінна быць блізка зацікаўлена грамадскае асяроддзе як у сродку вельмі важных магчымасцяў культурнага, этычнага і эстэтычнага выхавання людзей, асабліва — моладзі.

...Я ўсё яшчэ пад уражаннем двух дзён, якія адгуляў на вяселлі ў роднай вёсцы. У галаве гудуць маршы, вальсы і полькі нанятай у горадзе капэлі — акардэон, кларнет і бубен,— сабранай і злучанай выпадкова, на скорую руку, бо, едучы іграць вяселле, музыкі толькі ў аўтобусе пачалі знаёміцца між сабой, практыкавацца і згаворвацца, як іграць і хто на што здатны. На жаль, і кожны паасобку, і ўтрох яны мала на што былі здатныя, і маладыя мусіў іх наймаць толькі таму, што ў апошнюю хвіліну падвёў музыка, з якім было дамоўлена загадзя. Маймy беднаму, змардаванаму ўсімі іншымі клопатамі маладому прыйшлося, калі ў хату ўжо збіраліся госці, гойсаць па райцэнтры і шукаць — хто б мог уратаваць яго ў такую хвіліну, калі над вяселлем навісла пагрозай... музыка!

Нагледзеўся я на цяперашніх музык — бяздушных раменікаў. Яны ўсё могуць і нічога не ўмеюць. Дзіва, што не раз успамінаў я музык свайго юнацтва. У суседняй вёсцы было аж дзве капэлі, а цераз вёску — яшчэ і трэцяя. Гэта былі музыкі паводле прызвання. Яны шанавалі сваю славу, саміх сябе як музык, калі на людзях браліся за інструменты. Якая была зладжанасць і адчуванне ўрачыстасці свайго абавязку! Ужо тое, што вяселле ігралі гэтыя музыкі, надавала важнасць падзеі.

Тады вёска і сніць не магла пра той узровень дабрабыту і развіцця, якога дасягнула цяпер. І вось парадокс, над якім нельга не задумацца: матэрыяльнае багацце, тэхнізацыя культурнага побыту — тэлевізары, транзістары, машыны, матацыклы, газавыя пліты, электрасвятло ў сенцах, у хлявах — і ў той жа час занядбанне духоўных радасцяў, якія высока шанаваліся ў вёсцы.

Паспяхова сціраючы грані, вёска, як мне здаецца, занадта па-спажывецку глядзіць на горад, які, маўляў, павінен даваць ёй усю культуру, аж да вясельных музык, якіх, не дай бог, дадумаюцца (як дадумаліся ўжо ў гарадах) па нарадах пасылаць так званыя камбінаты бытавых паслуг! Няўжо сельская мастацкая самадзейнасць жыве толькі ад агляду да агляду — у раёне, у вобласці, у сталіцы? Пара, даўно пара часцей «агля-

даць» яе на месцы, дзе яна ствараецца і выпрабоўваецца — і ў калгасных клубах, і на вяселлях.

Рэжысура вяселля выпрацоўвалася стагоддзямі. Натуральна, што многае з абрадавай атрыбутыкі адышло ў нябыт, страціўшы свой сэнс. Але ці варта адкідаць літаральна ўсё? Не толькі не варта, а наадварот — трэба было б падумаць, як паэтычную сімволіку вяселля ператварыць у сродак выхавання эстэтычнай і духоўнай высакароднасці пачуццяў, якой так нестае такой вялікай падзеі ў жыцці, як вяселле, не толькі ў вёсцы, а і — асабліва — у горадзе.

Як стараецца сучасная людская фантазія ўпрыгожыць гэтую падзею, знайсці новую вобразную сімволіку! І трэба сказаць, што многае ўдала знаходзіцца. Удала, трапна знойдзенае пераходзіць, замацоўваецца ў народныя звычаі, у абрадавыя адзнакі: упрыгожанне кветкамі, істужкамі, каляровымі шарамі машын, у якіх едуць у загс, у сельсавет маладыя. Добрую душэўную ўсмешку выклікае святочная лялька, пасаджаная на радыятары або на кабіне машыны. Усё гэта знайшлося натуральна, самім народам і становіцца народным. Думаю, што і даўно знойдзенае магло б набыць новы вобразны сэнс.

Выпраўляючы сына па нявестку, каб ехаць у сельсавет, маці з бацькам тройчы абышлі машыну, абсыпаючы яе збожжам,— прыгожа і паэтычна! Адвечны напамін пра шчасце селяніна: жыта — жыццё, багацце. У некаторых славянскіх мовах і жыта і шчасце і цяпер завуцца адным словам — багацце.

А які прыгожы, як крапае за душу звычай, калі бацькі маладой выносяць насустрач маладому і яго гасціне стол і гэтак жа сустракаюць, прымаюць упершыню ў сваю хату нявестку бацькі маладога, калі маладая ў сваім урачыстым вясельным уборы, выйшаўшы з машыны, ідзе па дарожцы, высланай ёй ад вуліцы да парога, ды яшчэ ўсыпанай зялёнінай і кветкамі.

Выносяць сталы і яшчэ паводле аднаго звычаю на гэты раз — хлопцы, якія робяць «засады» на дарозе, патрабуючы выкупу за маладую. Гэтыя цырымоніі і відовішчы, якія збіраюць цікаўных — паглядзець маладую, маладога, пажадаць ім шчасця,— хоць і вельмі даўнія, але ўвайшлі ў звычай. Мне спадабалася, што і на ганку сельсавета маладых сустракалі і хлебам, і соллю, і добрым словам.

Вельмі цікавая і адна з найважнейшых вясельных цырымоній — і ў хаце нявесты, і пасля ў хаце жаніха як завяршэнне ўсёй паэзіі вяселля — дзяльба каравею. Я ўпэўнены, што гэты ўрачысты, пацешны і вясёлы абрад народ не выкіне з арсенала сваёй творчасці. Гэта надзвычай павучальны абрад паводле сэнсу закладзеных у ім традыцый, якія з пакалення ў пакаленне вучылі высокай пашане сямейнай этыкі: тут усе градацыі сваяцтва, сяброўскай і суседскай вернасці. У якім арэоле павагі паўстаюць бацькі, бабка, дзед, родныя ўсіх ступеняў і каленаў, і кожнаму павінна быць знойдзена і сказана шчырае слова прывітання, і яны ў сваю чаргу адказваюць маладой сям'і такой самаю шчодрасцю сваіх пачуццяў.

Гэтая цырымонія — цэлая школа ўзаемнай павагі і пашаны. Усю яе важнасць я адчуў упершыню, бо ўпершыню ў жыцці быў прызначаны на высокую і адказную пасаду вясельнага свата і два дні вёў гэты, не такі ўжо і лёгкі, рэй. Як я справіўся з пачэснымі абавязкамі? Па прызнанню гасціны — справіўся. Многае маё сваяцтва, нават і не самае блізкае, узяло з мяне слова быць за свата, бо ў многіх «ужо нешта наклёўваецца»— адны дачку аддаюць, другія сына жэняць, трэція — нагледзелі прымака. Так што калі і на пенсію пайду, то работы — да пакатынку, і якое работы!..

Спыніўшыся толькі на некаторых звычаях і абрадах, якіх народ шукаў да нас, шукае і ўдала знаходзіць цяпер, асобна хачу звярнуць увагу на самы адказны момант, без якога не абыходзіцца ні адно вяселле — на замацаванні новай сям'і грамадзянскім актам, дзяржаўным законам.

Хоць у гарадах галоўным цэнтрам вясельнай урачыстасці стаў так званы Палац шлюбу, гэта далёка не вырашае ўсіх магчымых формаў грамадзянскага рытуалу. Лягчэй за ўсё канапізаваць, выпрацаваць схему, штамп. Але нават царква, усталяваўшы шлюбны рытуал, стагоддзямі ўдасканальвала яго. Самае крыўднае, што многія, хто бярэцца выпрацоўваць новыя абрады, іх ідэальнае ўдасканаленне бачаць у цыркуляры. Але вяселле па цыркуляру, па інструкцыі не наладзіш. Прызнаюся па-шчырасці, я зусім не цешуся пампезнасцю шлюбных палацаў. Гэта — спараджэнне інертнай думкі: маўляў, хочаце, каб было прыгожа, калі ласка — не горш, чым у

царкве. Мала ўцехі, што колькасць гэтых так званых палацаў расце: у сталіцы — сталічны, у вобласці — абласны, у раёне — раённы...

У распараджэнні сельсавета, куды мае маладыя ездзілі браць шлюб,— цудоўны будынак клуба: прасторнае фае, радыёфікаваная аўдыторыя, вялікая спартыўная зала, пакоі самых розных прызначэнняў — для гульняў, для адпачынку. Няўжо ж некаму прыйдзе ў галаву будаваць яшчэ шлюбны палац? З гэтымі абавязкамі добра спраўляецца клуб.

У той дзень у ім запісвалася адначасова тры пары толькі з аднаго нашага калгаса! На сцэне сядзеў паважны прэзідыум. Зала была поўная моладзі, пажылых людзей, якія сабраліся на ўрачыстасць. Рытуал запісу ў клубе стаў не толькі асабістым святам маладажонаў. Пад гукі музыкі маладыя ва ўсім сваім харастве ўваходзяць у залу, па прыступках урачыста падымаюцца на сцэну. Прэзідыум устае. На стале — дакументы, гатовыя законам засведчыць новую сям'ю. Маладыя распісваюцца, да ўрачыстага акта далучаюць свае подпісы паручыцелі. Старэйшыя, паважаныя людзі віншуюць маладых. Потым абвяшчаецца вальс — спецыяльна для маладых.

Прыемна, што ў нашым сельсавеце гэта ўжо становіцца добрай традыцыяй, і прыкра толькі адно, што асоба, павязаная цераз плячо чырвонай істужкай і ўпаўнаважаная весці гэтую ўрачыстасць, ніяк не можа абысціся без паперкі, без напісаных некалькіх слоў, якія трэба сказаць з абавязку службы. Абыякавасць, бяздушнасць у такую хвіліну ўсім можа сапсаваць святочны настрой.

Крыўдная заўвага, але з песні слова не выкінеш. А я пяю песню такой, якой яна ёсць.

Мой старэйшы пляменнік, які жаніўся паўгода назад, шкадаваў, што на яго вяселлі было не так, як у малодшага. Чаму? Аніхто не сказаў вясёлага слова, а ўсё адно і тое ж: «За маладых!», «За маладых!», «Горка!» Ну, што ж, добра, што мае маладыя сябры разумеюць, што на вяселлі, як і на любой іншай добрай бяседзе, зусім не абавязкова, каб сталы былі густа ўстаўлены бутэлькамі, місамі і талеркамі. Найлепшая радасць — адчуць, што табе прыемна з людзьмі і між людзей. Старое вяселле з яго рытуалам, са стэрэатыпам гатовых, завучаных на памяць абрадавых выслоўяў, з вядомым рэпертуарам

прымавак свата і свахі існуе ўжо толькі ў фальклорных запісах.

Узровень культуры сучаснай вёскі, як і горада, вымагае і ў правядзенні сямейных свят жывой ініцыятывы, дасціпнай выдумкі, імправізацыі і той творчасці, што вынікае з сучасных умоў жыцця і новых адносін паміж людзьмі.

Як прыемна было, што і ў хаце нявесты, і ў хаце жаніха за два дні вяселля, на якім перабыло не меней двухсот чалавек гасціны, не было ніводнага выпадку, каб хто перабраў меру, каб нехта з некім браўся загрудкі. Найлепшай асалодай былі — удалы жарт, пажаданне маладым і добрая, задушэўная песня. Радасны настрой і ўзрушэнне ішлі ад разумення галоўнага: ствараецца новая сям'я з людзей, якія кроўна звязаны з жыццём, з будучыняй гэтай зямлі, гэтага калгаса, сям'я на прынцыпова новым сацыяльным і грамадскім грунце, на аснове ўзаемнай роўнасці.

На час майго юнацтва такая падзея была рэдкая, сучаснай вёсцы — характэрная: адслужыўшы ў арміі, калгасны шафёр, які завочна вучыцца на агранома, жэніцца з дзяўчынай, што канчае інстытут замежных моў. Дзе яны будуць жыць, працаваць? Вядома ж, тут, у вёсцы, якую любяць і хочуць аддаць ёй свае сілы, здольнасці і веды. Так рашылі яны.

З якім густам, як прыгожа былі прыбраны і адзеты маладыя людзі, іх сябрына! Сапраўды, у гэтым сэнсе не тое што ніякай розніцы паміж горадам і вёскай няма, а, як на маё асабістае ўражанне, якраз у вёсцы цяпер, можа быць, эстэтычны густ нават большы, чым у горадзе, бо падмацоўваецца ён высокім матэрыяльным дабрабытам.

І як крыўдна, што побач з такімі прыемнымі рэчамі культурныя патрэбы той жа вёскі сутыкаюцца вельмі часта з праявамі абыякавасці, бяздушнасці і самага звычайнага гультайства, ад якіх і дагэтуль не вызваліліся некаторыя людзі, што ўзначальваюць сельскія асяродкі культуры. Чамусьці загадчыкі калгаснага або саўгаснага клуба такую падзею, як вяселле, не лічаць сваім клопатам. У іх гэта не планавае мерапрыемства. Падрыхтуюць памяшканне, напаляць печ, калі загадае начальства. Але ніхто з іх не лічыцца з тым добрым звычаем,

што цяпер калі адбываецца вяселле, то моладзь сыходзіцца на танцы ў клуб.

Так было і на гэты раз. Калі моладзь прыйшла ў свой клуб, на дзвярах убачылі замок. Нарэшце, яго адамкнулі, але запусценне і няўтульнасць, холад — хоць ваўкоў ганяй — не вельмі выклікалі жаданне танцаваць. І ўсё ж танцавалі! Спярша ў паліто, у шапках, у хустках, потым, угрэўшыся, пачалі распранацца, звальваючы вопратку на сталы, на лавы, а то і ў кут...

І яшчэ новае дзіва, асабіста для мяне, чаго я раней не бачыў,— гэта сучасныя «трохпавярховыя» танцы. Адначасова танцуюць дарослыя і падлеткі, а паміж іх, як густая машкара, таўкуцца ва ўсім гэтым гармідары дзеці. Крый бог, не падумайце, што я падымаю голас пратэсту супраць дзяцей. Я не за тое, як некалі было, калі нас проста бралі за каршэнь і выкідалі за парог. Наадварот, я радуюся, што ў клуб, як на свята, ідуць і малыя, і старыя. Але ж, мілыя мае, хай жа гэта будзе сапраўды свята, хай клуб будзе месцам, дзе прыемна пабыць:, каму павесяліцца, каму адпачыць, каму павучыцца добрым манерам абыходжання, этыкету, пашане да жанчын і да старэйшых людзей. Калі ў школе гэтаму мала вучаць, павінен вучыць клуб, на тое ён — Дом культуры.

Ідучы ў гэты дом, кожны ведае, што павінен культурна, па-святочнаму апрануцца, а пераступіўшы парог гэтага дома, ведаць, дзе яму пакласці ці павесіць верхняе адзенне. Прыкра бачыць, калі ўсе куткі завалены вопраткай, калі пары танцораў сядзяць, адпачываюць, а старэнькай бабульцы, што прыйшла зірнуць на маладых, не адразу знайшлося месца.

Я ўсёй душой за тое, каб у клубе танцавалі дзеці, нават самыя малыя. Але няхай гэта будзе прыгожа, няхай спецыяльна для іх іграе музыка, а дарослыя не замінаюць ім. Якая асалода пaглядзець, пацешыцца, калі танцуюць дзеці! Думаю, што настаўнікі, якія вучаць дзяцей у школах, усюды павінны быць настаўнікамі, тым больш — у клубе.

І зусім не абавязкова, як гэта робіцца дасюль, вяселле зводзіць толькі да танцаў. Як бы ўсё напоўнілася большым зместам, падахвоціла творчую ініцыятыву моладзі, калі б са сцэны клуба загучалі песні, загучалі вершы, вясёлыя апавяданні, павіншаванні і пажаданні

маладым. Тут — самае шырокае поле сельскай мастацкай самадзейнасці...

Адзін мой друг, з якім я пазнаёміўся на бяседзе, развітваючыся, даў мне такі наказ: «Слухай, брат, апішы ты гэта вяселле, апішы...»

Пад гарачую руку я паабяцаў — і вось мусіў стрымаць слова. Але, канчаючы свае развагі, я ўжо думаю не пра тое, што было, а зноў вяртаюся да пытання, з якога пачаў: якім павінна быць вяселле?

Давайце падумаем разам.

*1974*

# *Чалавек, натоўп, мода...*

## *Голас друга*

Паведамляючы, што ў 1975 годзе будзе змешчана на старонках «Маладосці», часопіс упамянуў і гэтыя нататкі.

І вось, не надрукаваўшы яшчэ ні аднае з іх, я атрымліваю водгук чытача. Бываюць жа такія неспадзяванкі! І трэба сказаць, не толькі прыемныя, але і вельмі патрэбныя аўтару.

Мой будучы чытач, якога зацікавіла тэма размовы, так выразна і дакладна выказаў меркаванні, якіх якраз не хапала лагічнаму строю маіх думак: чалавек, натоўп, мода...

Адкуль пачаць гаворку?

Мой чытач пачаў яе з канца — з моды. І што мне самому здавалася найбольш складаным, раптам праяснілася, як тая печка, ад якое хоць і пачынаеш танцаваць, але неўзабаве пераконваешся, што печка надта ж заняла шмат карыснае плошчы.

Пачнём з моды.

«Усе любяць гаварыць пра свой густ, а калі глянеш, бывае, на той густ, дык там адна сляпая мода, у якой ён, гэты густ, увесь і ўтапіўся.

А густ — гэта ж вельмі адметнае адрозненне аднаго чалавека ад другога. Сляпы, неразборлівы густ выяўляе толькі аднастайнасць, стандартнасць, пазбаўляючы чалавека самастойнасці і асабістай адказнасці за развіццё сваіх індывідуальных схільнасцяў і магчымасцяў.

Мода не заўсёды фарміруе густ, часта яна выяўляе адсутнасць усякага густу — рабскае перайманне, малпаванне і папугайніцтва.

Стыхія сляпой моды ва ўмовах усеагульнага матэрыяльнага дабрабыту ператвараецца падчас у сваю супрацьлегласць — у забабоны...»

З удзячнасцю я прыгадваю гэтыя думкі не толькі майго чытача, але і дарагога друга яшчэ з юнацкай па-

ры Яўхіма Іванавіча Кохана, які прыслаў мне іх з дарогі.

За дзесяткі год ён аб'ездзіў усю краіну ад яе заходніх да ўсходніх граніц. У дарозе ён і цяпер, у дарозе жыцця, працы, паэзіі і няспынных разваг.

Дзякуй табе, дружа, што падаў ты свой голас якраз тады, калі мне так патрэбна была падтрымка.

Я не рашыўся б разгортваць сваіх запісаў, калі б яны займалі толькі маю ўвагу.

Мае нататкі не прэтэндуюць на катэгарычнасць, на безапеляцыйнасць сцверджанняў.

Магчыма, я ў нечым памыляюся, у нечым перабольшваю, але гэта выклікана неабыякавасцю да пэўных з'яў у практыцы этычна-эстэтычнага выхавання, якія не могуць не хваляваць і не трывожыць.

## *Зняважанае свята*

Быў сведкам урачыстасці — у раённым цэнтры адкрылі рэстаран. Падзея важная, тым болей што гэта першы і пакуль адзіны рэстаран у горадзе: узорная чысціня, утульнасць, дзяўчаты-афіцыянткі адчуваюць сябе на рабоце, як на вялікім свяце.

Але неўзабаве ўсё змянілася — парадак прыйшоўся не да густу самым актыўным наведвальнікам.

Зайшоўшы праз некалькі дзён паабедаць, я ўбачыў, як за сталамі, засланымі вышыванымі сурвэтамі, у мяккіх крэслах сядзеў «актыў» і «цвет» кліентуры, упэўненай, што рэстаран — гэта тая ж забягалаўка, толькі ў большых маштабах.

Яны сядзелі за сталамі ў брудных спяцоўках, у гумавых ботах, з тварамі, зарослымі шчаціннай, з рукамі ў сажы і мазуце. І калі каго прымушалі зняць плашч, паліто ці шапку, то ўсё гэта прымалася як непатрэбныя і лішнія цырымоніі.

Хто яны? Асмельцеся запытацца. Кожны скажа: рабочы, толькі-толькі ад станка, ад машыны. Ідучы сюды, яны ўжо з'ядналіся ў «дружныя калектывы» — па траіх, па чацвярых.

Але ў адрозненне ад сапраўднага рабочага, які высока нясе сваю працоўную годнасць, такі вось «забягалаўшчык» з асаблівай эгаістычнай зласлівасцю і нахабным

чванствам лезе ў вочы сажаю і мазутаю, выстаўляючы іх як права на хамства і самадурства.

Бясспрэчна, кожны недзе працуе. Але чаму пасля работы ён спяшаецца не дадому — памыцца, пераапрануцца, паабедаць, нарэшце? Здагадацца не цяжка: калі ён пойдзе дадому, да таго ж — паабедае, дык, напэўна ж, пішы — прапала: «культурненька» ўжо не пасядзіць і не прыпаўзе на карачках дадому.

Здавалася б, рэстаран, сталоўка — не толькі месцы харчавання, а і пэўныя грамадскія асяродкі, дзе чалавек на вачах у другіх людзей, дзе ўмовы прыстойнасці і культуры абыходжання разумеюцца самі па сабе і іх не абавязкова пісаць і вывешваць на сценах, як «Правілы паводзін».

У падваротнях, у цёмных кутах, на лесвічных пляцоўках, на падаконніках, дзе ўвесь «стол на траіх» змяшчаецца на абрыўку газеты і абыходзіцца шклянкай, пазычанай у аўтамаце газіраванай вады, выхоўваюцца, вядома, не найлепшыя звычаі.

## *Балельшчык, які не балее і не хварэе*

Тэхнізацыя эмоцый — духоўнае збядненне.

Калі я бачу, як, здавалася б, у самыя свае інтымныя хвіліны ў парку ці на скверы сядзяць двое, а між імі — транзістар, дык я заўсёды думаю, што гэты трэці, безумоўна, лішні, хоць і прыкідваецца другам.

Ёсць над чым задумацца: у запаветныя часіны, калі нам хочацца спяваць, мы ўключаем транзістар.

З цягам часу страціцца і эмацыянальны імпульс патрэбы выяўляць свае пачуцці, свой настрой у песні. Для гэтага ў нашай уладзе ёсць механічны голас.

Баюся, што і слова, уся дасканаласць яго адценняў, таксама бяднее па той жа прычыне. Мы ўжо можам задавальняцца лічанай колькасцю моўных знакаў. Прыслухайцеся, як абыходзяцца са словамі цэлыя табуны маладых людзей на вуліцах нашых гарадоў — іх лексікон вычэрпваецца ўжо дзесяткам усім вядомых сказаў. Адвучваючыся гаварыць, выказваць думку словамі, няўжо ж і гэтую сваю ўласцівасць мы аддадзім робату?

Вось вы прыйшлі ў госці да сяброў, з якімі даўно не бачыліся, з якімі ў вас, здавалася б, ёсць пра што пага-

варыць, але пагаварыць вы не зможаце. Вам не дасць той, хто ўзяў адзінае і манапольнае права — гаварыць, спяваць, забаўляць, вучыць — самы разумнейшы за ўсіх нас, разам узятых.

Ужо не гаспадар і не гаспадыня дома сустракаюць сваіх гасцей, а ён — няўмольны дэспат. Вы толькі пераступілі парог, а ўжо мусіце і свой пагляд, і сваю ўвагу аддаць яму. Нават калі будзеце сядзець за сталом, дык і тады ён не выпусціць вас з-пад свае ўлады.

Хто яго ведае, можа, многім ён, і праўда, незаменны памочнік, што бярэ ўсе клопаты на сябе. Інакш трэба было б думаць — пра што гаварыць, чым забавіць гасцей.

Свет сучасніка пашырыўся. У блакітным акенцы змяшчаецца ўся планета, але ці наблізіліся да нас яе трывогі? Эмацыянальна мы не паспяваем усе іх успрымаць і асэнсоўваць.

Большасць сваіх уласцівасцей, адкінуўшы самі, мы аддалі тэхнічнаму партнёру.

Мабыць, ніхто так не фанабэрыцца дачыненнем да ўсяго свету цераз сваё акенца, як сучасны абывацель.

Нішто так дакладна не характарызуе сучаснага абывацеля, як самае вядомае цяпер вызначэнне: балельшчык.

Не ўдзельнік, не творца падзей і спраў, а балельшчык, і, вядома ж, не ў тым сэнсе, што ён сапраўды здольны хварэць, перажываць, пакутаваць — не, балельшчык дзеля забавы, дзеля моды, і то пры ўмове, калі яго «балесці» абстаўлены камфортам.

Самыя «вялікія страсці» на стадыёнах, на футбольным полі. Крыўдна, што ў гэтую прафанацыю пачуццяў уцягваюцца дзеці. Мяне ўстрывожыла анкета дзіцячай газеты, якая пыталася ў сваіх чытачоў з таямнічай магіяй: «Што б ты зрабіў, каб стаў чарадзеем?»

— Зрабіў бы так, каб выйграла каманда «Дынама»! — адказала большасць юных «чарадзеяў».

## *Заломшчыкі*

Ідучы дзіцячым паркам, раптам пачуў за сабою выклік захаплення:

— Вот гэта здаравяк!

Госпадзі, ці не я здаўся некаму здаравяком?

Я азірнуўся.

Малады, інтэлігентнага выгляду мужчына — інжынер, урач, спартсмен, настаўнік, не ведаю хто, адным словам, сучасны мінчанін — паказваў сваёй маладой спадарожніцы новенькі мосцік цераз ручаіну, якая перасякае парк.

Што захапіла іх увагу — адразу я не зразумеў, зірнуўшы на мосцік: яго выфарбаваныя парэнчы зіхацелі на сонцы. І раптам я ўбачыў — адна з іх, тоўсты металічны прэнт, прыгнута зверху ўніз так, што ўтварыла перавернутую дугу. Вось што выклікала захапленне маладых людзей! Сапраўды, трэба было мець сілу бугая, каб гэтак выгнуць жалеза.

І тут у галаву мне стукнула думка: як жа я адстаў ад сучасных уяўленняў пра хараство і значэнне сілы! Відаць жа, каб я ўбачыў пераламаную парэнчу, першае, што я сказаў бы: — Ну, і свалата, ну, і падлюга ж!

Такой бы яна і была, мая псіхалагічная рэакцыя, маё разуменне той сілы, праявы якой вельмі ж часта не толькі відны, а кідаюцца ў вочы на кожным кроку: раскіданыя, разварочаныя лаўкі, пабітыя камянямі электрычныя ліхтары і лямпы на слупах, раструшчанае шкло ад посуду, асушанага аматарамі «культурна» пасядзець на ўлонні прыроды,— дый ці мала іх, слядоў штодзённага варварства на нашай зямлі?

З трывогай даўно заўважаю, што ў маладога гараджаніна вельмі мала павагі да таго, што робіцца, ствараецца для яго ж дабрабыту, дзеля прыгажосці, якая б цешыла яго вока, выхоўвала яго эстэтычны густ.

Калі будавалі каля музея Янкі Купалы першы, самы вялікі ў Мінску, фантан, яго гарлавіну, каб падсвечваць ваду, выклалі каляровым шклом. Аднае раніцы я выганяў адтуль, з фантана, падлеткаў, якія зубіламі выбівалі гэтыя каляровыя пліткі. Дзеля чаго спатрэбіліся яны — патоўчаныя, патрушчаныя на дробныя кавалачкі — дзецям? А так, дзеля забаўкі. Гэта былі дзеці з дома цераз вуліцу, што насупраць фантана і садка, у якім яны гуляюць штодня цяпер і будуць гуляць, калі стануць пенсіянерамі. Але баюся, наўрад ці заварушыцца калі іх вінаватае сумленне.

Пачынаецца самая шчаслівая пара года — вясна. Каго ў вольную хвіліну асабліва вечарам не вабяць паркі, скверы, нашы плошчы і вуліцы! Але паглядзіце, якія сляды дрымучага дзікунства застаюцца ў кожным

кутку і ля кожнай лаўкі, дзе пабывала «цёплая» гітарная кампанія: цэлыя горы смецця, недакуркаў, лушпіння, папяровага ашмоцця, бляшанкі ад кансерваў і нават не кавалкі хлеба, а пакрышаныя, паламаныя цэлыя буханкі. Як хутка забыліся некаторыя барадатыя і вусатыя нашы нашчадкі, якою цаною ён абышоўся іх бацькам, гэты хлеб!

Я ўжо не кажу пра такія адзнакі хлапецкага дзікунства, як віртуознае цырканне праз зубы, якому мог бы пазайздросціць вярблюд.

На кожным кроку стаяць урны, але для нашых юных сучаснікаў — гэта ўжо атрыбуты старажытнай цывілізацыі.

Дарагія мае мінчане, а ці мала хто з вас не затыкаў насоў, праходзячы цераз пад'езды і лесвічныя пляцоўкі сваіх дамоў? Смурод забівае дых. Гэта таксама сляды нашых сяброў, але зусім не тых, што пакідаюць свой «аўтограф», папярэдне абнюхаўшы вугал дома. Гэтыя распісваюцца, не нюхаючы, і з куды большым заліхвацкім росчыркам!

Адкуль ідзе гэта? А ўсё ад той жа заліхвацкасці, ад маладзецкага імкнення паказаць «силушку богатырскую». Рэдка-рэдка хто цяпер выступае ў адзіночку. Заліхвацтва прыстасавалася да сучаснасці. Якая цікавасць ставіць рэкорды, каб ніхто не бачыў? Так і нараджаецца тая «мастацкая» самадзейнасць, якая выклікае захапленне: «Ах, які здаравяк!» Іначай — навошта ж сілу траціць? Той маладыя, поўны сілы і «сучаснага» інтэлекту бугай, які ламаў парэнчы моста, я ўпэўнены, рабіў гэта не дзеля сваёй асабістай пацехі, не тайна, а на вачах аўдыторыі падобных да сябе.

А ёсць у нашым побыце з'явы, якія ўжо мала каго трывожаць. Хто з нас, гараджан, не бачыць, як тыя ж «рыцары» ў нашых кволенькіх садках і скверыках ломяць, латошаць кусты бэзу, што не паспеў яшчэ прыжыцца, разрасціся як след, топчуць ружы, выварочваюць з карэннем цюльпаны, гладыёлусы, а зацвітуць вішні і яблыні — не пашкадуюць і іх. Тое, што расце, цвіце на вачах усіх,— сучаснаму дзікуну яшчэ не краса, не асалода. Толькі тады ён у поўным шчасці, калі ўсё будзе скрышана, спляжана і перацягнута ў сваю «камфартабельную» пячору.

Не ведаю, ці ёсць у нашым гарсавеце статыстыка,

якая падлічвае ўсе гэтыя страты, што прычыняюцца гораду кожны год, і якая тэндэнцыя росту або зніжэння гэтых страт.

Не можа не трывожыць усіх нас іншая статыстыка, якую весці куды цяжэй, але з якою мы павінны змагацца ўсімі магчымымі сродкамі: гэта этычныя страты, духоўныя калецтвы, якія робяць, перш за ўсё, самі сабе, сваімі рукамі свайму сумленню тыя, хто шкодзіць, гнюсіць і брыдзіць у калектыўным доме, і тыя, хто бачыць гэта і не лічыць усё гэта небяспечным маральным злачынствам.

Калісьці ў старой вёсцы самым страшным злачынствам быў залом у жыце — пучок каласоў, заламаных і скручаных вузлом. Гэта значыла, што ў вас ёсць закляты вораг, які жадае вам няшчасця. Калі жыта зжыналася, залом пакідаўся некранутым. Ён заставаўся на полі жахлівым напамінкам і дакорам таму, хто зрабіў гэтае злачынства.

Ніякія дакоры сумлення, на жаль, не мучаць сучасных заломшчыкаў.

## *Гукавая экзекуцыя*

Не раз ужо ўзнікалі пратэсты супраць той бяздумнасці, з якой у нас у месцах масавых збораў — у парках, у цягніках, на стадыёнах і на катках зімою, а на вуліцах круглы год — пры дапамозе магутных сродкаў тэхнікі распаўсюджваецца механічная музыка.

У адзін голас мы, у тым ліку і я, абураемся празмернай пашыранасцю падобнай «музыкі». Гэта, так сказаць, цэль, на якую мы скіроўваем агонь. Цяпер я ўсё болей задумваюся і над іншымі аспектамі гэтай усеагульнай гукавой экзекуцыі, якая, па сутнасці, ужо ўвайшла ў побыт сучаснага чалавека. Нельга, відаць, не ўлічваць тых умоўных рэфлексаў, што паспелі замацавацца ў псіхіцы гараджаніна. Ды і не толькі яго. Гэта ж усім вядомы факт: калі нашы вёскі былі радыёфікаваны і ў кожнай хаце паявіўся рэпрадуктар, які ніколі не выключаўся, людзі так прызвычаіліся, прыстасаваліся да заўсёднага «гукавога фону», што пасярод ночы прачыналіся, калі змаўкала радыё. Што ж казаць пра горад з яго самай магутнай «сімфоніяй»!

Мы ўжо не заўважаем, што аглухлі і часта не здоль-

ныя адрозніваць тонкае, дасканалае ў невыказных нюансах хараство сапраўднай музыкі, а ўспрымаем яе імітацыю, эрзац, падробку — з дынамікаў, рэпрадуктараў, тэлевізараў і нават з эстрады — трансфармаваную цераз мікрафоны, у якія скіраваны галасы артыстаў.

Цяпер мы з сапраўднай музыкай, з дасканаласцю гукавога хараства, якога дасягнулі Бетховен, Шапэн, Грыг, Чайкоўскі, абыходзімся прыблізна так, як абыходзяцца з намі, з людзьмі, нашы марскія сябры — дэльфіны: гаворым у розных дыяпазонах гукавых хваль. Мы да дэльфінаў не можам прыстасавацца, настроіцца на вышыню іхняй хвалі, а яны могуць.

Можа настроіцца і музыка. Вось яна і настройваецца, прыстасоўваецца, шукае збліжэння з намі. Але паколькі мы аглухлі, яна пераходзіць на найбольш прымітыўныя і спрошчаныя сродкі, каб дайсці да нашага слыху, усё болей набываючы тыя формы, танальнасць рытмаў і гукаў, якімі поўніцца само жыццё, наш побыт: няспынны грукат вуліцы, гул самалётаў, аўтаматычная сігналізацыя, шум натоўпу на футбольным зборышчы — дый ці мала гукавых напластаванняў, каб скрозь іх наша вуха ўжо не магло ўлавіць і адрозніць найтанчэйшых уласцівасцей кампазіцый, створаных не толькі па законах магутнасці гучання, але і па законах хараства той цішыні, у спалучэнні і ў кантрасце з якой наш слых спазнаваў чарадзейства гукаў!

Тая музыка, якая зрабілася нашай абыдзёншчынай, якая цяпер на кожным кроку суправаджае нас — механічная музыка,— не мае і ніколі не мела галоўнай уласцівасці, неабходнай музыцы,— жывой душы, здольнасці эмацыянальнага ўздзеяння. У сваіх масавых маштабах і праявах у нашым побыце яна, гэтая музыка, фактычна злілася з той гукавой гіпертрафіяй, якая, разрастаючыся ў сваіх памерах, становіцца бядой сучаснага горада, бічом нашых слыхавых магчымасцей. Урбаністычная канцэнтрацыя з нарошчваннем тэхнічнай, прамысловай магутнасці, калі б яна была жывой істотай, я назваў бы яе аслеплай і аглухлай ад свайго эгаізму. Вось чаму можна толькі парадавацца за чалавека, які, нарэшце, ўбачыўшы яе ўсемагутнае «каварства», пачынае, шукаць паразумення і з той, болей лагоднай «дамай сэрца», з якой абышоўся не вельмі па-рыцарску, грозячыся, не чакаючы лішняй хвіліны, усе яе міласці ўзяць сілаю, хоць

даўно вядома, што нават самая прыгожая і багатая не можа даць болей, чым мае.

Інжынеры, будаўнікі, хімікі цяпер заняты клопатам, як ачысціць забруджаныя рэкі, якімі сеткамі і сітамі лавіць і прасейваць хмары дыму, сажы, каб мы дыхалі чыстым паветрам. А што ж кампазітары і музыканты? Не здзіўляйцеся гэтаму пытанню. Яно не такое ўжо недарэчнае, як можа здацца. Я маю на ўвазе катэгорыю людзей усіх прызванняў, хто павінен клапаціцца аб эстэтычнасці нашага музычнага слыху і наогул слыху чалавека. На першы погляд, гэта праблема нескладаная. Тут ніякіх ачышчальных збудаванняў і ўлоўнікаў шкодных сумесяў не патрабуецца.

Паветра, забруджанае кепскай музыкай, можна ачысціць. Як? З усіх рэпрадуктараў і дынамікаў, з усіх паркаў, стадыёнаў, масавых танцавальных пляцовак, з цягнікоў, параходаў і рэстаранаў выгнаць апрыкралую ўсім нам легкадумную хрыпатую модніцу? А чым замяніць? Моцартам? Пракоф'евым? Шастаковічам? Глыбока памыляецца, хто гэтак думае.

Аднойчы я ляцеў з Масквы ў Хабараўск. У магутным, утульным сучасным паветраным караблі чалавек ужо не адчувае асаблівых перагрузак. Арганізм прызвычаіўся. І да вышыні, і да хуткасці, і да атмасфернага ціску, і да сілы прыцягнення зямлі, і нават такая тонкая прылада, як наш вестыбюлярны апарат, не падвёў ніводным сваім вінцікам, а вось слыхавы... Для яго бесперапынная аднатонная музыка магутных матораў усе дванаццаць гадзін лёту была, бадай, самай цяжкай перагрузкай. Нездарма тады ў самалёце мне ў галаву прыйшла такая эстэтычна-тэхнічная ідэя: а што, калі б гэты непрыемны аднастайны гул трансфармаваць у стройную сімфонію? Можа, гэта было б і прыемней, але я не зусім упэўнены, што гэтая сімфонія адпавядала б маім пачуццям, а калі не маім, дык — настроям і пачуццям іншых пасажыраў. Вось чаму я не стаў дамагацца патэнта на сваю тэхнічную «ідэю». Яна, пэўна, болей прыдасца аўтару, які піша навукова-фантастычныя раманы. Тым болей, я не спяшаюся замяніць механізаваную валавую музычную прадукцыю сур'ёзнай музыкай. Папрабуйце, каб з тых жа магутных раструбаў на электраслупах у нашых парках і на стадыёнах цэлымі днямі бясконца ліліся мелодыі Мендэльсона і Дэ-

бюсі, і вы самых гарачых іх паклоннікаў зробіце іх ненавіснікамі.

У музыкі, як ва ўсякага сапраўднага мастацтва, свае шляхі да людскіх душ, свой нораў і характар. Калі яе імкнуцца гвалтам загнаць у мікрафон, у дынамік, уціснуць у магнітафонную істужку — яна пратэстуе. Гэта вельмі наравістая прыгажуня-чараўніца!

Ніяк не магу забыць, калі аднаго лета нас, некалькіх пісьменнікаў, запрасілі ў піянерскі лагер на сустрэчу з дзецьмі. Цудоўная мясціна ў сасновым бары непадалёк ад Мінска, слава лагера, як самага лепшага ў рэспубліцы, сапраўды маглі парадаваць кожнага, хто трапляў сюды. Але толькі мы ступілі ў гэтае зялёнае царства, як аглухлі... Не падумайце, ад цішыні, не. Ад рову магутнага дынаміка. Уключаны на поўную моц, ён глушыў усё лясное наваколле і яго насельнікаў. Яго голас быў мацнейшы за дзіцячыя галасы і смех, яго перавага над людзьмі была тая, што ён не мог стаміцца. Універсальны энтузіяст, ён выконваў усю выхаваўчую, культурную і эстэтычную работу — адзін за ўсіх. І іншага выйсця ў яго не было: яго замкнулі на замок, а ключ даўно згубілі і не вельмі рупіліся шукаць. Так наша сустрэча з дзецьмі і не адбылася. Але я бядую не пра гэта, а пра тое, колькі не адбылося ў дзяцей сустрэч, дзеля якіх яны ехалі сюды, сустрэч з прыродай, з невыказнай музыкай лесу, з ціхім пошумам высокіх хвояў, з кукаваннем зязюлі, з нястомным перастукам дзятлоў, з першымі воклічамі птушанят у гняздзе івалгі і салаўя...

А вось вам яшчэ прыклад гукавой экзекуцыі над нашымі дзецьмі, у чым вы можаце ўпэўніцца самі, нават здалёк, падышоўшы да летніх стадыёнаў і, асабліва зімой, да дзіцячых каткоў.

Як часта мы ўзвышана гаворым пра неабходнасць музычнага выхавання дзяцей. Мы гаворым... А ўсю праблему адным махам вырашае на свой выбар, а хутчэй за ўсё без усякага выбару, гаспадарнік, які возьме закупіць такі асартымент пласцінак, якіх на многія гады хопіць, каб глушыць, нявечыць слых дзяцей, што сотнямі тысяч перабываюць на гэтых катках. І глушаць, і нявечаць — тарабаршчынай, ашалелымі джазавымі сінкопамі, факстротамі, цвістамі. І гэта там, дзе дзіця, падлетак сапраўды цераз рытм, цераз рух усёй сваёй істотай павінны ад-

крываць, спазнаваць, убіраць у сябе чарадзейнае хараство, якое нясе чалавеку музыка.

Не, тут ужо няможна заставацца абыякавым. Камсамол, які ўвёў у абыходак работу дружын, што сочаць за парадкам на вуліцах, зрабіў бы добрую справу, каб стварыў дружыны, якія б строга і чула рэагавалі на безадказнасць, бяздушнасць, тупасць і казёншчыну ў эстэтычным выхаванні дзяцей. Гэта недаравальнае калецтва пачуццяў нашых дзяцей. У такую дружыну я запісаўся б сам першы.

Падсумоўваючы свае развагі, я менш за ўсё схільны даваць практычныя рэкамендацыі, але адна з іх мне здаецца самай галоўнай.

Шануйце, аберагайце эмацыянальную атмасферу, у якой мы жывём. Няхай будзе яна заўсёды чыстая, як першыя радасныя пачуцці да ўсяго самага прыгожага ў нашым жыцці.

## *Выпрабаванне натоўпам*

...Усё жыццё губляюся ў вялікім натоўпе, трачу адчуванне самастойнасці. Не ведаю, не ўпэўнены, ці гэта ёсць натуральны псіхалагічны стан чалавека ў натоўпе.

Недзе падсвядома заўсёды ўнутрана супраціўляюся тым спрошчаным, прымітывізаваным, а часам і грубым імпульсам і інстынктам, якія авалодваюць чалавекам на стадыёнах, масавых відовішчах, у вялікіх магазінах, на вакзалах, у чэргах, калі людзі раптам становяцца горшымі, зласнейшымі, хоць па натуры сваёй у жыцці — самыя добрыя і лагодныя.

Выпрацаваць у сабе імунітэт, які засцерагаў бы чалавека, яго годнасць ад усемагутных інстынктаў натоўпу, ад улады ўсеагульнага псіхозу, ад зманлівых спакус быць падобным на ўсіх, не адстаць ад моды і нават сілай, гвалтам дамагацца права на прыніжэнне людской годнасці — гэта і ёсць найвышэйшае выпрабаванне асобы чалавека.

Хіба не заўважалі вы, як часта ў сціску людскім, у цясноце чалавек, які не мае сілы волі, вытрымкі, а то і звычайнай выхаванасці, на вачах ператвараецца ў перашабытнага, дрымучага дзікуна, сваімі паводзінамі зневажае людзей, абсалютна ўпэўнены, што ён якраз і ёсць узор, па якім павінна вымярацца наша справядлівасць і

прынцыповасць. Усе заклікі да яго сумлення разлятаюцца ўшчэнт ад аднаго-двух ужо вядомых прыёмаў, якімі хамы маскіруюцца то пад прасцячка, то «пад змагара за праўду». «Прыёмы» даўнія, выпрабаваныя, эфектныя:

— Думаеш, калі надзеў капялюш...

— Разумнік у акулярах...

— Пачапіў гальштук і ўжо думае...

Дзікун не церпіць на сваім праціўніку ні капелюша, ні акуляраў, ні гальштука. Ён упэўнены, што якраз усё гэта і лічыцца перавагай культуры над бескультур'ем. Таму сучасны хам і сучасны варвар заўсёды першыя вылазяць напаказ: глядзіце, мы першыя!

Першыя глушым людзей транзістарамі, магнітафонамі, вар'яцкай музыкай з чужых галасоў і пласцінак.

Першыя нацягнулі на сябе ашмоцце і неданоскі, перакупленыя ў заезджых спекулянтаў.

Першымі, каб не адстаць ад моды, убачанай з кінастужак заходніх «баявікоў», абраслі каўтунамі, першымі перасталі стрыгчыся і галіцца. Мы перастанем хадзіць у лазню, мяняць бялізну — абы толькі знайшліся завадатары. Тым больш, што тут ужо асаблівых намаганняў волі, характару не трэба. Чым бліжэй да той мяжы, дзе канчаецца чалавек, годнасць, вартасць, самабытнасць, самастойнасць асобы, тым хутчэй мы станем на карачкі. Дасягнем, нарэшце, свайго ідэалу.

Дзікун застаецца дзікуном і тады, калі ён б'е людзей па галовах не дубінай, а транзістарам.

Цывілізаванае дзікунства, якое намагаецца стаць модай, культам і авалодвае натоўпам, патрабуе ўжо мужнасці, смеласці і самаахвярнасці, каб змагацца з ім, вызваляць з-пад яго ўлады.

Нецярпімыя (і справядліва) да невыразнасці класавых пазіцый у сваіх творах мастацтва, мы, на вялікі жаль, чамусьці паблажлівыя да таго патоку стандартаў «прыгожага жыцця», узораў «свабоды», што прапагандуюць замежныя фільмы, па якіх многія маладыя людзі складаюць ідэал маралі, этыкі і свае ўяўленні аб прыгожым.

## *На самоце*

Магчыма, я памыляюся, выбраўшы самога сябе адзінкай псіхалагічнага даследавання ў пытанні: чалавек і натоўп. У наш час электронныя машыны маглі б даць болей вычарпальны адказ, праверыўшы на мільёнах самаадчуванне ў натоўпе.

Карыстаючыся толькі сваімі назіраннямі над вірлівым жыццём горада, я не прэтэндую нават на аб'ектыўнасць вывадаў.

Можа быць, у натоўпе адчувае сваю адчужанасць той, хто найболей блізкі да натуральных умоў жыцця — поўнага выяўлення сябе ў працы, пазнання самога сябе цераз сваё асяроддзе, цераз прыроду. Прынамсі, спадчынныя рудыменты мне, асабіста, замінаюць усё жыццё канчаткова растварыцца ў гарадской стыхіі. Не толькі па сабе мяркую, што ў людской гушчыні чалавек найболей адзінокі таму, што траціць незалежнасць натуры. Вытокі гэтай з'явы трэба шукаць, перш за ўсё, у сацыяльных прычынах.

Асабліва адзіноцтва чалавека ў натоўпе мяне ўразіла ў Парыжы. Бурліць, кіпіць, віруе людскім патокам вуліца, але чалавек у гэтым віры — абсалютна абыякавы да сябе падобных. Вечарамі да позняе ночы тысячы, сотні тысяч адзінокіх людзей могуць прасядзець за бутэлечкай ліманаду, ну а хто — віскі, каньяку, хто — кубачкам кавы за столікам кафэ ў шуме, гамане, грукаце, смуродзе вуліцы, глядзець пустымі вачыма перад сабой і не абазвацца ні з кім ніводным словам. І гэта пры ўсёй, прызнанай светам, жвавасці французскага характару, экспансіўнасці і надзвычайным адчуванні гумару!

## *Дзень добры, людзі!*

Ці заўважылі вы, што чалавек, выключаны з турбот абыдзённшчыны, становіцца больш добрым, лагодным і чулым? Але гэта не як правіла. Абмежаваны, убогі душою, ён такім застаецца ўсюды.

Але думка, якая непакоіць мяне, не ў гэтым. Мае назіранні вымагаюць вось якога вываду: чалавек больш выяўляецца, відаць, усё ж тады, калі яму выпадае часіна задумацца, пабыць сам-насам з сабою, адчуць сябе як асобу, як індывідуальнасць. І самае цікавае, што тады

і на адзіноце ён не адзінокі. Абвастраецца яго ўвага, яго дапытлівасць і цікаўнасць ужо да кожнага, нават выпадковага знаёмага і сустрэчнага.

На вялікай дарозе, у полі, у лесе вы спаткалі незнаёмца. Нават размінуўшыся, яшчэ доўга будзеце думаць пра яго — хто ён, куды ідзе, з якім клопатам?

Заўважце, што на адзіноце людзі рэдка размінаюцца. Тут іншыя звычаі, правілы этыкету, тут чалавек больш натуральны ў паводзінах . Гэта ў натоўпе вы не даверыцеся выпадковаму знаёмству. У падарожжы, ведаючы, што, акрамя вас дваіх, на ўсё наваколле, можа быць, болей і няма нікога,— вы, адкінуўшы ўсе ўмоўнасці, не толькі пазнаёміцеся, але і можаце пасябраваць.

Нездарма ж у людзей такі харошы звычай — сустрэўшыся на адзіноце, сказаць адзін аднаму: «Добры дзень!»

# Святло будучыні

Сто гадоў таму назад у вёсцы Чаплічы на нашай Случчыне загарэўся агеньчык, святло якога ўбачылі дзеці і юнакі многіх навакольных вёсак. Але мала каму ўдалося дацягнуцца да жаданага святла. Набыць кнігу, сшытак, грыфельную дошку, аловак, справіць дзіцяці зімовае адзенне было нялёгкім клопатам селяніна, асабліва бедняка. І ўсё ж імкненне выбіцца з цемры перамагала і беднасць і галечу.

Дзеці ў лапціках, у самаробных світках і кажушках, з палатнянымі торбамі цераз плячо, у холад і ў завею ішлі, дабіраліся ў школу.

Калі б нам сёння прыйшлося ўбачыць тагачасных вучняў, мы сказалі б, што гэта жабракі. Цяпер не ўсе могуць паверыць, што так было. Але гэта было так.

Мала каму ўдавалася правучыцца зіму ці дзве. Мой бацька хадзіў у Чаплічы дзве зімы і скончыў поўны курс навукі — два класы. У нашых Еўлічах ён зрабіўся тады вядомым грамацеем — стаў сам вучыць дзяцей па хатах.

Так вучыліся дзяды цяперашніх дзядоў. Бацькам цяперашніх бацькоў было лягчэй. Яны ішлі ў школы, якія для іх адкрывала Савецкая ўлада. Школа была ўжо ў кожнай вёсцы. Няхай сабе не заўсёды ў новым будынку, а мясцілася ў такой жа хаце, у якой жылі сяляне, але яна была самая дарагая і блізкая сэрцу кожнага з нас. На самым відным месцы, рупліва ўпрыгожаны дзецьмі, вісеў партрэт Уладзіміра Ільіча Леніна, з-пад чые бацькоўскай рукі мы распраўлялі крылы для палёту.

Калі вучыўся я, наша школа, усе яе тры класы змяшчаліся ў адным пакоі. Настаўніца Таццяна Мікалаеўна, ходзячы паміж партаў, першаму класу загадвала пісаць у сшытках палачкі, другому — вучыць верш, трэцяму — рашаць задачкі. Вы можаце падумаць, што ў нас стаяў нечуваны гармідар. Не. У нас быў выдатны парадак. Таццяна Мікалаеўна спраўлялася адна з трыма класамі,

адна з усёй нашай школай. Калі я канчаў трэці клас, яна павяла мяне здаваць экзамен у суседнія Чалевічы. У былым фальварку, які тады ўжо называўся Трактар, знаходзілася школа другой ступені. Сюды на экзамены прыйшлі выпускнікі-пачаткоўцы з многіх навакольных вёсак. Ніколі не забуду свой першы экзамен. Нас, тых, хто хацеў вучыцца далей, было так многа, а настаўнікаў так мала, што экзамены цягнуліся дзень і ўсю ноч. Памятаю, што ў мяне страшэнна балела галава і, выбягаючы з душнага класа, у якім цяжка было павярнуцца, я прагна хапаў з таполі халодныя росныя лісты і прыкладаў да лба. І хоць мой экзамен быў доўгі і пакутны, але вяртаўся я раніцай дадому шчаслівы: з трэцяга класа мяне перавялі ў пяты.

Гэтак для многіх з нас пачыналася тая сцежачка ў школу, якая цяпер стала шырокай дарогай, адкрытай і даступнай кожнаму.

Вось чаму я часта з трывогай у душы думаю: а ці шануем, ці цэнім мы ўсё тое, што здабыта, што заваявана намі і што трэба берагчы, як нашы запаветныя традыцыі?

Чапліцкая школа за сто гадоў выпусціла шмат пакаленняў сваіх выхаванцаў. А колькі настаўнікаў, сапраўдных падзвіжнікаў, не заўсёды прыкметных герояў нялёгкай працы, перабывала ў яе сценах!

Ці ўсіх ведаем мы і ці будуць ведаць іх новыя пакаленні настаўнікаў і вучняў, памятаць тых, хто запальваў першыя агеньчыкі ў цемры, і тых, хто самаахвярна нёс святло ведаў нашым дзядам і бацькам?

На вялікі жаль, не ўсе нашы школы вядуць летапіс свайго жыцця, сваёй гісторыі. Час нам паклапаціцца пра гэта. У кожнай школе павінны быць і свой летапіс, і свае летапісцы. Жыццё ідзе шпарка. Многае забываецца, адыходзіць у нябыт, і толькі ў дні вялікіх дат раптам спахапляешся і бачыш, што час мацнейшы за нашую памяць — і асабліва тады, калі мераеш яго ўжо стагоддзямі.

*1972*

# *Шчасце быць настаўнікам*

Дзень настаўніка, можа быць, ёсць адзін з тых нямногіх дзён, калі выпадае вольная часіна сабрацца не толькі дзеля адпачынку, а і дзеля таго, каб пачуць добрае слова ўдзячнасці ўсім тым дням, усім тым будням, з якіх складаецца жыццё, праца і ўвесь клопат настаўніка.

Сапраўдным настаўнікам можа быць толькі чалавек самага чулага сэрца, чалавек, адметны шчырасцю, праўдзівасцю сваіх перакананняў, сваёй нястомнай прагнасцю да новага, да адкрыццяў, да пазнання свету, чалавек, які самаахвярна аддае душэўныя багацці і веды людзям. Зашпілены на ўсе гузікі казённай мудрасці сухар, чынуша не можа быць настаўнікам. Асабіста для мяне настаўнік — гэта цікавы чалавек. Мой першы настаўнік не ўмеў ні пісаць, ні чытаць. Гэта быў вясковы каваль. Але якой прывабнай, поўнай цудаў была для мяне яго кузня, што стаяла ўскрай вёскі! Можа, таму першай маёй спецыяльнасцю ў жыцці зрабілася спецыяльнасць каваля, слесара. Я і дагэтуль не магу забыць гэтага чалавека, называючы яго настаўнікам таму, што ён першы навучыў мяне любіць і шанаваць працу, патрэбную людзям.

Пазней, калі я далучыўся да літаратуры, адным з самых дарагіх мне вобразаў стаў вобраз гэтага простага, але душэўна блізкага чалавека, паэта сваёй справы.

Маімі настаўнікамі ў літаратуры, у якіх я вучыўся высокай чалавечнасці, душэўнай шчырасці, былі паэты ў самым высокім сэнсе слова, хоць самі яны вядомыя як празаікі,— Міхась Лынькоў і Кузьма Чорны. Ведаючы іх блізка ў часы сваёй маладосці, я вучыўся ў іх не толькі ашчаднасці слова і дысцыпліне думкі, але і стараўся быць падобным на іх, беручы за прыклад іх як людзей.

Можа быць, гэта і ёсць той адзіны крытэрый, які вызначае настаўніка: ці ёсць у цябе вучні, ці ёсць у цябе паслядоўнікі, ці ёсць у цябе сябры, якім хочацца не толь-

кі вучыцца ў цябе, вывучаць твой вопыт, але і пераймаць твае чалавечыя якасці? Гэтае пытанне рана ці позна абавязкова задае сабе кожны чалавек, незалежна ад таго, якую прафесію, якую спецыяльнасць ён мае. Самае вялікае шчасце быць паэтам сваёй працы, любіць яе, верыць, што яна самая патрэбная людзям. У нас чамусьці часта супрацьпастаўляюць лірыкаў фізікам, паэтаў — матэматыкам. Гэта недарэчнае супрацьпастаўленне. Паэтам сваёй справы павінен быць кожны — каваль і інжынер, матэматык і гісторык, географ і выкладчык літаратуры.

Той, у каго найболей вучняў, якраз і ёсць самы лепшы настаўнік. Успомніце, колькі даверлівых сэрцаў, колькі дапытлівых цікаўных вачанят імкнецца да вас! Нішто не застанецца без увагі — і як вы адзеты, і якая ў вас прычоска, і як вы вымаўляеце кожнае слова. І ўсе, амаль усе, асабліва дзяўчаткі, ужо канчаткова вырашылі — якімі яны будуць! Такімі, як іх Марыя Пятроўна, як іх Ганна Іванаўна!

Так асабістыя сімпатыі, чалавечыя якасці характару настаўнікаў адразу ж заваёўваюць даверлівасць дзіцячай душы.

І ў той жа час ніхто так, як настаўнік, добра не ведае, якімі складанымі, супярэчлівымі, неўтаймаванымі, цяжкімі і часта няўдзячнымі становяцца гэтыя душы пазней, калі канчаецца маленства. У старэйшых класах ужо няма ўсеагульнай улюбёнасці ў настаўніка, усеагульнага імкнення быць абавязкова такім, як Іван Іванавіч — фізік, матэматык, гісторык, літаратар.

Гэта самы цяжкі, самы адказны ў школе Рубікон, калі пачынае вызначацца характар, асоба будучага чалавека, новага грамадзяніна. На вялікі жаль, і нашай педагогіцы, найбольш недасканалай на гэтым этапе, самім педагогам якраз у гэты час не хапае псіхалагічнага пранікнення, душэўнага такту, каб застацца на вышыні даверу сваіх вучняў, быць не толькі настаўнікам па службе, але і другам паводле высокага абавязку, чалавекам, сяброўства з якім было б кожнаму юнаку вялікім асабістым шчасцем.

*1975*

# *Вясёлы талент*

Усе, хто ведаў яго — пісьменніка, педагога, грамадзяніна,— добра памятаюць, як і на схіле жыцця ён заставаўся чуйным да сваіх юных сяброў, быў шчаслівы, што жыве ў дзівосным свеце вясёлай казкі, у свеце маленства і юнацтва.

Калі вы сустракаліся з ім, слухалі, як ён гаварыў са сваімі чытачамі, нельга было не здзівіцца з яго душэўнай даступнасці, непасрэднасці, нават нейкай сарамлівасці, якая заўсёды ўласцівая шчырым і добрым людзям.

Без людскога асяроддзя, без сяброў ён не мог абысціся. У ім жыла няўрымслівая, нястомная душа дзіцяці, здольная заўсёды захапляцца, здзіўляцца ўсяму новаму, невядомаму.

Праз суровыя цяжкасці і пакуты прабіваўся ён да святла. Але нават маленькі хлопчык Янка з аўтабіяграфічнай аповесці «Шлях з цемры» ў галоднай сірочай хаце са шчырай даверлівасцю, поўны шчаслівага ўзрушэння, адкрывае сабе свет сваіх першых радасцяў.

Пісьменнік іранізуе над сваімі далёкімі душэўнымі адкрыццямі, ён не хавае добрай усмешкі. І ў гэтай шчырасці бачыш праўду жыцця, бачыш той аптымізм, які не пакідаў яго нават у самыя цяжкія хвіліны жыцця.

Ужо на восьмым дзесятку гадоў Янку Маўра спасцігла вялікая бяда. Ён пачаў слепнуць. Усе мы з болем у душы бачылі, як з кожным днём слабее яго зрок. Без праважатага ён ужо не мог перайсці вуліцы, а сваіх знаёмых пазнаваў толькі па голасе. Мы са страхам думалі пра яго няшчасце, і толькі сам ён кожнаму спакойна тлумачыў, што поўная слепата ўратуе яму вочы. Упэўненасць, з якой гэта гаварылася, не дапускала ніякіх сумненняў. Зусім сляпы, ён ні на хвіліну не паддаваўся адзіноце. Як і раней, мы бачылі яго і на сходах, і на творчых сустрэчах. У лютым 1955 года ён з дапамогай праважатага ездзіў у Маскву на Дэкаду беларускага мастацтва і літаратуры. Ёсць здымак: сустрэча беларускіх пісьменнікаў з Маршаком. Побач з Самуілам

Якаўлевічам стаіць Іван Міхайлавіч — у чорных акулярах, абапіраючыся на кій, і... усміхаецца.

Ён шчыра радаваўся сваім сябрам. Маўрава вытрымка і ўпэўненасць перамаглі і на гэты раз. Пасля складаных і тонкіх хірургічных аперацый пісьменнік, як ён сам сцвярджаў, «зноў нарадзіўся на свет». І, як зноў народжаны, цешыўся жыццём.

Васьмідзесятую вясну яго нараджэння мы адзначалі разам з ім. Іван Міхайлавіч, як заўсёды, быў дасціпны і нечаканы ў сваіх жартах. Мне выпаў гонар адкрыць і весці ў Тэатры юнага гледача гэтую ўрачыстасць. Даклад пра творчасць юбіляра рабіў яго даўні друг, паплечнік і рэдактар Алесь Іванавіч Якімовіч. Вясёлае і незабыўнае было гэта свята. Большасць з нас, сяброў юбіляра, ужо дзяды, дзяцініліся, як малыя. І, мабыць, таму, што такі тон і настрой задаў юбіляр. На свяце свайго любімага пісьменніка дзеці адчувалі сябе большымі імяніннікамі, чым ён сам. Гэта было ў яго натуры. Вясёлая містыфікацыя, розыгрыш, жарт — яго найлепшыя спосабы абыходжання з сябрамі. Гэта адчулі ўсе, хто віншаваў яго ў той вечар. Забываючыся на паважнасць паўнамоцтваў, усе стараліся не выбівацца з агульнага настрою.

Памятаю, большасць прывітанняў былі не адрасы ў аксамітных папках, а якія-небудзь смешныя сувеніры з неспадзяванкаю. Нават дэлегаты ад пісьменнікаў — саліднyя дзядзькі і цёткі — прыкінуліся выхаванцамі дзіцячых садоў, называючы сябе Сашамі, Васямі, Эдзікамі, Леначкамі, і гаварылі свае прамовы калектыўна, як мага звонкімі, а то пісклявымі галасамі. «Прапішчаў» і я сваё віншаванне:

Івану Фёдараву многа год,
А Янку Маўру — трыццаць восем.
Мы падначалены народ,
Удзячнасць Вам сваю прыносім.
З маленства адкрывалі свет
Па Вашых кнігах капітаны,
Што сёння пракладаюць след
Праз космас і праз акіяны
Да непазнаных таямніц,
Што вабілі людзей спрадвеку.
Вы — адкрывальнік тых крыніц,
Што так патрэбны чалавеку.
Наш слаўны, мудры Дзед-ўсявед,
Патрабавальны, строгі, колкі,
Паклон, пашана і прывет
Вам ад усіх сяброў «Вясёлкі».

Сам — завадатар гэтай гульні — юбіляр быў задаволены. І ў рэстаране, куды запрасіў усіх нас на пачастунак, ён не пакінуў свайго дзівацтва: памяняўся са швейцарам на шапкі, пасадзіў яго, як аказалася, свайго аднагодка, побач і не адпускаў увесь вечар: «Сядзі, браце. Можа, якраз тут тваё месца, а маё там»,— паказваў ён на гардэроб. І калі хто з гасцей не ўпраўляўся сам адзецца, быў напагатове памагчы.

У другі раз быў я сведкам вясёлага блазенства дзядзькі Янкі пасля ўжо яго васьмідзесяцігоддзя, калі яму часцей пачало нездаровіцца і дактары загадвалі ляжаць. Але яго гарэзлівая натура не магла ўтаймавацца. Хацелася быць у гурце, у жывым асяроддзі. Ён уцякаў з дому і тайна паяўляўся ў Саюзе пісьменнікаў, балазе — недалёка, перайсці толькі вуліцу. І вось ужо паміж сваіх субяседнікаў у адным з пакояў Саюза ўцякач раптам пачуў з калідора знаёмы голас нашага доктара Якава Уладзіміравіча.

— Ціха! — даў знак дзядзька Янка і на вачах здзіўленай кампаніі, як яму ні цяжка было, сагнуўся і ўціснуўся між тумбаў канцылярскага стала. Мы засланілі стол. Доктар адчыніў дзверы:

— Ці мне здалося, ці сапраўды я чуў голас Маўра?

— Здалося, здалося! — дружна пацвердзілі мы.

Доктар пайшоў. Іван Міхайлавіч, крэкчучы, вылез з-пад стала. Ён радаваўся, што яго не «застукалі»...

Пра Маўравы прыгоды можна было б напісаць прыгодніцкую кнігу. Але каб яна была такая ж, як Маўравы кнігі, патрэбен пісьменнік яго таленту, яго вясёлай гарэзлівай натуры.

З майго апісання ў тых, хто не бачыў і не ведаў Янкі Маўра, можа скласціся ўражанне, што гэта быў няўрымслівы непаседа, трапяткі і мітуслівы весялун. На дзіва, яго ўнутраны тэмперамент, яго душэўная экспансіўнасць не супадалі з паважнасцю і строгасцю аблічча, з усёй мажной паставай звычайна маўклівага, павольнага, нават маруднага ў сваіх рухах і жэстах чалавека. Але да глыбокай старасці ў ім заставаліся невычэрпныя запасы дзіцячай нястомнасці. І на схіле гадоў ён захапляўся свавольствамі. Яго рабочы кабінет быў поўны неспадзяванак. Хто прыходзіў сюды ўпершыню, вельмі лёгка трапляў на кручок чарговай Маўравай забаўкі. У кожным кутку падсцерагала небяспека: то на вас паў-

зла змяя, і ад нечаканасці вы не маглі пазнаць, што яна несапраўдная, то, сядаючы ў шырокае, мяккае крэсла, вы раптам падскоквалі траха не да самай столі... А паважны гаспадар, задаволены ўдалым фокусам, паціху ўсміхаўся, робячы выгляд, што нічога не заўважае.

Яшчэ часцей і, можа, болей з'едліва любіў пажартаваць ён з самога сябе. Пад сваім партрэтам напісаў самаэпіграму на трох мовах:

То не Эзоп, філосаф грэцкі,
И не француз — бунтарь Вольтер,
То белорусский автор детский,
Который поки ще не вмер.

Дарэчы, самае любімае яго захапленне, якое зрабіла яму як пісьменніку добрую паслугу, была мова эсперанта. Ён валодаў ёю дасканала, вёў перапіску з многімі сваімі сябрамі і карэспандэнтамі з тых далёкіх экзатычных краін, пра якія пісаў свае кнігі.

Янка Маўр — пісьменнік і настаўнік — вучыў весела, займальна. Ніколі змрочныя, злыя таленты, нават геніі, якія дамагаліся права вучыць людзей, не рабіліся любімымі настаўнікамі — ні пад прымусам, ні пад страхам, ні тым больш з дапамогай сродкаў інквізіцыі. Імкнучыся стаць дарослымі, дзеці гуляюць у дарослых. Вучыць дзяцей можа толькі той, хто сам здольны вучыцца ў іх.

Маўрава маленства і юнацтва, як і ўсё яго жыццё, навучылі пісьменніка ўсяму самаму лепшаму, што ён аддаў людзям у сваіх кнігах.

Цікаўны і дапытлівы, нястомны даследчык і шукальнік, ён не змарнаваў ніводнага дня, каб не спазнаць нешта новае, не ўзбагаціць сваіх душэўных запасаў. Усім, хто чытае яго кнігі, ён шчодра раздае багацці, здабытыя нялёгкім жыццём.

Чалавек моцнай загартоўкі, непрымірымы да несправядлівасці, няшчырасці, фальшу, ён прайшоў праз самыя пакутлівыя выпрабаванні, але ніколі і нідзе не адступіўся ад сваіх перакананняў.

Юнака, якому яшчэ не было дваццаці гадоў, выключаюць з настаўніцкай семінарыі і заносяць у спісы палітычна ненадзейных. Гэта было найцяжэйшым ударам не толькі яму самому, але і гаротнай удаве-маці, што столькі надзей ускладала на сына, які неўзабаве павінен быў стаць настаўнікам.

Колькі клопату і турбот каштавала і ёй, і яму, каб паступіць сіраце вучыцца на казённы кошт! І вось яго выганяюць з апошняга курса. Паліцыя бярэ з яго падпіску, што ён не будзе сустракацца са сваімі былымі сябрамі-студэнтамі. Праўда, семінарскія і паліцэйскія чыны прабавалі і іншымі спосабамі абрахманіць небяспечнага ім юнака: угаворвалі адумацца, узяцца за розум. Але яго гордае сумленне, вядома ж, не магло пайсці на такую ганебную капітуляцыю.

Студэнт Фёдараў пакідае семінарыю, не скончыўшы яе, але ён ужо добра ведае, што выходзіць з яе сцен зусім іншым чалавекам, які цвёрда ўпэўнены ў сваёй праваце. Тут ён пазнаёміўся з рэвалюцыйна настроенай моладдзю, стаў чытачом ленінскай «Искры».

Як жыць далей, чым уцешыць самага блізкага яму чалавека — маці, якая выбівалася з апошніх сіл, каб вывучыць сына — сваю адзіную надзею?

Юнак ужо меў спецыяльнасць, што магла б пракарміць яго і маці. Яшчэ да паступлення ў семінарыю ён скончыў рамеснае вучылішча, стаў падмайстрам слясарнай справы, але работы знайсці не ўдалося. Цяпер жа, калі за плячыма быў ужо вопыт семінарскага навучання і радасць пазнання тых высокіх ідэй, якімі жыла перадавая моладзь, уражлівы і прагны да новых ведаў, новых адкрыццяў, ён, церпячы голад і нястачы, не адступаецца ад мэты вучыцца далей. Не парывае са сваімі сябрамі. У яго цесным пакойчыку, як і раней, тайна збіраюцца студэнты, разважаюць, спрачаюцца, мараць пра будучыню. Цяпер, каб пракарміць сябе і маці, ён дае прыватныя ўрокі, вучыць «недаросткаў» — дзяцей купцоў, гандляроў, мяшчан, якім навука — не самы важны клопат.

У свае дваццаць гадоў Іван Фёдараў экстэрнам здае экзамены і атрымлівае права быць настаўнікам пачатковай школы. Спачатку вучыць дзяцей у вёсцы пад Панявежам, потым у Бутчы, непадалёк ад Барысава.

Не спалохаўшыся паліцэйскіх наглядчыкаў, малады настаўнік становіцца яшчэ больш актыўным удзельнікам рэвалюцыйнага падполля.

На першы погляд, гэта як бы ўсім вядомыя звесткі з біяграфіі пісьменніка, якія цяпер можна прачытаць у школьных падручніках. Пры жыцці самога Янкі Маўра мы, яго сучаснікі, рэдка калі і задумваліся над гэтымі

выдатнымі вехамі жыццёвай дарогі нашага старэйшага сябра, таго, хто сваімі кнігамі пачынаў савецкую літаратуру, у якой пісьменнік вучыць чытача не толькі сваімі творамі, а і прыкладам свайго жыцця.

З гордасцю і пашанай гаворым мы пра нашага Янку Маўра як пра пісьменніка грамадзянскай мужнасці, той мужнасці, што вымяраецца высокай самаахвярнасцю ў імя будучыні.

Сустрэўшыся ў 1906 годзе на падпольным з'ездзе беларускіх настаўнікаў з Якубам Коласам, ён стаў яго выпрабаваным другам на ўсё жыццё.

Гэта зусім не выпадкова, што пачынальнікамі дзіцячай літаратуры на Беларусі з'явіліся народныя настаўнікі — Якуб Колас і Янка Маўр. Асновы гэтай літаратуры, закладзеныя імі, моцна трымаюцца на вопыце мудрай народнай педагогікі, на вопыце народнай творчасці, хоць, здавалася б, Янка Маўр — гісторык, географ, нястомны вандроўнік — непасрэдна нідзе і не карыстаўся сродкамі ні дарослага, ні дзіцячага фальклору, аднак асноўная яго асаблівасць як мастака ішла, вядома ж, перш-наперш ад казкі, ад фантазіі, ад загадкавасці, ад той адвечнай здольнасці здзіўляцца, захапляцца, імкнуцца да яшчэ не адкрытага і не спазнанага, што заўсёды было і будзе ўласцівае дзіцячым і юнацкім гадам, развіццю і ўдасканаленню чалавека як асобы.

«Чалавек ідзе» — так называўся першы твор, напісаны Янкам Маўрам для дзяцей. Гэтая задушэўная, даверлівая гутарка пісьменніка са сваім чытачом, якая адкрывала таямнічыя старонкі далёкай гісторыі, і цяпер будзіць фантазію, мацуе ўпэўненасць у сілу розуму чалавека.

Чалавек ідзе. Усё даўжэйшым становіцца яго шлях. Колькі мільёнаў гадоў ён ужо ідзе? Як ён з'явіўся на зямлі, як жыў і як стаў тым магутным волатам, што дастае да іншых планет?

Новым чытачам кнігі цікава будзе ведаць, што аповесць «Чалавек ідзе» была надрукавана ў 1926 годзе на старонках часопіса «Беларускі піянер». Так Янка Маўр стаў адным з першых піянераў савецкай літаратуры для юнацтва.

Часопіс, у якім упершыню выступіў пісьменнік, быў невялікі і адразу цалкам не мог змясціць усю аповесць. Яна друкавалася ў некалькіх нумарах. Прачытаўшы

апублікаваныя раздзелы, чытачы не маглі дачакацца наступнага. Патрабавалі, каб рэдакцыя хутчэй друкавала прадаўжэнне, звярталіся да самога аўтара, каб ён хоць у пісьме паведаміў, пра што будзе расказваць далей.

Пісьменнік-педагог добра разумеў сваю задачу выхаваццеля-інтэрнацыяналіста. Пасля сваёй першай аповесці — гістарычнай — ён бярэцца за творы на зусім новую ў беларускай літаратуры тэму — аб жыцці дзяцей у каланіяльных краінах. Ідэя міжнароднага брацтва прыгнечаных народаў праходзіць праз яго многія творы. Цяпер яны ўжо складаюць цэлую бібліятэку.

Аповесць «Палескія рабінзоны» паказала новыя творчыя магчымасці пісьменніка. Любімы юнымі чытачамі прыгодніцкі сюжэт будуецца Маўрам ужо не на падзеях у далёкіх заморскіх краінах. У гэтым творы ва ўсім хараcтве раскрылася свая, яшчэ не спазнаная рамантыка. Незвычайнае падарожжа юных герояў па родным Палессі поўнае нечуваных і нечаканых адкрыццяў.

Выдатным дасягненнем Янкі Маўра — майстра не толькі ў літаратуры, а, напэўна, і ў слясарнай, тэхнічнай справе (нездарма ж ён канчаў рамеснае вучылішча) — была аповесць «ТВТ» (Таварыства ваяўнічых тэхнікаў). На Усебеларускім конкурсе на лепшую дзіцячую кнігу ў 1934 годзе яна атрымала першую прэмію. Аповесцю зацікавіўся М. Горкі. Ён папрасіў аўтара перакласці яе на рускую мову. Гэта было якраз напярэдадні Першага з'езда пісьменнікаў СССР. Горкі прачытаў кнігу і, аддаючы С. Я. Маршаку, сказаў: «Здаецца, нешта цікавае». У сваім дакладзе пра дзіцячую літаратуру Маршак адзначыў яе як цікавую школьную аповесць. Маўрава «ТВТ» была слаўнай папярэдніцай вядомай гайдараўскай кнігі «Цімур і яго каманда».

Ужо некалькі пакаленняў людзей, успамінаючы сваё маленства і юнацтва, не абмінаюць добрым словам пісьменніка, які адкрыў ім сваімі кнігамі цэлы свет — новы, таямнічы і захапляючы.

Першымі чытачамі Янкі Маўра былі нашы бацькі. Потым з цікавасцю чыталі яго кнігі мы, пасля — нашы дзеці. Цяпер яго чытаюць нашы ўнукі.

*1973*

# *Часцей глядзіце на зоры*

Дзіцячы пісьменнік. Я цвёрда пераканаиы, што кожны сапраўдны мастак рана ці позна прыходзіць да дзяцей. У гэтым ёсць свая заканамернасць. Прыходзіць, бо мае патрэбу далучыцца да той крыніцы, да тых вытокаў, якія жывяць чалавека шчасцем творчасці.

Не зусім спадзеючыся на маладога аўтара-пачаткоўца, нават самага здольнага, які бярэцца пісаць для дзяцей, я ўпэўнены ў большым поспеху пісьменніка, што ідзе не толькі ад літаратурнага вопыту, а ў першую чаргу — ад жыццёвага, і якому ёсць што сказаць, ёсць чаму навучыць, і які ўмее гаварыць з дзецьмі.

Захапленне, замілаванне дзецьмі — гэта яшчэ не любоў да дзяцей. Дзеці не церпяць саладжавай расчуленасці. Артыстка, вядомая выключнай імітацыяй дзіцячых галасоў, заўсёды выклікае бурны пратэст у маленькіх слухачоў. Яны не церпяць перадражнівання.

Дзеці вымагаюць роўнасці і абсалютнага даверу. Яны прымуць у сваю гульню, залучаць у свет сваёй выдумкі і фантазіі кожнага, не зважаючы на ўзрост, калі вы сапраўды паверылі ім — пераадолеўшы сілу сваёй «дарослаасці», узняліся ў стратасферу вобразнага мыслення дзіцяці.

Радаснае адчуванне «дзіцячасці» да апошніх дзён жыцця бераглі ў сабе ўсе сапраўдныя дзіцячыя пісьменнікі і сярод іх — наш Янка Маўр. Яму ды сваім дзецям і ўнучкам я абавязаны шчаслівым далучэннем да дзіцячай літаратуры.

Не так многа напісаў я кніг для дзяцей, каб не помніць гісторыю стварэння кожнай, у якіх умовах і акалічнасцях яны пісаліся, якія канкрэтныя задачы — узроставыя, мастацкія, моўныя, этычныя і эстэтычныя — ставіў я ў кожнай з іх. Раскажу толькі аб тым, як складалася мая першая казка «Вавёрчына гора».

Гэта было адразу пасля вайны. Мы ехалі з малым сынам — было яму восем год — да бабулі ў вёску. Да-

рога была далёкая. Прыехалі ў Слуцк раніцаю. Да маіх Еўліч транспарту не было, і мы пеша ішлі па дарозе кіламетраў пятнаццаць.

Ішлі доўга, слухалі, як спявае жаваранак над полем. Сыну было ўсё новае і цікавае, пакуль не стаміліся яго ногі. Каб дарога была лягчэйшая, я пачаў расказваць яму казкі.

Расказаў адну, другую, трэцюю, пятую, дзесятую — усе, якія ведаў. А сын ужо без казкі ісці не можа. Стаў я фантазіраваць, расказваць казку пра вавёрачку, якая таксама трапіла ў бяду — забалелі ў яе зубкі. Як памагчы беднай вавёрачцы? Пачалі мы думаць разам з сынам. І ў вёску прыйшлі з новаю казкаю.

Хлопчык адразу ж пазнаёміўся з суседскімі дзецьмі. Прывёў усіх у нашу хату, паабяцаўшы расказаць казку. Сталі мы расказваць. Бачу — слухаюць уважліва. Я падахвоціўся і рашыў напісаць яе ў вершах. Залез на гарышча, на вышкі пад саламянаю страхою. Гэта і быў мой кабінет. Там было ціха і ўтульна і ніхто не замінаў. Я сядзеў цэлы дзень на гэтым гарышчы, пры маленькім акенцы, сядзеў і пісаў казку ў вершах. І яна нейк вельмі лёгка пайшла, сама па сабе пачала складацца. Так мінула дзён тры ці чатыры. Я ўсё лазіў на гэта гарышча, у свой кабінет. Нарэшце скончыў працу і прачытаў казку ўжо ў новай рэдакцыі спярша сыну, потым суседскім дзецям, потым галоўнаму суддзі — нашай бабцы. Усе слухалі з цікавасцю, нават пераказвалі на памяць. Але я адчуваў сябе няўпэўнена. Не ведаў: добра гэта ці не.

Вярнуліся мы ў Мінск, і я ўсё ніяк не мог рашыцца паказаць сваю казку пісьменнікам. Найбольшым аўтарытэтам у нашай дзіцячай літаратуры быў Янка Маўр. Адважыўся я і пайшоў да Івана Міхайлавіча. Стаў ён чытаць, бачу — маўчыць, не лае мяне, а потым кажа: «Добрая казка». Пасмялеўшы, я паказаў яе рэдактарам. Казка была апублікавана ў нашым тоўстым літаратурным часопісе, які звычайна творы для дзяцей не друкуе. Гэта мяне падахвоціла, але наступную казку «Буслінае лета» я напісаў не адразу, а толькі праз дзесяць год.

У 1972 годзе ЦК КП Беларусі і ўрад нашай рэспублікі ўпершыню прысудзілі Дзяржаўныя прэміі за творы для дзяцей. Пасмяротна гэтай высокай узнагароды быў удастоены Янка Маўр. Я ганаруся, што адначасова з творамі патрыярха беларускай дзіцячай літаратуры

Дзяржаўнай прэміяй адзначаны і мае кнігі: «Чытанка-маляванка», «Казкі» і паэма «Беларуская калыханка».

З дня ўтварэння ў рэспубліцы дзіцячага часопіса «Вясёлка» на працягу семнаццаці гадоў я працаваў яго галоўным рэдактарам. Гэта былі прыемныя, шчаслівыя гады майго жыцця, мабыць, таму, што ўсё тое, што я пісаў і рабіў для дзяцей, было для мяне сапраўднай асалодай. Не зважаючы на ўзрост, маючы справу з дзецьмі, я і сам «дзяцінеў». Стварэнне казак, пацешак, загадак, скорагаворак, лічылак — усё гэта было як радасная «гульня» дзеда са сваімі ўнукамі. І сапраўды, якраз у гэтыя гады раслі і былі маімі субяседніцамі, памочніцамі ўнучкі Юля і Маша — мае непасрэдныя настаўніцы, у якіх я вучыўся маленству.

Калі ў астрафізіка акадэміка Абарцумяна спыталіся, не без іроніі, вядома: «Якую практычную карысць дае вам ваша работа»,— ён адказаў: «Чалавек адрозніваецца ад свінні тым, што ён часам усё ж задзірае галаву ўгару і глядзіць на зоры».

Колькі ёсць яшчэ сярод нас упэўненых, што няма ніякай карысці з таго, што чалавек глядзіць на зоры, слухае шум дрэў, спеў птушак, дзівіцца ўсходу сонца, не гаворачы ўжо пра музыку, паэзію, літаратуру, якую часам амаль пад прымусам трэба вывучаць у школе.

Напэўна, чалавек, які першы падняў галаву і ўбачыў начное неба ў зорах, якраз і стаў тым, з каго пачалося паэтычнае радаслоўе: думка, трывожны вобраз, народжаныя здзіўленнем.

Калі нехта ў тым, што я паспеў зрабіць, знойдзе вартае ўвагі, дык, можа быць, яму цікава будзе ведаць, што стаў я паэтам не тады, калі напісаў вершы. Сапраўдная паэзія, як я разумею цяпер, прачнулася, абудзілася ў маёй душы значна раней — тады, калі мой бацька, набыўшы першага ў жыцці каня, выпраўляў мяне на начлег і я ўсю дарогу — з вёскі да лесу,— задраўшы галаву ў неба, глядзеў і не мог адвесці вачэй ад незразумелай мне велічы зорнага сусвету. Здзіўленне, душэўная ўзрушанасць і пры ўсім пры гэтым — жаданне, няхай сабе голасам птушкі, любой жывой істоты, выказаць сваю радасць, што і ты ва ўсёй гэтай неабсяжнасці займаеш сваё месца і намагаешся зразумець — дзеля чаго яно табе.

Пазней, стаўшы ўжо ладным падлеткам, я ішоў у зі-

мовы марозны дзень са Слуцка, з прафтэхшколы, у якой вучыўся на каваля і слесара, на пабыўку дадому ў свае родныя Еўлічы. Абапал гасцінца стаялі, як у казцы, заінелыя бярозы. Такое хараство, цішыня. І мне, які яшчэ і не думаў пісаць вершаў, чамусьці так захацелася выказаць, спасцігнуць душою ўсё, што я бачу і адчуваю, але я не мог і не ўмеў. І тады я гэтак расчуліўся ад горкай крыўды, ад бездапаможнасці, што стаў пасярод гасцінца і доўга-доўга рыдаў, абліваючыся слязьмі.

Чаму я запомніў і пранёс праз жыццё гэтыя, на першы погляд, нязначныя ўспаміны?

Думаю, што якраз гэта былі тыя моманты, калі ўва мне, як і ў многіх з нас, абуджаўся паэт, але я нічым не мог памагчы яму.

Можа быць, мы так і пражылі ўсё жыццё: часта ён даваў знаць пра сябе, прасіўся на свет, але я быў нячулым, благім яму таварышам...

*1976*

# *Ленінскія надзелы*

Ён быў адзін з першых маіх настаўнікаў. Якая прывабная, таямнічая, поўная цудаў была для мяне яго кузня, што стаяла цераз вуліцу, якраз напроці нашай хаты.

Пракураная, прадымленая кузенька, пасярод якой на тоўстай калодзе стаяла кавадла, а палову займаў горан з мяхамі — сіпатымі і хрыпатымі, як падраны гармонік, яна ніколі не пуставала — ні летам, ні зімою. Перад жнівом першы клопат — назубіць сярпы, панапраўляць, панацягваць шыны на калёсы, перад ворывам — навастрыць сашнікі. Перад зімою, на пачатку першых замаразкаў, пачыналася каванне коней — самая шумная і вясёлая пара ля Валадымавай кузні. Улегцы, у запрэжцы, а то і верхам прыязджалі сюды людзі і з чужых сёл. А кожны свежы чалавек — гэта ўжо навіна. Вось чаму тут любілі збірацца цікаўныя мужчыны, вясёлыя характарам, вострыя на слова і фантазію. Мае аднавяскоўцы доўга не маглі забыць, як адзін заезджы чмут здзівіў усю вёску сваёй граматнай кабылай. Не выпрагшы яе з аглабель, ён зачапіў лейцы за вугал кузні, дастаў з кішэні кажуха газету і, папляваўшы на яе канцы, прыклеіў да сцяны. Кабыла, падняўшы галаву, уставілася вачыма ў паперу і так, можа б, прастаяла ўвесь дзень, каб мы, здагадлівыя паджыганцы, не прынеслі ёй сена — хто колькі мог.

Ад нас не было адбою. Мы вечна круціліся ля кузні, а той, хто пераступаў яе парог, быў самы шчаслівы. Дзіва што! Не кожнаму Валадым давяраў чорную, зашмальцаваную вяроўку, ухапіўшы якую аберуч, ты мог раздзьмуць у горне такі агонь, ад якога зіхацела ўся кузня і награвалася такім густым жарам, што сам каваль, які ляскаў па распаленым жалезе лёгкім малаточкам, і яго падручны, што гахаў з-за пляча цяжкім молатам, скідалі з сябе споднія кашулі. Кузня поўнілася прыемным гаркавым пахам вугалю, што аж займала дых.

Ахвотнікаў пацягаць вяроўку, пасапці разам з кавальскім мехам, а тым болей пагахаць, хоць і цераз сілу, цяжкім молатам было многа. Але не ўсім выпадала шчасце. Тыя, што не заслугоўвалі Валадымавага даверу, станавіліся яго зацятымі ворагамі. Падцікаваўшы, калі ён ішоў па вуліцы, ужо не малады па гадах чалавек, выскоквалі з-за платоў і крычалі ўслед, у такт яго хадзе, заўсёды адны і тыя ж словы:

— Руб дваццаць! Руб дваццаць!

Гэта была самая вялікая крыўда дзядзьку Валадыму — знявечаная яго нага каленам ляжала на цяжкай драўлянай кульбе, і, ідучы, ён так нізка прыпадаў, нібы знарок прыгінаўся, каб схапіць камень ці груду зямлі і шпурнуць упопускі. Гэта яшчэ болей развясельвала і падахвочвала крыўдзіцеляў.

У мяне ніколі язык не павярнуўся вымавіць крыўдныя Валадыму словы не толькі таму, што ён быў наш сусед, з якім мы з аднаго калодзежа бралі ваду, і не толькі таму, што ў кузні я быў яго давераны памочнік — раздзімаў мяхі, а як падрос — узяўся і за молат, а самае галоўнае таму, што Валадым быў асабліва ласкавы да мяне. Ён заўсёды зваў мяне сынок.

— Сынок, падзьмі! Сынок, гахні во тут, яшчэ раз, яшчэ!.. — і пагрукае сваім малаточкам па тым месцы, куды мне на ўвесь мах трэба «гахнуць».

Але добрае, ласкавае слова ў вуснах майго настаўніка стала злым, абразлівым у вуснах маіх праціўнікаў. «Сынок!» — зласліва пачалі пацвельваць яны мяне і так дапяклі, што я аднойчы, убегшы ў кузню, плачучы, сказаў:

— Дзядзечка Валадым, не завіце мяне сынок!..

— Чаму? — здзівіўся каваль.

— Не хачу! — яшчэ галасней заплакаў я.

— Ну што ж,— сказаў Валадым,— не буду.— Але ў словах яго мне пачуўся затоены жаль, і ад майго сэрца быццам адарвалася часцінка нечага самага дарагога мне. Я зразумеў, што пакрыўдзіў свайго настаўніка і суседа, але чым? Чаму Валадыму так хацелся зваць мяне сынам?

Пра гэта, ужо ўтаймаваўшыся ад сваіх перажыванняў, я спытаўся ў маці:

— Чаму дзядзька Валадым заве мяне сынком?

— Бо ён жа твой бацька,— усміхнуўшыся, сказала яна.

— Як гэта? — ледзь не закрычаў я ад нечаканасці такой навіны.— У мяне ж ёсць свой!..

— Дзядзька Валадым — твой хросны,— адказала маці.

— То чаму ж вы... — перапытаў я з дакорам і расчараваннем,— чаму ж вы выбралі такога... з крывою нагою?

— З крывою нагою, ды з душою простаю, харошаю...— сказала маці. І мне пачулася асаблівая павага да нашага суседа. Дый сам я неўзабаве ўпэўніўся, што дзядзька Валадым з тых людзей, якія не толькі за дабро плацяць дабром, але гатовы памагчы, паспрыяць і паспачуваць заўсёды па-шчырасці, па бескарыслівасці свае натуры. Нават да таго, хто меўся зрабіць, а то і рабіў ім крыўду, яны не былі помслівыя, знаходзячы магчымасць і нагоду даць вінаватаму ўрок усведамлення свайго ўчынку, які б запомніўся яму надоўга, а то і назаўсёды.

Цяпер, на жаль, мы рэдка ў нашым выхаванні звяртаемся да тых трывалых асноў маралі і этыкі, якія складаліся праз многія пакаленні нашых папярэднікаў. Душэўную чуласць можна выхаваць толькі такой жа чуласцю, далікацтва — далікацтвам, дабрату — дабратой. Можа, ніхто гэтага так не разумеў і не адчуваў, як нашы бабкі і дзяды, нашы маці і бацькі. Найбольш чулыя з іх, найбольш душэўна шчодрыя і выпрацоўвалі той вопыт выхавання, той кодэкс разумення дабра і зла, які склаў найбагацейшую скарбніцу народнай педагогікі. Разумныя бацькі і маці, любячы сваё дзіця, ведалі, што спосаб ушчування сілаю — самы ненадзейны. Калі дзіця не перажыло свае віны, сораму, раскаяння за зробленае кепства, а тым болей — злачынства, не будзе ніякай гарантыі, што ў далейшым ад благога ўчынку яго ўтрымае страх пакарання. Наадварот, заліхвацкасць, рызыка як своеасаблівыя разуменні ўяўных смеласці і адвагі будуць заахвочваць дзіцячую няўрымслівасць на новыя прыгоды і ўчынкі.

Дзядзька Валадым рабіў людзям дабро не толькі сваёй працай каваля, але і сваёй чалавечай прыязнасцю. Няхай вам не здасца дробязнаю падзея, пра якую я раскажу трохі пазней. Відаць, асабіста мне яна не дробяз-

ная, калі не забылася і дагэтуль як наглядны ўрок глыбока перажытага мною раскаяння ў сваёй правіннасці перад маім настаўнікам.

На Валадымавым прыгуменні расла груша. Дакладней кажучы, расла яна якраз паміж нашых сядзібак, мяжа між якімі сыходзіла ў вузкую, як праехаць адным калясьмі, дарогу на выган. Валадымава груша, пасаджаная ім на сваім аселішчы, аднак жа чамусьці ўся падалася ў наш бок. Мабыць, ад таго, што ёй заміналі вішні, якія купчасціліся за ёю, а на нашым баку заставалася незанятая прастора і якраз жа з гэтага боку ўзыходзіла сонца, груша выгнулася над самай дарогай, і ўвесь яе галінасты верх апынуўся па наш бок. Калі паспявалі грушы і самі падалі на наша прыгуменне, па даўняй суседскай дамове і мы маглі іх збіраць. Але які дбайны гаспадар папусціцца напаканец рук, каб не даглядзець дабро ў самую пару. Валадымавы грушы былі важкія і вельмі ж сопкія, і калі яны ўжо падалі з дрэва, то карысці і наедку з іх было мала. Яны бухалі дадолу, і рэдка каторая не разбівалася. Вось чаму абіранне груш было ледзь не святам і ў Валадымавай сям'і, і ў нашай. Асабліва любілі гэтую ўрачыстую хвіліну мы, дзеці. Кожнае гатова было ўслужыць: прыцягнуць лескі, падаць кош, а пасля — поўны і цяжкі — занесці дадому. Так, з году ў год груша станавілася як бы нашай супольнай уласнасцю, дрэвам нашага добрага суседства, сяброўства і, нарэшце,— сваяцтва.

А пачалося якраз з мяне, дакладней кажучы, з майго паяўлення на свет. Не буду ўдавацца ў падрабязнасці. Як пазней расказвала маці, асабліва я ёй не даўся ў знакі. І хоць быў першынцам, але трымаўся лагодна і ціха. Я спачуваў сваёй маці, яшчэ не радзіўшыся. Ужо ў глыбокай старасці яна часта ўспаміняла і расказвала, як усё абышлося лёгка. Так лёгка, што сходнімі днямі і да самай хвіліны, калі яе «схапіла», яна пасвіла вяскоўую чараду. Пажаніўшыся, мае бацькі, не маючы ні зямлі, ні каня і астаўшыся ў дзедавай хатцы, выбралі адзіны магчымы спосаб да жыцця — наняліся ў пастухі. Плата была сходная, дый работа не ўвярэдная. Усё ішлося добра, каб якраз жа ў самую вясну, калі як вока ў ілбе, трэба пільнаваць кожную карову і раз-пораз бегаць адварочваць ад шкоды, пастушка так абцяжарала, што ледзьве перавальвалася з нагі на нагу. Хлопцам гэта бы-

ло за вясёлую забаўку. Яны па-свойму аберагалі маладзіцу. Як толькі яна, крэкчучы, падымалася ісці адварочваць чараду, пастухі ўжо былі напагатове. Толькі яна разгоніцца, а самы спрытны — падножку, і непаваротная маладзіца кулялася на купіну. І пакуль падымалася, вясёлыя гарэзнікі аж клаліся з рогату. «Гэтак ім было пацешна глядзець, як я перакочвалася з купіны на купіну»,— расказвала мне маці. Расказвала весела, без аніякай крыўды на пастухоўскія забавы. Так, яшчэ не нарадзіўшыся, відаць, і я прывучыўся адрозніваць, дзе злая крыўда, а дзе жарт, няхай сабе не зусім удалы і дасціпны. Можа, таму, як упэўнівала маці, «у нас і абышлося ўсё лёгка: на цямочку, калі выганялі чараду, я адчула, што мне пара, і сказала бацьку: «Васілько, гані сёння ты»,— а сама пайшла ў хату, легла на палку каля печы, і не паспелі па бабку збегаць, а я ўжо гатова, як табе кажу...»

Але дабра не бывае без ліха. Мала з'явіцца на свет, трэба, каб людзі пацвердзілі, што ты ёсць ты, і, кажучы сучаснаю моваю, узялі цябе на парукі. Праз некалькі дзён, калі прыйшлося мяне хрысціць, я даў нямала клопату сваім бацькам. На радасцях, што нарадзіўся сын, ім думалася, што і яны, як усе, маюць права на ўвагу і пашану. Як ім, небаракам, хацелася, каб маім хросным быў не абы сабе хто. Бацька пайшоў прасіць царкоўнага старасту — той не прыняў ласкі. Адмовіўся нават родны бацькаў дзядзька. Яму, валасному суддзі, гэта быў завельмі малы гонар. Тады маці з уласцівым ёй аптымізмам сказала:

— Э, Васілько, нам лепшага кума не трэба, як Валадым!

І праўда, сусед адразу ж згадзіўся, нават абрадаваўся.

Так мае бацькі пакуміліся з кавалём. Нездарма ж кажуць: лепшая радня — свая раўня. Дзядзька Валадым быў нам раўнёю — і ён не меў ні зямлі, ні каня. Адным яго спосабам да жыцця была кузня. Мае ж бацькі пачыналі з пастухоўскае пугі. Але наш сусед разумеў і цаніў людзей не па гонары, а па тым, на што яны здатныя. «Вучыся, браце, таму, што табе па душы»,— заўсёды раіў ён. Не маючы за што рук зацяць, бацька мой паехаў у Сібір. Пятнаццацігадовы бацькаў брат Усцім астаўся за гаспадара. Ён наняўся ў фальварак за парабка. Трое —

бабка Аксеня, маці і я — асталіся ў старой, трухлявай хатцы з акенцамі велічынёй роўна на адно бервяно. Колькі я помню, хату нашу звалі істопкай, бо яшчэ дзед прыстасаваў яе пад жытло з варыўні.

У Сібіры бацька ўкладваў шпалы на чыгунцы, быў пуцявым абходчыкам і толькі потым узбіўся на сталы занятак. Навучыўшыся шавецтву, ён атайбаваўся ў Омску і на гарадскім рынку на хаду ладзіў самы просты і грубы людскі абутак. Халодны шавец — так звалася спецыяльнасць, якую набыў мой бацька. Яна дала яму такі-сякі спосаб мець свой хлеб. Праз які год бацька выпісаў да сябе маці і мяне. Гэта была наша першая паездка на цягніку. «Што я, мой сыночак, папатрэслася, папакалацілася, едучы на Урэчча, бо тады ж яшчэ ў Слуцку станцыі не было»,— часта расказвала маці. Мне было толькі год ад роду, і таму не памятаю, ці тросся і калаціўся я,— напэўна ж, і тросся, і калаціўся ад доўгай, выбітай каляіністай дарогі на возе, але не ад страху перад сустрэчай з «машынай, што рэжа людзей». Такіх жахаў нарасказвалі вяскоўцы маёй маці пра цягнік, пра паравоз, што, убачыўшы яго на станцыі і «як з яго чорнага коміна рваўся дым і шугала полымя», яна, бедная, траха не ўмлела. Але ж потым, ачомаўшыся і ўпэўніўшыся, што машына нікога не рэжа, а наадварот, ехаць на ёй нават лепей, чым на возе, мая маці вельмі ж здзівілася хуткасці, з якой мы даехалі да Омска: «Гэта ж за якія два тыдні і былі там». Па тым часе, шэсцьдзесят гадоў таму назад, гэта была касмічная хуткасць. А яшчэ раней маёй бабцы Аксені не меншае дзіва быў веласіпед. Убачыўшы, як па гасцінцы ў хмарах пылу самі па сабе каціліся два высозныя колы, а паміж імі — нешта падобнае на чалавека, прыгнуўшыся, перабірала нагамі, мая бабка, нема закрычаўшы ад страху, кінулася ў вёску. Задыханая, мыляючы збялелымі губамі, яна толькі і вымавіла словы: «Чорт на калёсах!» Неўзабаве людзі дазналіся, што на самакаце ездзіць не чорт, а пан Залескі, і, як у свае пазнейшыя гады дазнаўся я, той самы Залескі, што разам з Тарасам Шаўчэнкам адбываў ссылку ў далёкіх прыаральскіх і прыкаспійскіх пясках, і як там яны, сумуючы па сваіх родных мясцінах на Украіне і Беларусі, змаўляліся, калі толькі судзіць ім доля вызваліцца, абавязкова сустрэцца ў нас, на Случчыне. Вярнуўшыся раней, Браніслаў Залескі не па-

кідаў свайго друга ў бядзе, падтрымліваў яго не толькі пісьмамі. На малюнкі і карціны, якія прысылаў паэт свайму сябру, Залескі знаходзіў пакупнікоў, якія, набываючы творы ўкраінскага Кабзара, прыкладалі і шмат намаганняў, каб вызваліць яго з няволі. Залескі не раз апісваў дарогу і даваў Тарасу Рыгоравічу план, як знайсці яго сядзібу. Калі б гэты план здзейсніўся, Шаўчэнка ішоў бы ў Рачкавічы якраз праз мае Еўлічы, па тым самым гасцінцы, на якім яго сябар здаўся бабцы Аксені «чортам на калёсах».

Так, бывае, сыходзяцца або могуць сысціся, перакрыжавацца лёсы і шляхі людзей, якія, жывучы на свеце, часам зусім нічога не ведаюць адзін пра аднаго.

Мая бабка Аксеня была такая глухая, што субяседніку трэба было на ўсю моц крычаць ёй у самае вуха. Добра памятаю першае непаразуменне паміж мною і бабкай, праўда, прычынай якога была не так глухата, як бабчына недасведчанасць у філалагічных тонкасцях.

Вярнуўшыся з Омска, я ў свае шэсць гадоў быў для вяскоўцаў «гарадскі». Маё здзіўленне з усяго ўбачанага, маё адкрыццё нанава тых з'яў і рэчаў, якія звычайна якраз у раннім малалецтве найбольш уражваюць душу і сэрца чалавека, аднагодкам маім, а тым болей дарослым, здаваліся такімі смешнымі і недарэчнымі, што ў іх вачах я выглядаў дзіваком, які з'явіўся невядома адкуль.

Доўга не мог забыцца, стаўшы вясковым анекдотам, мой першы дыялог з бабкай Аксеняй. Прыехаўшы дадому, на другі дзень раніцай я ўбачыў, як ад нашага парога ўроссып кінуліся шэрыя лупатыя істоты, і ў захапленні закрычаў:

— Бабушка, лягушки!

Бабка доўга ўглядалася туды, куды я паказваў,— у разорку між бульбоўніку, а ўгледзеўшы, са збянтэжаным здзіўленнем і крыўдным дакорам свайму дурному ўнуку сказала:

— Якія, хлопчык, галушкі, гэта жабы.

Праз які год-два сэнсавыя адценні і рызыкоўныя сугуччы зрабіліся ўласцівымі і майму слыху, бо і я стаў думаць і ўсё ўспрымаць цераз сваю мову. А навучыўшыся чытаць, сам трапіў у становішча сваёй бабкі, калі ўпершыню прачытаў прозвішча Катаеў, бо зразумеў яго літаральна, як паведамленне пра рэдкае здарэнне.

Чытач ужо заўважыў непаслядоўнасць майго апа-

вядання. Адхіленні ў бакі разбурылі мой сюжэт. Прызнаюся, я і не думаў пра яго. Гаворачы з вамі так, як плыве мая думка, я ўсё ж адчуваў, што ў гэтай плыні ёсць выток. Дзе ён? У раннім маленстве я пабываў у Сібіры, у думках з вамі перанёсся на пустынны бераг Аральскага мора, а потым усё ж вярнуўся да той хатыістопкі, дзе нарадзіўся і з акенца якой убачыў свет. Як сляпы за плот, я не раз яшчэ буду брацца за яе вугал, ад якога да гасцінца было рукою падаць. Напэўна ж, калі б украінскі пясняр, ідучы ў госці да свайго друга, павярнуў у палявую сцежку напрасткі, ён не абмінуў бы нашай істопкі, сеў бы адпачыць на яе парозе, і мая бабка Аксеня, тады яшчэ зусім маладая, прыгожая, вынесла б яму ў кадаўбцы халоднага бурачнага квасу...

Як бы далёка ў свеце ні былі тыя, хто выйшаў з гэтай хаты, рана ці позна, а ўсё ж вярталіся з гасцінца зноў да яе прызбы, выкладзенай цёплай зляжалай кастрыцай.

З нялёгкіх дарог імперыялістычнай і грамадзянскай войнаў вярнуўся дадому мой бацька. У салдатах ён набыў яшчэ адну спецыяльнасць — фельчара, але яшчэ больш удасканаліўся і ў першай: мог не толькі наладзіць зношаныя, старыя боты, а з тавару заказчыка пашыць новыя, па самай апошняй модзе — з высознымі цвёрдымі заднікамі і з халявамі-бутэлькамі, што шчыгульна аблягалі да самых каленяў мужчынскія і хлапечыя лыткі. Разлік быў сходны: насып поўныя халявы збажыны — вось і ўся плата.

Умець — за плячыма не насіць. Цяпер мой бацька ўмеў многае, але надоўга хапіла б і гэтых двух клопатаў: лячыць хворых і абуваць здаровых, каб не пачаўся перамер усяе зямлі нанава, па душах.

Нас было з бабкай Аксеняй сямёра. Не магу сказаць пэўна, колькі нам нарэзалі, але добра памятаю, што надзелы тыя называліся — Ленінскія. І дагэтуль у маёй вёсцы так завуцца тыя палеткі самай лепшай і ўрадлівай зямлі.

Які вялікі сэнс гучыць мне ў гэтай назве! Людзі, што ніколі не мелі за што рук зацяць, парабкі і пастухі ўпершыню ступілі нагою на цёплую родную баразну жаданай зямлі, якую ім даў Ленін!

Была ў нашай сям'і і восьмая душа: бацькаў брат, а мой адзіны дзядзька Усцім, якога, вярнуўшыся з Сібі-

ры, мы ўжо дома не засталі. Яго забралі ў салдаты на імперыялістычную, а потым віхура грамадзянскай занесла так далёка, што за многія гады і почуту не было. Бабка Аксеня, яго маці, была ўпэўнена, што «яго і костачак даўно няма». Але ён сыскаўся-такі ў матчыну хату. 23-гадовы юнак, ён служыў у штабе ўзброеных сіл Украіны і Крыма — арміі, якой камандаваў Фрунзе. У самы цяжкі для маладой Савецкай дзяржавы час, калі Урангель з поўдня і з усходу рваўся да Масквы, фальварковы парабак уступіў у рады партыі камуністаў. «Я ведаў,— успамінае ён цяпер,— ніколі не адступлюся ад таго, што мы заваявалі,— не магу адступіцца. Няўжо ж зноў — аброчная торба пастуха, беспрасветнае і ганебнае парабкоўства ў маёнтку? Успомніў сваю вёсачку ў балоце, сваю замшэлую хатку з падслепаватымі акенцамі. «Не! — сказаў я сабе.— Памру, а не вярнуся да старога жыцця!» А я слухаў яго і думаў: недзе ж і мяне ў дворнай афіцыне чакала пастухова пуга і такая ж торба, каб не ўсё тое, ад чаго не адступіўся мой дзядзька.

Усцім Максімавіч праз усё жыццё быў далікатны і сціплы чалавек. Такі ён астаецца і цяпер, на схіле год, жывучы пасля апошняй вайны ў аблюбаваным ім Львове, і рэдка-рэдка хто ведае яго цяжкую і слаўную біяграфію. Такі ж даступны, не паказны, не фарсісты быў ён і ў маладыя гады. На кароткую пабыўку прыехаў не ў сваёй камандзірскай форме, а ў абмундзіраванні чырвонаармейца. У дадатак да ўсяго мяне ўразіла тая акалічнасць, што дзядзька нясмела, як бы не ўпэўнены ў тым, што гэта магчыма, папрасіў маю маці падараваць яму... свайго, нашага палатна! Маці так абрадавалася, што хоць чым можа зрабіць прыемнасць дзеверу. «Выбірай, Усцімко, што ўпадабаеш!» — і яна дастала са скрыні ўсе свае кужэльныя багацці. Хутка самы лепшы вясковы кравец пашыў майму дзядзьку палатняны гарнітур. Тады яны сама што ўваходзілі ў моду. Абнова была спраўлена якраз перад вялікаднем. І мы з дзядзькам пайшлі ў суседнія Чаплічы на ўсяночную, бо вельмі ж там была харошая, як у нас казалі, пеўчая. Пеўчай я ўжо быў наслуханы даволі. Цяпер мне была адна цікавасць — наш госць. Толькі б не адстаць ад яго, не спусціць яго з вока. Тады я наўрад ці разумеў, што шмат у чым і замінаў яму, яшчэ зусім маладому хлопцу. Ці мала яму трэба было каго сустрэць, убачыць і каб ад неча-

га позірку адчуць, як зойдзецца ў даўнім суме хлапечае сэрца. У такіх тонкасцях я тады не разбіраўся, хоць і быў вельмі ўражлівы. Памятаю, як мы вярталіся дадому і як мяне здзівіў і ўзрушыў усход сонца. Гэта быў мой, асабіста мой, усход ва ўсёй яго харашыні.

Спярша небакрай заружавеў вузкай палоскай. Раптам імклівы прамень шугануў з-пад зямлі і рассыпаўся на дробныя пырскі. Чырвань згусцілася і ахапіла паўнеба. Але трывала нядоўга і адразу ж сцьмела. Тады спакваля выкацілася яно, вялікае, але рахманае, нейкае вельмі ж свойскае і бездапаможнае. І пакуль раскатурхалася, я доўга глядзеў на яго, не зводзячы вачэй. Раптам яно прачнулася, ажыло, заварушылася і набрала такой сілы, што цяпер ужо ўвесь свет здзівіўся яго хараству.

Сонца іграла! Гэта бывае рэдка — у самыя першыя дні ранняй вясны. І цяпер, калі б мне прыйшлося малязаць сонечны ўсход, я не ўзяўся б пісаць з натуры, я маляваў бы яго такі, які ўбачыў упершыню. Выпрабаваная памяць, відаць, і ёсць аснова мастацкай праўды.

Пасля свят мы пайшлі з дзядзькам у Крошню. Так зваўся лес, а праўдзівей сказаць — рэшткі лесу таго самага «чорта на калёсах», што траха не да смерці перапалохаў бабку Аксеню. У Крошні мы накапалі, як падняць удвух, цэлую вязку маладзенькіх бярэзінак. Імі мы абсадзілі ўвесь равок, які канчаўся наш прысядзібны паплавец — ад вулічнай грэблі да выгану. Некалькі бярэзінак пасадзілі пры хаце. Якраз яны і прыняліся. А тыя на раўку, на ветры, на буі, зачэзлі. Бяроза не любіць адзіноты. Затое гэтыя, пры хаце, з кожнай вясной набіралі сілы. Дзядзька зноў быў далёка ў сваіх нялёгкіх вандроўках, а яго бярозы шумелі магутнымі купчастымі вярхамі.

Можа, яны і ўспаміналіся калі Усціму Максімавічу, але зноў на многія гады згубіўся яго след. Зноў бабка Аксеня аплаквала сынавы костачкі. Толькі ж добрая вестка паміж добрых людзей ніколі не губляецца. Так дайшла яна і да нас. З якога канца, з якой вёскі і ад каго — невядома, але ў нашу хату прыйшоў зашмальцаваны, перагартаны дзесяткамі і сотнямі рук часопіс «Огонек».

...На неспакойным, трывожным Далёкім Усходзе была створана Асобая Чырванасцяжная Армія на чале з праслаўленым у баях Блюхерам. Пра гэта мы, пэўна,

хоць і ведалі, але без тых падрабязнасцей, якія прынёс часопіс. У ім на цэлую старонку быў змешчаны здымак камандавання арміі. Там мы ўбачылі Блюхера. Але што асабліва ўразіла нас сваёй нечаканасцю — гэта тое, што побач з ім стаяў стройны, падцягнуты, у доўгай да каленяў гімнасцёрцы камандзір, і прозвішча яго было наша. Мой бацька, маці, бабка Аксеня і ўсе суседзі прызналі — гэта ён, Усцім. Пад прозвішчам была пазначана і яго пасада: старшы сакратар камандарма...

Яго бярозы і мяне выпраўлялі з дому, а калі вярнуўся назад, заўсёды першыя сустракалі, бо выраслі ўжо намнога вышэй за хату і бачыліся здалёк.

Бачыліся яны мне і далёка ад хаты за многія-многія адлегласці і гады. Бачыліся з пакутных дарог вайны, бачацца і цяпер, хоць іх даўно няма. Мая вёсачка, якая тулілася ў балотнай нізіне, хаваючыся ад вечных пажараў і спусташэнняў, што неслі з сабой навалы прагнага заваёўніцтва,— мая палахлівая, зняверaная стагоддзямі вёсачка смела, з размахам пачала перабірацца з балота на самую высокую разлегласць, якраз на тую роўнядзь, па якой пралягаў спрадвечны гасцінец з Усходу на Захад.

Некалі выцягнутая ў адзін шнур, цяпер яна ўжо заняла аж чатыры вуліцы, раскінуўшыся на чатырох пасёлках на той лепшай і ўрадлівай зямлі, якая завецца — Ленінскія надзелы.

Калі заснаваўся калгас, першым старшынёй яго стаў мой бацька. На Ленінскіх надзелах пачала закладацца аснова новага аселішча. Былыя парабкі і пастухі выбіраліся на першыя ў сваім жыцці сялібы. Калгас рос і разбудоўваўся на выгодзе і прасторы. Прагныя фашысцкія грабежнікі вынішчылі ўсе яго набыткі. Гітлераўскія прыхвасні — стараста з паліцэйскімі — звялі свае даўнія рахункі і з маім бацькам: закатавалі ў гестапаўскай турме.

Пры нашай новай хаце выраслі ўжо іншыя дрэвы, пасаджаныя добраю і дбайнаю рукою. На запаветных надзелах нанава адбудавалася ўсё паселішча. Яно зберагло сваё імя, сваё слаўнае радаслоўе як удзячнасць, як памяць, як наказ і спадчыну сваім нашчадкам...

Няма бяроз, пасаджаных дзядзькам Усцімам, але, штораз прыходзячы на даўняе хацішча, многа разоў перааранае трактарнымі плугамі, я знаходжу сляды, дара-

гія маёй душы, сляды людзей, якім я абавязаны ў жыцці. Яшчэ нядаўна непадалёк ляжаў цяжкі млынавы камень з дзіркаю пасярэдзіне. Праз яе прабіваўся густы куст конскага шчаўя. На гэты камень мы клалі калясо, каб нацягнуць шыну. Тут была Валадымава кузня — пачатак маёй памяці, адкуль мне бачыцца ўся разлегласць пражытых гадоў.

Зноў вяртаюся я да свайго настаўніка, які вучыў мяне не толькі кавальству, але і даў урокі той простай педагогікі, што заклала асновы душэўных набыткаў. Нездарма я так падрабязна расказваў вам пра суседаву грушу, што хілілася верхам на наш бок. Гэтая груша запомнілася мне яшчэ і таму, што праз адно прыкрае здарэнне, а праўдзівей кажучы — праз маю пакваплівасць, я назаўсёды зразумеў і ацаніў, якое было мудрае сэрца ў майго настаўніка.

...Яны былі яшчэ зелянцовыя і гаркавыя, але я наважыў паскорыць іх паспяванне. Ведаючы, што Валадым у кузні, я ўзлез на дрэва і стаў латашыць грушы. Ці то захапіўшыся гэтай работай, ці то ўзрушаны адчуваннем храбрасці і рызыкі, я не пачуў, адкуль узяўся гаспадар, хоць яго драўляная кульба заўсёды грукала і рыпела, падаючы верны знак, хто ідзе. Але ён, мабыць, падышоў даўно. Бо стаяў пад дрэвам спакойна і, задраўшы галаву, глядзеў на мяне, нібы сам папрасіў — узяць пробу.

— Мабыць жа, сынок, зялёныя яшчэ...— сказаў дзядзька Валадым разважліва, быццам паміж намі ішла добрая суседская гаворка.

Яны былі жорсткія і даўкія. І хоць мая згаладалая істота прагла навіны і мы, дзеці, як ненаедны вусень, грызлі нават самую першую завязь, я згадзіўся з суседам:

— Зялёныя, дзядзюхна...

І так мне стала горка і ў роце і на душы, што і дагэтуль адчуваю тую гаркавасць.

Злазіў я з дрэва марудна і неахвотна ўжо не ад страху, а ад сараматнога цяжару: вокал паясніцы мае запазухі былі поўныя зялёных груш, і калі сарочка вылузалася з нагавіц, усе яны пасыпаліся дадолу...

Праз які тыдзень верныя добраму звычаю, мы зноў разам абіралі Валадымаву грушу. І звыш тых кашоў, што прыйшліся пароўну, каваль дадаў яшчэ адзін.

— Гэта майму хрэсніку,— сказаў ён і ўсміхнуўся. Так дзядзька Валадым хрысціў мяне другі раз.

Самае цікавае скажу пад канец: грушу тую звалі валадымаўка. Гэта такі гатунак ранніх, вялікіх, прыгожых і смачных груш. Адкуль ён завёўся ў нас, хто вырасціў яго? Я і дагэтуль упэўнены, што мой хросны, бо толькі ў нашым невялікім наваколлі чутна валадымаўка. Можа, у іншых мясцовасцях яна завецца інакай — не ведаю.

Для мяне каваль Валадым і яго груша жывуць у адзінстве, разам з той дарагой спадчынай, якая засталася мне ад вечнага матчынага жыццялюбства, ад бацькавай неўтаймаванасці, ад дзядзькавага высокага абавязку — быць заўсёды на варце тых вялікіх багаццяў, якімі надзялілі нашы душы самыя дарагія нам людзі — нашы настаўнікі.

*1971*

# Уваход дарослым дазваляецца

# *Дыялогі з унучкамі*

Адкрыты Карнеем Іванавічам Чукоўскім і ўзаконены ім у літаратуры жанр дзіцячай творчасці так палюбіўся людзям, не абыякавым да паэзіі маленства, што цяпер ужо не адны пісьменнікі, а і самі бацькі, дзяды, настаўнікі і выхавацелі пачалі клапатліва збіраць той каштоўны матэрыял, без асэнсавання якога не можа быць навукі аб выхаванні.

Кожнае дзіця — цудоўная, захапляючая кніга. Спазнаючы дзяцей, мы спазнаём саміх сябе. Вучачы дзяцей, вучымся самі.

Справа не толькі ў самабытнасці дзіцячай творчасці, а перш за ўсё, у імкненні спасцігнуць асаблівасці псіхалогіі дзіцяці, законы яго мыслення.

Хто сумеўся ад нечаканасці запытання дзіцяці, убачыў яго здзіўленне перад з'яваю, якая дарасламу здаецца самай звычайнай, той, напэўна ўжо, не адмахнецца ад дзіцячай дапытлівасці, а задумаецца і сам — як адказаць, якімі словамі растлумачыць.

Адгэтуль і пачынаецца ўзаемаразуменне дарослых з дзецьмі, без якога немагчымае выхаванне.

Гэтыя занатоўкі, хоць і без пэўнай сістэмы, вяліся ў той адцінак часу, калі дзіця ў спазнанні самога сябе і ўзаемадачыненняў дарослых у нейкай ступені яшчэ трымаецца не заўсёды зразумелых нам уласцівасцяў свае логікі і фантазіі.

Абсяг дзіцячай цікаўнасці, разнастайнасці пытанняў вымагалі, вядома, паслядоўнага тэарэтычнага асэнсавання, але, не прэтэндуючы на яго, я пераважна запісваў самі пытанні і адказы на іх — не свае, а маіх субяседніц — з усёй грунтоўнасцю іх аргументацыі, што, безумоўна, дае той узровень духоўнага і матэрыяльнага развіцця, з якога пачынаюць сваё жыццё нашы ўнукі.

## *Першыя адкрыцці*

Яны пачынаюцца з самай блізкай адлегласці — са свайго абліччa.

Як і ўсе дзеці, яна пазнавала ўжо сваіх родных, адрознівала іх галасы, цягнулася да бразготкі, прывешанай над галавой.

Магчыма, гэта былі яшчэ рэфлексы. Але вось пачынаюцца рухі, у якіх выяўляецца і намаганне волі, і цікаўнасць пазнання.

Рукі, аказваецца, патрэбны чалавеку не толькі дзеля таго, каб іх беспераныпна пхаць у рот. З дапамогаю рук можна адкрыць і яшчэ шмат невядомых загадак.

Вось пальчыкі затрымаліся на шчацэ, потым пасунуліся далей. Стоп! Пальчыкі сціснуліся ў жменю. Ёсць! Нешта злоўлена. З усёй сілы пацягнуўшы кулачок да сябе, яна паднесла яго да вачэй, распрастала — пуста. Што ж гэта? Толькі што было ў кулачку — і няма.

Зноў пачынаецца ўсё нанава. І гэта ўжо намаганні, прадыктаваныя дапытлівасцю. Паспрабаваўшы некалькі разоў злавіць у жменю і паднесці да рота незразумелую загадку, яна нарэшце ўпэўнілася, што не ўсё пазнаецца на смак. Не ўсё невядомае, заціснутае ў кулачок, трэба цягнуць у рот, тым болей — сваё вуха.

На першы раз дастаткова ўведаць, што яно ў цябе ёсць. А дзеля чаго — дазнаешся пазней.

Наперадзе яшчэ нямала дзівосных адкрыццяў.

## *Бу — бу — бу*

— Вы не паверыце, што гэта за дзіця,— гаварыла ў захапленні бабка сваім суседкам.— Такое малое, а ўжо ўсё-ўсё гаворыць!

— Што ж яно гаворыць? — зацікавіліся суседкі.

— Бу-бу-бу! — радасна паведаміла шчаслівая бабка.

## *Калыханка*

Самыя першыя ўражанні, што глыбока западаюць яшчэ не ў свядомасць немаўляці, а ў яго пачуцці,— гэта гукі. Паступова ў гукавым наваколлі, спярша бязладным і нястройным, слых пачынае адрозніваць той парадак, што падначальваецца рытму дыхання, а потым настрою.

Перш чым зразумець слова, дзіця авалодвае мовай гукаў.

Натуральна, што адгэтуль пачынаюцца вытокі эмацыянальнага фарміравання чалавека. Мілагучнасць, суладнасць, гармонія, адкрытыя раней за слова,— стартавая пляцоўка для ўзнікнення думкі.

Задоўга да таго як дзіця пачне гаварыць, яно ўжо адчувае мелодыю, чуйна адгукаецца на той настрой, які нясе песня. Дзіця само пачынае спяваць.

У народзе пра гэты перыяд гавораць больш вобразна: дзіця гудзе! Цікава, што ў многіх славянскіх мовах слова гудзьба (гудба) азначае — музыка.

Калі, бывае, чуеш, як маладыя бацька і маці з жалем скардзяцца, што іх дачцэ ці сыну «мядзведзь вуха адтаптаў», так і хочацца сказаць: не мядзведзь, а вы, паважаныя! Калі дзіця з першых дзён не жыло ў свеце характва гукаў, не чула найлепшых песень, цяжка, ой, як цяжка будзе яму самому набыць гэтыя душэўныя багацці!

Ніякія спецыялісты не паставяць голасу, калі ў чалавека змалку, з пялёнак не пастаўлены слых!

Нашы маці праз вопыт многіх пакаленняў добра ведалі, што першаасновы душэўнага характва чалавека пачынаюцца з калыскі, з той самай простай, геніяльнай у сваёй мудрасці і паэтычнасці песні, якая называецца — калыханка.

Як жа крыўдна, што цяперашнія маці так рэдка спяваюць калыханкі сваім дзецям, што многія самі не чулі калыханак, створаных і сагрэтых матчынымі сэрцамі.

Нашы маладыя маці збядняюць душы сваіх дзяцей, калі думаюць, што калыханку можна замяніць любой бяздумнай песенькай.

Ад свайго нараджэння чалавек павінен адчуваць, што ўсё самае прыгожае ў жыцці створана дзеля яго шчасця.

## *Тэатр з пяці пальцаў*

Да такое простае рэчы магла дадумацца толькі геніяльная народная педагогіка.

На руцэ пяць пальцаў, але з іх дапамогаю можна адкрыць ісціны, якія трэба ведаць чалавеку ўжо змалку.

Праца — найлепшы спосаб выхавання. Як давесці гэтую сентэнцыю? Метад слоўнага павучання — не самы прыдатны. Гэта добра ведалі нашы прабабкі.

Вось яны і заснавалі дзіцячы тэатр, выдатна паставіўшы ў ім свой першы спектакль: «Сарока-варона па прыпечку скакала, дзеткам кашку мяшала...»

Кожны палец — жывы персанаж. А ўсе разам яны цудоўна выконваюць свае ролі. Чацвёра дзетак дружна, у ахвотку памагаюць маме, пяты — гультай, не хоча памагаць.

І вось вам апошняя сцэна спектакля, яго бліскучы фінал. Той, хто «круп не драў, вады не насіў, цеста не мясіў», церпіць поўнае паражэнне!

Гледачам і слухачам адкрыта найвялікшая мараль жыцця: хто не працуе, той не есць. Адкрыта не назольна, не дыдактычна, а праз паводзіны і ўчынкі, праз нагляднасць жыццёвых вобразаў.

Якімі простымі, якімі мінімальнымі сродкамі даведзена ісціна, на доказ якой мы, прафесіяналы, падчас трацім намаганні цэлых калектываў выхавацеляў!

## *Лічылкі*

Ены бэны тыкі пакі
Орбы торбы енцы смакі
Евус дэвус кут натэвус —
Старой бабе за печ спаць!

Ці зразумелі вы што ў гэтай пацешцы? Відаць, нічога, акрамя апошняга радка.

А заўважце, што многія пакаленні нашых папярэднікаў, ды яшчэ і мы з вамі, усе свае дзіцячыя гульні пачыналі гэтаю лічылкаю.

Мабыць, таму яна гэтак доўга жыла і жыве, што ў ёй ёсць самае галоўнае для дзіцячай гульні — магія таямнічасці, якая заўсёды будзіла дзіцячую фантазію.

Ніхто гэтак, як дзеці, не верыць у чарадзейнасць слова. У іх яно заўсёды мае такую ўсемагутную сілу, з дапамогаю якой можна зрабіць любы цуд.

Такое лічылкі не маглі прыдумаць дарослыя. Хоць, можа, тонка дасведчаны гісторык-філолаг мог бы знайсці ў ёй якія-небудзь рэшткі каранёў, скажам, старажытнага санскрыту. Хто яго ведае. Пушчаная ў абыходак першатворцамі, яна праз многія стагоддзі ўвайшла ў дзіцячы фальклор у самых разнастайных варыянтах, але з нязменнай сваёй уласцівасцю — загадкавасцю і таямнічасцю.

«Самая дзівосная і глыбокая эмоцыя, якую мы можам перажыць,— гаварыў Эйнштэйн,— гэта адчуванне тайны. У ёй — пачатак усіх сапраўдных адкрыццяў».

Я не даследую гісторыю лічылкі, хоць і яна магла б стаць найцікавейшым аб'ектам вывучэння псіхалогіі дзіцячай творчасці. Ісціна часта спасцігаецца ў параўнанні.

Таму я параўноўваю лічылку свайго маленства з лічылкамі сваіх унучак:

Из-за горки катится
Голубое платьице.
На боку зеленый бант —
Меня любит лейтенант.
Лейтенант молоденький,
Звать его Володенька.
Через месяц, через два
Буду я его жена.
Он жену не полюбил,
Взял топор и зарубил.
А жена не умерла,
Взяла сумку и ушла.

І гэтая, сучасная, лічылка складзена, безумоўна, дзецьмі, бо і ў ёй, не зважаючы на трагізм сітуацыі, сюжэт завяршаецца аптымістычна, што заўсёды характэрна творчай фантазіі дзяцей.

У імя справядлівасці, дабраты дзіцячай душы можна ажывіць любога героя, не толькі даверлівую прасцячку.

І ў той жа час у наіўнай прастадушнасці гэтай пацешнай «аптымістычнай трагедыі» па-свойму адлюстраваліся і ўяўленні сучасных дзяцей пра адносіны паміж дарослымі, пра легкадумнае і безадказнае вырашэнне імі такіх маральна-этычных праблем, як шлюб і развод, як матэрыяльная незалежнасць жонкі ад мужа: «Взяла сумку і...» Адным словам, з чым прыйшла, з тым і пайшла!

## *Прывст*

Выходзячы на прыпынку з тралейбуса, жанчына наказвае сваёй знаёмай і яе малой дачушцы:

— Перадайце прывет тату.

— Мама, што перадаць? — перапытвае дзяўчынка.

— Прывет!

— А дзе ён?

— Хто?

— Ну гэты прывет. Цёця табе яго аддала?

— І мне і табе.

— А які ён, прывет? — дамагаецца малая.

— Ну, як табе сказаць...— задумваецца мама.— Ну, скажам, што сустрэлі ў тралейбусе цёцю Люсю...

— І яна перадала прывет,— паспешліва дадае дзяўчынка.

— І яна перадала прывет,— паўтарае мама, задаволеная, што дачка нарэшце зразумела, што такое прывет.

— А дзе ж ён? — не можа супакоіцца малая.— Ты яго ў сумку паклала? — і цягнецца да сумкі, поўнай памідораў.— Пакажы, мамачка.

## *Бацька і маці*

Гэта як бы два полюсы, узаемна патрэбныя адзін аднаму, і два пачаткі для новага, будучага характару. Ад бацькі — стрыманасць, нецярпімасць да расчуленасці, зацятасць волі. Ад маці — чуйнасць, спагада дзіцячым слабасцям і заўсёды запас пачуццяў, без выяўлення якіх не можа супакоіцца сэрца.

У малога Вадзіка забалеў зуб. Гэта быў першы нясцерпны боль у яго жыцці. Дома ён не мог стрываць свайго гора — крычаў немым голасам. Прыйшлося шукаць ратунку.

У бальніцу Вадзіка павёз бацька. І сын усю дарогу і ў трамваі, і на вуліцы трымаўся мужна. Ён толькі крывіўся ад болю. Яшчэ з большай храбрасцю хлопчык увайшоў у бальніцу. У доктарскім крэсле ўскрыкнуў толькі адзін раз. Калі ж доктар паклаў яму ў руку вырваны зуб, ён, сціснуўшы кулачок, выбег на калідор і радасна, з нязвычным прысвістам, сказаў тату:

— Во ён!

Дадому ехалі той самай дарогай, і Вадзік, моцна трымаючы ў кулаку свой адбалелы зуб, зусім забыўся пра перажыты страх.

Але вось дзверы адчыніла мама. Трывогу, хваляванне, спагаду, душэўны боль — усё адразу ўбачыў Вадзік у яе на вачах.

— Сыночак! — толькі вымавіла яна, а Вадзік ужо кінуўся ёй на шыю і, ледзь пераступіўшы парог, даў поўную волю ўсім горкім слязам, што сабраліся ў яго душы, калі ён астаўся адзін на адзін з бацькам, з незнаёмымі

людзьмі ў трамваі і на вуліцы, з доктарам у бальніцы — і з усімі пакутамі і перажываннямі гэтага доўгага і цяжкага дня.

## *Казка*

— Хто ты?
— Я фея-чарадзейка.
— А што ты можаш?
— Я ўсё магу.
— Фея-чарадзейка, уладзь мяне ў дзіцячы сад.

## *Сапраўдная казка*

Я расказваю казку не з кнігі, а са сваіх слоў.

## *Дзе хаваецца бог*

— Гэта палац?
— Не, царква.
— А-а, тут выступаюць ільвы, мядзведзі і сланы?
— Ты зблытала: не цырк, а царква.
— Ведаю, успомніла! Гэта дзе хаваецца бог.
— Навошта яму хавацца?
— А ад касманаўтаў.

## *Добры знаёмы*

— Вунь ён! — радасна паказала на афішу, на якой красаваўся элегантны мужчына ў цыліндры, у фраку, з гарапнікам у руках.
— Хто гэта?
— Царкоўны артыст.

## *Русалкі*

— А праўда, дзядуля, русалкі ёсць?
— Гэта толькі ў казках.
— Не, яны ёсць у моры.
— Ніхто іх не бачыў.
— А ведаеш чаму?
— Чаму?
— Таму, што ў нас няма хвастоў. Русалкі выйдуць на бераг, паглядзяць, што ў нас няма хвастоў, і схаваюцца.

## *Рука*

— Дзядуля, колькі год маёй руцэ?
— Пяць.
— Колькі і мне?
— Ну але.
— А чаму ж яна вышэйшая за мяне?

## *Ступа*

— А я ведаю, што такое ступа.
— Што?
— Ракета бабы-ягі.

## *Парада*

— Ты куды?
— На работу, Юлечка.
— Ой, дзядуля, не ідзі. З кім жа я гуляць буду?
— Няможна не ісці. Мае таварышы прыйдуць, а мяне няма.
— А ты ім пазвані, што ты сягоння на пенсіі.

## *Грошы*

— Дзядуля, ты на работу?
— Ну але. Хадзем са мной, Маша. І табе пара ўжо грошы зарабляць.
— А ў мяне кашалька няма.

## *Маша — англічанка*

— Маша, як па-англійску — кот?
— Кэт, а маленькі — кіці.
— А сабака?
— Дог.
— А слон?
— Такіх вялікіх слоў я не ведаю.

## *Слон і мурашка*

— Дзядуля, калі б цябе праглынула мурашка — ведаеш, якая б яна была?
— Якая?
— Як слон.

## *Пачэсныя госці*

— Калі мы пойдзем на Оліны імяніны?
— Калі нас пазавуць.
— А нас будуць частаваць?
— Ну а як жа. Чаму вы пытаеце?
— А мы ж не імяніннíцы, нашы імяніны ўжо былі.

## *Высокая дасведчанасць*

Чыталі апавяданне пра Леніна.

— Вось каб цяпер паявіўся Ленін,— летуценна прамовіла большая,— што было б?

Меншая падумала і сказала:

— Быў бы салют.

## *Вайны не будзе*

— Вайны не будзе!
— Чаму?
— Мой тата хворы.
— А хто твой тата?
— Страшны лейтэнант!

## *Першы дзень вясны*

— Сёння першае сакавіка, першы дзень вясны.
— А салют будзе? — спыталася Маша.

## *Заказ*

— Бабка, нарадзі яшчэ адну ўнучку.

## *Сон*

— Чаму ты так рана прачнулася?
— Кончыўся сон.

## *Хачу брацíка*

— Хачу брацíка.
— Давай абмяняем на Машу.
— Не.
— Як жа быць?
— Надзенем Машы штаны.

## *Не хачу брацiка*

— Мама, я перадумала — не хачу брацiка. Лепш нарадзi мне сабачку.

## *Дзе ляля?*

Схавала ляльку пад прыпол сукенкi — падняўся жывот.

— Дзе ляля?

— Яшчэ не нарадзiлася.

## *Дваюрадная мама*

— Цёця, вы такая харошая — будзьце мая дваюрадная мама.

## *Пасля бальнiцы*

— Столькi ты песень харошых ведала, а цяпер пазабывала.

— Не пазабывала. Усе яны ў мяне на языку.

## *Званок*

Яна яшчэ не можа дацягнуцца да званка. Калi вяртаецца з двара, грукае ў дзверы кулачком. Дзверы абабiтыя, грукату не чуваць, а толькi цiхае шорханне.

— Хто там?

— Я.

— Чаму ж ты не звонiш?

— Дз-дз-дзын! — чуецца за дзвярыма радасны галасок. I дзверы адчыняюцца.

## *Запарожац*

— Дзядуля, хто гэта — запарожац?

— Той, хто жыве ў Запарожжы, на Украiне.

— А як яго завуць?

— Па-рознаму: Iван, Мiкола...

— Не.

— А як жа?

— Тарас Бульба.

## *Маці Горкага*

— Гэта тут стаіць помнік Горкаму?

— Гэта не помнік, а скульптура.

— А чаму ў нашым парку?

— Парк імя Горкага.

— А я бачыла маці Горкага. Яна такая маладая. Маладзейшая за яго.

— Дзе ты бачыла?

— А ў кіно паказвалі. Называецца: маці Горкага.

## *Абвяржэнне*

Рэдакцыя ў лісце да свайго карэспандэнта напісала: «Паважаны...»

Праз некалькі дзён прыйшоў пратэст: «Які я вам паважаны?

Я — вучань першага класа!»

## *Зарубкі*

— Зарубі сабе на носе...

— А ў мяне ўвесь нос у зарубках,— і паказала на вяснушкі.

## *Без маскі*

— Кім ты была на маскарадзе?

— Чалавекам. У мяне не было маскі.

## *Словатворчасць*

— Ты школьніца? Ты ходзіш у школу?

— Не, я садніца. Я хаджу ў сад.

*

— Ідзі сюды.

— Не хачу.

— Чаму ты такая нехацяка?

*

— Маша, вазьмі цукерку.

— А я ўжо вазьміла.

*

— Ой, дзядуля, мы сёння ішлі па вуліцы, і ўсе людзі думалі, што мы не рускія.

— Чаму?

— Мы так гаварылі.

— Як?

— Кіз, хол, хом, зін...

*

Мядзведзь спіць прыпяваючы.

*

— Вяснушак на мне — цэлы вагон.

*

Аўтобус ходзіць у гадзіну па чайнай лыжцы.

*

— Шум лезе ў акно — не магу заснуць.

*

Гразь і не думала высыхаць.

*

Ён даўно на тым свеце ў труне валяецца, п'е чай і цукеркі жарэ.

## *Выбар мужа*

— Я, калі буду жаніцца, вазьму сабе самага-самага прыгожага мужа.

— Дзе ты яго возьмеш?

— А ёсць такі палац, дзе жэняцца.

## *Вэлюм*

— У Тані ёсць такое, што на галаву надзяваецца, калі жэняцца.

— Дзе яна ўзяла? Яна ж яшчэ малая.

— А ёй дала сястра, што пажанілася. Дзядуля, купі і мне такое.

## *Шыньён*

— Дзядуля, купі мне шыньён!

— Што гэта?

— Прычоска без галавы.

## *Не хачу быць тоўстай*

— Чаму ты прымушаеш мяне есці?

— Хачу, каб ты была здаровая. Паглядзі на сябе, якая ты худая.

— А я не хачу быць тоўстай.

— Чаму?

— Ніхто замуж не возьме.

— Хто табе сказаў?

— Усе дзевачкі на двары.

## *Дачаснае гора*

— Дзядуля, мне ўжо сем год, а жаніха ў мяне няма.

— Гадоў праз дзесяць знойдзецца. Не гаруй.

— Я цяпер адгарую, а потым няхай ён гаруе.

## *Прызнанне*

— Мне Федзя так падабаецца, што я, мабыць, вазьму яго замуж.

## *Незвычайныя поспехі*

Большая са школы прынесла нечаканую навіну:

— У мяне два хлопчыкі ўлюбіліся! Дзіма і Сяргей. Дзімачка такі харошы! Мы разам сядзім. На ўроку працы ён даў мне клей.

— Значыць, справа ў вас клеіцца? — заўважыў дзед.

— Ага. Ён сказаў, што пажэніцца са мною.

Меншая, якая ўважна слухала, сказала:

— А ў мяне ў Маскве ў садзіку ёсць Толік і Віця. Я ў іх улюбілася сама. Вось паеду забяру і прывязу іх сюды. Праўда, дзед? — спыталася яна, чакаючы дзедавай падтрымкі.

— Калі ласка.

Большая памаўчала, потым уздыхнула і сказала:

— Шкада бабулі.

— Чаму?

— Прыйдзецца ёй, беднай, гатаваць на ўсіх...

## *Першае расчараванне*

— Заўтра па мяне зойдзе Дзімачка! — паведаміла наша першакласніца.

І праўда, Дзіма зайшоў. Бабка накарміла дзяцей абедам. Дала ўнучцы і яе сябру па яблыку. І яны, задаволеныя і радасныя, пабеглі ў школу.

Праз два дні Дзімачка зноў прыйшоў. Але, на вялікае наша здзіўленне, унучка сустрэла яго рыданнямі:

— Не хачу, не хачу, каб ён па мяне заходзіў!

— Чаму? Вы ж разам седзіце.

— Я перасяду на другую парту! — горка ўсхліпваючы, сказала яна.

— Непрыгожа гэтак. Ты крыўдзіш свайго сябра.

— Тады перавядзіце мяне ў другую школу!

— Што з табою? Дзіма — такі харошы хлопчык.

— Я яго бачыць не магу! Як толькі ён увайшоў, сэрца ў мяне абарвалася...— заліваючыся слязамі, вымавіла ўнучка і схапілася за сэрца.

Ледзь мы супакоілі нашу пакутніцу. Стараючыся загладзіць вінаватасць і няёмкасць перад Дзімачкам, мы пачалі ўгаворваць яго не крыўдзіцца на ўнучку.

Дзіма і не думаў крыўдзіцца. Спакойна і разважліва ён сказаў:

— Я ведаю. Яна мяне больш не любіць.

Бабка зноў шчодра частавала нашага госця, просячы не чакаць унучкі, а ісці ў школу аднаму.

Дзіма ахвотна згадзіўся і пайшоў. Праз пяць хвілін выправілася ўнучка. Але ў клас яны ўвайшлі — кожнае паасобку.

На другі дзень наша першакласніца прыйшла дадому з дзяўчынкай.

— Гэта мая сяброўка Любачка,— шчасліва паведаміла яна.

А дзед з бабаю самі сабе падумалі: «О сяброўства, о любоў! Дзе канчаецца адно і пачынаецца другое? І чаму яны не могуць жыць у дабры і згодзе нават на школьнай парце першага класа?»

## *Форма*

— Да Дзімачкі мама прыехала! — паведаміла ўнучка.

— Якога Дзімачкі?

— Што да нас прыходзіў і я плакала...

— А дзе ж яго мама была?

— Ташкент будавала. Прывезла яму новую форму. Ён сёння прыйшоў у школу такі прыгожы...

— А чаго ж ты раўла?

— Я цяпер ведаю. Бо ў старой форме ён быў непрыгожы.

## *Стары друг*

— А Дзіма, ведаеш, які?

— Які?

— Смелы. Заўсёды за мяне заступаецца.

— Ну вось бачыш. Стары друг лепш за новых двух.

## *У людзі*

Сынок суседкі-прыбіральшчыцы прыйшоў у новым паліто.

— Віця, у цябе абнова?

— Гэта ў людзі. Мама казала, насіць буду старое, а гэта — у людзі.

## *Муж і жонка*

— Дзядуля, гэта закаханыя?

— Як ты пазнала?

— Яны не падобныя. А муж і жонка заўсёды падобныя.

## *Правінка*

— Насварыся на мяне.

— За што?

— Я ўзяла твой карандаш.

— Нічога.

— Хацела трохі павалявацъ.

— Ну і што?

— Зламала.

## *Хаваймасо!*

— Хаваймасо! — закрычалі суседавы ўнукі, якія гулялі на вясковай вуліцы, і кінуліся ў сенцы.— Пісар ідзе!

Большы выткнуў галаву з дзвярэй і, убачыўшы мяне, сказаў:

— Гэта пісацель.

— Усё адно хаваймасо! — пачулася з сянец.

## *Сакрэт маладосці*

— Дзядуля, ты б хацеў быць маладым?

— Ну вядома.

— Дык трэба перакрасіцца: твар, валасы, бровы, а вочы няхай застаюцца такія. Станеш малады і выйдзеш замуж за маладую бабку...

## *Адзнака бацькоўства*

— Гэта твой дзед?

— Не, гэта мой тата.

— А чаму ён з барадой?

— Цяпер усе таты з барадамі.

## *Адам і Ева*

— Кніжка для дарослых, а я ўсё зразумела.

— Хто ж яны такія?

— Адам — самы, самы першы чалавек, яшчэ голы і ў пялёнках.

— А Ева?

— Такая жанчына з крыламі, што ўсё за гэтага Адама заступаецца...

## *За сталом*

— Я адчуваю сябе не ў сваёй талерцы,— сказаў госць.

— Калі ласка, вазьміце маю місачку.

## *Звяры і людзі*

— Дзядуля, чаму звяры не людзі?

— Таму што людзі не звяры.

— Не. Таму што ў іх не такое сэрца.

## *Пытанні па сутнасці*

— Дзядуля, а ты нарадзіўся ў акулярах?

*

— Чаму дарослыя ўзялі сабе два выхадныя, а нам пакінулі толькі адзін?

*

— Калі паміраюць, гэта баліць?

*

— Дзядуля, калі ты памрэш, ты мяне не забудзеш?

## *Свята настаўніцы*

Ужо гатовая ісці ў школу, Юля раптам спахапілася:

— Ой, сёння ж свята!

— Якое, Юлечка? — спыталася бабка.

— Дзень настаўніка.

Позна было шукаць кветак. І бабка зрэзала апошнія астры, якія дацвіталі ў гаршках на балконе. Букет атрымаўся бедны і сіратлівы. Гэта адчувала і ўнучка, несучы яго ў школу.

Вінавата падышла яна да стала настаўніцы і паклала кветкі. Села за парту і ніяк не магла супакоіцца. Вельмі ж яна любіла сваю настаўніцу. Хацелася зрабіць ёй нешта асабліва прыемнае.

Юля адкрыла партфелік. Ой, якая знаходка! У партфеліку ляжаў «Залаты пеўнік» — адна-адзіная цукерка. Дзяўчынка абрадавалася шчаслівай нечаканасці. Яна дастала цукерку і паклала побач з астрамі.

Настаўніца ўвайшла ў клас. І хоць яшчэ не зірнула на стол, але так радасна ўсміхнулася — мабыць, такі ўбачыла Юлін падарунак.

## *Мы з Ліляй*

Юля прыбегла са школы з сяброўкай.

— Ёсць у нас мікалатура? — яшчэ з дзвярэй з нецярпеннем у голасе спыталася яна.— Нам з Ліляй сказалі, каб мы разам сабралі і заўтра прынеслі. Ёсць у нас міка-

латура? — яшчэ раз перапытала яна, гатовая адразу ж распачаць нарыхтоўку.

— Не мікалатура, а макулатура,— паправіў унучку дзед, а баба супакоіла:

— Ёсць. Назбіраем, што не падымеш.

— А мы з Ліляй!

Адказнае даручэнне так узрушыла сяброўак, што Ліля адразу пабегла дадому і вярнулася з вялізным мехам. У ім ляжала некалькі старых газет.

— Добра, Лілечка. Да заўтрага падрыхтуем і мы,— сказала Юліна бабка.

Дзе там да заўтрага! Сяброўкі ўжо не маглі думаць ні пра што іншае. Уся папера, што была дома, пайшла ў мяшок. Нарыхтоўка так захапіла ўсіх, што дзед вымушаны быў дачасна прачытаць новыя газеты.

Калі мех быў поўны, Ліля паспрабавала падняць.

— Юля, памажы,— папрасіла яна.

— Куды ты, Лілечка? — здзівіўся Юлін дзед.

— Дадому,— адказала Ліля так упэўнена, што толькі цяпер усе зразумелі: яна ж адказная за мяшок.

Як тут быць? Усе доўга думалі і нічога не маглі прыдумаць.

— Да заўтрага, Лілечка, мабыць жа, і ў вас яшчэ сёе-тое знойдзецца,— падала няўпэўнены голас Юліна бабка.

— Мой дзед яшчэ не ўсе газеты прачытаў,— сказала Ліля.

— Ну, вось бачыш! — абрадавалася бабка.— Значыць, зробім так: тое, што ёсць, няхай да раніцы пабудзе ў нас. Навошта табе цягнуць дадому, а потым зноў да нас, а ад нас у школу?

Ліля пайшла, але, мабыць, не вельмі ўпэўненая, што пакідае свой скарб у надзейных руках.

Назаўтра Юля прахапілася раней, як заўсёды. Яе першы клопат быў адразу ж бегчы да Лілі. Ледзьве бабка з дзедам угаварылі яе паснедаць.

— Нікуды не дзенецца твая мікалатура,— запэўнівала бабка.

Але, відаць, тыя ж турботы не давалі спакою і сяброўцы. Юля толькі канчала снедаць, як прыбегла Ліля.

— Заходзь, Лілечка.

— А я з сястрою. Паглядзіце, які ў нас мех — большы, як у вас!

Цяпер ужо Юліна старана павінна была пастаяць за свой гонар. Пачалі шукаць новых запасаў. Дзед мусіў аддаць гадавы камплект тоўстага часопіса, у якім асталіся многія непрачытаныя раманы.

Стройнай калонай нарыхтоўшчыкі выправіліся ў школу. Юлін дзед і Ліліна сястра, прыгнуўшыся ад цяжару, неслі на плячах мяхі, бабка — школьныя партфелі, а Юля і Ліля ішлі наперадзе — урачыстыя і шчаслівыя.

## *Добрая навіна*

Толькі яна пераступіла парог, як усе пачулі:

— Мяне Любоў Мікалаеўна пацалавала!

Гэта было большай навіной, чым пяцёрка, і так узрушыла дзяўчынку, што ў хаце гаворка ішла толькі пра гэтую падзею. Сталі вядомыя нават падрабязнасці, як усё адбылося:

— Я схілілася над сшыткам і пісала, а яна ціха падышла і дакранулася да маёй галавы губамі...

— А можа, рукою?

— Не — губамі. Яна добрая, Любоў Мікалаеўна...

— А калі ставіць табе тройкі?

Юля сумелася.

— І тады добрая,— сказала яна з нечаканай радасцю, упершыню зразумеўшы, што добры чалавек заўсёды справядлівы.

*1971*

# *Для пасажыраў з дзецьмі*

У кожным поездзе ёсць такі вагон. Калі не набіраецца пасажыраў з дзецьмі, білеты ў яго прадаюць і пасажырам без дзяцей.

Я люблю ездзіць у гэтым вагоне. Колькі заўсёды новых уражанняў і знаёмстваў — адна асалода.

З Масквы да Мінска ноч язды, і адпраўляецца поезд яшчэ завідна, так што, пакуль класціся спаць, паспееш пераэнаёміцца з усімі спадарожнікамі. І ў першую чаргу, вядома, з тымі, хто едзе па праву ў гэтым вагоне, з яго галоўнымі пасажырамі.

З імі знаёміцца прасцей, чым з дарослымі, хаця, як я даўно ўпэўніўся, і яны не церпяць залішне цікаўных, надакучлівых, адным словам, усіх, хто вельмі ўжо набіваецца ў знаёмыя.

Яны самі ставяць умовы знаёмства, і калі ты прымаеш гэтыя ўмовы — калі ласка, можаш не толькі пазнаёміцца, а і пасябраваць.

Прыйшоўшы ў купэ і ўладкаваўшыся з рэчамі, я збольшага паспеў і асвойтацца, і адпачыць, пакуль паявіўся мой першы спадарожнік.

Адразу я ўбачыў не яго самога, а яго вочы — бліскучыя, чорныя, як агатавыя шпонкі. Ён акінуў імі купэ з верхняй паліцы да падлогі, не заўважаючы мяне.

Я сядзеў пры століку, чакаючы далейшага ходу падзей.

— Наша, наша,— пачуўся за яго спіной жаночы голас,— заходзь, Борачка.

Борачка пераступіў металічны парожак, і цяпер я ўбачыў яго ва ўсёй ваяўнічай красе.

Ён адначасна нёс службу і ў сухапутных узброеных сілах, аб чым сведчыў аўтамат, перакінуты цераз плячо, і ў марскіх; пры боку вісеў шыкозны, зіхатлівы корцік, з якога, здаецца, вось-вось закапае золата. Але не паспела ўпасці ні адной залатой кроплі, як Бора, выхапіўшы з ножан кінжал, нечакана наставіў яго на мяне:

— Зарэжу!

Яго агатавыя вочкі яшчэ болей пацямнелі, і я ўбачыў у іх тую зацятасць, якая выдавала рашучую натуру.

— Я думаў, што ты — марак, а ты — разбойнік,— сказаў я, не вельмі абрадаваўшыся такому знаёмству.

— Бора, перастань,— сказала жанчына, і толькі цяпер я разгледзеў яе. Гэта была прыгажуня, што адразу ж ашаламляла сваёй опернай шыкоўнасцю. Я не выпадкова сказаў — опернай, бо не ведаю болей дакладнага вызначэння тым прыгажуням, якія ўпэўнены, што паходзяць з аднаго роду, заводу і племені з чараўніцай Кармэн.

І маю спадарожніцу ніхто б і ніколі не пераканаў, што яна не валодае незвычайнай сілай прывабнасці.

У яе былі важкія доказы чараўніцтва: вялізныя залатыя калёсы завушніц не схілялі ёй галавы ні налева, ні направа толькі таму, што былі аднае вагі, але вушы прыкметна адцягвалі ўніз.

— Перастань, Бора...— паўтарыла яна механічна, абыякавым голасам, па якім не цяжка было зразумець, што мілыя, бяскрыўдныя сваввольствы сына не вартыя ўвагі.

Гэтакім жа, не вартым увагі быў і той, каго збіраўся «зарэзаць» яе сынок, а потым, для больш надзейнай расправы, нацэліўшыся ў твар, выпусціў увесь набой аўтамата: тр-тр, та-та-тах!

Затое як ажывілася яна, як зайгралі ўсмешка і густа падведзеныя вочы, калі ў наша купэ ўвайшлі два новыя пасажыры, два прыгожыя вайскоўцы — капітан і старшы лейтэнант, і як адразу ж сцьмелі, згаслі, калі высветлілася, што вайскоўцы памыліліся, што іх месцы не ў нашым, а ў суседнім купэ.

На вольныя месцы ў нашым прыйшлі законныя пасажыры: бабка з малым унукам.

І новых суседзяў Бора сустрэў тымі ж знакамі ўвагі.

— Тр-р, тр-р, та-та!— навёў ён свой аўтамат на малога незнаёмца.

Хлопчык, на многа меншы за Бору, здаўся мне больш сталым і разважлівым. Яму не спадабалася такое знаёмства, і ён адвёў настаўленую на яго рулю аўтамата.

Чараўніца Кармэн на гэты раз не вымавіла ні слова.

Бабка ж, падбадзёрваючы ўнука, ахвотна ўключылася

ў гаворку. Як неўзабаве высветлілася, яна везла свайго гарадскога ўнука да сябе ў вёску на ўсё лета.

— Не бойся, Савачка,— хлопчык з табой пагуляць хоча.

Але Савачка не прыняў гульні.

Поезд крануўся з месца і, пакінуўшы ўжо далёка за сабой горад, усё болей набіраў хуткасці. Пасажырскае жыццё ўваходзіла ў свой парадак.

Нашай Кармэнсіце не ўседзелася сярод бабы і дзеда, і яе залівісты голас хутка пачуўся з суседняга купэ, куды яна ўжо як знаёмая выправілася ў госці.

— Пагуляй, Савачка, з хлопчыкам,— угаворвала бабка ўнука.

Поўная радаснага замілавання, яна гатова была ўсёй істотай далучыцца да дзяцей, каб тыя паразумеліся і пасябравалі.

— Борачка, Савачка...

Але Савачка не знайшоў агульнай мовы з Борачкам не толькі таму, што авалодваў першымі словамі і нават сваё імя вымаўляў яшчэ — Ава, Авацька, яму мала было адзінага ваяўнічага захаплення. Не знайшоўшы кампаніі, і Борачка ўслед за мамай пакінуў купэ.

Савачка ўпершыню ехаў у поездзе. І як толькі знік за дзвярыма Борачка, і ён памкнуўся ў калідор. Ён помніў, як ішлі яны сюды з аднаго канца і як нядаўна бабка вадзіла яго па невялікай патрэбе ў другі канец, калідор яму здаўся бясконца доўгім — значыць, не ўсё яшчэ ўбачана і адкрыта.

Савачка пачаў тузаць цяжкую металічную ручку, але дзверы не паддаваліся.

— Туды няможна,— сказала бабка.

Савачка доўга заклапочана маўчаў і дадумаўся-такі да прычыны, з якою не магла не палічыцца бабка.

— Э-э-э,— сказаў ён і пакутліва зморшчыўся.

Бабка падхапілася і павяла ўнука.

Па калідоры, узброены да зубоў, гуляў Борачка. Ён па чарзе заглядаў у кожнае купэ і, наводзячы аўтамат або пакручваючы ў руках бліскучы корцік, распраўляўся паддчыстую з усімі пагалоўна.

Борачка не любіў, калі найбольш падатлівыя, гатовыя звесці ўсё на гульню, задаволена рагаталі, ахвотна падымалі рукі ўгору. Сапраўднага працаўніка ён пазнаваў у тым, хто мяняўся ў твары, злосна адмахваўся: адстань!

Ад такога Борачка якраз і не мог адстаць, пакуль зусім не выводзіў з цярпення і ўрачыста не завяршаў перамогі радасным: тра-та-тах!

Савачка ж з бабкай неўзабаве вярнуліся ў купэ.

— Ах ты балаўнік,— пазнаў я яшчэ за дзвярыма лагоднае ўшчуванне.— Гэта ж так ашукаць,— весела абуралася бабка, уваходзячы ў купэ.— Бач, які хітрэц. Ну, у другі раз не павяду...

Але ўнуку захацелася і ў другі раз. І ён зноў пачаў тузаць ручку дзвярэй: — Э-э-э.

— Хлусіш!— сказала бабка.— Вось я сама спытаюся...

Падхапіўшы Савачку, яна павярнула ўнука ніцма на сваіх каленях і прыклала вуха ніжэй хлопчыкавай спіны. Пасля сакрэтнай размовы, якая вялася пошапкам, бабка высветліла ўсё:

— Хлусіш,— сказала яна, і на гэтым скончыліся ўсе ўнукавы спробы выбрацца ў вялікае падарожжа.

Савачка быў у тым шчаслівым узросце, калі ўвесь свет поўны таямніц і загадак не толькі на адлегласці, але і вакол цябе і ў табе самім, калі ўсё жыве, гаворыць, адчувае гэтак жа, як і ты.

Калі наш вагон страсянуўся і Савачка паваліўся, ён добра знаў, хто вінаваты:

— На, на, на!— паляпаў ён рукой па падлозе, на якой сядзеў, і, устаўшы, быў задаволены, што праўда ўзяла верх, што крыўда атрымала сваё, належнае ёй.

Набліжалася пара, калі прыходзіць усемагутны сон. Даўно змарыўся ад сваіх ваяўнічых прыгод Борачка, выпрабаваны пасажыр, ён спаў надзейна. Не сціхаў толькі ў суседнім купэ вясёлы смех яго мамы, ды ніяк не мог супакоіцца Савачка.

Нязвыклы грукат вагона, цемра і зялёны агеньчык начной лямпачкі не давалі яму сцішыцца, аддацца сну. І тут памагло вялікае чарадзейства.

— Адно вочка спіць, спіць... і другое засынае...—начуў я ціхія добрыя бабчыны словы.

Можа, таму неўзабаве пачаў засынаць і сам, паспеўшы толькі пашкадаваць свайго другога спадарожніка Борачку, маці якога так ніколі і не даведасцца, якія дзівосныя чары ёсць на свеце.

*1975*

# *Трынаццаты*

Мяне пазнаёмілі з героем, якім ганарыўся ўвесь першы клас.

Усё яго аблічча было спрэс зялёнае: і шчокі, і лоб, і нос, і нават пад носам — густая пляма зялёнкі.

Баец, відаць, бывалы.

— У іх самая вялікая сям'я,— з прыкметным захапленнем сказалі яго сябры.

— Колькі ў цябе брацікаў і сястрычак?

— Дзве дзеўкі і адзін хлопец...

Ён чамусьці стараўся зменшыць лік сваіх сямейнікаў — налічыў толькі трое.

— А з табою?

— Са мною многа.

— Чаму ж ты так мала налічыў?

— Бо пра сябе забыўся.

— А ты каторы?

— Трынаццаты.

*1975*

# *А кампот?*

У школьнай сталоўцы ўсе сабраліся на полудзень. Гаспадыня выйшла з кухні і абвясціла:

— Дзеці, сёння абед — мясны.

— І першае? — пачуліся пытанні.

— І першае.

— І другое?

— І другое.

— А кампот? — устрывожылася маленькая першакласніца, якая з усяго абеду найбольш любіла трэцюю страву.

*1975*

# *Сын свайго дзеда*

Зімовым адвячоркам сустрэў у парку свайго сябра з унукам.

Малы прымяркоўваўся, як яму з'ехаць на лыжах з невысокага ўзгорачка. Толькі ён прабаваў адштурхнуцца кійком, як лыжы разыходзіліся ў бакі — і лыжнік падаў.

Хлопчык ужо добра засопся, але не адступаўся ад свайго намеру.

Ён бачыў, што я заўважыў яго намаганні, але рабіў выгляд, што гэта ў яго — так сабе, выпадковыя нелады.

— Хто гэты малады чалавек, што так добра ездзіць на лыжах? — спытаўся я, перакінуўшыся ўжо двума-трыма словамі з дзедам.

— Саша! — пачуўся адказ самога лыжніка.

— Як Саша? — здзівіўся я.— Гэта ж твой дзед — Саша.

— А я — сын дзеда,— сказаў Саша, рады, што гаворка дасць яму, нарэшце, магчымасць перадыхнуць.— Я — сын свайго дзеда...

— Рэдкі выпадак, але бывае...

І мы, дзяды, весела зарагаталі.

— Чаго вы? — незадаволена спытаўся Саша, і ў яго голасе пачулася крыўда.

Выпраўляючы сваю вінаватасць, я кінуўся ў другую крайнасць:

— А ты працуеш,— спытаўся я,— ці ўжо на пенсіі?

— Працую,— стала і разважна сказаў Саша.

— Дзе?

— У падрыхтоўчай.

— О! — толькі і аставалася вымавіць мне.

Мой субяседнік быў у падрыхтоўчай групе дзетсада. Ён рыхтаваўся ў першакласнікі.

*1975*

# *Кірмаш*

Усе вуліцы гарадка, абсучасненыя новымі будынкамі, агучаныя рэпрадуктарамі на слупах, з самага ранку заварушыліся і напоўніліся жыццём, якое даўнімі каранямі ўсё яшчэ трымаецца ў вёсцы, у яе турботах і клопаце.

Да рыначнага пляца спяшаліся «Волгі», «Масквічы», «Жыгулі» са сталіцы, «Запарожцы», матацыклы і веласіпедысты мясцовай знаці, а апошнімі па хуткасці — вазы, той від транспарту, на прыезд і прывоз якога якраз і разлічвалі самыя хуткія, упраўныя і ўвішныя.

Напэўна, мала хто прызнаўся б, але той, хто выглядаў з машыны і бачыў, як урачыста па шашы коціцца воз, закладзены свежай, кагадзе ўкошанай канюшынай і засланы каляровай посцілкай, здаецца, усё ж зайздросціў паязджанам. Якая гэта, сапраўды, раскоша — ехаць па канюшыне ў такую прасторную, сонечную раніцу!

Седзячы ў перадку, кіруеш сабе канём, што прывык ужо і да асфальту, і да бруку і нават не скаланецца і вухам не павядзе, калі паўз аглоблі шугане не тое што «Масквіч», а і самазвал.

На возе — сям'я або цэлы гурт седакоў, а з самага заду — спіною наперад дзядок ці бабка, якіх падсадзілі дарогаю. Звесіўшы ногі да зямлі, яны заўсёды добра бачаць, колькі прайшлі і праехалі, і не вельмі выразна, колькі яшчэ засталося.

Што асабліва цешыць, дык гэта цяперашнія коні — сытыя, гладкія, рахманыя. Няхаї, можа, і дажываюць веку, але ж у заслужаным доглядзе, не так, як пасляваенныя пакутнікі і заморкі.

Колькі ім было работы, колькі разам з людзьмі нагараваліся, нацярпеліся і ад бяскорміцы, і ад задухі!

А цяпер аж блішчаць — глядзіся, як у люстэрка.

А як не расчуліцца даўняму вяскоўцу, убачыўшы столькі знаёмага начыння і прыладдзя: дзежачкі, цабры, начоўкі, апалонікі, гаршкі, збаны, глякі, паліваныя місы і макатры!

Колькі ў космасе кружыць спадарожнікаў і даследчых лабараторый, а тут, на зямлі, яшчэ патрэбны і кубельчык на сала, і дубовая кадушачка на шаткаванку і агуркі, і бойка, каб збіць «свежанькае, над якога не знойдзеш смачнейшага ні ў адным магазіне»!

На вазах — ад пярэдніх да задніх калёс — цяжка стогнуць кормныя япрукі. Пад вазамі валтузяцца, вішчаць парасяты.

Стаяць, дажоўваючы жвайку, каровы. Падкурчыўшы ногі, ляжаць мілыя цяляты і глядзяць на свет такімі чыстымі, адкрытымі вачыма, ажно заходзіцца душа.

— Колькі просіце?

— Рубель трыццаць за кіле.

— А колькі яно важыць?

— Кіле, мабыць, за сорак. Але, купіўшы жывое, вы яшчэ вернеце сваіх дзесяць, а то і дванаццаць рублёў.

— Як?

— А за шкуру. Калі добра злупіць, чысценька...

На рынку, на нядзельным кірмашы, усё сышлося разам — і мінулае і сённяшняе, і старое і новае, і халодны разлік і кволая дзіцячая ўра́жлівасць.

Маленькі гараджанін з усяго шматгалосся і шматфарбнага кірмашовага багацця знайшоў адзінае, што ўразіла і ўзрушыла яго пачуцці: звязанае цялятка цёплаю, яшчэ неабсохлаю ад малака пыскаю даверліва цягнецца да рукі.

Хлопчык стаіць каля воза і чуе ўсе разлікі і парады гаспадара. Ён сіратліва туліцца да цялятка, потым бяжыць і вяртаецца з пучком дзяцельніку — і корміць, і корміць, і гладзіць, і гладзіць...

Якія дасканалыя прылады, якія сейсмографы ўловяць і перададуць нам трывогі, што ўжо не месцяцца ў маленькім дзіцячым сэрцы?

Чуйнае, уражлівае, спагадлівае, яно, на жаль, — бездапаможнае перад цвярозай жорсткасцю.

*1975*

# *Вы таксама — пісьменнік?*

На любое пытанне, у тым ліку і на гэтае, трэба адказваць дакладна. Няўпэўненасць можа пашкодзіць у самых лепшых спадзяваннях.

Тым памятным вераснем, які наўрад ці калі яшчэ здарыцца ў маім жыцці, я ў вялікім гурце пісьменнікаў вандраваў па Далёкім Усходзе. Гэта былі сустрэчы самыя розныя, але ўсе радасныя па непасрэднасці і шчырасці пачуццяў, з якімі прымалі нас усюды.

Гэта, можа, таму, што для большасці людзей — і дарослых, і дзяцей — сустрэча з пісьменнікам была ў навіну. Пісьменнікаў засыпалі кветкамі — цэлымі ахапкамі, што здавалася асабліва дарагой і лішняй раскошай, бо ўжо і кветкі трацілі сваю цану.

Але самай незабыўнай мясцінай, дзе кветкі набылі найбольшае значэнне, таму што іх з асаблівай урачыстасцю падносілі дзеці, а потым павязвалі гальштукі, прымаючы ў ганаровыя піянеры, была славутая Валачаеўская сопка.

І вось якраз у найвышэйшы момант урачыстасці я выявіў слабасць волі, няўпэўненасць і нерашучасць і не прабіўся, не праплішчыўся праз натоўп, праз гушчу людзей да таго цэнтра ўвагі, дзе належала стаяць мне як дэлегату. Зацёрты і заціснуты, я спыніўся на сваю бяду якраз жа там, дзе стаў замінаць ходу самой цырымоніі.

Разы тры мяне далікатна таркануў у плечы адказны распарадчык.

— Грамадзянін, адсюль будуць выходзіць піянеры для прывітання пісьменнікаў!

Я быў бы рады не перашкодзіць піянерам, але падацца не было куды — ні назад, ні наперад.

Тым часам пад гукі горна паявіліся піянеры. Яны падыходзілі да гасцей, падавалі кветкі і павязвалі гальштукі. Кожны госць нагінаў галаву, каб дзяўчынцы ці хлопчыку было зручней справіцца са сваім адказным даручэннем.

Некаторыя, ужо вопытныя госці загадзя нагіналі шыі, як бы даючы знак, што яны гатовы да ўрачыстага рытуалу.

Асабіста я, як ніколі, перажываў гэтыя хвіліны — і таму, што адбывалася ўсё гэта на вышыні, з якое далёка відна гераічная гісторыя нашых заваёў, і таму, сказаўшы па праўдзе, што мяне ніколі не прымалі ў піянеры, ні ў ганаровыя, ні тады, калі нарадзілася сама арганізацыя і пакуль дайшла да нашай вёскі, мне пара ўжо было ўступаць у камсамол. Вось чаму на старасці год я быў бы шчаслівы стаць піянерам.

І хоць урачыстасць адбывалася не так ужо і далёка ад месца, дзе я стаяў у натоўпе, але ўсё ж я не быў яе ўдзельнікам, а толькі гледачом.

Відаць, і гальштукі, і букеты былі загадзя разлічаны на пэўную колькасць, аднак дзецям цяжка было адрозніць і пазнаць, каго трэба прыняць у піянеры. Таму ахапіўшы самых прыкметных, што стаялі на відавоку, яны потым скіравалі сваю ўвагу і трошкі на бакі.

Адна дзяўчынка, мабыць, западозрыла ў мне госця, ці, можа, я не стрымаўся ад спакусы і выткнуў з натоўпу шыю, але даручэнне было адказнае, і піянерка, каб упэўніцца цвёрда, спыталася:

— Вы таксама — пісьменнік?

Пытанне вымагала яснага і катэгарычнага адказу.

Маё замяшанне і няўпэўненасць былі ацэнены правільна: у піянеры мяне не прынялі.

*1975*

# *Страшная казка*

Наташка і Стасік доўга не засыналі. А бабцы хацелася, каб яны спалі. Бабка збіралася ў госці. Яна абяцала, што прынясе пірага. Смачнага, салодкага. Нават кот, які сядзеў на пасцелі, і той не вытрымаў, аблізнуўся.

— Раскажы нам казку,— папрасіў Стасік,— а тады ідзі сабе.

Бабка расказала казку. Страшную, пра ваўка. Стасік прыціхшыўся. А Наташка пачала плакаць:

— Бабка, не ідзі. Мне страшна.

— Добра, я не пайду. Спіце, дзеткі. Я каля вас буду сядзець...

Як толькі дзеці пазасыналі, бабка надзела новую кофту, завязала белую хустку і нават у люстэрка паглядзелася. Толькі яна там нічога не ўбачыла, бо было ўжо цёмна. А запальваць святло яна пабаялася, каб не пабудзіць дзяцей.

«А калі і праўда папрачынаюцца, а мяне не будзе,— падумала бабка,— яны ж з плачу пазаходзяцца...»

Але бабцы вельмі хацелася пайсці ў госці. І тады яна надумалася зрабіць другую бабу. Узяла дзве падушкі, надзела на іх старую сукенку, а малую падушку абвязала хустачкай і паклала зверху...

Стасіку ўночы захацелася піць. І ён праз сон папрасіў:

— Малачка...

Ніхто на абазваўся. Тады Стасіку яшчэ мацней захацелася малачка, і ён прачнуўся. Баба сядзела на сваім месцы.

— Бабка! — гукнуў Стась.

Але бабка нават не варухнулася. Тады Стасік падсунуўся бліжэй і хацеў яе пабудзіць. Толькі крануў за плечы, а яна ўзяла і з'ехала з ложка далоў.

Стасік спалохаўся і пабудзіў Наташку. Але тут яны ўбачылі нешта яшчэ больш страшнае. З цемры на іх глядзелі бліскучыя вочы. Якраз як у таго звера, пра якога бабка расказвала казку.

— Воўк! — крыкнула Наташка.

— М-м-яў!..— азваўся воўк.

Дзеці пазналі ката Кузьму. А той пачаў лашчыцца да іх, залез пад коўдру і заспяваў ціхую знаёмую песню.

Цяпер Наташы і Стасіку было не страшна. Хутка яны заснулі зноў. Прачнуліся толькі раніцай і зусім не пакрыўдзіліся на бабку, бо яна такі стрымала сваё слова. Дала кожнаму па вялікаму кавалку салодкага пірага. А коціку не здагадалася даць. Тады Стасік сказаў:

— Бабка, дай коціку. Ён пільнаваў нас. З ім нам ніякі воўк не страшны.

Бабка дала пірага і коціку.

*1958*

7 Зак. 3611

# *Абнова*

Гэта былі яго першыя сапраўдныя штаны. Не кароценькія, па калені, што дагэтуль насіў Стась, а з доўгімі калашынамі, з адпрасаванымі рубчыкамі, з кішэнямі. У іх можна было ўвабраць кашулю, поверх падперазаўшы папружкаю.

Стась адразу ж вырас. Гэта заўважыла і мама.

— Ну, ты цяпер сапраўдны мужчына,— прызнала яна, аглядаючы пакупку.

— Насі здароў,— сказала сястра Наташа. Гэта было і віншаванне, і пажаданне. Так заўсёды гаварылі таму, хто надзяваў абнову.

Стась адчуваў сябе шчаслівым. У сваім шчасці ён не заўважыў, як пераглянуліся паміж сабой мама з бабкай і з усёй стараннасцю пачалі падцягваць яму штаны.

— Даўгаватыя,— сказала мама.

— Ат, вырасце — будуць у самы раз,— запэўніла бабка.

— Прыйдзецца караціць,— стаяла на сваім мама.

А Наташа, здаўмеўшыся, пра што ідзе гаворка, з гатоўнасцю паднесла ножанкі.

— Рэзаць? — спытала яна, ухапіўшы брата за калашыну.

Толькі цяпер Стась скеміў, што адбываецца змова, якая пагражае яго шчасцю.

— Не дам рэзаць! — закрычаў ён так, што жанчыны сумеліся і адступілі.— Не хачу кароткіх штаноў! — рашуча сказаў Стась.— Я ўжо вялікі.

— Але, унучак,— згадзілася бабка.— Я ж кажу, што няхай будуць нападрост.

Стась з удзячнасцю паглядзеў на бабку. Самая старэйшая з жанчын прызнавала яго законнае права насіць сапраўдныя штаны. Цяпер Стась не саступіў бы і на макавае зерне, бароничы гэтае права.

На гэтым сямейная рада была скончана. Стась доўга пакручваўся перад люстэркам. Ён перамог. Праўда, ха-

дзіць пераможцу было не так ужо лёгка, бо штаны сюд-туд з'язджалі і з'язджалі.

— Дай я прышыю шлейкі,— сказала мама,— і ты будзеш насіць цераз плячо.

Гэта было новай знявагай мужчынскай годнасці Стася. Пакрыўджаны, ён выйшаў з хаты. І толькі на вуліцы, у кампаніі сяброў, адчуў, што сапраўды штаны не па ім.

— Што ты як сам не свой? — спыталіся ў яго хлопцы.

— Свой,— адказаў Стась.

Тады сябры, ведаючы, што Стась вельмі ж любіў дужацца, пачалі штурхаць яго пад бакі.

— Чаго ты стаіш як слуп? — засмяяліся хлопцы. І яшчэ з большым задзёрам заскакалі вакол Стася.

Забыўшыся пра абнову, Стась рынуўся ў атаку.

Новыя штаны адразу ж з'ехалі на пяты. Стась наступіў на калашыны і паваліўся. Сябры аж заходзіліся ад рогату. А Стась, як спутаны конь, таптаўся на месцы. Потым, падцягнуўшы пояс пад самы падбародак, ён кінуўся наўздагон за вясёлым гуртам. Але нават самыя меншыя не вельмі ўцякалі ад яго, а, пацвельваючыся, падбягалі ззаду і чапляліся за плечы. Яны ведалі, што Стасю адной рукой усё адно не падужаць іх.

Вярнуўшыся дадому, Стась паціху, каб ніхто не бачыў, дастаў з прыскрынка ножанкі і выйшаў у сенцы. Цяпер ён паказаў сваю волю штанам. Як толькі яны аб'ехалі на пяты, ён адцягнуў вышмарганы ў пяску закаўраш і са злосцю зацісн̆уў яго ў сталёвую пастку. Пэўна, ножанкі былі тупыя, а можа, у Стася не было такой сілы, каб адным махам расправіцца са штанамі, сукно не паддавалася, а толькі клычылася.

Доўга мучыўся Стась і, не вытрываўшы крыўды, моцна заплакаў.

Маці выбегла ў сенцы.

— Чаго ты? — спалохана спыталася яна.

— Я... я...— сказаў плачучы Стась,— я хачу быць сам свой.

Хоць і шкада было абновы, штаны прыйшлося-такі караціць.

*1958*

# Стасева падарожжа

Малога яго вазілі ў калясцы. Калі ж ён навучыўся хадзіць, дык вазілі яго рэдка. Каляска пуставала. Потым ён сам прабаваў падымаць дышаль і голасна пакрыкваў: но, но! Але сілы неставала, і колькі ён ні тузаўся, не мог скрануць воза. Потым бабка прыстасавала Стасеву машыну для свайго абыходку.

Возьме рыдлёўку, пасадзіць унука ў каляску — і паехалі з двара на другі бок вуліцы. Там, на агародзе, яна капала бульбу, а Стась збіраў па адной і кідаў у каляску.

— Баба, хопіць! — казаў Стась і, падцягнуўшыся на дыбачках, заглядаў цераз білца, колькі ўжо ён накідаў.

Бабка, паклаўшы рыдлёўку, выкіроўвала каляску з разоры на дарогу. Стась ужо не садзіўся ехаць. Ён намагаў везці воз. Узяўшы доўгую цявіну, хвастаў па дышлі і падганяў: но, но!

Дарога была недалёкая, і Стась нават шкадаваў, што так хутка канчалася яго вандроўка.

А хлопец любіў вандраваць. Як толькі згледзеў, што бабка некуды збіраецца, ён ужо гатоў:

— Бабка, куды ты?

— На трэці пасёлак схаджу.

— І я з табою.

— Не зойдзеш, унучак. Ножкі забаляць.

Колькі ні адгаворвала — не памагло. Пайду і пайду.

— Ідзі, але каб не плакаў, не прасіўся на рукі.

І Стась пайшоў. Пайшоў у першае вялікае падарожжа.

Мінуўшы сваю вуліцу, яны поплавам пайшлі праз калгасны сад, потым праз гараж, дзе стаялі грузавыя машыны, а каля кузні завярнулі ў доўгую-доўгую, не знаёмую Стасю вуліцу. Гэта і быў трэці пасёлак. Усё было тут такое новае і цікавае, што хлопец не адчуваў аніякай стомы.

Каля хаты, перад вокнамі якой цвілі мальвы, яны спыніліся. Стась першы раз бачыў такія высокія кветкі, упо-

равень са страхою. У іх ружовых трубах, як у рэпрадуктарах, раўлі на ўвесь агародчык калматыя чмялі. Не паспеў Стась надзівіцца, як з двара загукалі:

— Ой, глядзіце, які госць прыйшоў!

І добрыя рукі падхапілі Стася, а дзверы самі расчыняліся перад ім: перш у сенцах, потым у хаце. Калі Стась разгледзеўся, ён пазнаў, што гэта была яго другая бабка, татава мама, Матрэна.

Чым толькі ні частавалі госця! І мёдам, і яблыкамі, і гарбузікамі. А на адыходзе бабка Матрэна насыпала яму гарбузікаў яшчэ і ў кішэню.

— Бяры, унучак. Па дарозе будзеш лузаць. Дарога ж доўгая.

І сапраўды, дарога назад здалася хлопцу такою доўгай і цяжкай, што было не да гарбузікаў. Як толькі выбраліся яны з бабкай на поплаў, ён стаў прасіць:

— Бабачка, любенькая, сядзем каля гэтага стога.

І яны селі, і сядзелі-такі доўга. А калі ўсталі, дык Стасю ўжо зусім не хацелася ісці. Ён гатоў быў папрасіцца на рукі, каб не баяўся, што другі раз бабка не возьме з сабою. Тады Стась учапіўся за мультановую бабчыну спадніцу і, нехаця пераастаўляючы ногі, ледзь дайшоў да калгаснага гаража.

— Зойдзем да таты,— сказаў ён.— Няхай падвязе. Вунь дзе ён! — радасна закрычаў Стась, убачыўшы каля машыны свайго бацьку, які рабіў у калгасе шафёрам. Бацька якраз садзіўся ў кабіну.

— Тата, падвязі! — гукнуў Стась.

Бацька, мабыць, не пачуў. Памахаў сыну рукой з кабіны. Машына загула і павярнула ў палявую дарогу.

Стась як стаяў, так і сеў на сцежцы, гатовы заплакаць ад крыўды. Бабка даводзіла, што ў таты цяпер шмат работы: самая звозка з поля.

— Ты ж сваю машыну маеш,— сказала яна.

— Якую машыну? — падняў галаву Стась.

— А каляску. Забыўся, як я цябе вазіла?

Стась, седзячы на поплаве, падумаў: а і праўда, як бы добра было цяпер не ісці сваімі нагамі, а ехаць.

— Падвязі мяне, бабка,— жаласна папрасіў ён.

— Як жа я падвязу? — спагадліва спытала бабка. І раптам радасна пляснула рукамі.— Хіба збегай прывязі каляску, і я цябе як бачыш дакачу да самага дома.

Стась недаверліва зірнуў на бабку. Але тая нават і

вокам не маргнула. Значыць, гаворка была не так сабе, а напраўду. І Стась, як падмецены, усхапіўся на ногі. Проста дзіва сталася з хлопцам.

— Толькі ж ты тут пастой, пачакай мяне! — гукнуў ён, і па зялёнай атаве адно замільгалі яго лёгкія сандалікі. Ён прабег, як пачынаўся калгасны сад, спыніўся, каб упэўніцца, ці стаіць бабка на тым самым месцы, і памчаўся далей.

Але і бабка не стаяла. Пакуль бег унучак, яна на поўны ход, назіркам спяшалася за ім. Спыняўся Стась, каб азірнуцца,— спынялася і яна, а потым яшчэ шпарчэй шыбавала ўслед. І толькі на самай паваротцы з поплава ў сваю вуліцу спынілася перадыхнуць.

А тым часам з двара Стась ужо вывозіў каляску.

Бабка ад душы засмяялася і неўзаметку ўвайшла ў сваю вуліцу. Да іх хаты заставалася прайсці толькі чатыры двары. Засопшыся і стараючыся, колькі было змогі, яе ўнук каціў перад сабой свой нялёгкі воз.

З якой палёгкай сеў ён пасля доўгай дарогі ў каляску і быў самым шчаслівым на свеце!

Ён ехаў праз добра знаёмыя яму хаты, праз вяргіні ў агародчыках, праз вішнёвыя вулічныя прысады, праз свой калодзеж і пеўня, што стаяў на плоце і, выцягнуўшы шыю, здзіўлена глядзеў на вялікага падарожніка...

Уязджаючы ў двор, Стась сказаў бабцы:

— Вось ты і прывезла мяне.

Бабка засмяялася:

— Гэта ты сам сябе прывёз, унучак.

*1959*

# *Наташына сямейка*

Сям'я ў Наташы невялікая — Каця і Мішка. Вы скажаце: якая ж гэта сям'я? Гэта ж цацкі! Няхай сабе цацкі, але яны як жывыя.

Каця ўмее плакаць. Толькі яе зачэпіш, яна адразу ж: а-а-а! А пачне Наташа супакойваць, на руках калыхаць, дык яна аж заходзіцца. Вочы ў Каці сінія, вялікія: самі расплюшчваюцца і заплюшчваюцца. А валасы чорныя-чорныя. Шмат клопату ў Наташы з Кацяй — і накармі яе, і прычашы, і памый, і спаць палажы, ды яшчэ і спявай ёй:

Лю-лі, лю-лі, лю-лі,
Усе даўно паснулі.
Не спіць адна ў хаце
Толькі мая Каця.

Затое калі ўжо Каця засынала, дык спала доўга. А Наташа тым часам бралася за другую работу. Шыла Каці новую сукенку. А Мішка сядзеў сабе ля Кацінага ложка і круглымі, быццам гузікі, вачыма ўважна цікаваў, як бегае ў Наташыных пальчыках іголка.

Мішка быў паслухмяны і добры. Праўда, часта кволіўся жыватом. Калі хто знянацку, бывае, ткне яму пальцам у жывоцік, дык ён аж прысядзе ад болю: ой, ой!

Наташа шкадавала Мішку. Яна ведала, чаму ён крычыць. «Яму рабілі аперацыю,— расказвала Наташа.— Была ў яго на жывоціку болька. Дактары яе выразалі, а ў ямачку ўставілі кнопку».

Моцна спіць Каця. Наташа шые сукенку. І тут зусім неспадзявана хтосьці — торк Наташу пад локаць. Іголка як кальне ў палец: ай! Аж кропелька крыві выскачыла.

Усхапілася Наташа, замахала рукою ад болю. А вусаты Кузьма трэцца аб нogі, як ні ў чым не вінаваты.

Кузьма — гэта кот. І Наташа добра ведае, што гэта ён штурхнуў яе пад локаць. Ён заўсёды ляжыць-ляжыць у запечку, а сумна стане — падыдзе, выгне спіну і трэцца аб цябе. Хоча, каб з ім гулялі.

— Ты будзеш татам! — строга загадала яму Наташа.

Кузьму гэты абавязак прыйшоўся не па душы. Ён пакрыўджана паглядзеў на Наташу, сонна пазяхнуў і адышоў у куток. Але доўга ўседзець не мог.

Як толькі Наташа ўзялася за шытво, ён, крадучыся, падпоўз да Мішкі і драпнуў яго лапай па жываце. Мішка як войкне, як заенчыць ад болю, як кінецца пад Кацін ложак, каб схавацца. Але ж каму не вядома, якія ўсе Мішкі непаваротныя. Ложак перакуліўся. Каця выпала з пасцелі. Нічога не цямячы спрасонку, яна то расплюшчвала, то заплюшчвала вочы. І так заплакала, што Кузьма, ведаючы сваю віну, кінуўся з-пад самых ног Наташы, адным махам ускочыў на палічку, прыбітую над мыцельнікам, і схаваўся там за гладышом.

— Хіба так робяць таты? — сказала з дакорам Наташа і сярдзіта паківала яму пальцам.

Хто ведае, колькі б ён там праседзеў, але з гладыша так пахла смятанай, што Кузьма не вытрываў — падняўся на лапах і зазірнуў у гладыш. Ён добра памятаў, што раніцай, калі снедала Наташа, дык і яго частавала. Смачная смятана. Але засталося мала, толькі на самым дне. Як яе адтуль дастаць? Кузьма лапамі нагнуў гладыш, асцярожна паклаў яго і залез з галавой усярэдзіну. З гладыша тырчаў толькі хвост.

— Кузьма! — крыкнула Наташа.

— Мала, м-м-а-ла! — пачуўся гулкі водгалас.

— Вось я табе дам мала! — прыгразіла Наташа.

Кузьма хацеў уцячы і разам з гладышом бразнуўся з паліцы.

Калі Наташа глянула на падлогу, там ляжалі толькі дробныя чарапкі. А Кузьма... Убачыўшы Кузьму, Наташа так і зайшлася ад смеху.

— Каця, Мішка! — гукнула Наташа.— Паглядзіце вы на свайго тату!

Каця пакінула плакаць і пачала смяяцца. А Мішка аж за жывот хапіўся ад смеху.

Кузьма бачыў, што рагочуць з яго, але не цяміў, чаму рагочуць.

— Ды зірні ты на сябе! — крыкнула Наташа і яшчэ званчэй залілася смехам.

Кузьма павярнуўся разы тры вакол сябе, агледзеў хвост, вінавата патаптаўся паміж бітых чарапкоў і ўскочыў на падаконнік. А там стаяла люстэрка. Як глянуў

ён у люстэрка, дык не пазнаў самога сябе. Уся яго галава да вушэй і пушыстыя вусы былі белыя, нібы мылам намыленыя.

Кузьма незадаволена паморшчыўся, потым, наслініўшы лапу, пачаў старанна скрэбці ёю каля вусоў...

На той час у хату зайшла Наташына мама. Яшчэ з парога яна заўважыла непарадак.

— Што тут робіцца ў вас? — спытала яна.

— Наш тата брыецца! — ледзь вымавіла ад смеху Наташа.

*1959*

# *Першая пяцёрка*

У школу Наташа ўзяла з сабой ляльку Кацю. Пасадзіла побач і сказала:

— Сядзі ціха і слухай, што кажа настаўніца.

Але Каця не магла доўга ўседзець. Як толькі паварочвалася Наташа, паварочвалася і Каця. І мала таго, што паварочвалася. Кожны раз яна яшчэ і плакала:

— А-а-а!

— Хто гэта плача? — спыталася настаўніца.

— Каця,— адказала Наташа.

— Яна яшчэ малая,— спагадліва пагладзіла па галаве Кацю настаўніца.— Ёй яшчэ рана ў школу. Яе трэба аддаць у дзіцячы сад.

Нядаўна Наташа сама хадзіла ў дзіцячы сад. Добра ў садзе, весела. Але як гэта аддаць Кацю? Сумна зрабілася Наташы. Ды іншае рады не было.

Назаўтра, ідучы ў школу, яна забегла ў сад і папрасіла:

— Няхай Каця ў вас пабудзе, пакуль я ў школе...

Загадчыца Марыя Антонаўна ўсміхнулася і сказала так, як гаварыла заўсёды мамам:

— Будзьце спакойныя, грамадзяначка...

Наташа радасна пайшла ў школу. І праўда, як гара звалілася з плячэй. Седзячы за партай, яна старанна выводзіла літару за літарай. Ёй ніхто цяпер не замінаў. «Мама» — напісала Наташа.

Настаўніца паглядзела і сказала:

— Малайчына! — і загадала яшчэ раз напісаць.

І Наташа, больш упэўнена націскаючы на пяро, зноў вывела дарагое ёй слова.

Настаўніца нахілілася над Наташыным сшыткам і чырвоным алоўкам паставіла пяць. Гэта была першая Наташына пяцёрка.

Як толькі скончыліся заняткі, Наташа памчалася дадому.

— Я пяцёрку нясу! — сказала яна яшчэ ў парозе.

— За што, дачушка? — абрадавалася маці.

— За маму,— адказала Наташа.— За цябе, мамачка...

І толькі ўвечары, калі трэба было садзіцца за ўрокі, Наташа спахапілася:

— Ой, а Кацю ж я пакінула ў садзіку. Пабягу забяру.

— Позна, дачушка, Каця спіць ужо.

Шкада было лялькі, але Наташа ўспомніла словы Марыі Антонаўны: «Будзьце спакойныя, грамадзяначка...» — і адразу супакоілася.

Яна разгарнула буквар і пачала вучыць урок.

*1959*

# *Чмяліны мёд*

Таго дня, калі пачынаўся сенакос, узяў мяне дзед з сабою. Папрабаваў і я касіць. Махнуў касою, а яна так глыбока ўрэзалася ў купіну, што мы ледзьве выцягнулі. Тады дзед сказаў, каб я за ім разбіваў пракосы. Гэта работа лёгкая. Ідзі сабе і палачкай раскідай на абодва бакі траву, а яна на гарачым сонцы адразу ж і вяне. Потым я доўга бегаў па поплаве, куляўся ў пахучым сене. Стаміўся і ўжо не ведаў, што яшчэ можна рабіць. Аж бачу, дзед прысеў на кукішкі і корпае сцяблінаю сухі мох.

— Што там, дзядуля?

— А вось бяжы сюды, паглядзі.

Я падбег і ўбачыў, што пад мохам ляжыць тоўсты камячок воску, круглы, увесь у ямачках. А вакол яго снуюць вялікія калматыя пчолы і гудуць: ж-ж-ж-у.

— Пашукай саломіны,— сказаў дзед.— Я цябе чмяліным мёдам пачастую.

Я знайшоў саломіну. Дзед уваткнуў яе ў васковую ямачку і сказаў:

— Смакчы!

Я калі смактануў, дык у роце зрабілася соладка-соладка.

— Ну як? — спытаў дзед.

— Ой, смачна!

Я перабраў саломінай кожную ямачку.

— А што ж чмялі будуць есці? — спахапіўся я.

— Яны наносяць яшчэ,— сказаў дзед.

На полудзень мы ішлі паўз калгасны пчальнік. А там добры пчаляр, майго дзеда друг. Як убачыў нас, узрадаваўся:

— Я твайго ўнучка мёдам пачастую,— сказаў ён і вынес мне з будана поўную міску мёду — светленечкага, чысценечкага і такога духмянага, што мо за вярсту чутно, як пахне. Я еў, еў — і не захацеў.

Потым мы надзелі на галаву сеткі і аглядалі вуллі. Яны якраз як хаткі. І дзверы ёсць, але не такія, як у ха-

тах, а толькі адна дзірачка ў сцяне, а пад ёю дошчачка. Пчолы далёка лётаюць збіраць мёд, а потым вяртаюцца назад, садзяцца на гэтую дошчачку, як на які ганак, а пасля ўжо лезуць у дзірачку...

Так мне спадабаліся гэтыя хаткі, што я і надумаўся зрабіць такую. Знайшоў дошчачкі, роўна паабпілоўваў дзедавай пілачкай, гладка выстругаў гэблікам і збіў цвікамі маленькую скрыначку.

— Ці не вулей гэта ты робіш? — спытаўся дзед.

— Вулей,— сказаў я.— Пасаджу сюды чмялёў, што мы на поплаве знайшлі. Няхай носяць мёд.

— Маладзец,— сказаў дзед.

Адвячоркам, калі пачало цямнець, пайшлі мы з дзедам на поплаў.

— Гэтаю парою чмялі спяць, і мы іх усіх да аднаго забяром у вулей,— сказаў дзед.

І праўда. Калі мы адгарнулі мох, яны толькі бзыкалі, а ляцець не маглі. Разам з сотамі мы забралі іх у маю хатку. А тым, каторыя заставаліся ў гняздзе, мы падсоўвалі сухую сцяблінку. Як толькі чмель чапляўся лапкамі за сцяблінку, мы і перакідвалі яго ў хатку.

Вулей я паставіў на прызбе. А назаўтра цэлую раніцу я цікаваў, як мае чмялі выпаўзалі праз ляток, аглядалі новенькі домік, але ляцець не асмельваліся. Яны доўга гулі там, усярэдзіне, як на якім сходзе. А потым сталі вылазіць на самы краёчак лятка і адзін за адным выпраўляліся ў дарогу. «Ці вернуцца ж хаця?» — непакоіўся я. Але трывога мая была дарэмнай.

Пад вечар я зняў стрэшку і зірнуў на соты. Іх вочкі былі паўнюткія. «От і ў мяне свой пчальнік»,— падумаў я і праз саломінку высмактаў увесь мёд.

Гэтак я ласаваўся штодня і думаў, што яшчэ доўга буду ласавацца. І такой неспадзяванкаю было для мяне, калі аднае раніцы прыйшоў я з саломінкай да вулля і не пачуў там пчалінага гуду. Соты былі пустыя. Я чакаў, можа, з паўдня, але не вярнуўся ні адзін чмель.

— Не можа быць, каб яны адцураліся сотаў,— заспакойваў я сам сябе.

А дзед усміхнуўся і сказаў:

— А ім лягчэй зрабіць новыя, чым без упынку насіць і насіць мёд, а самім нават і не пакаштаваць яго...

*1959*

# Зайчык-вадалаз

Наш калодзеж пры самай вуліцы. І хоць ён завецца Ціхонаў калодзеж, ваду з яго бяруць усе, хто хоча.

Вада ў ім заўсёды светлая і чыстая.

Калодзеж капалі мы — я і мой тата. Але як толькі пачалі, бачым — ідуць і суседзі з рыдлёўкамі.

— Прыйшлі памагчы табе, Ціхон,— сказалі яны майму тату.

Тата абрадаваўся, бо гуртам выкапаеш за два-тры дні, а ўдвух мы і за месяц не справіліся б.

І работа ў нас закіпела. Калі пасля абеду я зазірнуў у калодзеж, дык аж спалохаўся. Такая была глыбіня.

Тата сказаў:

— Стась, адыдзіся. Лепш збірай вунь каменьчыкі, што мы выкідаем наверх з глінаю.

Я стаў ля халоднай жоўтай гары і навыбіраў цэлую копку мокрых і гладкіх галышыкаў. А потым перанасіў усе да аднаго ў агародчык і абклаў імі градкі.

Назаўтра мы спускалі трубы, ставячы іх адну на адну. Калодзеж у нас цэментаваны. Тата сказаў мне:

— Зірні, Стасік, як далёка вада.

Я зірнуў і не ўбачыў дна.

— Як мы яе дастанем, тата? — спытаў я.

— Яна сама прыйдзе.

Я крыкнуў у калодзеж:

— Вада!

З самага дна адгукнулася:

— А-а!

Тады я зусім паціху сказаў:

— Стась.

Глыбіня абазвалася:

— Ась!

Тую ваду, што насачылася за ноч, мы з татам вычарпалі. Яна была каламутная, з глеем і пяском.

Гэтак мы выскрабалі дно, пакуль не паказаўся чысты жвір.

Цяпер наша вада самая смачная. Бывае, і не хочаш, а пачнеш піць — не адарвацца.

Не дзіва, што ля нашай хаты спыняюцца і падарожныя і праезджыя. Ніхто не абміне калодзежа. Людзі п'юць, выціраюць рукою пот і гавораць:

— Але ж і вадзічка ў вас!

У гарачы дзень, ідучы на работу, людзі налiваюць сабе вады ў дубовыя біклажкі, каб было чым прагнаць смагу ў полі. Няма адбою і ад малых. Яны збягаюцца з усяе вуліцы. І мне столькі клопату, пакуль усіх territанапойваю.

— Стасічак, выцягні хацяя з паўвядзерца.

— Стась, прынясі кубачак,— просяць самыя меншыя, што не ўмеюць піць з вядра.

Я бягу ў хату і выношу вялізную конаўку, якая стаіць у нас у мыцельніку.

Спярша я ўсіх паіў у ахвоту, а потым сказаў:

— Не буду.

— Хіба табе вады шкада?

— Няўжо ж не.

Тата пачуў мае словы.

— А ты ведаеш, чаму наша вада смачная? — спытаўся ён.

— Чаму, татачка?

— А таму, што ёй не даюць застойвацца. Чым больш яе п'юць, тым яна смачнейшая. Нікому не шкадуй напіцца,— сказаў тата.— Зняможаны чалавек і той адразу падужэе, як пап'е свежай вады.

І я нікому не шкадую. Я рад напаіць з нашага калодзежа кожнага. Заходзьце, піце. Калі не можаце з вядра, я вам конаўку вынесу.

Даставаць ваду ў нас лёгка. Над калодзежам мы паставілі калаўрот. Круці за ручку — ланцуг навіваецца на вал і выцягвае вядро.

Круціць я магу. Чэрпаць адно не ўмею. І не толькі я. І нашы суседзі часта тапілі вядро. Хіснуць ланцугом, восілка выскачыць з зашчапкі, вядро — боўць! І няма.

Тады ідуць да нас.

— Ціхонка,— просяць майго тату,— памажы дастаць.

Мы з татам бяром доўгі прут з кручком на канцы і спускаем яго ў калодзеж. Бывае, доўга папаводзіш, папашнырыш ім, пакуль уловіш. І гэтак часта тапілася наша вядро, пакуль мы не прыкавалі яго да ланцуга.

І тады ўжо ўсе чэрпалі смела. Як хочаш боўтай — не адарвецца.

Але, на маё няшчасце, яно такі адарвалася. І якраз жа ж у мяне.

Хацеў я маме памагчы: прынесці трохі вады.

Можа, я лішне боўтаў, а можа, вядро было прыкавана слаба. Але толькі зачэрпаў я, пачаў круціць калаўрот, аж чую — вельмі лёгка ланцуг ідзе. Паглядзеў, а вядра і няма.

Крыўдна мне зрабілася. Маме не памог, а бяды нарабіў.

Як жа ж будзе? Без вады ж застанецца ўся наша вуліца.

Падышлі суседкі, але ніхто нічога не можа зрабіць без майго таты. А ён на цэлы дзень у горад паехаў. Павёз калгасныя памідоры. Ён шафёр.

Тут якраз вуліцаю ішла наша другая машына. Везла калгасніц на сенакос. Усе ў квяцістых сукенках, у белых хустачках. Вясёлыя. І, вядома ж, прыпыніліся каля нас. Усім жа хочацца папіць і з сабой узяць нашай вады.

— Стасік! — закрычалі з машыны.— Частуй вадою!

Я стаяў, унурыўшы галаву, гатовы заплакаць.

Тут выбегла з хаты мама і спалохалася:

— Што такое?

— Вядро ўпусціў.

— Яно ж прыкаванае было.

— Адкавалася.

З кабіны вылез шафёр.

— Падумаеш, бяда! — засмяяўся ён.— Не гаруй, Стась. Мы яго як бач дастанем.

Ён узяў прут з кручком на канцы і пачаў вадзіць па дне. Кручок бразгаў па вядры, але ніяк не мог падчапіць за восілку.

Вадзіў-вадзіў шафёр доўгім прутам і не мог даць рады. Вада ўжо зрабілася цёмнай і каламутнай. І як усе ні прыглядаліся — не маглі ўбачыць дна.

Стаўшы на дыбачкі, зірнуў у калодзеж і я. І ў тую ж хвіліну ўспомніў, што ёсць у мяне памочнік.

— Я ведаю, хто паможа дастаць вядро!

— Хто? — спытаўся шафёр.

— Зайчык! — сказаў я.

— Які зайчык? — спытала мама. І ўсе засмяяліся.

— Штукар ты, брат,— сказаў шафёр.

Я кінуўся ў сенцы. Знайшоў у каморцы сваё паліто і доўга абмацваў кішэні. Што такое? Куды ж ён мог прапасці? Нарэшце намацаў-такі, у самым нізе за падкладкаю. Гэта быў асколачак люстэрка. З ім я любіў гуляць, а ў сонечныя дні пускаў зайчыкі. Навядзеш яго, і зайчык куды хочаш праб'ецца.

Калі я падбег са сваім асколачкам і навёў яго на ваду, усе здзіўлена паглядзелі на мяне. А зірнуўшы ў калодзеж, радасна закрычалі:

— Глядзіце, глядзіце!

— Напраўду, дно відаць,— сказала мама.

— А вунь і вядро ляжыць! — І шафёр, нацэліўшыся, крукам падчапіў яго.

Мой тата зноў прыкаваў вядро, і цяпер смела чэрпаюць ваду ўсе. Калі ж яно і адарвецца, дык невялікая бяда. У нас ёсць памочнік: зайчык-вадалаз.

*1959*

8 Зак. 3611

# *Бацькава слова*

Вылецеўшы з гнязда, яны яшчэ доўга не маглі адвыкнуць ад яго цяпла. Першыя дні трымаліся блізка дамоўкі. І хоць пачыналі дзень разам з дарослымі, на досвецці ўставалі неахвотна. І калі б не будзілі, яны спалі б да ўсходу сонца. Дарослыя прачыналіся нацямочку. Спярша паціху і ласкава разварушвалі дзяцей, і калі тыя не падымаліся, ускрыквалі на іх рэзкім, сярдзітым голасам. Сцепануўшы крыльцамі, малыя выпырхвалі з гнязда. Але далёка не адляталі. Садзіліся на дроце каля хаты, каля страхі, пад якой вывеліся, і пачыналі церабіць свае белыя фартушкі на грудзях. Гэта яны ўмываліся, але, як і ўсе дзеці, вельмі ж марудна і доўга. У дарослых не хапала цярпення дачакацца, пакуль яны ўмыюцца.

Бацька і маці ведалі, што малыя не ляпуюцца, а не могуць ляцець далёка. У хвасце ў падлеткаў яшчэ не было таго доўгага вузкага пяра, якое надае палёту вёрткасць і хуткасць, і, пакуль не ўбярэцца ў сілу гэтае пяро-руль, маладыя не адважацца выпраўляцца далёка. Няхай вучацца, практыкуюцца, набываюць упэўненасць, смеласць і спрыт.

Пачынаўся золкі досвітак. Чацвярым ластавянятам было холадна і непрыемна сядзець на дроце. Вецер раздзімаў фартушкі. Тулячыся адно да аднаго, яны адварочваліся ад сіверу. Тады вецер біў ім у хвасты, і птушаняты, угінаючы шыі, ледзь не валіліся з дроту. Цяпер яны былі непадобныя на прыгожых, фарсістых ластавак. Іх, натапыраных і расхрыстаных, нават вераб'і маглі палічыць за сваіх. Дзіва што бацькі, якія вярнуліся з палёту і ўбачылі сваіх сіратлівых дзяцей, адразу кінуліся да малых і, спяшаючыся, пачалі карміць. Прынесенай здабычы хапіла, як кажуць, толькі на першы зуб. Дзеці з такой прагнасцю глыталі кожную мошку і камара, што

бацькі на тым часе кідаліся ў новы палёт і неўзабаве вярталіся зноў...

Накарміць згаладалую сямейку было нялёгка. Бацька і маці выбіваліся з сіл. А дзеці ўсё разяўлялі і разяўлялі свае ружовыя, ненаедныя раты.

Першы змогся бацька. Ён прысеў побач з дзецьмі і стаў расціраць сабе грудзіну, распраўляць пер'е на стомленых крылах. Распрастаўшы адно, потым другое, ён раздаваўся кароткай часіне перадыху. Адна маці не паддавалася ўтоме. Вельмі ж яна шкадавала малых, раз-пораз падлятала да кожнага і з дзюбы ў дзюбу аддавала спажыву.

Але, седзячы каля дзяцей, бацька заўважыў, што яны ўжо не так прагна кідаюцца да маці. І калі тая падлятала, забываліся нават разявіць рот. Сонца, якое паднялося над хатай, прыгрэла ластавянят. Яны пачалі весела патузвацца, штурхацца. Раптам лёгка рвануліся ў паветра.

Доўга з урачыстым, радасным крыкам ляталі ў чыстым блакітным небе, усё шырэйшымі і шырэйшымі кругамі аддаляючыся ад хаты. Налятаўшыся, кожнае зноў вярталася і чакала, калі маці прынясе пачастунак. Бацька дапытліва прыглядаўся да дзяцей і заўважыў, што пяро, ад якога залежалі лёгкасць і спрыт іх палёту, хоць яшчэ і не вельмі доўгае і пругкае, ужо даволі набрала сілы.

Пасядзеўшы яшчэ хвіліну, бацька імкліва шугануў у вышыню. Ластавяняты ўбачылі, як ён кінуўся напярэймы маці, што спяшалася да дзяцей, нешта крыкнуў ёй і як яны абое павярнулі назад і зніклі з вачэй.

Доўга чакалі дзеці. Час браўся пад поўдзень. Пара было абедаць. Ластавяняты спадзяваліся, што хутка іх зноў пачнуць карміць. Яны і не падумалі, што бацькі, якія вылецелі на досвітку, самі яшчэ не паснедалі.

Убачыўшы маці, якая маланкай мільганула над імі, ластавяняты ўзрадаваліся і жаласна закрычалі, паразяўлялі раты. Але знянацку з вышыні вынырнуў бацька. І дзеці пачулі адно-адзінае слова:

— Цурык!

Яны не ведалі, што азначае слова, але зразумелі яго як рашучы і строгі загад. Ластавяняты спалохана ўспырхнулі з дроту і ўбачылі, што ў паветры іх акружыў цэлы гурт ластавак, якія прарэзліва крычалі:

— Цурык! Цурык! Цурык!

Маладыя ластаўкі ведалі, што іх бацькі пабывалі ў многіх краінах і разумелі чужаземныя мовы. Яны здагадаліся, што бацька крыкнуў такое слова маці, каб зразумела толькі яна. Маці, вядома, знала, што цурык панямецку азначае — назад! І яна з аднаго слова зразумела ўсё.

— Хопіць! Яны ўжо самі ўмеюць лятаць!

З гэтага дня маладыя ластаўкі пачалі лятаць разам з дарослымі.

*1971*

# *Трывога ў Ельнічах*

Бываюць от жа рызыканты: ты яму кол на галаве чашы, а ён адно выскаляецца. З такім гаварыць — што на вей-вецер.

Якраз пра гэтакага джыгуна расказалі мне сёлета ў Ельнічах, адкуль я родам.

Яўстрата Скачыляса, чалавека ціхмянага, мала хто калі ўдзень і бачыць. Мужчына немаладога веку, ён працуе ўжо каторы год калгасным вартаўніком. Нават у цёплыя летнія ночы Яўстрат надзяе кажух і зімовую шапку, адно вуха якой звісае на каўнер, а другое вытыркае наперад, быццам насцярожана ўслухоўваецца ў цішыню, і са стрэльбаю на рамяні прыцемкам выходзіць з хаты. Хоць і негаваркі чалавек, а пачуўшы гурт, ён заўсёды падыдзе, пастаіць, паслухае, а то, бывае, і слова ўставіць і знікне ў цемры гэтак жа непрыкметна, як і паявіўся.

Пра Яўстрата ў Ельнічах ніхто слова благога не скажа. І пра самога, і пра трох яго сыноў. Праўда, толькі пра трох, бо чацвёрты, самы меншы, Юзік — такі ж кругасвет, што проста дзіва, у каго ён і ўдаўся. Можа, таму, што меншых заўсёды болей песцяць і пялегуюць, Юзік з самага малку ўзяў над усімі такую патолю, што нікога не прызнаваў.

Колькі там было таго Юзіка, а як пайшоў у школу, дык дзецям жыцця не стала ад яго. То грымакоў у плечы надае, то выхапіць з чужога партфеліка кніжку і пашмагае, то якога кепства ў школе наробіць. Ну, проста вока не спускай з гэтага вісуса! І ні просьбы, ні грозьбы не памагаюць. Пачаў настаўнік бацьку скардзіцца, а Яўстрат усё далікаціцца. Колькі разоў хадзіў перапрошваць за сына, а ўпічуваць шкадаваў, абыходзіўся гаворкаю. А той нібыта і слухае, а выскачыў за парог — і зноў за сваё.

Немаведама, дакуль бы гэта ішлося, каб не здарэнне, якое ўзрушыла ўсю вёску.

Дзяцей якраз распусцілі на лета. Пачыналася самая радасная пара, калі ўсё наўкола аж кіпіць жыццём. Дрэвы так раскупчасціліся атожылкамі з шырокімі лапушнымі лістамі, што цяжка было знізу разгледзець, што робіцца на верхавіне. А якраз на верхавіне таполі, што расла цераз вуліцу, напроці Яўстратавай хаты, адбываліся важныя падзеі.

Яшчэ напрадвесні Яўстратаў сусед Адам Патрубейка з сынам Толікам усцягнулі на таполю старое кола. Вельмі ж Толіку хацелася, каб на таполі пасяліліся буслы. І яны не падвялі хлопца. Прыляцелі, зрабілі сабе дамоўку і атайбаваліся жыць. Даверлівыя да людзей, яны кружылі зусім нізка над хатай, а часам спускаліся і на падворак. З вуліцы можна было бачыць, як спаважна яны пахаджаюць сабе між курэй, скоса пазіраючы на задзірыстага рыжага пеўня, які чамусьці не любіў буслінага панібрацтва.

Калі разумныя, добрыя навасельцы рабілі гняздо, калі выседжвалі малых, а потым, занятыя клопатам з ранку да позняга змяркання, нястомна насілі ім спажыву — у тыя дні якраз паміж Юзікам і Толікам пачалося сяброўства. На першы погляд, гэта было неспадзяванкай, бо яшчэ зусім нядаўна Юзік не раз хапаўся з Толем загрудкі. Не раз качаліся яны на пераменках сярод школьнага дзядзінца і ўваходзілі пасля званка ў клас з павырыванымі гузікамі, а то і з расквашанымі насамі. І от жа цяпер яны не маглі ўжо адзін без аднаго і дня перабыць. А здружылі іх буслы. Хлопцы вельмі ж упадабалі цікавых і дасціпных птушак і дзень у дзень наглядалі за імі.

Спярша, калі птушаняты былі яшчэ малыя, бусел з бусліхай па адным выляталі з дому, а як дзеці падраслі, адлучаліся ўжо разам і то ледзьве ўпраўляліся, каб удосталь накарміць сямейку.

Хлопцы аж заліваліся ад смеху, як чацвёра цыбатых буслянят прабавалі станавіцца на край гнязда і, спалохаўшыся высачыні, туліліся да маці. А тая сярдзіта клекатала, відаць, сварылася на малых гарэзнікаў.

Аднаго разу Юзік сказаў:

— Ведаеш, Толік, давай узлезем на гняздо і возьмем па бусляняці: я — сабе, і ты.

Толік не згадзіўся:

— Што ты! Яны ж з голаду памруць.

— А мы будзем карміць.

— Як гэта ты будзеш карміць? — пачаў рагатаць Толік.— Хіба будзеш на балоце жаб лавіць ды ім насіць?

Юзік не мог трываць, калі з яго хто смяяўся. Тады ён нахмурваў бровы і адно кідаў злосныя позіркі.

— Ведаю, чаму ты не хочаш!..— ускіпеў ён.— Ты думаеш, што гэта твае буслы? Твае, га?.. А я от вазьму і скіну к чорту ўсё гэтас кола!..— і Юзік, ухапіўшыся абедвума руч за ніжні сук, спрытна падцягнуўся і палез па шурпатым камлі ўгару.

— Не дам! — закрычаў Толік.

Ён падбег і з усяе сілы тузануў Юзіка за кашулю. Той шаргануўся тварам аб кару і аб'ехаў уніз. Усхапіўшыся на ногі і адчуўшы, як балюча шчыміць падрапаны твар, Юзік гатоў быў рынуцца з кулакамі на свайго нядаўняга сябра. Але Толік паспеў ужо ўскочыць у сенцы. Юзік пачуў, як бразнула клямка, а перад самым яго носам шчоўкнула і засаўка.

— Папомніш ты мяне, Патрубейчык! — памахаў кулаком перад дзвярыма раз'ятраны Юзік.

— Юзік — адарваны гузік! — смела абазваўся з-за дзвярэй Толік і палез на вышкі. А там, стаўшы ля круглага акенца, якое з-пад лабка выходзіла на вуліцу, пачаў цікаваць, што ж будзе рабіць Юзік.

Чакаць доўга не прыйшлося. З Патрубейкавага двара Юзік кінуўся ў свой. З малога акенца Толю добра было відно, як ён ускочыў у свае сенцы і, не бавячыся там, выбег назад. У руках у Юзіка была стрэльба. Не самаробная, не выструганая з палена, з якімі яны яшчэ нядаўна гулялі ў партызаны, а сапраўдная, тая, з якой Яўстрат Скачыляс хадзіў на начную варту.

Толік ад нечаканасці аж сумеўся: што ён надумаў, гэты шаленец? А Юзік, выйшаўшы з варот, стаў, падняў стрэльбу і навёў яе... Куды б вы думалі? У самы лабок Патрубейкавай хаты, у самае акенца, за якім стаіўся Толік.

— А-а-а! — немым голасам закрычаў Толік і грэйма кінуўся з вышак у хату.— Татачка, міленькі! Юзік хоча мяне застрэліць! — ледзь паспеў вымавіць ён. І ў гэты час грымнуў стрэл. Пачуўся спалоханы крык Яўстрацішы, Юзікавай маці:

— А за што ж ты яго, Юзічак? А ці ж ён табе замінаў? А ці ж ён табе свет заступіў? Гэта ж такое няшчасце на маю галаву-у-у!..

Толяў бацька, не цямячы, што здарылася, здзіўлена ўтаропіўся ў сына. А Толік, з палёгкай уздыхнуўшы, весела закрычаў:

— Ён у мяне не пацэліў! — і кінуўся з хаты на двор.— Ён мяне не забіў, цётка Настуся! — крыкнуў Толік Юзікавай маці і ў гэтую ж хвіліну ўбачыў самога Юзіка. Той, увесь спалатнелы, з апушчанай галавой стаяў каля свайго агародчыка. Стрэльба ляжала каля яго ног. Толіку так шкада зрабілася свайго сябра, што ён не вытрываў.

— Юзік...— ціха паклікаў ён.

Юзік нават не паварушыўся.

— А-а, дык ты яшчэ і шкадуеш гада такога! — пачуў Толя дакор сваёй другой суседкі і толькі цяпер убачыў, што каля вулічных акон іх хаты сабраўся цэлы натоўп. Паміж людскіх галасоў Толік чуў устрывожаныя пытанні і гнеўныя адказы:

— Хто гэта яго?

— Яўстратаў, хто ж яшчэ можа.

— А родненькія мае! І як у яго рука паднялася?

— У яго спытай. Бачыш, вунянё стаіць ля падваротні і зыркае спадылба, як ваўчаня...

Услухваючыся ў людскую гаману, Толік яшчэ раз паглядзеў на Юзіка. Сэрца яго сціснулася ад жалю. Ён ніяк не мог уцяміць, чаму людзі з такім гневам гавораць пра хлопца. «Ну, можа, у злосці ён і падумаў быў, каб забіць мяне. Але ж як ён, небарака, цяпер мучыцца, як ён перажывае...»

І Толік павярнуўся да натоўпу. Ён хацеў закрычаць людзям: «Глядзіце, вось жа я! Жывы!», але словы так і захлынуліся ў горле. Тое, што ўбачыў ён у гэтую кароткую хвіліну, было самым страшным. Страшнейшым за тое, што ён думаў.

Людзі расступіліся. Пасярод вуліцы ляжаў бусел. Падкурчыўшы пад сябе пасінелыя ногі і выцягнуўшы доўгую дзюбу, ён шырока распластаў свае крылы, быццам намагаўся яшчэ падняцца. Але падняцца не мог. Ён быў мёртвы.

Толік адчуў, як хістанулася вуліца. Вялізныя цёмныя абручы паплылі перад ім. Каб не ўпасці, ён стуліўся ўвесь і здаўся сабе зусім маленькім і бездапаможным. Але з усяго цяжару, які зваліўся на яго, Толік выразна

адчуў толькі, што ў гэты спякотлівы дзень раптам зрабілася холадна, як зімою.

Ён не памятаў, як бацька завёў яго ў хату, не чуў, як гаварылі, што Юзік, выскачыўшы са стрэльбаю, сам яшчэ не ведаў, што будзе рабіць. Ён ірваўся адпомсціць сябру. І ўбачыўшы бусла, які ляцеў над самай хатай Патрубейкавых, злажыўся і ўсадзіў у яго цэлы набой шроту.

Вуліца гула, як устрывожаны вулей. Калгаснікі сарамацілі і дакаралі Яўстрата і Настусю Скачылясаў, а каторыя дык адкрыта казалі, што такому шыбеніку, як іх сын, не можа быць месца ў Ельнічах, што ад такога немаладу якой можна бяды дачакацца. І каб Юзік не ўцёк, то невядома, як бы ўся гэта гаворка і павярнулася.

За сваімі трывогамі людзі і не заўважылі адразу, якая трывога ахапіла чыстае летняе неба. Над вуліцаю, над старою таполяю Патрубейкавых у адчаі і роспачы клекатала ўжо не адна асірацелая бусліха, а цэлая чарада буслоў, што дазналася пра няшчасце. Малыя буслянята стаялі галодныя ў гняздзе і палахліва туліліся адно да аднаго. Растрывожаныя буслы лёталі ўжо траха не над самымі галовамі людзей. Пэўна, з усіх паселішчаў, з усіх вёсак зляцеліся яны сюды. І як толькі людзі разышліся, буслы адразу апусціліся на вуліцу. Яны абступілі нябожчыка, і доўга не сціхаў іх журботны клёкат.

Людзі, прыпаўшы да шыбаў, глядзелі на вуліцу. Патрубейчыха, пад вокнамі якой адбывалася гэтае сумнае развітанне, не вытрывала, выбегла і загаласіла:

— А людцы, а суседзейкі, а нешта ж трэба рабіць...

Яўстрат Скачыляс выйшаў са свайго двара з рыдлёўкаю. А за ім на тым жа часе высыпалі з хат і старыя і малыя. Буслы залапаталі крыламі, падняліся і зноў пачалі кружыць у паветры.

Скачыляс падышоў да забітае птушкі, уткнуў рыдлёўку ў задзірванелую вулічную абочыну і стаў капаць яму. Усе бачылі, што маўклівы Яўстрат пакутліва перажываў няшчасце і невыказную крыўду на сына. І гатоў быў хоць гэтым цяжкім абавязкам павініцца перад людзьмі і перад горкім сумленнем.

— А Яўстратачка ж ты мой! — пляснула рукамі Патрубейчыха.— А што ж ты надумаў... А не па-суседску ж ты, галубок, робіш...

Скачыляс кінуў капаць. Ён не зразумеў, чым яшчэ мог пакрыўдзіць суседку.

— Гэта ж на век вечны перад самымі нашымі вокнамі такі цяжкі дакор будзе. А за што? Хіба ж мы вінаватыя? — заплакала Патрубейчыха.

І ўсе згадзіліся: сапраўды, гэта было б чорнай несправядлівасцю.

Яўстрат пастаяў, падумаў, абвёў вачыма натоўп, нагнуўся над буслам, падняў яго, прыхапіў рыдлёўку і выправіўся ў самы канец свайго агарода. Людзі цераз Скачылясаў двор рушылі ўслед за гаспадаром.

Каля густога вішняку, дзе толькі што пачыналі на пробу капаць маладую бульбу, Яўстрат пахаваў бусла. Доўга маркотныя, прыціхлыя птушкі сноўдаліся па Яўстратавым агародзе, не баючыся людзей, і ў роспачы лапамі грэблі свежае бульбянішча.

Надвечар з гнязда скінулася двое буслянят. Яны яшчэ не паспелі ўвабрацца ў пер'е. Цяжка было сказаць, ці то не вытрымалі яны вялікага гора, ці то зацякліся за цэлы дзень з голаду. Хутчэй за ўсё бусліха, ведаючы, што цяпер адна не выкарміць сям'ю, сама асудзіла іх на пагібель. Але бусляняты былі жывыя. Калі Толік, узрушаны гэтым новым няшчасцем, унёс малых у хату і накарміў прасяною кашаю, а потым пасадзіў у запечку і накрыў кажушком, яны павесялелі і дзюблікамі пачалі скубці яго за рукавы...

Пасярод ночы, калі ў Патрубейкавых спалі, у акно пастукалася Юзікава маці.

— Толік! — трывожна паклікала яна.

Толік усхапіўся з ложка і выбег на двор.

— А мой жа ты Толічак, мой залаценькі. Няма ж нашага Юзічка, і не ведаем, дзе шукаць. Бацька з ног збіўся...

І хоць на вуліцы было не так і цёмна, Толік вярнуўся ў хату і запаліў ліхтар «лятучая мыш». А Яўстраціха, як апантаная, зноў кінулася да свае хаты. Не знаходзячы прыстанку, яна тупала босымі нагамі вакол круглага каменя, што ляжаў ля сенечных дзвярэй, плачучы і прыказваючы сама сабе:

— А як жа ж таго дня дачакацца.. А я ж ужо ўсіх сваіх абабегла... А хлопчык жа ты мой, а любенечкі,— заплакала яна яшчэ галасней, убачыўшы Толіка з ліхтаром.— А каб жа ж ён хаця чаго не надумаў... А прабягу

ж я яшчэ па людзях, а мо што прачую...— і вуліцаю падалася ў цемру ночы.

Толік завярнуў у Яўстратаў двор. Не на жарт устрывожаны, куды мог знікнуць Юзік, ён успомніў, з якім вінаватым выглядам стаяў яго бяздумны сябрук удзень перад людзьмі. Абавязак сяброўства, няхай сабе нялёгкага і крыўднага, вымушаў Толіка зараз жа, не бавячыся ні хвіліны, ісці на гэтыя начныя пошукі.

Перш за ўсё Толік палез на гарышча Яўстратавай хаты. Каля акенца ў лабку ён пераканаўся, што Юзік доўга стаяў тут. Абярэмак леташняй саломы быў нашчэнт перацёрты нагамі. Значыць, Юзік да самых прыцемкаў чуў і бачыў адгэтуль усё, што адбывалася на вуліцы і на двары.

Спусціўшыся па лесках з вышак і высвечваючы перад сабою ліхтаром дарогу, Толік выйшаў на падворак. У палахлівай нерашучасці ён спыніўся ля калодзежа, пастаяў, можа, з хвіліну, потым, так і не зазірнуўшы ў яго цёмную прорву, адкінуў лёгкія плеценыя веснічкі і разораю падаўся ў канец агарода. Збіваючы каленьмі халодную расу з бульбяніку, ён неўзабаве дайшоў да таго месца, дзе Яўстрат пахаваў бусла.

Зыркі круг ліхтара ўпаў на невялікі прагалак каля вішняку. Такі Юзік быў тут. Угнуўшы плечы, ён сядзеў на вытаптаным учарнелым грудку, а непадалёк ад яго ў разоры на адной назе стаяла бусліха. З высокага бульбяніку выткнулася яе галава. І Толік убачыў, як ад рэзкага святла бусліха на момант заплюшчыла вочы і адразу ж зноў расплюшчыла іх — самотныя і дакорлівыя.

Юзік не паварухнуўся. Нахіліўшыся з ліхтаром, Толік убачыў, што хлопец як бы застыў у зняменні. А можа, ён спаў? Праўда, Толя яшчэ ніколі не бачыў, каб спалі з шырока расплюшчанымі вачыма. Гэта была тая цяжкая гадзіна ў жыцці яго сябра, калі ён упершыню сам зазірнуў у сваю яшчэ не зразумелую, збітую з тропу душу, якая цяпер ужо не магла так лёгка супакоіцца і бесклапотна знябыцца.

Толік крануў сябра за плячо. Юзік маўчаў. Тады Толік схапіў яго за локаць і з усяе сілы пацягнуў за сабою.

Юзік падняўся. Як малое дзіця, што толькі-толькі намагаецца рабіць першыя крокі, няўпэўнена пераастаўляючы ногі, ён паслухмяна пайшоў за Толікам. Так ішлі яны моўчкі адзін за адным разораю, потым дваром аж да са-

мае хаты Скачылясаў. Ля сенечнага парога Юзік ледзь чутна вымавіў:

— Што ж цяпер будзе, Толік?

— Не ведаю.

Яны абодва змоўклі і доўга не абзываліся. Потым Толік падняў шкляны каўпак ліхтара і патушыў святло. З вішнёвага зарасніку выбіваўся ранні досвітак.

— Так яна там і прастаяла ўсю ноч?

— Усю ноч,— вінавата ўнурыўся Юзік.

— А двое малых сядзяць у мяне ў запечку. Упалі з гнязда,— сказаў Толік.— Прыйдзецца гадаваць.

— Прыйдзецца,— згадзіўся Юзік.

*1959*

# Газета

Якраз таго дня, як нас распусцілі на летнія канікулы, у нашым доме ўжоканчалі рамонт і браліся за пабелку калідора.

На лесвіцы стаялі абляпаныя глінай рыштаванні. А на пляцоўцы проста нельга было павярнуцца ад вёдраў і бляшанак з вапнай і фарбамі. І што нас асабліва здзівіла — распараджаўся тут Косця Зубок.

Косціка мы добра ведалі. Ён жыў у нашым жа доме. Летась яшчэ хадзіў у шынялі вучня-рамесніка, а нядаўна паведаміў нам, што ўжо мае добры заработак. «Выхваляецца»,— падумалі мы. Але аднаго разу ў нядзелю за свае грошы ён купіў усім хлопцам нашага двара білеты на «Міколку-паравоза», а ў буфеце яшчэ і па порцыі марожанага. І тады мы пераканаліся, што Косця сапраўды пры вялікіх грашах. Хоць Зубок быў і старэйшы за нас, а трымаўся, як наша раўня. І мы любілі Косцю за гэта.

Мы ведалі, што Зубок маляр, часта бачылі яго ў спяцоўцы, расфарбаванай у розныя колеры. Але ніхто з нас не мог падумаць, што Косця на сваёй рабоце старшы, што яго слухаецца аж цэлая брыгада.

Цяпер у сваёй размаляванай брызентоўцы Косця стаяў на рыштаваннях і малатком абіваў старую тынкоўку.

— Прывітанне адпускнікам! — гукнуў ён. І, бачачы, што мы стоўпіліся ля парога, не асмельваючыся ісці паўз сцяну, з якой сыпалася пабелка, весела засмяяўся: — Што, выдатнічкі, канец вашай газеце?

Мы здзіўлена пераглянуліся, не разумеючы, пра якую газету гаворыць Зубок. А Косця, узяўшы рагожны квач на доўгім кіі, пачаў вадзіць ім па сценах, як настаўнік указкай па карце.

— Чытайце. Ну-ну, чытайце! Каб я чуў!

Ад сораму ў нас запалалі вушы. Усе сцены абапал лесвіцы, дзе вугалем, дзе алоўкамі, а то і цвікамі, былі густа спярэшчаны надпісамі, няхай даўнімі, нават забытымі, але добра знаёмымі нам.

Так, гэта была сапраўды газета. Яе пісалі ўсе, хто хацеў. Адзін, каб спагнаць злосць на сваім крыўдзіцелі, другі дзеля пацехі, трэці — проста таму, што ўмеў накрэмзаць слова.

Калі гэта пісалася? Ну, вядома ж, зімовымі вечарамі, калі мы бавілі свой вольны час на лесвіцы. Тут было заўсёды шумна. Расказваліся навіны, якія адбываліся за дзень у школе, звяраліся адказы на цяжкія задачы. Узнікалі спрэчкі, даходзіла і да боек. Не дзіўна, што таго ж вечара на сценах паяўляліся новыя таямнічыя пагрозы, мянушкі, злосныя карыкатуры, а назаўтра — і самыя экстраныя паведамленні:

«Мішка ўхапіў двойку».

«Сёмка + Галя = ...»

Што даваў гэты плюс — невядома. Збоку, як заключэнне, было прыпісана «дурань».

— Чытайце, чытайце! — падганяў нас Зубок, водзячы квачом па сценах.

— «Вова курыць»,— было напісана крывымі літарамі. «А табе што?»

Не цяжка было здагадацца, што гэта ўжо была рука самога Вовы.

Пад чорнымі, вышынёй на паўметра, словамі: «Людка — выхваляка» стаяў не менш выразны адказ: «А ты, Ленка,— румза».

І маё імя красавалася ў гэтай кампаніі. Вялізны, як калясо, круг, абведзены тлустым вугалем, азначаў маю галаву. На патыліцы тырчалі не то пікі, не то стрэлы. Гэта, відаць, былі мае валасы. Дзве дугі абапал чорнага круга замянялі вушы. Рот быў настолькі страшны, што каб быў у мяне такі, дык я, доўга не думаючы, праглынуў бы таго, хто намаляваў мой партрэт. А ў тым, што гэта быў мой партрэт, не магло быць ніякага сумнення. Унізе было напісана: «Васька Мардаська».

Але цяпер усім нам было не крыўдна, а сорамна перад нашым добрым сябрам, перад Косцем Зубком.

— Канчаецца ваша газета. Палюбуйцеся апошні раз,— сказаў Косця і, памаўчаўшы, дадаў: — Праўда, тыдні два прыйдзецца мне паваждацца, пакуль давяду ўсё да ладу. Брыгаду ж я паслаў у суседні дом...

Доўга стаялі мы, унурыўшы галовы, не асмельваючыся падняць вачэй на Косцю. А ён, як бы спахапіўшыся, весела гукнуў:

— Чаго насы паспускалі, выдатнічкі? Умелі пісаць, дык давайце памагайце сціраць.

Тут увесь наш гурт заварушыўся, загуў. З нашых плячэй як цяжкі камень зваліўся. Паабедаўшы на скорую руку і надзеўшы на сябе такое, чаго не было шкада, мы ўсе, да аднаго, высыпалі на калідор і сталі пад каманду Зубка.

Усім знайшлася работа. Дзяўчаткі выдзёўбвалі стары тынк з расколін і замазвалі іх глінай; хлопцы насілі ваду, пераастаўлялі цяжкія рыштаванні. А Косця Зубок, пачаўшы з самае верхняе пляцоўкі, як пажарным брандспойтам, вадзіў пырскачом па столі і сценах. Густы пруткі струмень пабелкі пакрываў назаўсёды нашы даўнія крыўды, горкія мянушкі, злосныя партрэты і наш сорам. Сцены высыхалі на тым часе і былі гладкія і белыя, як ліст паперы, але ўжо ні ў кога з нас не паднялася б рука, каб дакрануцца да іх.

Так пачалося лета. Гэта былі самыя шчаслівыя дні нашых канікулаў. Калі рамонт быў закончаны і пад'езд зазіхацеў ад святла і чысціні, Косця Зубок сабраў нашу каманду на сход і сказаў:

— А добра было б усё ж мець нам сваю газету.

І тут жа мы выбралі рэдкалегію. Назаўтра змайстравалі рамку, пафарбавалі, прыдумалі загаловак. І кожны напісаў і намаляваў тое, што хацеў і ўмеў. Былі ў газеце і жарты, і сур'ёзныя артыкулы. А я напісаў апавяданне пра тое, як загінула брыдкая і нарадзілася наша новая прыгожая газета «Сяброўства».

Яе мы вывесілі ў самым пачатку калідора, каб чыталі ўсе, а калі хто захоча напісаць у яе — калі ласка. Няхай піша ўсё, што думае пра нас,— і добрае, і благое. Мы не баімся крытыкі.

*1959*

# *Трое ў палаце*

## *I*

І ў самыя цяжкія хвіліны чалавека не пакідае цікаўнасць. Ён не можа бачыць жыццё толькі з аднае пазіцыі, падобна рыбалову, які сцішыўся на беразе і, усёй увагай прыкаваны да паплаўка, глядзіць на раку, што, верная сваім законам, плыве і плыве далей.

У кожнага свая рака. Але рэдка хто безуважны сузіральнік яе плыні, нават калі і вымушаны на бяздзейнасць.

Колькі можна прабыць у настроі сузіральнасці самаму стомленаму і знясіленаму — месяц, няхай два, а ў бядзе, у трывозе чалавеку страшней за ўсё адзінота.

Трапіўшы ў бальніцу нават цяжка хворым, цераз якую хвіліну-дзве ты ўжо ўсёй напружанай, нацятаї душэўнай вастрынёй адчуваеш, як, перамагаючы боль, на паверхню ўсёй пакутнай трывогі выбіваецца цікаўнасць: хто твае суседзі, можа, у іх яшчэ большая бяда, чым твая? І спачуванне чужому гору суцішае твой асабісты боль.

Далучыўшыся да агульных намаганняў перамагчы хваробу, ты адчуў, што і самому стала лягчэй.

Бруіцца рака жыцця — імклівa і няспынна. Не маючы змогі плыць, не кідай у яе камянёў горкай крыўды.

У бядзе чалавек спазнаецца, які ён ёсць.

Нярэдкае прабыванне і падоўгу ў бальнічнай палаце заўсёды зводзіла мяне з харошымі людзьмі, хоць раней, ва ўмовах свайго асяроддзя, у службовых, бытавых і штодзённых клопатах, яны, здаецца, нічым не маглі прывабіць і зацікавіць.

Значыць, або я іх не ведаў, або, хутчэй за ўсё, асяроддзе, сфера іх інтарэсаў, якімі яны жылі, не памаглі ім выявіцца ў сваіх найлепшых якасцях і магчымасцях.

Чалавек, відаць, пазнаецца больш за ўсё тады, калі выходзіць пераможцам з цяжкага выпрабавання, пераканаўшыся, што гэтай перамогай ён абавязаны не адна-

му сабе, а і намаганням людзей, доўг і абавязак перад якімі сталі цяпер яго самымі высокімі пачуццямі. Пасля такога спазнання яснейшаю становіцца душа, а чалавек — лепшым, дабрэйшым, прыгажэйшым.

Ён ужо і на адзіноце не адзінокі. Абвастраецца ўвага, дапытлівасць і цікаўнасць да кожнага — хто ён, якімі клопатамі заняты, якімі трывогамі і думкамі жыве?

Пра такія знаёмствы не магу сказаць — выпадковыя. Яны заўсёды дарылі мне добрых сяброў.

## *II*

На гэты раз маім другам стаў Рома. І я многім удзячны яму за тое, што хвароба, якая скруціла мяне ў казіны рог і не давала прасветлае гадзіны ні ўдзень, ні ўночы, раптам расслабіла свае ўчэпістыя лапы і нават палагаднела, як толькі я ўбачыў яго, свайго будучага друга...

Ён сядзеў на ложку пры акне і на поўную магутнасць заводзіў... баявы танк. Спружыне не цярпелася адразу ж даць ход цяжкім гусеніцам. Танк увесь калаціўся, роў і грукатаў, ірвучыся з рук вадзіцеля. Машына імкнулася наперад, але поле танкадрома было да немагчымасці абмежаванае.

На каленях Ромы ляжала тонкая, лёгкая дошка, што служыла яму сталом. На ёй, вядома ж, нескавала патрэбнага аператыўнага прастору. Разагнаўшыся, танк з грукатам ляцеў на падлогу. Сам танкіст, не могучы ўстаць, націскаў на кнопку званка, і тады прыбягала няня або дзяжурная сястра.

Разумеючы сваю бездапаможнасць, ён не адчуваў сябе вінаватым.

Якраз у момант такой вялікай аварыі, калі машына ляжала дагары гусеніцамі, натужна і жудасна равучы, сястра і няня прывялі ў палату мяне.

Рома невыказна абрадаваўся — кончылася, нарэшце, адзіноцтва! І хоць яно цягнулася не болей гадзіны, пакуль выпісваўся мой папярэднік, а на яго месца ў прыёмным пакоі рыхтавалі мяне, але чалавеку кіпучай, няўрымслівай натуры і гадзіна магла здацца вечнасцю.

Матор танка каратка раўнуў і змоўк. Цяпер ён ляжаў без найменшай прыкметы жыцця.

Рома падняў на мяне ціхі, засмучаны пагляд — і я зразумеў увесь адчай яго бездапаможнасці.

Самае ж невыноснае ў маёй бядзе было — нагнуцца і разагнуцца. Але спадзяванне, якое я прачытаў у сумных вачах Ромы, магло вымусіць і на большы подзвіг.

Я нагнуўся, падняў машыну, але падаць яе сваіму суседу не змог. Разагнуцца мне памаглі сястра і няня, якіх выклікаў Рома, даскапала спрактыкаваны ў тэхніцы сігналізацыі.

І ўсё ж хоць першая спроба сагнуцца і разагнуцца пацярпела няўдачу, потым я ўпэўніўся, што якраз у гэтым быў мой адзіны паратунак.

Цераз неймаверныя намаганні, перасільваючы нясцерпны боль, чым болей я згінаўся і разгінаўся, варушыў рукамі і нагамі ў кожным іх суставе, тым выразней, няхай сабе і вельмі яшчэ далёка наперадзе, праяснялася надзея, што я перамагу хваробу.

Пастунова далучаючыся да турбот і клопатаў свайго аднапалатніка, я набываў у ім друга, але не скажу, што і аднадумца. Якраз у думках, у поглядах на многія рэчы мы разыходзіліся з ім, часта займаючы рэзка супрацьлеглыя пазіцыі.

Першым пунктам нашых гарачых спрэчак і вострых канфліктаў быў... футбол.

У вачах Ромы адзінае, што апраўдвала мяне, гэта паважаны ўзрост. Але ў такія хвіліны я прыгадваў і некаторых сваіх старых сяброў, якія ў асобе майго юнага друга знайшлі б не толькі аднадумца, але і падзвіжніка ў імя самай высокай страсці нашых дзён.

Рома паў ахвярай гэтай страсці.

З поля бою ён падняўся, але сюды, у бальнічную палату, яго даставіла «хуткая дапамога».

Чорт вазьмі, калі ўжо не шанцуе, дык не шанцуе! Адна бяда шукае другое.

Заставалася два месяцы да заканчэння заняткаў у школе, і Рома, прыкаваны да пасцелі, мусіў яшчэ мужна і самаадцана канчаць свой першы клас.

Штодня прыходзіла настаўніца, дэлегацыі аднакласнікаў, і мой друг адчуваў сябе героем, што пацярпеў дзеля шчасця і дабра ўсіх бліжніх і дальніх, з'яднаных адзінай любоўю і захапленнем.

Першакласнік і першакласны — словы падобныя, але паміж імі вялікая розніца.

Калі першае можа вызначаць сабой любога смертнага, хто начапіў на плечы ранец і прыйшоў у школу, дык

другое — о, другое — першакласны футбаліст, сапраўды гучыць горда.

У гэтым Рома пераканаўся нават у бальніцы.

Па тым як у дні футбольных перадач пусцелі палаты і ўсе спяшаліся ў вестыбюль, да тэлевізара — хто на кастылях, хто трымаючыся за сцяну, хто — за плячо таварыша, не цяжка было зразумець, што ў жыцці адбываецца найважнейшая падзея, ад якое залежыць лёс кожнага.

Дзіва, што Рома не прапускаў ніводнае гульні. Удасканаліўшыся ў чытанні не так па буквары, як па раскладзе тэлепраграм, ён чакаў кожнае гульні, як вялікага свята.

У гэты дзень, калі не прыходзілі бацькі, дзяжурная сястра або няня бралі ў абярэмак першакласнага футбаліста і ўрачыста неслі на руках цераз увесь доўгі калідор.

Рома, абняўшы за шыю свайго насільшчыка ці насільшчыцу, пераможна ўсміхаўся, гледзячы, як усе расступаюцца перад яго паднятай, нібы гарматны ствол, загіпсаванай нагой.

Рома шкадуе, што паламаў нагу.

— Хай бы лепш руку...

— Што ты, Ромачка? — здзівіўся я. Але яшчэ болей здзівіўся, пачуўшы яго прафесійныя меркаванні:

— Калі б руку,— сказаў ён разважліва,— усё ж можна было б гуляць у футбол,— і яшчэ больш радасна дадаў: — І не хадзіць у школу!

Логіка жалезная. Што называецца, двух зайцоў адразу ж і — напавал!

Філасофскі рацыяналізм майго друга не толькі захапляў мяне нечаканасцю абагульненняў, але і вялікай мудрасцю адкрыццяў.

Убачыўшы, як я, сцяўшы зубы, моршчуся ад болю, і, напэўна, спачуваючы мне, ён глыбакадумна сказаў:

— Каб не было людзей, не было б ніякіх хвароб...

Госпадзі, вуснамі младзенца глаголет ісціна. Ды яшчэ якая! Ну хто б гэта нават з найвялікшых філосафаў дайшоў да самой першапрычыны ўсіх пакут на зямлі: каб не было людзей?

— А хто быў бы, Ромачка?

— Робаты. Сапсавалася што — выкінуў і замяніў другім.

— А хто б гэта ўсё рабіў?

— А сам,— не дапускаючы пярэчанняў, сказаў Рома,— сам адвінціў галаву, наліў масла і зноў прывінціў.

Прызнаюся, я не люблю фантастыкі, але калі б нявіліся ў нас кнігі з такімі героямі і такой ідэальнай сістэмай самаабслугі, я запоем чытаў бы ўсю гэтую літаратуру.

Дзіця свайго веку, ён ніколі не адступаўся ў сваёй упэўненасці.

Дарэмна было спрачацца, ён не любіў пярэчанняў.

Усякае ваша намаганне падсунуць доказ адразу цярпела поўнае паражэнне.

— Я ж лепш ведаю! — заяўляў пераможна ён, і вы павінны былі згаджацца з гэтым, сапраўды не абвержным аргументам.

Багаты вопыт сямігадовага жыцця вызначаў у ім натуру, я сказаў бы, цвёрдае волі.

Катэгарычнасць яго меркаванняў, безумоўна, ішла ад бацькоўскай улады. Ён толькі не ведаў, каму аддаць перавагу: тату ці маме.

— Ну, дома хто галоўны?

— Дай падумаць,— сказаў Рома, але думаў нядоўга: — Тата.

— Чаму?

— Таму, што ён уключае тэлевізар...

## *III*

Падрабязнасці матча, які адбыўся на школьным двары і пасля якога цэнтральны нападаючы трапіў у бальніцу, я запісаў са слоў пацярпелага.

Сам Рома ўспрыняў мой запіс як акт гістарычны.

— Пішы, пішы,— сказаў ён, заўважыўшы, што я цяжка варочаю пальцамі, якія ледзь упраўляюцца вадзіць алоўкам.

Мне хацелася запісаць толькі асобныя эпізоды незабыўнага подзвігу Ромы, але ён, пільна сочачы, ці адпавядае кожнае сказанае слова працягласці і адпаведна занятаму месцу пад маёй рукой, і на гэты раз здзівіў дакладнасцю разумення праўдзівасці ўсякага летапісу.

— Пішы ўсё, а то не будзе цікава...

І праўда, як у ваду глядзеў Рома! Калі цяпер мне за-

хацелася ўзнавіць дарагія ўспаміны і, адшукаўшы маленькі бальнічны блакноцік, я ўбачыў у ім сцёртыя, малавыразныя каракулі, як жа я пашкадаваў, што іх так мала!

Цяпер ужо кожнае слова майго друга для мяне на вагу золата.

Добра, што я запісаў хоць найважнейшыя акалічнасці, не грэбуючы і дэталямі, што надта ажывілі праўдзівасць абставін, тыповых і характэрных умовах, у якіх пачаўся гэты летапіс.

— Я так даўно табе, дзядуля, расказваю, што захацеў у туалет,— прызнаўся Рома і націснуў кнопку званка.

Паявілася няня, і пасля нядоўгай і нескладанай працэдуры наша работа над стэнаграмай пайшла болей паспяхова.

Мяркуючы па тым, як расказваў Рома, школьны матч абяцаў поўны трыумф.

«Я быў нападаючы, гнаў мяч у вароты. Р-раз нагой — і Уладзіку. Уладзіка акружылі, але ён сумеў перадаць мяч мне. Я павёў мяч у вароты. Разагнаўся, ды я-а-ак даў, а варатар — мне пад ногі. Мы абодва ўпалі. Я яму нагой — у патыліцу. Ён ускочыў і схапіўся за галаву, а я ляжу, бо не магу ўстаць. Склаўшы рукі сядлом, хлопцы ўзялі мяне і вынеслі з поля. Гульня не спынілася. За мяне білі штрафны. І зраўнялі лік: адзін-адзін. У-р-ра! Я паспрабаваў падняцца, каб закрычаць разам са сваімі «ўра», але не мог. Тады я адпоўз яшчэ далей, каб не замінаць гульні, і стаў думаць: як дабрацца дадому аж цераз чатыры вуліцы? Я ўвесь час зваў Уладзіка, свайго друга, але ён не чуў майго голасу. Тады я паклікаў Грышу з трэцяга класа. Ён падбег і спытаўся:

— Што з табой?

— Баліць нага.

— Я пайду пазаву медсястру.

— Ой, не трэба.

Але падышлі яшчэ з трэцяга класа, падналі мяне і панеслі ў школу. Медсястра, убачыўшы, як мяне валакуць, спыталася:

— Што з ім?

— Нага.

— У футбол ганяў?

— Ганяў.

— Скора і галовы паскручваеце. Давайце ў медкабінет. А я пайду доктара паклічу.

Мяне палажылі на тапчан. Я не мог павярнуцца ад болю, але цярпеў. Назе зрабілася холадна-холадна. Я папрабаваў падняцца. Падняўся і сеў. А потым устаў і пайшоў кульгаючы...

— Ну, дзядуля, праўда, цікава? А ты не хацеў запісваць. ...дакульгаў я да парога, хацеў адчыніць дзверы, спытацца, як там футбол, і паваліўся.

Прыйшоў доктар. Паглядзеў, памацаў.

— Пералом. У бальніцу!

Я заплакаў... Толькі ж ты не пішы, што я плакаў. Я цярпеў, як салдат...»

Так закончыў Рома сваё апавяданне, не забыўшыся паклапаціцца, каб яно гучала бадзёра, аптымістычна, адпаведна подзвігу.

Арэол перамогі лунаў над яго стрыжанай галавой.

Хто б мог падумаць і ў каго б павярнуўся язык сказаць, што ён нарабіў бяды не толькі сабе, але бацькам і школе?

Што вы! Школа першай парупілася, каб бліскучыя гадавыя паказчыкі класа ўпрыгожылі і незвычайныя поспехі Ромы.

У дзень апошняга званка, калі скончыліся заняткі, настаўніца прыйшла да нас у палату. Яна прынесла свайму вучню ўрачысты рэскрыпт, які называўся: «Падзяка за вучобу і прыкладныя паводзіны», а ў дадатак яшчэ і памятны падарунак — кнігу, на якой былі напісаны тыя ж гарачыя словы ўдзячнасці, замацаваныя подпісам і пячаткай дырэктара.

Рома зіхацеў у промнях славы.

## *IV*

Надышоў і мой урачысты дзень.

Мне стукнула шэсцьдзесят.

Стукнула памяркоўна. Лёс пашкадаваў мяне. І хоць ноч была трывожная, але паспаў я засаб аж тры гадзіны. Боль палагаднеў — можна было трываць.

Дзень якраз быў, як кажа Рома, упускны. І яшчэ толькі ён пачаўся, а родныя мае нанеслі ў палату цюльпанаў, нарцысаў, бэзу. Унучка Юля, агледзеўшы ўсю гэтую раскошу, сказала:

— Дзядуля, ты як у раі!

І праўда, я быў у раі. Я быў на тым сёмым небе, куды так рэдка-рэдка падымаемся мы з вамі.

Дзякуй вам, мае дарагія, за гэты ранак і за сонечны майскі дзень, які яшчэ ўвесь быў наперадзе. Дзякуй табе, вялікая мая пакутніца маці, што нарадзіла мяне ў гэты харошы дзень на зямлі!

— Значыць, табе шэсцьдзесят? — перапытаў Рома, як бы нанава аглядаючы мяне.

— Шэсцьдзесят.

— Чаму ж ты не вырасціў сабе вусоў?

— Не паспеў, Ромачка. Давай будзем разам расціць...

Рома не згадзіўся.

Не таму, што ў яго не раслі. Была болей важкая прычына:

— Я яшчэ не на пенсіі...

Цвярозая разважлівасць друга радасна асвятліла і маю перспектыву: сапраўды, колькі яшчэ наперадзе прыемнага занятку.

Аказалася, што і сівізна — не прычына для засмучэння.

Рома аўтарытэтна сказаў:

— Лепш сівы, чым лысабрысы.

І хоць я не зусім дакладна ўяўляю, што гэта такое, але шчаслівы, што «лысабрысасць» мяне абмінула.

Аўтарытэтная дасведчанасць майго друга ў падобных, прыемных для мяне адкрыццях не выклікала ў мяне сумненняў яшчэ і таму, што я ва ўсім паслухмяна згаджаўся з яго неабвержным доказам: «я ж лепш ведаю...»

— Дзядуля, а мы з табой равеснікі! — раптам выгукнуў Рома.

— Вядома,— згадзіўся я, яшчэ не спасцігнуўшы глыбокага сэнсу такой прыемнай нечаканасці.

— Я ж таксама нарадзіўся ў нядзелю! — удакладніў ён, і, такім чынам, усе далейшыя знакі пашаны мы пачалі прымаць разам.

Толькі ў адной урачыстай цырымоніі яго абмінулі ўвагай. Гэта калі прыйшлі мае старыя сябры і крадком дасталі з кішэні сотачку — той абавязковы сімвал, без якога не абыходзіцца ніводзін юбілей, нават у бальнічнай палаце. Тым больш што і цырымонія набыла чыста медыцынскае значэнне. Мензурка, з якое я кагадзе выпіў законную мікстуру, так дакладна адмерала кожнаму з

нас незаконную дзель, што літаральна памачылі вусы ўсе ўдзельнікі банкету.

Усе, акрамя майго дарагога равесніка. Затое разам з ім мы налеглі на закуску.

Юля прынесла кошык чарэшань — першых, паўднёвых. Я высыпаў ягады ў вазу з-пад графіна. Атрымалася поўная ваза з коптурам. Мы селі ўдвух і ў дружнай згодзе за паўгадзіны далі ёй рады.

Мы маглі пасядзець і яшчэ, але другу рупіў больны клопат: з вестыбюля пачуліся пазыўныя футбольнай тэлеперадачы...

А пакуль Рома глядзеў тэлевізар, я на самоце паддаўся (часова, вядома!) не зусім святочным настроям.

Як ні кажыце, юбілеі ў бальніцах не выклікаюць асаблівага ўздыму. Бездапаможны перад акалічнасцямі, я адчуваў сябе вінаватым перад усімі дарагімі мне людзьмі, з якімі хацелася пабыць разам і ўсім сказаць словы, для якіх так рэдка здараецца нагода. Яе чакаеш, бывае, цэлыя гады, а то і ўсё жыццё, ды ўсё не рашаешся: а раптам нехта не так цябе зразумее або, крый бог, западозрыць у благіх намыслах.

Не паддаюцца сумным настроям толькі заўсёды бадзёрыя і загартаваныя павіншавальнікі.

З асаблівай асалодай нясуць яны аксамітавыя, лідэрынавыя і дэрмацінавыя папкі, поўныя аптымізму, што здольны падняць віноўніка ўрачыстасці нават з бальнічнага ложка.

Ну хіба не можа расчуліць і ўзрушыць такі даверлівы, такі пяшчотны клопат: «Куды несці кветкі, якія закупіў мясцком?» Калі ты ўжо і не зможаш падняцца, тым болей абрадуешся:

— Давайце сюды, мае мілыя. Нясіце...

Але была і сапраўдная радасць: вестка пра ўзнагароду высокім ордэнам.

У майго друга Ромы гэта выклікала асаблівае захапленне:

— А салют будзе? — узрушана спытаўся ён.

— З якое прычыны, Ромачка?

— А твой жа дзень нараджэння!

Пасля пагадзіўшыся, што гэта не вельмі лёгкі клопат і турбацыя для нашых артылерыстаў, Рома спагадна згадзіўся:

— Ведаеш, дзядуля, лепш было б, каб пра твой дзень нараджэння ніхто не ведаў, а толькі мы ўдвух: стаміўся ты.

— Так, Ромачка. Давай паспім, набяромся новых сіл...

— А ў мяне старых яшчэ многа!..

Што праўда, то праўда. Сілы яго былі невычарпальныя. Вострыя, усмешлівыя вочы так і свідравалі мяне сваёй няўрымслівасцю. Вясёлая ўхмылка разводзіла рот да самых вушэй. Асабліва цешыўся ён, калі ўдавалася каго разыграць, напалохаць:

— Мама, я ўчора ледзь не памёр!

— Што ты, сынку? — устрывожылася маці, толькі што пераступіўшы парог.— Ад чаго?

— Ад смеху,— залівіста рагоча сын.

Характар маіх пачуццяў вымагаў спакою. Яго натура прагла кіпучай дзейнасці. Запас «старых сіл» бурліў нястомна і няспынна.

І я каторы раз упэўніўся, якія магутныя эмацыянальныя фактары акружаюць сучаснага чалавека з дня яго нараджэння.

І ўсе яны адкрытыя. Іх не трэба шукаць. Яны цябе самі знаходзяць скрозь і ўсюды.

Пазнанне жыцця ідзе пераважна ў адным вымярэнні. Уся ўвага скіравана на верхні пласт: што бачу, чую — тое і ёсць самае важнае. Не складанасць навакольнага свету, поўнага загадак і таямніц, а яго вонкавыя, найбольш магутныя праявы: шум, грукат і эфекты — у літаральным сэнсе ашаламляльныя, здольныя не толькі здзівіць, а і аглушыць.

Можа, таму ён ужо змалку глухі. Я ніколі не чуў, каб ён гаварыў паціху, павольна, ён заўсёды крычыць. І гэта ўжо яго спосаб абыходжання, спосаб, які сфарміравала ўсемагутная ўлада гукавай стыхіі.

Мой друг хаця і любіць спяваць, але слыху ў яго няма. Ён не адчувае мелодыі і яе нюансаў. У выпадку, калі песня не пяецца, ён пераходзіць на пафасную дэкламацыю.

— Паслухай, дзядуля, я з песні зрабіў верш:

Шел отряд по бережку,
Шел издалека,
Шел под красным знаменем
Командир полка...

Адспяваўшы такім спосабам адну, пераходзіць да другое:

Красноармейская тачанка —
Все четыре колеса...

— Пулеметная,— папраўляю я.

— Не, мы ў дзетсадзіку спявалі: красноармейская.

Не цяжка пераканацца, што той, хто вучыў яго ў дзетсадзіку, не вызначаўся дакладнасцю слыху.

Усё адно спрачацца марна. Я толькі ўдакладніў, што сам я ў дзетсадзіку спяваў: пулеметная...

Але і тут не прайшоў мой нумар.

— У вайну дзетсадзікаў не было,— сказаў Рома, і, як заўсёды, выйшаў пераможцам,— я ж лепш ведаю.

Госпадзі, ці ёсць, ці засталося што на свеце, чаго б не ведаў мой друг Рома?!

У яго выключны дар гукавай імітацыі. Ён дакладна перадае ўрачыстыя парады, дэманстрацыі, салюты і ўсё магутнае шматгалоссе вуліц, плошчаў і асабліва — стадыёнаў.

А з незвычайным захапленнем — сваю любімую стыхію: гульню ў футбол! Тут ужо разыгрываецца ўся яго фантазія і натхненне: «Гол! У-р-ра! Ма-лай-цы!» — якое багацце дыяпазону, якая разнастайнасць эмоцый гучыць у голасе майго друга!

V

Апрача футбола ў Ромы яшчэ і другое бясконцае і няўпыннае захапленне — вайна, яшчэ адзін пункт нашых разыходжанняў.

— Табе пашанцавала,— сказаў ён,— ты бачыў вайну.

— І табе хацелася б пабачыць?

— Яшчэ як! Бяжыш з аўтаматам і — тра-та-тах-тах! Ур-ра!

— А калі заб'юць?

— Ну і што? Дадуць ордэн. І я з ордэнам хадзіў бы.

Калі ёсць логіка жалезная, дык тут, напэўна, яшчэ цвярдзейшая — стальная.

Нярэдка на яго находзіла натхненне. І тады Рома складаў вершы, малюючы вайну такою, якая адпавядала яго ўяўленням:

Шла дивизия далеко,
Шла дивизия вперед,
Самолет летел высоко,
Наша рота шла в поход.

Вдруг отряд остановился,
И забил наш пулемет,
«Тигр» немецкий задымился —
Он от нас не удерет.

Он на месте закрутился,
Заревел, остановился.
Мы пришли, открыли люк,
Смотрим, а врагам — каюк!

И за эту нам победу
Всем вручили ордена.
Я домой с наградой еду,
Мной гордится вся страна.

Усе мае спробы і намаганні пераканаць, колькі гора, няшчасця і жахаў нясе вайна, разлятаюцца ў пух і прах ад неператожнасці болей магутных аргументаў: тр-тр-тра-та-тах, гу-гу-гу, ж-ж-ж, зь-з-зю, б-бух!

Майму другу хапіла і сямі год, каб пераканацца, што вайна — самая прывабная гульня, якая толькі ёсць на свеце. Такому перакананню нямала паспрыялі кіно і тэлевізар. Гэта яны навучылі Рому так дасканала пераўвасабляцца ў бамбардзіроўшчык, які ляціць і стогне ад цяжару свайго грузу, і ў бомбу, што, вываліўшыся з люка, усё хутчэй і хутчэй набліжаецца да зямлі, узмацняючы свой прарэзлівы, свідруючы свіст, і нарэшце — выбух!

Першы раз, пачуўшы гэты гукавы шабаш, я жахнуўся: божа мой, няўжо зноў Беласток, зноў тая яшчэ далёка не раніца, а самая палова ночы, калі, выхапіўшы з пасцелі малога сына, я бягу з ім, сам не ведаючы — куды. Ірвуцца бомбы, падаюць забітыя, рушацца дамы, і не паспявае асесці пыл, як пачынаецца новы гул. «Гу-гу-гу»,— паўтарае сын і паказвае ў неба — самалёт! Для яго гэта — усё яшчэ добрая, мірная птушка, а для мяне — самы жахлівы драпежнік.

Тыя, хто перажыў выпрабаванні, калі ўсе твае нервы, усе найтанчэйшыя твае душэўныя струны напіналіся да вышыні, за якою канчалася паветра і не было чым дыхаць, памятаюць, што і пасля вайны яшчэ доўга не маглі прывыкнуць, што самалёт можа стаць зноў нястрашным.

Баявая біяграфія майго друга пачынаецца з першых год свядомага жыцця.

Калі мы толькі пазнаёміліся і, як заўсёды бывае, па-

чалі высвятляць — дзе хто жыве, аказалася, што амаль суседзі.

— Хіба ты не помніш, як я аднаго разу бег цераз ваш двор з зялёным рэвальверам і страляў: трах-трах, бах-бах? Ты ж, здаецца, стаяў у пад'ездзе?

— Каго ты страляў, адкуль у цябе рэвальвер?

— А-а,— голасам чалавека ўжо даўно пасталелага сказаў Рома і махнуў рукой.

Дзіва што. З таго часу адбыліся куды большыя выпрабаванні.

— З мяне столькі крыві выйшла,— сказаў ён. І ўжо ад аднаго таго, як прагучала гэтае прызнанне, цяжка было ўстрымацца ад цікаўнасці:

— Калі, Ромачка?

— А як аперацыю рабілі, з горла мікробы выцягвалі...

Так што і ён хлебтануў гора.

Але спачуваў я яму ў другім — у тым, што сам ён не навучыўся бачыць і разумець, як цяжка і балюча можа быць і іншым людзям.

Бывалі часіны, калі боль у суставах набіраў такое сілы, што пачынала здаваць сэрца. Я сціскаў зубы. А мой сусед якраз жа ўваходзіў у такое ваяўнічае натхненне, што на баявыя плацдармы кідалася ўся грозная тэхніка: танкі, гарматы, кулямёты, самалёты і ўвесь арсенал зброі, якую так шчодра пастаўлялі сыну клапатлівыя бацькі.

І вось адначасна разгортваліся самыя бліскучыя аперацыі — і прарыў, і акружэнне, і бязлітаснае вынішчэнне праціўніка!..

— Ромачка, чаму ты такі неспагадлівы? Мабыць, каб чалавек памёр, ты і не заўважыў бы...

— Калі б памёр, заўважыў бы,— заспакоіў мяне мой добры сусед.

Але аднойчы мае нервы не вытрывалі:

— Каб яна згарэла, твая вайна!

Для Ромы такі выбух быў неспадзяваны. Зняважа вайны закранула яго найлепшыя пачуцці.

Не паспеў я дакончыць ненавіснае слова — вайна, як раптам у адказ, нібы магутнае водгулле, пачулася:

— На!

Гэта быў выгук майго суседа, выгук, поўны апошняга адчаю:

— Н-на!

Выхапіўшы руку з доўгага рукава піжамы і склаўшы пальцы ў адпаведную камбінацыю, ён паказаў мне, вы ўжо самі здагадаліся, што.

Гэта была ўрачыстасць перамогі, напэўна, найбольшай, чым усе здабытыя толькі што на полі бою.

Такога трыумфу я яшчэ не бачыў.

Але заадно прызнаюся, што ніколі я яшчэ не цярпеў і такога паражэння, такога поўнага краху сваёй педагагічнай стратэгіі.

## VI

Нічога дзіўнага, надыходзіць патрэба адпачыць і ад сяброў.

Парушаючы строгую забарону выходзіць на двор, я, захутаўшыся ў суконны бальнічны халат, крадком спусціўся па службовай лесвіцы ўніз і, балазе клаўся ўжо густы прыцемак, выйшаў і аблюбаваў сабе лаўку пры ўезных варотах.

Прыемна ўздыхнуць вольна і пасядзець у зацішку бэзавых прысадаў.

Душэўнае ўзрушэнне пачало спадаць. І першае, што я рашыў,— заўтра ж дамагчыся, каб мяне адпусцілі дадому, не падазраючы, што праз якую хвіліну мог паплаціцца за сваю легкадумнасць.

За варотамі спынілася машына і пачуліся патрабавальныя гудкі.

Не паварухнуўшыся, я сядзеў на сваёй лаўцы.

Патрабавальныя і. ўжо болей не цярплівыя сігналы паўтарыліся зноў.

Нарэшце дзверцы машыны адчыніліся і пачуўся, я не сказаў бы — мілы голас, хоць гэта быў голас жанчыны:

— Гэта што за новыя парадкі? Хто павінен адчыняць вароты?

Толькі цяпер я зразумеў, што павінен адчыняць я.

— Ты — сторож?

— Я,— прызнаўся я, бяздумна рызыкуючы такой адказнасцю, і адразу ж усхапіўся з лаўкі.

— Чаму не адчыняеш?

— У мяне няма ключа...

— А дзе ж ён?

— На тым пасце,— падладжваючыся ў тон, махнуў я рукавом халата, паказваючы на вароты з другое вуліцы.

Рэзка адкінуўшы дзверцы жалезнай брамкі, жанчына рванулася туды, але неўзабаве ўжо бегла назад:

— Чорт ведае, што робіцца!.. Сабраліся на адным пасце, сядзяць, языкамі мянцяць, а сустрэць машыну некаму!

Па тым як быў зроблены націск на слове «машыну», не цяжка было зразумець, што мелася на ўвазе не так машына, як той, хто ў ёй ездзіць.

— Стораж! — пачуўся грозны вокліч.

Я не абазваўся.

— Заўтра ж выганю ў тры шыі!

Гэта была не вельмі прыемная перспектыва ні для мяне, ні для маіх трох шыяў.

Я сцішыўся за густым бэзнікам, каб не трапіць у такую блізкую бяду.

Старшая над начнымі вартаўнікамі, начальніца правярала іх пільнасць, і крый мяне доля яшчэ хоць раз сустрэцца з яе строгасцю.

Крадучыся паўз сцяну свайго корпуса, я вярнуўся ў пусты вестыбюль. У палату не хацелася. Трэба пабыць яшчэ на адзіноце. Я ведаў, што на самым версе ёсць вельмі прытачнае месца, адкрытае з усіх бакоў, толькі зверху — казырок застрэшка. Цікава з вышыні паглядзець на вячэрні горад.

Кабіна ліфта была адчынена. У ёй сядзела дзяўчынка і пры яркім святле чытала кнігу.

— Добры вечар!

Дзяўчынка не паварухнулася.

— Ці не падкінеце вы мяне ў салярый? — як мага ветлівей пацікавіўся я.

Не падняўшы галавы, юная ліфцёрша перапытала:

— Куды?

— У салярый.

— А што гэта такое?

— Як — што? Пляцоўка, дзе загараюць.

— Туды няможна,— рэзка і коратка вымавіла яна, так і не павярнуўшыся тварам.

— Чаму? — здзівіўся я.

— Няможна, і ўсё. Я ж лепш ведаю!..

Бацюхны, мілыя! Ці не сястра майго Ромы? Але ж не,

ён — адзіны ў бацькоў. Адкуль жа такая душэўная роднасць? Няўжо нават самая маленькая пасада, калі толькі ад яе залежыць нечая патрэба, дае абавязковае права перавагі?

— Ну, што вам яшчэ няясна? — спыталася яна.

— Дзіцятка маё, адно няясна — адкуль ты пераняло мудрасць, што лепш забараняць нават тое, чаго сама не ведаеш?..

На сёмы паверх я дабіраўся саматугам. Але любавацца вячэрнім горадам асаблівай радасці ўжо не было.

Спусціўшыся на два паверхі ніжэй, я пайшоў у сваю палату, што пасля стольніх незвычайных прыгод здалася мне родным домам.

Рома сустрэў мяне радасна:

— Дзе ты быў так доўга?

Вясёлае аблічча майго друга высвечвала дапытлівасцю.

Усё было, як і раней. Нібы нічога між намі не адбылося. Нібы непрыемная, прыкрая тайна, якая лягла паміж намі, нават не засмуціла майго друга.

Няўжо ж і яна, успышка такой гнеўнай маланкі, што працяла навылёт адразу дзве душы, не пакіне ніякага следу?

Цяжка прасіць прабачэння вінаватаму, а калі не вінаваты...

На маім століку ляжаў тэрмометр. Значыць, сястра ўжо абышла ўсіх, застаўся толькі адзін даўжнік, хто затрымлівае апошнюю тэмпературную зводку.

Узяўшы тэрмометр пад паху, я па яго незвычайнай халоднасці адчуў, што ўсе непрыемнасці яшчэ не скончыліся: тэмпература мая набірала ўсё большую вышыню.

— Колькі? — пацікавіўся Рома.

— 36 і 5,— сказаў я, каб не засмучаць друга.

— І ў мяне ж столькі. Значыць, мы — равеснікі!

— Равеснікі, Ромачка...

Сапраўды, многае зблізкала нас: і тое, што абодва нарадзіліся ў нядзелю, і тое, што тэмпература ў нас адна, і тое, што абодва любім дзяцінства...

Толькі здаецца мне, што нехта з нас перабраў меру і здзяцінеў залішне, забыўшыся, што яшчэ паўвека назад выйшаў з гэтага шчаслівага ўзросту...

## VII

Я не мог вінаваціць майго друга ні ў чым. Наадварот, я заступаўся за яго, бараніў ад праціўнікаў, што не хавалі сваёй варожасці і адкрыта ішлі ў наступленне.

Даўнія нелады і непаразуменні былі ў яго з Аўгінняй Іванаўнай, санітаркай, што прыязджала, як казаў Рома, са свайго Маладзечнага горада і на цэлыя суткі засмучала яго ўзнёслы настрой.

— На, спаласніся,— пачынала яна дзяжурства, прыносячы таз з вадой.

Рома мыўся размашыста. Пыркі ляцелі на пасцель, на сцены. Ад ложка да парога расцякалася лужына.

— Цюхцяй, брында! Зноў увесь абхлюпаўся! — лаялася Аўгіння Іванаўна, выціраючы анучай падлогу.— Ён жа знарок, дальбог, знарок!

— Ну, што вы, Аўгіння Іванаўна,— стараўся я згладзіць вінаватасць Ромы.

— Заступайцеся, заступайцеся — ён толькі таго і чакае. Бачыце, як хмыліць губы. Чаго ты хмылішся, чыкілдун няшчасны? Ты хоць падумаў, што з цябе будзе?

— Чалавек...— не зусім упэўнена падаў голас Рома.

— Які чалавек? Злыдзень!

— Я ж лепш ведаю...

— Чуеце? Ён ведае!

— Ыгы,— імкнуўся ўтрымацца мой друг.

— Што ты ведаеш? Ну што: з носа кап, ды ў рот — хап?

Трэба сказаць, што такога рашучага наступу не вытрымлівала і яго ўпэўненасць.

Бывалі моманты, калі Аўгіння Іванаўна не магла стрымаць гневу:

— Вось, здаецца, хапіла б і паадкручвала табе вушы!

— А дзе б я ўзяў другія? — заклапочана пытаўся Рома.

— Хоць бы хутчэй цябе адгэтуль выпхнулі, я паўлітру купіла б і выпіла б з радасці.

Рома плаціў ёй такім жа спосабам абыходжання. Ніякія павучанні пра павагу да старэйшых яго не пераконвалі. Ніколі ён так і не сказаў ёй добрага слова, нават за паслугі, якіх вымушаны быў прасіць.

У Аўгінні Іванаўны быў невычэрпны запас навін і гісторый, якія сцвярджалі непахіснасць яе выхаваўчых пе-

ракананняў. І як толькі выдаралася часіна, асабліва вечарамі, самыя павучальныя яна лічыла сваім абавязкам расказваць нам. І заўсёды знаходзіла доказы свайму вываду: з неслухаў выходзяць адны злачынцы.

— Якое яно змалку, такім і вырасце...

Рома не цярпеў ні навін, ні самых вострасюжэтных гісторый цёткі Аўгінні.

Мусіў цярпець іх я, каб не страціць сувязі з непасрэдным жыццём і мець пра яго ўяўленне хоць бы па ўражаннях жывых сведак.

— От точна такім быў,— сцішыўшы голас да пошапку, даверліва пачынала Аўгіння Іванаўна, паказваючы паваротам галавы на майго суседа, захопленага чарговым танкавым прарывам: др-р, бах, бух, у-р-ра!

— Точна. А цяпер восем год турмы. Прыйшлі, наручнікі — раз, і павялі галубчыка.

— За што?

— Абакраў сельпо.

Аўгіння Іванаўна любіць расказваць біяграфіі «галубчыкаў». Яна ведае іх жыццёпісы ва ўсіх падрабязнасцях.

Сёння перада мной паўстае жыццёпіс таго, што абакраў сельпо:

— Пяць разоў паспеў жаніцца і ўсіх пакідаць. Потым адбіў у Мінску ў мужа жонку з дваімі дзецьмі. Муж прасіў, маліў: «Што ты сабе думаеш? Ён жа ўсё адно цябе кіне». Так яно і выйшла — кінуў. Потым зноў папаўся, два гады адседзеў. Цяпер электрыкам на цагельні, зноў жаніўся...

— Адкуль вы, Аўгіння Іванаўна, усё гэта ведаеце?

— А мой ты братка, а мой ты залаценькі! Хіба ж я завочніца якая і за вочы дарэмшчыну вярну на людзей? Я ж яго з самага малку ведаю...

Мяне трывожыла адно: Аўгіння Іванаўна, маючы сваіх дзяцей, ніколі, ніводным словам не абмовілася пра іх. Нечым вельмі крыўдным былі зняверааны яе матчыны пачуцці.

Аднаго разу яна з нечаканай спагадай папікнула Рому:

— Ніхто цябе не любіць.

— Як гэта? — сумеўся Рома.

— А от глядзі, усім букеты прыносяць, а табе і кветачкі ніхто не прынёс.

— Кветкі дарагія: два, а можа, пяць рублёў.

— Для скупых усё дарага.

— А вы не скупая?

Цераз дзень, заступіўшы на дзяжурства, нянечка ўнесла ў палату букет ружовых цюльпанаў і ў літровым слоіку з-пад кампоту паставіла кветкі на столік свайго неслуха.

— Дзякуй,— разгубіўшыся, вінавата вымавіў Рома. І гэта было першае слова ўдзячнасці, што ён сказаў старой жанчыне, якой даставалася столькі клопату і турбот з усімі намі.

## VIII

Улюбёнкай нашай была Галіна Мікалаеўна. Яе дзяжурстваў Рома заўсёды чакаў з нецярпеннем.

Раніцай ён прачынаўся ў самым радасным настроі, на поўную магутнасць фальцэту выкрыкваючы яшчэ адну сваю любімую песню:

Если б я был Салтан
И имел трех жен...

— Ой, Ромачка, нашто табе столькі? — уваходзячы ў палату, весела пытаецца Галіна Мікалаеўна.

Рот майго друга разыходзіцца да вушэй:

— Цёця Галя, хіба гэта многа?

Я, вядома, не бяруся ўдакладняць, што ён пераблытаў аднаго цара з іншым царом, які меў толькі адну жонку, ды і тую ткачыха з паварыхай і сваццяй бабай Бабарыхай пасадзілі з сынам у бочку і пусцілі ў акіян.

Галіна Мікалаеўна далікатна ўсміхаецца.

Маючы ўжо сваіх унукаў, яна выпрацавала ў сабе той шчаслівы імунітэт стрыманасці, без якога немагчымая дабрата людской душы.

Лагоднасць не пакідае яе, калі нянечка корміць майго друга, настойліва дамагаючыся, каб ён «усё чысценька з'еў».

Залітую кашулю, разбітую шклянку з кісялём, што здаралася нярэдка, яна мяняла як бы незаўважна, не абражаючы ні крыўдным словам, ні грозьбаю.

Чым яшчэ завабіла, заваражыла і зачаравала нас мілая наша цёця Галя, дык гэта, можа, вы і не паверы-

це,— казкамі. Гэта — цудоўная казачніца. Яна, вядома, сама не складае іх, але як яна ўмее расказваць!

А я ж люблю казкі. І ўсе крыўды гатоў быў даравацъ свайму другу ўжо за тое, што і ён не мог жыць без казак.

Памяць Галіны Мікалаеўны берагла вялікія скарбы, аднак калі, здаралася, і яны былі на сыходзе, тады наша нянечка мусіла перад дзяжурствам яшчэ забегчы і ў бібліятэку, каб папоўніць запас.

Тыя выпадкі, калі яна не ўпраўлялася, цяжка засмучалі нас.

— Не магла забегчы...— вінавата апраўдвалася яна, і мой друг упадаў душою, а я надзеі не траціў.

Казка, вядома ж, знаходзілася. І гэта былі самыя прыемныя хвіліны перад сном. Праўда, былі і не толькі прыемныя, здараліся і страшныя. Але мы ніколі не трацілі мужнасці. Мы нават з радасцю выпрабоўвалі сябе спакусай страху. Чым страшней, тым цікавей.

— Дзядуля, я выключу святло...

— Давай схаваемся пад коўдры,— дадаваў я на выпадак, калі чакалася нешта такое, што магло выйсці за межы нашай храбрасці.

## *IX*

Пасля аднае ціхае гадзіны ў нашу палату ўнеслі трэці ложак. Галіна Мікалаеўна тут жа заслала яго свежай пасцеллю, у галавах паставіла тумбачку, графін з вадою і шклянку.

— Чакайце трэцяга,— сказала яна.

Не паспела разыграцца наша цікаўнасць, хто будзе новым суседам, як паявіўся ён сам, выклікаўшы асаблівую дапытлівасць Ромы:

— Дзядзя, вы — Марэсьеў?

— А ты бачыў Марэсьева?

— Бачыў, у кіно.

— Я і ёсць Марэсьеў.

Збіраючыся легчы, хворы зняў з нагі пратэз.

— А дзе другі?

— Другога няма.

— Значыць, вы не Марэсьеў.

І Рома пераключыў увагу на пратэз і яго механізм. Пакуль усё было не даследавана, ён не супакоіўся.

— А ў цябе, дружок, што з нагой?

— А-ат,— сказаў Рома, як бы пра штосьці не вартае ўвагі,— зламаў.

— Ну, гэта яшчэ паўбяды.

— А ў вас?

— Прафілактыка,— у тон яму адказаў наш новы сусед.

Савелій Карнеевіч аказаўся даўнім знаёмым усіх нашых дактароў, сясцёр і санітарак.

Прафілактыка, як ён назваў прычыну, што прымусіла легчы ў бальніцу, відаць, была яго частым клопатам.

Галіна Мікалаеўна з нейкім асаблівым душэўным досціпам памагала яму, папраўляла пасцель, узбівала падушку. А паглядзеўшы на Рому, паціху вымавіла:

— Божа, божа...

— Богу няможна верыць,— сказаў Рома.

— Чаму, Ромачка?

— Таму што ён хлусіць.

— А ты хіба ніколі-ніколі не хлусіш?

— Дык я ж не бог.

Савелій Карнеевіч весела засмяяўся. І ўсім нам стала весялей.

Гэтага дня ў нашай палаце адбылася і яшчэ адна падзея, якое Рома даўно чакаў. З яго нагі знялі гіпс, і Галіна Мікалаеўна прынесла свайму пестуну новенькія кастылі.

Невыказна радуючыся, што, нарэшце, будзе хадзіць, і, разглядаючы кастылі, ён адразу ж ацаніў і перспектыўныя магчымасці футбола:

— От бы ў варотах з імі стаяць — ніводнага б мяча не прапусціў.

## X

Ці то ад уражанняў стольках падзей, ці ад новага знаёмства, ноччу я не мог заснуць.

Паміж дзвюх штораў у акно высвечвала поўня. Яна ўсё болей набірала вышыні, і сцяна, на якую падала святло, станавілася тым зманлівым, таямнічым экранам, на якім маглі ўзнікнуць і разгарнуцца самыя неспадзяваныя падзеі.

Не спаў і Савелій Карнеевіч.

У такія хвіліны наплываюць успаміны.

На экран яго памяці ўсплыла вайна.

Ён усё ж лічыў, што лёс абышоўся з ім літасціва.

Часта, будучы на валаску ад смерці і ў думках ужо развітваючыся з жыццём, дваццацігадовы юнак, малодшы лейтэнант, усё ж аставаўся жыць.

Трапіўшы на Доне ў акружэнне, групоўка байцоў, што асталася ў глыбокім яры, ужо не мела ратунку.

Ён забыўся пра свае камандзірскія адзнакі, і немцы яго першага — а, афіцэр! — павялі ў штабную хату.

— Як яны пацяшаліся нада мной, як яны таптаді маю годнасць камандзіра, каб паказаць сваю самазадаволеную перавагу!

— Кім камандаваў?

— Ротай,— знарок перабольшваючы, сказаў я, ужо не спадзеючыся ні на літасць лёсу, ні тым больш — ворагаў.

— Колькі ў цябе было салдатаў?

— Шэсцьсот,— далей хлусіў я, бачачы, што гэта ўжо ніякі не допыт, а забава.

Перакінуўшыся паміж сабою словамі, афіцэры зарагаталі і сказалі нешта малодшаму сярод іх.

Я зразумеў толькі адно, што цяпер маё жыццё ўжо ў яго ўладзе.

Малады немец загадаў ісці. Я павярнуўся і выйшаў з хаты на вясковую спусцелую вуліцу.

Я ішоў, адчуваючы, што ў любую хвіліну можа прагучаць той адзіны стрэл, ад якога залежыць маё жыццё.

І ў той жа час недзе ў падсвядомасці мільганула думка, што тут, пасярод вуліцы, ён мяне не застрэліць, а, напэўна, выведзе за вёску.

Але ніць маёй кароткай надзеі абарвалася нечаканым загадам.

Што гэта быў загад, я зразумеў не з сэнсу, а з тону, па інтанацыі.

Я спыніўся. Мой канваір пісталетам паказаў мне — павярнуць у двор пустой хаты, сенцы якой былі расчынены насцеж. І паміж двух вушакоў, паміж двух шулаў я ўбачыў прадонне той невядомасці, што чакала мяне.

Гэта ўжо было на самым захадзе сонца. Двор быў асветлены прамянямі, якія клаліся на зямлю, ледзь дастаючы ніжняга бервяна сенечнай сцяны.

У раме дзвярэй гусцеў змрок. Сюды якраз і гнаў мяне немец.

Што ён задумаў?

Хата была пустая, з выбітымі вокнамі. Ні месцам нобага допыту, ні турмой для мяне яна не магла быць.

Яна магла быць толькі маім апошнім прытулкам.

Гэта я адразу скеміў, узышоўшы на ганак і як толькі немец загадаў спыніцца ў парозе.

Павярнуўшыся, я ўбачыў, як ён нацэліўся мне ў галаву...

— А-ай! — ні то выгукнуў, ні то застагнаў Рома. І Савелій Карнеевіч змоўк.

Ён працягнуў руку да пасцелі хлопчыка і паправіў прасціну, што зусім была спаўзла дадолу.

— Спіць,— пошапкам сказаў ён.

«Напэўна, сніць сваю новую бітву,— падумаў я,— ці ўчарашнюю страшную казку цёці Галі... Добра, што не чуе гэтай...»

— Уся мая постаць была перад ім,— ужо нейкім іншым, пацішэлым і даўкім, голасам пачаў расказваць Савелій Карнеевіч далей.— Я стаяў у раме дзвярэй, і на маіх брудных кірзавых ботах ляжала сонца, маё апошняе сонца.

У тую ж хвіліну пачуўся стрэл.

Падаўшыся назад, я з усяго маху кульнуўся па той бок парога, але адчуў, што ўпаў не на дол, а ў затхлую яму паміж трухлявых дошчак.

Сенечная падлога была ўзарвана, разварочана, і я апынуўся ў гнілой пацярусе і пілавінні, якія забівалі мне дых. Што я жывы — мне было зразумела, калі, ужо лежачы па другі бок парога, я пачуў яшчэ два стрэлы, безумоўна, таксама прызначаныя мне. Але чаму фашыст страляў, бачачы, што я ўпаў?

Лежачы ў яме, позняй ноччу, у суцэльнай цемры і цішыні, я перабраў, перадумаў усё да драбніц: ясна, што прыкончыць мяне як нудную работу старэйшыя даручылі малодшаму. Але і ён, бачачы, што даручэнне гэтае не вартае асаблівай увагі, тым больш — без сведак, рашыў вызваліцца ад мяне чым хутчэй, паленаваўшыся весці далей. Убачыўшы, што яго ахвяра ўпала пасля першага стрэлу, астатнія ён выпусціў механічна, наўздагон. Але ж зацяты фашыст мог падысці і для большай пэўнасці дастрэліць у патыліцу. А можа, яму і не рупіла тая пэўнасць? А можа, у ім заставаліся яшчэ нейкія рэшткі чалавечнасці, і ён, убачыўшы мяне зблізку, такога ж маладога, свайго ра-

весніка, нават пашкадаваў мяне? Пашкадаваў мяне, і рука яго скалапулася? Цэліў ён мне ў галаву, а папаў у нагу, вышэй калена.

Заціскаючы рану аберуч, я адчуваў, як падплываю крывёй. Ад болю, ад зняменння я ўжо не мог падняць галавы, а трывожныя думкі абганялі адна адну: калі немцы прыйдуць сюды раніцай, калі толькі я дажыву да яе — як мне трымаць сябе? Не выдаць ніводным рухам, што я жывы, ці лепей няхай даб'юць?

Не ведаю, колькі мінула часу, была ўжо глыбокая ноч, як я пачуў галасы, што набліжаліся да сянец. Гэта былі жанчыны. Яны гаварылі між сабой паціху, але я разабраў словы:

— Божачка, а калі гэтак і нашых, праклятыя ірады... І за што яго, небараку, такога маладога?.. Як ён, бедны, хацеў рукой засланіцца...

— Не заслонішся, не загародзішся...— пачуўся другі, болей разважлівы голас.— Не заслонішся. Цяпер ляжыць мёртвы.

— Жывы... жывы! — прастагнаў я з усяе сілы, якая ў мяне была. І голас мой здаўся мне слабым мармытаннем. Але жанчыны пачулі.

— А божухна,— жывы!

Яны нахіліліся нада мною, вобмацкам шукаючы галаву.

— Пацярпі, паляжы, сынок...— сказала, відаць, старэйшая.— Мы прыйдзем па цябе...

«Прыйдуць? Калі? А што, калі немцы раней дазнаюцца, што я жывы?» — зноў рой ліхаманкавых думак загуў у маёй галаве, якая развальвалася ад нясцерпнага болю...

Але неўзабаве яны такі прыйшлі — маці і маладзіца, дачка. Гэта ўжо было пад самае світанне. Заваёўнікі спалі, і такая была ціша, што толькі і чуваць было, як гудзе ў вушах.

Жанкі прынеслі мяне ў хату. Загадалі скінуць тое ашмоцце, што заставалася на мне. Памылі, перавязалі чыстым паркалём нагу, а зверху ўкруцілі ручніком. Маладзіца прынесла штаны і кашулю свайго мужа, што быў у арміі. Пераадзетага мяне паклалі ў ложак.

Толькі я знябыўся, як у хаце пачуліся перапалох і мітусня: немцы!

Яны ішлі сюды. Але, як высветлілася на тым часе,— не па мяне.

— Матка, яйкі, куркі...

Гаспадыні забегалі, заклапаціліся — чым бы хутчэй заткнуць горла праклятым, каб адвесці ад галавы большую бяду.

Як на тое ліха, немцы адразу ж заўважылі мяне:

— Хто ест?

— Брат, брат...— пачала тлумачыць старая болей на мігі, чым словамі,— хворы, тыфус...

— А-а! — ускрыкнулі немцы і кінуліся з хаты.

Тае ж раніцы нашы адбілі вёску. Мяне забралі ў шпіталь і адразу ж — на аперацыйны стол: пачыналася гангрэна...

Савелій Карнеевіч змоўк. Але як ні намагаліся мы, заснуць так і не змаглі да раніцы.

Непрыкметна, паціху прачнуўся Рома, нават без сваёй жыццярадаснай песні: «Если б я был Салтан и имел трех жен, я б их бил, и любил, и на свидания водил...»

— А наш Рома нейкі сон сёння сніў...— сказаў Савелій Карнеевіч, і мы незаўважна пераглянуліся.

Рома паглядзеў на аднаго і другога і сказаў:

— Сніў. Страшны.

— Што ж ты сніў, Ромачка?

— Чорта.

— Цікава,— сказаў Савелій Карнеевіч,— які ж ён, чорт?

— У вадалазным касцюме, толькі без трубак.

Мы весела зарагаталі.

Аказваецца, і чорт паспеў знайсці сабе новы занятак. Толькі і выдала яго, што, надзеўшы маску вадалаза, забыўся пра трубкі і кіслародны шланг. На гэтым і папаўся!

## *XI*

Мабыць, ад таго, што змянілася надвор'е і па нашым акне пачаў хвастаць вецер з дажджом, перамяніўся і настрой у палаце.

Дзень цягнуўся марудна, але і вечар не абяцаў нічога цікавага. На дзяжурства заступіла новая, незнаёмая санітарка. На казкі Рома не спадзяваўся.

І ўсё ж пасля адбою, калі мы ляжалі ў сваіх пасцелях, ён не ўцярпеў:

— Дзядзя,— папрасіў ён Савелія Карнеевіча,— раскажыце пра вайну. Толькі не страшнае.

— А на вайне нічога страшнага няма,— сказаў Савелій Карнеевіч.— Хочаце, я раскажу вам нават вясёлую гісторыю, якая...— ён павярнууся да мяне і дадаў: — якая была раней за гэтую...— і пастукаў пальцам па пратэзе, што стаяў за тумбачкай.

Савелій Карнеевіч, сапраўды, расказаў эпізод, поўны нязвычных акалічнасцей.

Стоячы ў абароне на тым жа Доне блізка — пазіцыя ў пазіцыю,— нашы і немцы гэтак дасканала вывучылі адны адных, што, павёўшы насамі, ведалі, які ў каго гатуецца абед.

— Іван, ідзі ў госці! — пачулася аднаго разу з таго боку. І ўслед — вясёлы, самазадаволены рогат.

Гэта быў выклік, свядомае пацвельванне: ну, хто адважыцца?

Адважныя знайшліся.

І ніхто не здзівіўся, што гэта быў Іван — наш старшына...

Неўзабаве кончыўся ў нас запас бульбы. Пачалі вышукваць бліжэйшыя рэзервы. Мы знайшлі іх, сапраўды, блізка. На самай прыстрэленай зоне, на відавоку вытыркаў узгорачак, які да пары да часу не займеў нашай увагі. Гэта быў ладны капец. І мы адкрылі гэты скарб — свежая, адборная, сопкая, развярыстая бульба!

Наш вопытны разведчык, старшына, які ўжо ведаў дарогу, пайшоў першы. Узяўшы добры мех, ноччу ён папоўз да капца. І з іх, і з нашага боку ўся зона, вядома ж, была абсаджана мінамі. На зямлі, што называецца, не аставалася жывой лапінкі. І трэба было быць не толькі ўпэўненым, што запомніў дарогу, трэба было быць яшчэ сапраўдным рызыкантам, каб рашыцца паўзці па гэтай зямлі.

Старшына папоўз. Ён вярнуўся жывы і цэлы, прываломшы поўны мех бульбы.

Раніцай, збітыя з панталыку, адкуль узяўся на нашай кухні такі прыемны бульбяны пах, немцы доўга вадзілі насамі, ніяк не могучы ўцяміць, дзе мы разжыліся на такі ласунак?

Так мы выбралі паўкапца, поўзаючы туды штоночы.

Мы выбралі б і ўвесь капец, каб немцы, западозрыўшы нешта супраць сябе, не пачалі высочваць нас.

Аднае ночы наш старшына не вярнуўся — яго схапілі. Цяпер ён ужо быў палонным, «языком», які так спатрэбіўся немцам, каб дазнацца, што задумвае праціўнік.

А планы, сапраўды, задумваліся вялікія. Фронт рыхтаваўся да наступлення.

— У-у! — злосна сказаў Рома.— Я іх тады ж бы ўсіх пастраляў...— і павярнуўся да сцяны.

## XII

Рома, аказваецца, не спаў тае ночы, калі Савелій Карнеевіч расказваў жудасную казку сваёй маладосці.

Ён прагаварыўся, калі мяне не было ў палаце.

Савелій Карнеевіч разгубіўся ад такой неспадзяванкі і доўга не мог супакоіцца, адчуваючы сябе вінаватым.

— Як нядобра атрымалася,— гаварыў ён мне на калідоры,— гэтае апавяданне не для дзяцей. Дзіця, мабыць, цэлую ноч не спала...

— Супакойцеся, Савелій Карнеевіч, можа, якраз і добра, калі, адкрываючы невядомыя ісціны, не спяць нашы дзеці.

Але яго ўстрывожаны настрой доўга не знаходзіў раўнавагі.

Прыйшоўшы апошнім у палату, ён першы пачаў збірацца дадому.

Інжынер-будаўнік, ён спяшаўся будаваць новыя дамы, школы, дзіцячыя сады і яслі.

— І стадыёны,— напомніў Рома.

— І стадыёны,— весела згадзіўся Савелій Карнеевіч і дадаў: — Папраўляйся, футбаліст, а то некаму будзе ў варотах стаяць.

Назаўтра выпісваўся і я. Зайшоўшы развітацца, я не застаў свайго друга ў палаце — яго павялі на кансультацыю да прафесара.

Спусціўшыся на бальнічны двор, я раптам пачуў знаёмы і ўжо дарагі мне голас:

— Дзядуля!

Я падняў галаву. З акна нашай палаты на пятым паверсе выглядаў Рома.

Яшчэ ніжэй схіліўшыся на падаконнік, ён сказаў:

— Даруй, дзядуля!

Ён сказаў паціху, але я пачуў.

Так знікла тайна, якую ведалі толькі мы ўдвух.

— Што сказаў прафесар? — пракрычаў я, задзіраючы галаву.

— Скора буду хадзіць!

Я ўздыхнуў з палёгкай і адчуў, як радасна стала на душы.

— Бывай здароў, Ромачка!

*1975*

# *Хто памагае Сонцу*

Сучасная чарадзейная казка

## *I*

Самі па сабе знаеце, як соладка спіцца на дасвецці.

Даўно заружавела палоска ўсходу. Вялізнае чырвонае кола выкацілася на край небасхілу. А вы ніяк не можаце прачнуцца, хоць і ведаеце, што нараджэнне раніцы — самая дзівосная хвіліна не толькі дня, а можа, і ўсяго жыцця.

Колькі ўсходаў мы праспалі?

Многа.

Давайце дамовімся: пачынаючы з заўтрашняга, не праспім ніводнага.

Кожны світанак ніколі не падобны на іншы. Той, хто бачыў іх найболей,— самы шчаслівы на свеце.

А ёсць жа і такія, што ні разу не бачылі, як узыходзіць Сонца.

Думаюць, яму вельмі лёгка: паднялося і пайшло.

Э, не, мае мілыя, чым больш нас устае разам з Сонцам, тым лягчэй падымацца яму. Бывае, яно так напрацуецца за доўгі дзень, што раніцай не можа расплюшчыць вачэй.

Сонцу трэба памагаць.

Пра гэта і пойдзе казка.

## *II*

Не ў адным далёкім царстве, а ў піянерскім лагеры «Зубраня» ранкім летнім досвіткам спалі дзеці.

А ў лясной казачнай альтанцы на седале спалі два пеўні — Стары і Малады.

І хто ведае, колькі б яшчэ храплі яны — гэтыя пільныя вартавыя часу,— каб не прахапіўся Малады:

— Ку-ка-рэ-ку!

Старому здалося, што Малады без пары высунуўся са сваім пісклявым галаском, і ён сярдзіта сказаў:

— Не будзі, яшчэ рана. Я ўчора сам наставіў стрэлкі па Сонцы...

Але, прыгледзеўшыся да гадзінніка на сцяне, Стары певень нечакана сумеўся: ходзікі не ішлі. Ходзікі сталі.

— Бацюхны мае! — спалохана ўскрыкнуў певень і схапіўся за галаву.

З дупла замшэлай асіны высунулася Зязюля:

— Ку-ку...— і, папярхнуўшыся, вінавата спыталася: — Каторая гадзіна?

Але ёй ніхто не адказаў. У лесе панавала цішыня.

Ускрай лесу на старым дубе ў гняздзе прачнуўся Бусел. Шырока ўзмахнуўшы крыламі, ён стаў пільна ўглядацца ўдалячынь. І што ж ён убачыў? Стомленае, знямоцанае Сонца не магло падняцца: яно то падымала, то, бездапаможна міргнуўшы вокам, зноў апускала павекі.

Бусел хапіў свой будзільнік, прыклаў да вуха — ніякай адзнакі жыцця. Страсянуў раз, другі. Але замест званка пачуліся трывожныя сігналы, вельмі падобныя на бусліны клёкат.

Ускочыў з пасцелі ў сваім цераме Зай: няўжо праспаў? Першы раз на вяку падвёў гадзіннік? Не, ручны зайцаў гадзіннік ішоў дакладна — мінута ў мінуту. Для большай пэўнасці Зай уключыў транзістар. Загучалі пазыўныя першай ранішняй зарадкі. Наспех зрабіўшы прывычныя рухі, Зай умыўся, адзеўся, як заўсёды — з густам і па апошняй модзе. Зірнуўшы ў акно, на ўсякі выпадак узяў парасон і выйшаў на ганак.

Тут ён убачыў Бусла, які ў трывожным одуме хадзіў па палянцы.

— Што здарылася?— спытаўся Зай.

— Яно... не можа падняцца...— ледзь паспеў вымавіць Бусел, і Зай, якому адразу ж перадалася неспадзяваная трывога, з усіх ног кінуўся да піянерскага спальнага корпуса. Абабегшы доўгія рады ложкаў, Зай спыніўся ля самага крайняга, на якім, скурчыўшыся ў абаранак, спаў яго маленькі друг Вася Вясёлкін.

— Уставай, уставай, братка! — патрос Зай хлопчыка за плячо.

Вася прахапіўся і аж падскочыў на пасцелі:

— Ужо ўзыходзіць?

Зай збянтэжана і вінавата паглядзеў на Васю Вясёлкіна.

— Што, праспаў, друг? — спытаўся Вясёлкін.— А ты

ж учора абяцаў мне... Я ж ніколі яшчэ не бачыў, як яно ўзыходзіць.

Цяжка стрываць незаслужаныя дакоры, але нельга ўтаіць і страшнае навіны.

— Яно не можа падняцца, Вася,— не хаваючы слёз, сказаў Зай і, нахіліўшыся да сябра, зашаптаў яму нешта таямнічае і жахлівае.

Сумныя вочы Васіля рабіліся ўсё большымі, усё шырэйшымі. З іх высвечваў страх, але вось мільганула і надзея:

— А ў нас ёсць кран!

— Які кран?

— Пад'ёмны.

Вася і Зай кінуліся на пляцоўку, дзе будаваўся новы корпус лагера.

Тут было поўна машын. Апусціўшы хобаты і глюгі, спалі краны, спаў на тэрасе сваёй канторы Прараб.

— Дзядзечка Прараб, нам патрэбен кран,— тузануў яго за рукаў Вася.

— Не дам! — закрычаў Прараб.— Я сам у трэсце ледзьве выпрасіў. З усходам Сонца пачынаем работу...

— Нам да ўсходу трэба,— сказаў Вася.— Мы да ўсходу ўправімся. Як ты думаеш, Зай?

— Думаю, управімся,— пацвердзіў Зай.

Вася схіліўся над вухам Прараба і зашаптаў яму, напэўна ж, тое, што сам пачуў як нечаканую вестку.

Прараб падняўся, пачухаў пяцярнёй патыліцу:

— Калі ўправіцеся — давайце. Толькі трэба Зайцаву сказаць.

А ён сам тут,— сказаў Вася.

— Ты тут, Зайцаў? — перапытаў сонны Прараб.

— Тут,— сказаў Вясёлкін і штурхануў пад бок Зая.

— Тут...— няўпэўнена пацвердзіў Зай.

— Пад тваю асабістую адказнасць, таварыш Зайцаў,— строга загадаў Прараб і з галавой накрыўся коўдрай...

Не губляючы ні секунды, Зай выбег на будаўнічую пляцоўку. Прыставіўшы лапу да губы, ён крыкнуў нешта на сваёй мове — гучнае, прарэзлівае, незразумелае, але, напэўна ж, таямнічае:

— Ай-ай-ай!

І адразу ж, на тым часе, усю пляцоўку запоўнілі зайцы.

Друг Васі Вясёлкіна меў у лесе вялікае сваяцтва. Адусюль пачуліся заклапочаныя і ўстрывожаныя воклічы:

— Што здарылася?

— Чаму нас выклікалі, таварыш Зайцаў?

— Хлопцы! — сказаў Зай.— Неадкладная замежная камандзіроўка...— І, зірнуўшы на ручны гадзіннік, загадаў: — Па машынах!

І вось у адно імгненне ажыла, заварушылася тэхніка. Загулі МАЗы, выязджаючы на дарогу. Пайшлі самазвалы. І на кожным замест матора — сярэбраны зубр, а ў кабіне за рулём —заяц. Набіраючы хуткасць, рушылі бульдозеры, экскаватары, пад'ёмныя краны, пажарныя машыны. З усіх кабін, шырока ўсміхаючыся, вадзіцелі віталі свайго начальніка...

З пляцоўкі Вася і Зай павярнулі на лясную сцежку. Змрочна, цёмна ў густых нетрах. Прыціхлі, насцеражыліся дубы, яліны.

— Куды мы, Зай?

— Як — куды? Яго ж нам усё адно на абмінуць, не абысці.

— Каго?

— Самога...— і Зай, заміраючы ад страху, пачаў на мігі паказваць Васілю нешта ўсемагутнае і непераможнае...

Па тым як Вясёлкін зноў кінуўся ў спальны корпус, хапіў са сцяны свой аўтамат верны, свой меч фанерны, узяў залаты горн, напакаваў кішэні ўсімі неабходнымі для падарожжа рэчамі і ў апошнюю хвіліну надзеў будзёнаўку, не цяжка было здагадацца, што сабраўся ён у рызыкоўную і небяспечную дарогу.

Ля пад'езда Васю чакаў Зай з матацыклам — у камбінезоне, у шафёрскіх акулярах. Няўрымслівы матацыкл ірваўся з рук, яму не цярпелася — хутчэй, хутчэй у дарогу. І толькі Вясёлкін сеў у каляску, як ён гайсануў з месца, пакінуўшы каснічок дыму.

## *III*

Праз якое паўгадзіны Вася з другам спыніліся на мяжы чужое дзяржавы. І хоць яна была суседняя, але ўсё яшчэ загадкавая і таямнічая.

Праўда, і тут былі ўстрывожаны тым, што час выбіўся з раскладу, парушыўшы свой строгі кругабег.

— Каторая гадзіна? — пачулася з кратовай нары.

— Ха-ха-ха! — зарагатала Сава, седзячы на гнілым пні.

— Даўненька я не бачыў, як узыходзіць Сонца,— цяжка ўздыхнуў Крот.

— Па мне — няхай яно зусім не ўзыходзіць! — гукнула Сава і навяла свае ліхтары на Васю і яго сябра.

Вясёлкін і Зай стаялі на адвечнай зямлі суседняй дзяржавы. Але вароты яе былі непрыступныя. На іх вісеў велізарны цяжкі замок. Мяркуючы па тым, як густа ён пакрыўся ржою, даўно не адчыняліся дзяржаўныя вароты.

Далікатна, нерашуча Зай стукнуў лапай раз-другі і спалохана азірнуўся.

Спалохацца было чаго. Прытаіўшыся на дрэве, з яго не зводзіла злых, драпежных вачэй Рысь, з густога зарасніку выглядаў Дзік. Ён ужо вастрыў свае крывыя іклы. Лісіца з Куніцай прагна лавіла кожны гук, кожнае слова.

На далікатны стук Зая ніхто не абазваўся. Тады да варотаў ступіў Вясёлкін. Але не зрабіў ён і двух крокаў, як з падваротні паднялася галава Гадзюкі. Паварочваючыся навокал, яна вадзіла доўгім языком і сіпела — чым бліжэй, тым страшней.

Вася не вытрымаў выпрабавання. Ірвануўшы з пляча аўтамат, ён прыцэльным агнём ударыў у галаву змяі. Гадзюкі — як не бывала. Там, дзе яна пакручвалася, засталося пустое месца. І толькі водгулле стрэлу пракацілася па пушчы. Калі яно змоўкла, Вясёлкін смела павярнуў да варотаў. Але што такое? З падваротні зноў паднялася змяіная галава.

Вася схапіўся за меч. Галава ў адно імгненне схавалася. Ад узмаху мяча варухнуліся кусты.

І раптам за варотамі пачуўся грозны голас:

— Хто з мячом да нас прыйшоў?

— Я...— паціху вымавіў Вася. Але за варотамі яго пачулі.

— Чаго ты хочаш?

— Сонца...— сказаў Вясёлкін,— Сонца не можа падняцца. Прапусціце нас. У нас ёсць магутныя машыны.

— Позна! Позна спахапіліся!

Але праз лясныя нетры, ламаючы дрэвы, трушчачы зараснік, прабівалася ўжо неперdroжная тэхніка. Усё жывое сцішылася і змоўкла, пачуўшы, як пад яе цяжарам застагнала зямля і захісталіся дубы.

— У нас ёсць пад'ёмны кран! — гукнуў Вася, намагаючыся перакрычаць гул машын.

— Разбойнікі, драпежнікі, захопнікі! — пачуўся страшны енк за варотамі.

І зноў запанавала злавесная цішыня.

— У нас ёсць... у нас ёсць залаты горн, па якім яно заўсёды падымалася! — сказаў Вясёлкін і паднёс да губ свой горн.

І вось над спрадвечным зялёным царствам паплылі ўрачыстыя гукі, якія заўсёды чаравалі жывы слых.

Каля падваротні паднялася знаёмая нам галава. Услухоўваючыся ў дзівосную музыку, цяпер ужо змяя — хітрая, спрытная, выкрутлівая — уся была ва ўладзе чалавека.

Але чарадзейны горн пакарыў не толькі змяю, улада залатой трубы зачаравала ўсю пушчу, усіх яе насельнікаў і нават непраходнае балота, над якім не магло падняцца Сонца.

Пачуўшы сігналы, яно падхапілася, ірванулася, паласнула залатымі пырскамі і, здавалася, вось-вось устане над лесам, але, знямогшыся, зноў упала, асвятліўшы край неба толькі на адно імгненне.

І калі б не ўпэўненыя, пераможныя гукі Васевага горна, адчай і беспрасвецце авалодалі б усёй пушчай. Цяпер жа і тут зразумелі, што надзея не страчана.

— Прапусціце! — пачуўся царскі загад.

Да гасцей з вялізным ключом выйшаў начальнік аховы — у эпалетах, у шнурах, з доўгай крывой шабляй на баку — генерал Воўк.

Заскрыгатаў замок, зарыпелі цяжкія вароты.

— Пропуск! — патрэбаваў генерал.

Калоцячыся ад страху, Зай схаваўся за сябра. Вясёлкін не спяшаючыся дастаў з кішэні пакунак. Пакуль разгортваў яго, уся ахова чакала з затоенай цікаўнасцю. І якое здзіўленне і нават спалох ахапілі ўсіх, калі стражнікі ўбачылі ў руках у Васі сярэбраны партрэт свайго ўладара!

Узяўшы лапу пад казырок, Воўк выцягнуўся і прыціх. А Вясёлкін і Зай, сеўшы на матацыкл, з горда пад-

нятымі галовамі ўрачыста ўехалі ў царства Зубра. Насцеражылася ўся пушча. За кожным дрэвам і кустом затаіліся цікаўныя. І толькі госці сышлі з матацыкла, як на Зая рынуліся вялікія і малыя звяры. Яны не маглі дапусціць, каб разам з Вясёлкіным у ганаровыя паслы трапіў заяц! Гэта выклікала іх асаблівае абурэнне. Беднага Зая абступілі з усіх бакоў. Вакол яго пачаўся танец злых насмешнікаў.

— Хто такія?

— Вы турысты?

— Мы... лясныя, мы ар-тыс-ты...— намагаючыся вырвацца з кола, мармытаў Зай.

Яшчэ мацней загучалі кпіны і смех:

— Га-га! Го-го! Паглядзіце на яго! Бач, які ён важны франт! Ты хто: танцор ці музыкант?

Тут ужо не ўцярпеў і Вася:

— Вас тут зграя, а мы ўдвух, дык спыніце віск і свіст. Хто не верыць, што мой друг — слаўны цыркавы артыст? Сам яго нядаўна бачыў я па тэлеперадачы. Ён выходзіў на экран і лапай біў у барабан.

— О-о-ох! — пачуўся царскі стогн. Звяры сыпануліся хто куды, і нашы госці ўбачылі самога цара. Ён сядзеў пад дубам на сваім троне — у мантыі, з жазломскіпетрам і з каронай на галаве паміж рог. Да старога Зубра тулілася малое Зубраня.

— А-а-а! — плакала яно, залліваючыся горкімі слязамі.

Стары не мог ні ўцешыць, ні супакоіць яго.

Вясёлкін пачціва пакланіўся.

— Што здарылася? — заклапочана спытаў ён.— Чаго плача ваш унучак?

Расчулены спагадай, малы пястун зароў яшчэ мацней. Рыдаючы, ён не мог вымавіць ні слова. Прычыну гора растлумачыў дзед:

— Мой жа ўнучак ніколі яшчэ не быў у цырку, не бачыў ні кіно, ні тэлевізара.

— ...Не бачыў... слаўнага барабаншчыка Зая...— усхліпваючы, дадаў царскі ўнук і закрычаў: — Хачу тэлевізар! Хачу барабаншчыка Зая!

Тут застагнала, завохкала, зараўла ўся Зуброва радня, увесь двор.

— Пашкадуйце яго высокасць... Супакойце яго вялікасць...

Заю паслужліва паднеслі бубен. І сэрца артыста не вытрымала спакусы, здалося. Ён выйшаў на круг і паказаў шаноўнай публіцы свой кароны нумар — танец з бубнам, такі вясёлы, гарэзны, заліхвацкі, што, міжволі захапіўшыся, прыпляскваючы лапамі, прытупваючы капытамі, у скокі пусцілася ўся дзяржава.

Доўга і самазадаволена гула дворня, цешачыся танцам. Але неспадзявана зноў зароў царскі пястун:

— Хачу Вясёлкіна! Няхай паскача Вася!

Стаў прасіць і сам цар:

— Пацеш, дружок, майго хлопчыка. Сумна яму.

— Не! — рашуча сказаў Вася.— Я ішоў сюды не для таго, каб забаўляць вашага равуна. Не хочаце са мной дружыць — прымушаеце служыць? Я думаў, што вы добры, падобны на свайго брата. Брата вашага прызналі, ён вядомы на ўвесь свет. У нас на кожным самазвале зіхаціць яго партрэт. Вось! Паглядзіце! — І, дастаўшы з кішэні бліскучую фігурку зубра, Вася паднёс яе лясному волату.

Стары рэзка, са злосцю адвярнуўся, а малы, схапіўшы цацку, заскакаў ад радасці.

— Як падобны ён на вас! — усклікнуў унук, паказваючы дзеду сярэбраны партрэт.

— Ён у нас завецца МАЗ,— дадаў Вясёлкін, падзяляючы захапленне малыша.— Сапраўды, асілак ён, падымае дзвесце тон!

— Во-о-н! — ашалела зароў стары белавежскі ўладар і ўсхапіўся з трона.— Мне сказаць такое ў вочы, у самы лоб такі ўдар! Абняславіць мяне хочаш? Цар я тут або не цар?

Не трацячы высокай годнасці, Вася спакойна сказаў:

— Больш няма цароў на свеце, кончылася іх улада, гэта знаюць усе дзеці, нават малышы з дзетсада.

Што тут пачалося! Раз'ятрылася, азвярэла ўся царская чэлядзь. Затрэсся, закалаціўся разам з тронам сам цар і адразу ж падаў знак стражнікам і генералу не выпускаць Васю і Зая за межы царства. Прарэзліва заскрыгатаўшы, цяжкія вароты зачыніліся.

Але скрозь злавесную цішыню ўсё мацней і выразней праступаў гул машын. Усё бліжэй чуліся іх сігналы і гудкі.

Цяпер стары волат ужо свядома ішоў на выклік. Не

могучы ўтаймаваць раз'юшанасці, ён доўга бушаваў, сам сабе пераказваючы словы, якія так уразілі яго:

— Як гэта няма цароў? Зніклі ўсе — і будзь здароў? Н-не, славуты зубраў род мае сотні тысяч год. Шмат я выхадзіў бароў, горкіх папагрыз асінак, і таму сярод звяроў самы дужы стаў асілак. Вось табе мой сказ, браток. Паспрабуй ступі хоць крок: на мяжы маёй дзяржавы пільныя стаяць заставы, і не выйдзеце без візы вы, аж пакуль наш род зубрыны не пабачыць тоі карціны, што глядзеў ты ў тэлевізары! Гэта царскі мой указ — хопіць з вас на першы раз.

Разгубіўся Зай.

— Што рабіць, Вася? — спытаўся ён і, цяжка ўздыхнуўшы, паглядзеў на свой ручны гадзіннік: — Яму б самая пара ўзысці...

Вася і Зай памкнуліся былі сесці на матацыкл, але ім ужо завалодаў царскі пястун. Новая цацка так яму спадабалася, што ніхто не мог ні падысці, ні падступіцца. Ён безупынна націскаў на сігнал, з асаблівай асалодай услухоўваючыся ў трывожныя гудкі.

Але больш магутныя і трывожныя гудкі пачуліся з месца аварыі.

Сонца, Сонца ў бядзе! Тут ужо не да царскага ультыматуму. І Вася Вясёлкін пайшоў на часовае пагадненне:

— Адкажу на ўказ ваш так: заключаем з вамі пакт, мірны дагавор часовы, толькі пры адной умове: калі вы такі асілак, не рабіце больш памылак. Слухаць я не вас павінны, а важатага дружыны. Вы — не пан, я — не батрак. Абвяшчаецца ан-тракт!

## *IV*

...Глухая бясконцая сцежка вядзе нашых падарожнікаў. Вася падбадзёрвае друга. Вось толькі б знайсці вады. Так хочацца піць!

Раптам праз лясны шум прабіўся тонкі серабрысты званочак.

— Ручаёк!

Падбадзёраныя, радасныя сябры кінуліся наўздагон. Беглі, беглі і спыніліся ад нечаканасці: дзе ж ён?

Выслізнуў з-пад самых ног, прапаў. Вася і Зай азір-

нуліся і яшчэ болей насцеражыліся: не зводзячы вачэй, след у след за імі краліся хіжыя царскія стражнікі.

Прыклаўшы да зямлі вуха, Вясёлкін адразу ж вызначыў накірунак ручая: наперад! Сябры пабеглі далей, але не адставалі і ворагі: генерал Воўк, ікласты злосны Дзік, слепавокі Барсук і неразлучная пара — Лісіца з Куніцай.

Стомленыя, знямożаныя, Вася і Зай пападалі на зямлю. Неадольная смага мучыла іх:

— Бачыш, як засмяглі губы? Хоць бы кропельку вады. Ручаёчак, братка любы, дзе ж падзеўся ты, куды? А-у, ручай, а-у, ручай, хутчэй з бяды нас выручай!

Услухаўшыся ў водгулле, Васіль, яшчэ не верачы сам сабе, падхапіўся:

— Можа, гэта мне здалося, але вунь між гонкіх сосен штосьці бліснула, як вока, во! Зусім жа недалёка. Чуеш, нехта абазваўся?

Зай спалохана натапырыў вушы:

— Нешта боязна мне, Вася. Хочаш вер ты ці не вер — гэта вельмі страшны звер.

Але Вася расхінуў густы зараснік і аж ускрыкнуў ад радасці:

— Гэта ж возера лясное! Гэй, хутчэй, хутчэй за мною!

Сябры кінуліся ў лагчыну. Перад імі адкрылася круглае, чыстае, як люстэрка, возера. Прыпаўшы да вады, Вясёлкін доўга піў, потым ускочыў, весела засмяяўся і пачаў танцаваць. Зай са здзіўленнем глядзеў на сябра. Тады Вася падвёў Зая да вады: у празрыстым люстры яны ўбачылі саміх сябе: выгаралы русы чуб і аблуплены, увесь у рабацінні Васілёў нос і доўгія вушы Зая, яго мокрыя абвіслыя вусы і скамечаны модны гальштук.

Тут ужо не ўтрымаліся абодва і сталі рагатаць на ўсю сілу.

Доўга смяяліся яны, пакуль Вясёлкін не спыніўся і не стукнуў сябе па лбе:

— Стоп! Збываецца мой план! Паглядзі, экран?

— Экран!

— Дык скідай хутчэй каптан!

Закіпела работа, пачалося сапраўднае чарадзейства. Па сасне, як маланка, шуганула ўгору Вавёрка.

Доўга не раздумваючы, Васіль свіснуў і кінуўся на дрэва сам. Дастаўшы з кішэні маток дроту, ён разам з Вавёркай ужо наладжваў антэну, весела напяваючы.

ПЕСЕНЬКА ВЕРХАЛАЗА

Я палезу сам
На хвою
І антэну вам
Настрою.

Не баюся
Я ані,
Што звалюся
З вышыні.

Стаўлю строма
Мачту ўраз,
Я вядомы
Верхалаз.

Але вось новая бяда: не хапіла дроту для зазямлення. Зажурыўся Вася:

— Пэўна, выйшла пераборка. Селі, братцы, мы на мель. Што ты хоч сказаць, Вавёрка?

— Я прыдумала: вунь хмель! Хмель віецца па сасне. Зай, падай сцяблінку мне. Прычаплю да верхавіны, падыму да самых зор — няхай слухае навіны белавежскі цёмны бор!

І на тым часе шчаслівыя сябры гучна ў тры галасы абвясцілі ўсёй пушчы:

— Пачынаецца тэлеперадача! Па сцэнарыю Зай Зая пойдзе хроніка лясная. Усе, хто толькі пажадае,— кожны сам сябе пазнае. Хай бацькі ўжо заадно і дзяцей вядуць у кіно. Дазваляецца ўваход усім, каму шаснаццаць год!

Глухі, хмуры, затоены бор нечакана зарагатаў:

— Не смяшыце наш народ. У нас усё наадварот: у такія ўжо гады ў нас не дзеці, а дзяды.

І адразу ж валам навалілі глядзець тэлевізар усе — і стары, і малы.

— Мне сягоння роўна год!
— Што ж, праходзь, сядай, Янот.
— А нам месяцаў па восем...
— Просім, Бабраняткі, просім!

Бліскаючы дапытлівымі вочкамі, на плячо Васі ўскочыла шустрая Ласачка:

— Я — маленечкая Ласка,
У мяне маленькі хвост.
Гэта для маленькіх казка?
— Для маленькіх, нападрост.

## V

Велізарная аўдыторыя прыціхла, рыхтуючыся глядзець перадачу. Кожны выбраў месца па сабе — зручнае і ўтульнае.

Пачуліся першыя гукі: сасна загула густым віяланчэльным басам. Ля камля заспяваў чмель, падымаючыся ўсё вышэй, і ўся зямля слухала музыку «Палёт чмяля».

Шырокае блакітнае шкло праяснілася — пачалося кіно.

Мільгануўся на экране Лось, нібы намаляваны: даўгашыі і цыбаты, паміж вушак — дзве лапаты.

Паварочвалася шустра модніцаю перад люстрам і яшчэ адна красуля — еўрапейская казуля.

Раптам хлопец у далоні ад здзіўлення аж запляскаў: з дна, з блакітнага прадоння на яго глядзела казка, светлы чарадзейны сон:

— Хто ты, цень?

— Я — Алень.

— А чаму ў цябе на лбе кактусавыя галіны?

— Гэта летні мой вазон, я яго зімою скіну.

На свой здымак паглядзець падышоў стары Мядзведзь, нахіліўся асцярожна. І хоць быў адбітак пробны, ён сказаў:

— Дальбог, падобны. Тут мяне пазнае кожны!

Крадучыся, да тэлевізара падпаўзлі царскія ахоўнікі. Цікаўнасць узяла верх. Кожнаму хацелася паглядзець нябачанае дзіва.

Не цярпелася і самому генералу хоць адным вокам зірнуць на сябе — як глыбока ён наказаны:

— Ну-тка, што там за экран? Стойце, гэта — здзек, падман! Хіба ж злосны я і грубы і такія ў мяне зубы?

Пачуўся прарэзлівы свіст. Выхапіўшы з ножнаў крывую шаблю, Воўк рынуўся на Вясёлкіна. Можа, і прапаў бы Вася, галава зляцела б з плеч, каб не Васеў верны меч.

Зграя стражнікаў абступіла Зая.

— Заю беднаму — канцы! Заю нашаму — канцы! — пачуліся з усіх бакоў воклічы.

Але другая нечаканая вестка прымусіла ўсіх змоўкнуць:

— Царскія бягуць ганцы! Бачыце, вунь-вунь мядзведзі! Грозны гасудар наш едзе!

Цар не ехаў. Яго вялікасць урачыста неслі ў паланкіне. Чатыры мядзведзі, прысядаючы пад цяжарам, валаклі ўладара пушчы. Убачыўшы, што жыццё Васі і Зая на валаску, ён спыніў свой грозны пагляд на прыдворных, што вераломна парушылі слова гонару. Белавежскі волат узлаваўся не на жарт:

— Слухайце мой царскі голас: калі зваліцца хоць волас з галавы маіх гасцей — усім вам не сабраць касцей! Хто парушыў слова чэсці, каб са свету Васю звесці?

— Ваша вялікасць! — узвыў ад страху Воўк і падтуліў хвост. Але на яго бяду здарылася яшчэ большая непрыемнасць: немаведама адкуль узяўшыся, над галавой Зубра закрычала Варона:

— Кар, кар, цар, цар! Ходзіш ды грызеш асіны, а зла-віць мяне бяссільны! — і раптам белая пляма распаўзлася на дзяржаўнай кароне.

Тут цара хапіў удар. Такое ганьбы ён яшчэ не ведаў:

— Дзе ахова? Дзе чыны? І куды глядзяць яны?

Трымаючы лапу пад казырок, генерал калаціўся ад страху. А Зубр ужо бушаваў на ўсю сваю сілу:

— Быў загад, быў мой закон — палавіць усіх варон? Чаго лыпаеш вачыма? Пазбаўляю цябе чына! — крыкнуў цар, і ў гневе ён з Воўка сам сарваў пагон.

Дзік, Барсук з такой нагоды як далі са світы ходу, а зласлівая Варона зноў над галавой цара, не шануючы закона, калі каркне:

— Кра-кра-кра!

Падышоў тады сівабароды цар да блакітнага экрана. Доўга ўглядаўся і цяжка ўздыхнуў:

— Як відаць, адпета песня, састарэў, пайду на пенсію. Слепнуць я пачаў, няйначай, кепска бачу перадачу.— І стаў шарыць пад мантыяй, мацаць па кішэнях камзола.

Сыны кінуліся да насілак — акуляры былі там. Удвух ледзь падналі велізарны футляр. Бацька адчыніў яго, дастаў рагавыя акуляры і надзеў іх на рогі. Зняўшы карону і зірнуўшы на яе, ён размахнуўся і хацеў быў шпурнуць на дно, але Вася ўтрымаў:

— Лепш мы здадзім яе ў музей.

І пайшла круціцца плёнка, выгукнуў Вясёлкін звонка:

— Пачынаецца карціна: «Зай-Зайчына — малайчына!»

Нялёгкая задача — такая перадача, калі за кожным

рухам Лісіца водзіць вухам і хоча Зайца з'есці і толькі дзеля чэсці слугуе да пары на лапках пры Зубры.

А Зай наш — малайчына, артыст, штукар і хлус, з лясной кінакарціны пакручвае ўжо вус. З крывулінай сухою, нібы касец з касою, ён, весела сустрэты, пяе свае куплеты.

КУПЛЕТЫ ЗАЯ

Нясу
Касу
На плячы,
Хачу
Лісу
Засячы.

Дрыжы,
Ліска,
Ліжы
Міскі,
Дагрызай
Косці —
Едзе Зай
У госці.

Хавай,
Кажу,
Кіпцюр
Хіжы,
Скідай,
Скідай
Кажух
Рыжы.

Павярніся,
Ліска,
Пакланіся
Нізка:
Смертухна
Ўжо блізка.

Такога Ліса не магла ні стрываць, ні даравацъ. Аж пацямнела ў вачах. Яна ўсхапілася і рашыла канчаткова вывесці самазванага артыста на чыстую ваду:

— Зірніце, гляньце самі — ён дагары нагамі! Падманшчык! Шарлатан! — І скок на той экран.

Ад Ліскі — толькі пыркі, а публіка ад віску, ад крыку «Брава! Брава!» аж млела і стагнала. Тады, як па сігналу, на дзве, на тры хвіліны выходзіў Зай з карціны і кланяўся налева, і кланяўся направа.

Сам Зубр на той камедыі стрымаў свой гонар ледзьве. Варочаўся, згінаўся, пасля ўсё ж засмяяўся, і доўга смех зубрыны пагойдваў верхавіны.

Глыбока расчулены, ён зняў акуляры, выцер слёзы і сказаў:

— Рад я, што з табой спазнаўся, што прыйшоў ты ў пушчу, Вася. Аддаю табе дуброву, не палову, а Зуброву ўсю вялікую дзяржаву, усю адпісваю па праву, дык валодай ёй на славу. Буду я з табой дружыць, буду сам табе служыць...

А тым часам усё бліжэй станавіліся шум, грукат, скрыгатанне экскаватараў і бульдозераў, што ўгрызаліся ў балотную багну і лясны жвір...

— Грамату! — загадаў цар-пенсіянер. Сыны паднеслі яму скрутак папірусу і гусінае пяро. І Зубр стаў выводзіць літару за літарай: «Лясы, пералескі і заснікі перадаю...»

— Пад асабістую адказнасць таварыша Зайцава...— удакладніў Вясёлкін, і былы цар напісаў: «Пад асабістую адказнасць таварыша Зайцава».

«Зямлю, воды, неба...» — пісаў далей Зубр.

— І Сонца! Сонца! — падхапіўся Вясёлкін. І як бы ў адказ на яго трывогу яно ўспыхнула і на імгненне асвятліла ўсё наваколле.

«І Сонца»,— напісаў Зубр.

— Пад асабістую адказнасць таварыша Вясёлкіна! — сказаў Заї.

«Пад асабістую адказнасць...»

Усё выразней набліжаўся гул машын...

## VI

Што ж з Сонцам? Кепска, зусім кепска.

Але магутная тэхніка, кінутая на ліквідацыю аварыі, рабіла сваю справу: раўлі самазвалы, стагналі бульдозеры, скрыгаталі краны. Як вокам скінуць, ад лясных выцерабаў цераз усё балота да самага Сонца ўжо была гатовая грэбля.

Вопытныя, умелыя майстры пракладалі да яго дарогу — пільшчыкі Бабры, укладчыкі бярвенняў Мядзведзі. Паміж будаўнікоў не цяжка было пазнаць і ўцекачоў, разжалаваных царадворцаў — Ваўка, Барсука, Куніцу і нават Рысь: усе пілавалі, seклі, цягалі, вельмі задаволеныя, што знайшлі работу.

Ліса выбрала больш лёгкі занятак: з вядзерцам і пэндзлікам яна стаяла і на дарожных слупах пісала кірунак машынам. На адным слупе: «Да Сонца», на другім: «У гаспадарку тав. Зайцава».

Патоку машын не было канца. Машыны, машыны... Ад іх ужо не павярнуцца, не дыхнуць. Стогнуць, кашляюць, чхаюць, закрываючы насы ад дыму, затыкаючы вушы ад шуму, Бабры, Барсукі і Мядзведзі.

З ляснное праскі на грэблю выйшлі Вясёлкін і Заї — з велізарнай даравальнай граматай пад пахай. Зайцы-шафёры з усіх кабін радасна віталі свайго начальніка. Былы генерал Воўк нізка сагнуўся ў паклоне.

— Працуеш? — паблажліва спытаўся Зай.

— Стараюся,— лісліва, яшчэ ніжэй сагнуўся Воўк.

— Я табою задаволены,— сказаў Зай і паляпаў шэрага па загрыўку.

Ліса з вядзерцам і пэндзлем таксама старалася трапіць на вочы Заю.

— Добрай раніцы,— падлашчваючыся, забягала яна наперад, але Зай, не заўважаючы Лісы, ішоў з Вясёлкіным далей і далей, да Сонца.

Надыходзіў самы адказны момант. Усе самазвалы павярнуліся на выезд. Замёр у напружаным чаканні кожны сярэбраны зубр. Пад'ёмны кран набліжаўся да Сонца.

— Усім адысці ад стралы!

— Не стойце пад грузам! — прагучалі каманды.

— Стоп! — сказаў Вясёлкін і накіраваўся ў кабіну крана.

Кіпела работа і вакол Сонца. Акрамя Баброў, адзетых у вадалазныя скафандры, тут асабліва завіхаліся Буслы. Доўгімі дзюбамі яны намагаліся падчапіць чырвоны шар і ўскаціць яго на платформу, спушчаную на тросах з пад'ёмнага крана. Ускацілі!

— Ускацілі! — пачуліся радасныя галасы.

— Увага! — загучала каманда Вясёлкіна з кабіны крана.

— Пад'ём!

Заскрыпеў, заскрыгатаў кран, нацягнуліся тоўстыя стальныя тросы — і вось самы дарагі груз на свеце пачаў павольна падымацца над зямлёй — вышэй і вышэй.

— Стоп! — падаў каманду Вясёлкін. Сонца спынілася. Яго апусцілі ў кузаў самазвала.

— Падаць ад берага!

І доўгі цуг машын напяўся з усіх сіл. Зараўлі ўсе сярэбраныя зубры, а калона так і не скранулася з месца.

— Раз-два, узялі!

Зноў толькі гул, стогн, газ, пыл, куродым.

Але вось на прасецы паявіўся жывы Зубр, наш добры знаёмы і цяпер ужо сапраўдны друг.

Усе расступіліся перад старым волатам. Ён падышоў да велізарнага самазвала, і ўпёрся ў яго магутным плячом.

— Рушай!

Калона напялася, загула і... пайшла! Сонца павісла над платформай, на доўгіх стальных тросах.

— Стоп! — распарадзіўся Вася. Спусціўшыся з кабіны крана, ён абышоў і агледзеў Сонца з усіх бакоў. Няважны выгляд у Сонца: цьмянае, сляпое, шэрае.

— Куды яго такое? — сказаў Вясёлкін сябрам.— Куды яго такое на неба?

Усе спагадна, з жалем паглядзелі на Сонца, потым на неба. Бацюхны родныя! А і неба ж, і неба ж не лепшае! Уся прастора яго была чорным-чорная ад сажы і куродыму. Цяпер усім стала ясна, што, калі б Сонца і падняло-ся, яго ўсё адно не ўбачылі б.

— Самазвалы, з дарогі!

Самазвалы ў адно імгненне ачысцілі пляцоўку і пад'-язны шлях.

— Пажарныя машыны, усе помпы і шлангі — сюды! — распарадзіўся Вася.

І адразу ж у рух прыйшла ўся ратавальная тэхніка. З брандспойтаў, з усіх шлангаў ударылі скіраваныя ўгару магутныя струмені. Барсук і Дзік, стоячы ў пад'ёмніках, анучамі шаравалі неба. Прыставіўшы лесвіцу, Воўк швабрай сціраў тлустыя плямы. Па небасхіле сцякалі брудныя патокі, нябесны блакіт паступова ачышчаўся і праясняўся. Здалося, нават само Сонца павесялела і ўсміхнулася.

Але так толькі здалося. І Сонцу патрэбен быў ранішні туалет.

Вася ўвайшоў у аўтапад'ёмнік. Тут ён успомніў Лісу. А яна і сама напагатове.

— Давай сюды вядро і пэндзаль,— сказаў Вясёлкін і, падняўшыся да Сонца, пачаў асвяжаць яго яркай фарбай.

Усе з захапленнем убачылі, як яно ажывала, набірала чырвані, ружавела, потым сапраўды ўсміхнулася і пачало падымацца. Матухны мілыя, само ўстала!

Уздых палёгкі пракаціўся над пушчай, зашумелі дрэвы, зашчабяталі, заспявалі птушкі...

## *VII*

Калі Вася Вясёлкін вярнуўся ў лагер, тут яшчэ спалі. Але першыя промні ўжо ўспыхнулі і заігралі ў вялізных бліскучых літарах аркі «Зубраня».

На будаўнічай пляцоўцы ў поўным зборы стаялі машыны, уся тэхніка. На тэрасе канторы спаў Прараб.

Толькі ў казачнай альтанцы прахапіўся Стары певень і стаў будзіць Маладога. І два галасы — тонкі піскЛявы фальцэт і ўпэўнены бас — злучыліся ў адным дуэце:

— Ку-ка-рэ-ку!

Над гняздом узмахнуў крыламі Бусел, пачынаючы свой працоўны дзень.

— Ку-ку!..— высунулася з дупла Зязюля і, няўпэўнена азірнуўшыся, спыталася:

— Каторая гадзіна?

Ускінуўшы залаты горн, Вясёлкін затрубіў.

— Пад'ём! — загучала каманда па лагеры. Па радыё пачуліся сігналы праверкі часу.

Вася паглядзеў на гадзіннік.

— Точна,— сказаў ён.— Добрай раніцы, Сонца!

*1975*

# *Змест*

*Ад аўтара* . . 3

*Увага, нараджаецца чалавек*

Дзеці і мы . . . . . . . . . . . . . . . . . 4
«Сэрца аддаю дзецям» . . . . . . . . . . 69
Настаўнік . . . . . . . . . . . . . . . . . 77
Выхаванне словам . . . . . . . . . . . 84
Вытокі вобраза . . . . . . . . . . . . . 103
Вачыма маленства . . . . . . . . . . . 107
Не толькі сямейная падзея . . . . . . . . . 111
Чалавек, натоўп, мода... . . . . . . . . . . 119
Святло будучыні . . . . . . . . . . . . 133
Шчасце быць настаўнікам . . . . . . . . . . 135
Вясёлы талент . . . . . . . . . . . . . 137
Часцей глядзіце на зоры . . . . . . . . . . 144
Ленінскія надзелы . . . . . . . . . . . . . 148

*Уваход дарослым дазваляецца*

Дыялогі з унучкамі . . . . . . . . . . . . 162
Для пасажыраў з дзецьмі . . . . . . . . . 181
Трынаццаты . . . . . . . . . . . . . . 185
А кампот? . . . . . . . . . . . . . . . . 186
Сын свайго дзеда . . . . . . . . . . . . . 187
Кірмаш . . . . . . . . . . . . . . . . . 188
Вы таксама — пісьменнік? . . . . . . . . . . 190
Страшная казка . . . . . . . . . . . . . 192
Абнова . . . . . . . . . . . . . . . . 194
Стасева падарожжа . . . . . . . . . . . . 196
Наташына сямейка . . . . . . . . . . . . 199
Першая пяцёрка . . . . . . . . . . . . . 202
Чмяліны мёд . . . . . . . . . . . . . . 204
Зайчык-вадалаз . . . . . . . . . . . . . 206
Бацькава слова . . . . . . . . . . . . . 210
Трывога ў Ельнічах . . . . . . . . . . . . 213
Газета . . . . . . . . . . . . . . . . . 221
Трое ў палаце . . . . . . . . . . . . . . 224
Хто памагае сонцу . . . . . . . . . . . . 252

ВАСИЛЬ ВИТКА
(Тимофей Васильевич Крысько)
*Дети и мы*
На белорусском языке

Рэдактар В. І. Рабкевіч. Мастак Т. А. Мельянец. Мастацкі рэдактар А. І. Труханава. Тэхнічны рэдактар Л. М. Шлапо. Карэктар Я. Ф. Харко.

ИБ № 203

АТ 10563. Здадзена ў набор 23/IX 1976 г. Падп. да друку 23/II 1977 г. Тыраж 13 000 экз. Фармат 84×108¹/₃₂. Папера друк. № 1. Ум. друк. арк. 14,385. Ул.-выд. арк. 13,89. Зак. 3611. Цана 1 р. 18 к.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Мінск, Свярдлова, 4.

Паліграфічны камбінат імя Я. Коласа Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Мінск, Чырвоная, 23.

Вітка В.
В 54 Дзеці і мы. Мн., «Маст. літ»., 1977.
272 с., 2 с. укл.

Кніга В. Віткі «Дзеці і мы» ўзнікла з патрэбы пісьменніка выказацца пра тое, што яго трывожыць і хвалюе: які сучасны чалавек, якім ён імкнецца стаць, у чым яго ідэал, як ён разумее і бачыць жыццё.

В $\frac{70303-073}{М\ 302\ (05)-77}$ 4—77 Бел 2